ЯН ПЯТРОЎСКІ

# ЛЕПШЫЯ ДУМКІ ЧАЛАВЕКА



ДУМКА ЧАЛАВЕКА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА
ПРАМОЦЫЯЮ ЯГОНЫХ АСЯГНЕНЬНЯЎ

ЛЕПШЫЯ ДУМКІ ЧАЛАВЕКА

## ІНВОКАЦЫЯ

Прыроджанае імкненьне да філязофіі дзеля яе самое і бадай што фанатычная любоў да справядлівасьці - гэта шлях праґрэсу Францішка Скарыны - Сымона Буднага - Васіля Цяпінскага - Льва Сапегі - Братоў Луцкевічаў - шлях, які творыць сабою Літоўскую традыцыю, да якое з ласкі Нябёсаў з гордасьцю я адзначаю сваю прыналежнасьць.

# MAN'S
# BEST THOUGHTS

Compiled
by
John Piatroŭski

FIRST VOLUME

Gainesville, Florida, U.S.A.
1977

# ЛЕПШЫЯ ДУМКІ ЧАЛАВЕКА

выбраў і ўклаў паводля тэматыкі

*ЯН ПЯТРОЎСКІ*

=========
ТОМ ПЕРШЫ
=========

Ґэйнсвільл, Флярыда, ЗША
1977

Чалавек павінен быць гордым
са свае Бацькаўшчыны, і жыць
гэтак, каб ягоная Бацькаўшчына
была гордаю зь яго.

Паводля Р. Дэйлі

Published by Byelorussian Charitable Educational Fund, Inc.
1716 N.E. 7th Terrace
Gainesville, Florida, USA
Copyright, 1977



Ян Пятроўскі

Гэтыя праўды, якія, як я цьверджу, выясьніліся ў бегу нашае гутаркі і замацаваныя - хоць гэта можа гучэць празьмерна груба - жалезнымі і непахіснымі абаснаваньнямі. І пакуль ты ці хто-небудзь іншы ня зьбіў іх, няма ніякае магчымасьці запярэчаньня таго, што я кажу. Бо мой пагляд заўсёды быў, што я сам ня ведаю, як гэтыя рэчы ўсуадношваюцца, але, як да гэтае пары, вось як і цяперака, я не спаткаў нікога, хто мог-бы сказаць нешта іншае, не асьмешыўшы самога сябе.

Сакратас

# П Р А Д М О В А.

Прадложаная гэтым праца тварылася ў атмасфэры перакана246ньня, што "Усе людзі родзяцца свабоднымі і роўнымі адносна свае годнасьці і сваіх правоў". У межах гэтых правоў існуе права на карыстаньне духовымі асягненьнямі людзкасьці, як і гонар індывідуальнага прыняцьця адказнасьці ў галіне культурнага поступу ў васяродзьдзі нашае ра́сы. Роўнасьць і права вымерваюцца ахвочасьцю <u>ўзяць</u> і <u>даць</u>.

Іншымі словамі: роўнасьць вымерваецца нормаю вышэйшых асягненьняў пазытыўнага ўкладу ў галіне культуры, вялікаю вартасьцю годнасьці чалавека, які паставаю свайго інтэлекту змушае іншых лічыцца зь ягонымі пастулятамі як роўнага ў сям'і роўных.

Тое, што творыць сабою зьмест "Лепшых думак чалавека" - гэта вынік веры чалавека ў лепшыя духовыя ўмовы быту, свабоды; гэта працэс ягонага думаньня ці - выніку таго, што́, пачынаючы ад дня ягонага нараджэньня і да самае сьмерці, кіруе ім - ягонага розуму.

Думкі гэтыя выражаюць сілу пераканаьня і глыбокую спадзею на лепшае заўтра; яны пісаліся і перахоўваліся на працягу доўгіх тысячалецьцяў, і ў сваім аднаўленьні сягоньня, знаходзяць свой працяг.

Усяроўна, дзе чалавек жыве, што ён робіць, куды крочыць, характэрным ёсьць для прадложаных думак, што яны заўсёды дышуць жыцьцёвасьцю, ня губяць свае сьвежасьці і сілы пераканаьня, і ніколі не старэюцца.

Зь першых дзён свайго сьведамага існаваньня, у

розным часе і на розных мясцох, чалавек уздымаў тое, што́, паводля ягонага меркаваньня, было лепшым з таго, што́ ён гаварыў і ўтрывальваў на пяску, гліне, на пэргаміне... Былі гэта спачатку простыя, кароткія сказы, выражаючыя ў той ці іншай ступені мудрасьць. Запісы гэтакія ўвайшлі ў гісторыю цывілізаванага сьвету пад імем афорызмаў.

Афорызмы, звычайна, выражаюць глыбейшую думку, адзначаюцца ґрацыяю ў выражэньні і прыгожаю лякарнічнаю хвормаю. Напрыклад, грэкі старажытныя казалі: "Пазнай самога сябе". Тут прыгожая і глыбокая, сьцісла ўнятая думка дамагаецца шырэйшае агаворкі, у тым сэнсе, што, апрача пазнаньня навакольнага сьвету, у якім чалавек жыве, яна суґэруе ідэю пазнаньня чалавека і, – што найболей важным – пазнаньня самога сябе. Бо і запраўды, апрача веданьня свайго месца нараджэньня, імя і веку, што́ чалавек ведае болей пра самога сябе? – Інакш кажучы: вывучай сьвет, вывучай чалавека, вывучай самога сябе, каб стацца сьведамым і сільным.

Або вазьмем іншы афорызм зь беларускае мудрасьці: "Абсьліненая ваўком авечка, у лес бяжыць". – Авечка тут сымбалізуе добрага, але нясьведамага чалавека, каторы, з прычыны свае нясьведамасьці часта дзейнічае сабе на шкоду. – Або:

"Аднойчы запыталі мудраца:

– Чаму хатняя жывёла прывязваецца да чалавека?

І мудры чалавек адказаў:

– Хатняя жывёла затым прывязваецца да чалавека, бо яна ня ведае тае крыўды, якую яна дазнае́ ад чалавека".

Зборнік "Лепшых думак чалавека" сваім духовым

памерам часта перастулае межы афорызмаў і ўваходзіць у сьвет выказваньняў чалавека на шматлікія філязафічныя тэмы, якія цікавілі людзей кажнага пакаленьня.

У 1941 годзе ґэстапо сканфіскавала маю бібліятэку, а зь ёю асабістыя дакуманты, маю прыватную карэспандэнцыю, у рознай стадыі пісаны матэрыял і шкіцы, фатаграфіі; усё гэта прапала разам зь першапачаткавою сэлекцыяю лепшых думак.

Пасьля вайны трэба было пачынаць усё нанова.

У зборніку знаходзяцца выказваньні нікім непадпісаныя. Сталася гэта з прычыны таго, што яны, або ўзятыя мною зь першакрыніцаў непадпісанымі, або з прычыны тэхнічнага недагледжаньня, або належаць мне.

У прадложанай кнізе знаходзяцца пераклады аўтараў, імёны якіх або жаролы, падаюцца напрыканцы кнігі. - Пераклады часамі рабіліся не з арыгіналаў, але з перакладаў ужо дакананых на іншыя мовы. З гэтае прычыны яны могуць не адказваць дакладнасьці арыгіналу, калі ідзе пра даслоўны пераклад. Аднак, з пункту гледжаньня навуковых тэндэнцыяў сягоньняшняга дня, мадэрны пераклад мае на ўвазе не пераклад слова, але думкі. І ў гэтам дачыненьні, я спадзяюся, пераклад адказвае свайму заданьню.

На гэтым месцы, хацеў-бы выразіць пераканаsuccessfully, што, чытаючы лепшыя думкі, хай сабе першы раз ці перачытваючы некалькікратна, чытач дазнаціме і перажыве тыя шляхэтныя пачуцьці, якія перажыў я ў часе працы над укладам як і цяпер, перачытваючы іх нанова.

Ян Пятроўскі

Месяц ліпен, 1977 г.
Ґэйнсвільл, Флярыда, ЗША

Дыялёгі Плятона на беларускай мове
ў перакладзе Яна Пятроўскага

Кніга першая, 1967

Абарона Сакратаса
Крытон
Файдон

Кніга другая, 1970

Сымпозыён
Іён
з дадаткам кароткага Грэцка-беларускага слоўніка

Кніга трэйцяя, 1973

Ґорґіяс
з дадаткам Грэцка-беларускага слоўніка

Кніга чацьвертая, 1975

Протаґорас
Гіппіяс вялікшы

Кніга пятая, 1976

Пармэнідэс
Мэнон

--- --- --- --- --- --- ---

Кажны чалавек, дзеля пазнаньня сваіх правоў і паглыбленьня свае юрыдычнае сьведамасьці, павінен запазнацца са зьместам працы пад тытулам:

УНІВЭРСАЛЬНАЯ ДЭКЛЯРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

ў перакладзе на беларускую мову
Яна Пятроўскага

Пішэце на адрыс:

**Byelorussian Charitable Educational Fund, Inc.**
1716 N.E. 7th Terrace
Gainesville, Florida 32601

## У НАПРАМКУ ПАЗНАНЬНЯ

Мы часта, дзе ня трэба, рвёмся ў бой.

Над мудрасьцю,
бывае,
строім кепікі,

А глупства падымаем над сабой.

Алег Лойка
/"Беларус", №240/

Запраўдная мудрасьць карыснаю ёсьць затым, што яна вучыць нас, што асновы думак вялікага чалавека жывуць у ягоных болей скромных братох, і, што тыя свомасьці, якія выказвае вучоны ў сваіх глыбінных адкрыцьцях, зусім тыя самыя, якімі звычайны чалавек карыстаецца ў сваіх штадзенных жыцьцёвых справах.

Запраўднае разуменьне вялікіх людзей заключаецца ў тым, што яны толькі прыклады і праявы нашае агульнае натуры, якія паказваюць на тое, што свома думаць для ўсіх, хоць яно і выяўляецца яшчэ сярод нешматлікіх людзей. Сьвятло, якім зіяюць яны, зьяўляецца ні чым іншым, як слабое адкрыцьцё тае сілы, якая тоіцца ў кажным людзкім існаваньні. Яны ня дзіва, ня цуд, але натуральнае разьвіцьцё душы чалавека.

"Перадавая думка сьвету"

Гэтаксама, як ты ня бачыш душы чалавека, ты ня бачыш Бога, але ты пазнаеш Яго ў Ягоных творах. Гэтаксама ня можаш ты ня прызнаваць боскую сілу душы, якая выяўляецца дарогаю здольнасьці тварыць, памяці і сталага імкненьня да дасканаласьці.

Сэнэка

У нашай душы ёсьць нешта гэтакае, што мы, калі мы паважна зьвернем на яго ўвагу, будзем заўсёды назіраць з найбольшым зьдзіўленьнем /а дзе зьдзіўленьне ўправамоцнена, там яно адначасна ўзьдзейвае на нашу душу ўздымаюча/ - гэтае нешта - першабытныя маральныя схільнасьці, запачаткаваныя ў нас.

Кант

Чалавек зьяўляецца магутным існаваньнем, і той, хто астаецца сьведамым магутнасьці свае душы і ведае, што губіць сваю сілу, калі шукае яе навонкі сябе, - гэтакі ўціхаміры́ўшы сваё цела і дух, робіцца запраўдным валадаром, крочыць наперад і творыць цуды. Ён падобны да чалавека, які, стоячы на сваіх нагах, натуральна, магутнейшым ёсьць ад таго, хто ўпаў на зямлю.

Эмэрсон

Пазнаньне самога сябе - ёсьць пазнаньне Бога.

Л. Талстой

Дзіўным было-б крычаць чалавеку, каторы ня ведае сябе, каб ён з самога сябе пераходзіў да Бога! Карысным гаварыць гэта чалавеку, які ведае сябе.

Паскаль

Найбольшае веданьне ёсьць веданьне самога сябе; хто сябе пазнае́ - той пазнае́ і Бога.

Л. Талстой

Адзіная непасрэдна запраўдная рэчаіснасьць - гэта рэчаіснасьць сьведамасьці.

Дэкартэс

Сьведамасьць таго, што ў чалавеку жыве Бог, найболей за ўсё ўстрымлівае чалавека ад зла і спрыяе ў тварэньні дабра.

Л. Талстой

Сьвятло розуму, што родзіцца з маральнае дасканаласьці, завецца натуральнаю мужнасьцю. Натуральная дасканаласьць, што родзіцца са сьвятла розуму, завецца здабытаю сьвятасьцю. Для натуральнае дасканаласьці неабходным ёсьць сьвятло розуму, для сьвятла розуму неабходным ёсьць натуральная дасканаласьць.

З кітайскае мудрасьці

Тыя, што на ўзвышшы гары, бачаць усход сонца раней, чымся жыхары раўнінаў. Падобна рэч маецца і з тымі, што знаходзяцца на духовых вышынах: яны бачаць нябесны ўзыход сонца раней, чымся тыя, што жывуць на раўнінах матэрыялізму. Але прыходзіць час, і сонца ўздымаецца нагэтулькі, што стаецца бачаным і ўсімі.

"Перадавая думка сьвету"

У табе самым, унутры цябе крыніца дабра. Яна ня супыніцца журчэць у меру таго, як ты будзеш раскопваць яе.

Марк Аўрэліюс

Магутныя сілы працуюць у сьвеце. Ніхто ня можа затрымаць іх. Азнакі гэтага: новае разуменьне хрысьціянства, новая пашана да чалавека, новае пачуцьцё братэрства і аднолькавых суадносінаў усіх людзей да Айца ўсіх. Мы назіраем гэта, мы вычуваем гэта. І перад гэтым рынуцца ўсе ўгнятаньні. Грамадзкасьць, моўчкі пранікнутая гэтым духам, перайначвае сваю адвечную вайну на мір і супакой. Магутнасьць усё агортваючага выкажа сваю натуральную сілу ў перамозе над сябелюбствам, якое выдаецца непераможным. "На зямлі мір і ў людзях добрая воля" не заўсёды будуць толькі мроею.

Чаньнінґ

Ці-ж запраўды немагчыма спадзявацца, што надыйдзе дзень, калі людзі зразумеюць, што жыць для іншых гэтаксама лёгка, як яны часта ўважалі, што лёгка паміраць за іншых? Патрэбна толькі прабуджэньне і рассьвятленьне духа ў лядзях, каб учыніць жыцьцё чалавека шляхэтным і прыгожым служэньнем братом, зь якімі Бог злучыў яго, і праявіць у жыцьці людзей той самы дух служэньня і самаахвярнасьці, які праяўляўся ў сьмерці мучаньнікаў. Толькі-б дух зыйшоў у даліну высахлых касьцей, і ўсё станецца магчымым.

Браўн

Той, хто любіць вышэйшага, у таго гордасьць шчазае з сэрца, гэтак як сьвятло распаленага вогнішча пры сьвятле сонца. Той, чыё сэрца чыстае і ў кім няма шака гордасьці, хто ціхамірны, лагодны, сталы і просты, хто глядзіць на кажнае існаваньне, як на свайго сябру, і любіць кажную душу, як сваю, хто аднолькава ўсуадношваецца да кажнага з далікатнасьцю і любоўю, хто імкнецца тварыць дабро і пакінуў фанабэрыстасьць, - у сэрцы гэтакага чалавека жыве валадар жыцьця.

Вішну Пурана

Наколькі чалавек праўдзівы, нагэтулькі ён боскі; непахіснасьць, несьмяротнасьць, велічнасьць боскасьці ўваходзяць у чалавека разам з праўдзівасьцю.

Эмэрсон

Як адукаваны чалавек выяўляе плады свае адукацыі ў часох, у якіх мы жывем?... Ён мусіць трымаць сваю галаву, і ўжываць яе. Ён ніколі не павінен з высака глядзець на іншых людзей, нават тады, калі ён бачыць, што яны моўчкі або неахвотна згаджаюцца зь ім. Ён не павінен паддавацца сіле хваляў гістэрыі з боку іншых. Ён мусіць быць гатовым ціхамірна плаціць кару непапулярнасьці,... але ён мусіць упорыста дамагацца пагляду, што свабода ёсьць найвышэйшаю славаю людзкасьці і, што ўціканьне яе ёсьць нічым іншым, як уціканьнем духа чалавека.

Робэрт М. Гатчынс

--

Разважайце аб тым, што ў вас ёсьць у вашай маленькай адумысна выбранай бібліятэцы. Суз грамаджаньне мудрэйшых і найболей годных людзей, якое можа быць выбраным з усіх цывілізаваных краінаў на працягу тысячалецьцяў, разгарнула перад вамі ў найлепшым парадку вынікі свайго вывучэньня і свае мудрасьці. Людзі, наагул, сукрытыя, і недаступныя, адасобленыя і былі-б нецярплівымі, калі-б ім перашкаджалі, яны адасобіліся-б ад вас у сілу прынятае этыкеты, але думка, якою яны часта не дзяліліся з найлепшымі сваімі сябрамі, напісана тутака выразнымі словамі для нас, чужых людзей іншага стагодзьдзя. Мы знаходзімся ў даўгу ўдзячнасьці кнігам тых дабрадзействаў, каторыя выток свой бяруць з высокіх, разумных дзеяньняў.

Эмэрсон

---

Бог ёсьць любоў.

І. Пасланьне Іоана, 4:16

Бога ніхто ніколі ня бачыў: Калі мы любім адзін аднаго, дык Бог у нас прабывае, і любоў Яго дасканалая ў нас.

І. Пасланьне Іоана, 4:12

Голас Бога – у кліках лясных бураломаў,
Голас Бога – у веліччы гулкага грому,
Голас Бога – у полымі вогнішч вялікіх,
Голас Бога – у хвалях прыгожых і дзікіх,
Голас Бога – у песьні малітвы адвечнай,
Голас Бога – у волі сьвятой бесканечнай.
Голас Бога - існуе ад веку да века,
Голас Бога - жыве у душы чалавека.

З. Бядуля

Затым, Адно было, ёсьць і будзе; Яно ставалася, стаецца і будзе ставацца.

Дык,значыцца, магчымым ёсьць пазнаньне Аднаго,і наш пагляд адносна Яго, і пачуцьцёвае ўспрыймо Яго, калі мы ўжо маем у гэтую хвіліну нашую думку пра Яго, веду і пачуцьцёвае ўспрыймо Яго.

І імя ёсьць для Яго, і ўнутранае выражэньне, і Яно дорыцца назовам, і выказваюцца пра Яго; і ўсё ў гэтым родзе, што адносіцца да іншых рэчаў, адносіцца і да Аднаго.

Плятон
"Пармэнідэс",155

На сьвеце мы падобныя да дзіцяці, якое ўвайшло ў пакой, у якім вучоны чалавек гаворыць пра сваю навуку. Дзіця ня чула пачатку і выходзіць перад канцом. Яно пачула нешта, але не зразумела таго, што пачула. Вялікая навука Бога пачалася шмат тысячалецьцяў перад тым, як мы пачалі сваю навуку, і будзе трываць і тагды, калі мы абернемся ў парахню. Мы чулі толькі частку гэтае навукі і нядобра зразумелі таго, што чулі. Але ўсё-ж, хоць і частку і сумна, але мы зразумелі нешта вялікае, урачыстае, тое, што будзіць, тое, што паказвае на тое, што мы маем здольнасьць успрыйманьня.

Давід Томас

Няхай сабе вучоныя, філёзафы прыдумваюць свае прыпадкавасьці, свае праднназначэньні, свае неабходныя рухі і твораць сьвет з прыпадкава кінутых костак да гульні. Я назіраю ў сьвеце тую адзінасьць разумнае думкі, якая, ня гледзячы на іхныя цьверджаньні, змушае мяне прызнаць Адзіны Пачатак. Гэта ўсяроўна, быццам яны казалі-б мне, што Іліяда была зложана з прыпадкава кінутага друкарскага шрыфту. Бяз хістаньня я сказаў-бы ім: так, магчыма гэтак было, але гэта няпраўда, хоць я ня маю ніякае іншае прычыны ня верыць у гэта, апрача тае адзінае, што я ня веру ў гэта. "Усё гэта забабон",- кажуць яны. Магчыма і забабон, - адказваю я, аднак, што можа тут зрабіць ваш мутны розум супроць забабону, які болей пераконваючым, чымся розум? Вы кажаце: "Няма двух субстанцыяў, духовае і матэрыяльнае". А я кажу, што няма нічога супольнага паміж маею думкаю і дрэвам. І, што найболей забаўным зьяўляецца, дык гэта тое, што яны самыя сабе ўзаемна пярэчаць сваімі сафізмамі і гатовымі зьяўляюцца барджэй бачыць душу ў ка́мені, чымся прызнаць яе ў чалавеку.

Жан Жак Руссо

Рэлігія не затым запраўдная, што яе прапаведвалі апосталы, але апосталы прапаведвалі яе, што яна запраўдная.

Ґ.Э.Лессінґ

Рэлігійная навука - аснова ўзгадаваньня, аднакжа ў нашым хрысьціянскім сьвеце прыкідваюцца, быццам паважна вучаць тое, у што ніхто ня верыць. Дзеці праніклівыя і бачаць і ня вераць ня толькі ў тое, што́ іх вучаць, але і тым, каторыя вучаць іх.

Л. Талстой

Р о з н ы я р э л і г і і - якое дзіўнае выражэньне! Натуральна, могуць быць розныя в е р ы ў гістарычныя падзеі, якія мелі месца не ў рэлігіі, а ў гісторыі, для ўмацаваньня рэлігіі, і якія адносяцца да галіны пазнаньня сродкаў; гэтаксама могуць быць розныя рэлігійныя кнігі /Зэндавэста, Вэды, Кара́н і г.д./. Але запраўдная для ўсіх стагодзьдзяў р э л і г і я можа быць толькі адна. Усе-ж розныя веры ня могуць зьмяшчаць у сабе нічога іншага, як толькі дапаможны сродак для рэлігіі, які выступае прыпадкава і можа быць разнаякім, у залежнасьці ад розьніцы часу і месца.

Кант

Рэлігія - гэта ўпрошчаная і накіраваная да сэрца мудрасьць. Мудрасьць - гэта лягічна апраўданая рэлігія.

Л. Талстой

Рэлігія - гэта кажнаму зразумелая філязофія. Філязофія даводзіць рэлігію.

Л. Талстой

Рэлігія можа асьвяціць філязафічныя развażаньні. Філязафічныя развażаньні могуць пацьвердзіць рэлігійныя праўды. Затым, шукайце супольнасьць з праўдзіва рэлігійнымі людзьмі і з праўдзівымі філёзафамі, гэтак жывымі, як і памершымі.

Л. Талстой

Зь няздольнасьцю да веры расьце неабходнасьць веды. Існуе пункт кіпеньня на скале, на якім выпарваецца кажная вера, кажнае адкрыцьце, кажны аўтарытэт, і чалавек па-своему хоча быць навучаным, перакананым. Дзіцячыя дапаможнікі зваліліся зь яго, і ён хоча стаяць на сваіх уласных нагах. Пры гэтым ягонае мэтафізычнае патрэбы гэтаксама ня можна выкараніць, як і кажнае фізычнае. Калі ўзьнікае паважная неабходнасьць праўдзівае філязофіі, тады ў вадчаі людзкасьць кліча да ўсіх думаючых розумаў, якія яна калі-небудзь нарадзіла.

Шопэнгаўэр

Першае і самае старажытнае перакананьне ў рэчах абстрактных заўсёды самае праўдзівае, дзелятаго, што здаровы людзкі розум зараз-жа трапіў на яго.

Ґ. Э. Лессінґ

Калі рэлігія памірае - супыняюцца гэрэзыі.

Недзе прачытанае

Гэрэзыя аднаго стагодзьдзя стаецца прававернасьцю наступнага.

Гэлен Кельлер

Бадай-што ўсю нашую веду мы заўдзячваем ня тым, каторыя заўсёды згаджаліся, але тым, каторыя розьніліся ад свайго асяродзьдзя.

Ч. К. Кольтон

Мой уласны розум зьяўляецца маею ўласнаю царквою.

Томас Пэйн

Сьвярбячка ў часе рэлігійнае дыспуты даводзіць наяўнасьць каросты на целе царквы.

Сэр Гэнрі Ўвоттон

У спасьцярожнай царкве праўдзівыя хрысьціяне зьяўляюцца неспасьцярожнымі.

Нямецкая прыказка

## СУРАЦКАЯ КАВЯРНЯ

Была ў індыйскім месьце Сураце кавярня. І зыходзіліся туды з розных куткоў зямлі прыежджыя і чужынцы і часта гутарылі.

Зайшоў туды аднойчы пэрскі вучоны тэалёг. Усё сваё жыцьцё ён вывучваў сутнасьць Боскасьці, і чытаў і пісаў пра гэта кнігі. Доўга думаў, чытаў і пісаў ён пра Бога, пераpuталася ўсё ў ягонай галаве, і дайшоў ён да таго, што перастаў верыць у Бога.

Даведаўся пра гэта шах і выгнаў яго з пэрскага валадарства.

Дык вось, усё сваё жыцьцё разважваючы аб першапрычыне, запутаўся бедны тэалёг і, замест таго, каб зразумець, што ў яго ўжо не хапіла розуму, пачаў думаць, што няма болей вышэйшага розуму, які кіруе сьветам.

Быў у гэтага тэалёга нявольнік афрыканец, які хадзіў за ім усюды. Калі тэалёг увайшоў у кавярню, афрыканец астаўся надварэ за дзьвярыма, і сеў на камені на сьпякоце сонца; ён сядзеў і адганяўся ад мух. А сам тэалёг лёг на тапчане ў кавярні і загадаў падаць сабе кубак опіюму. Калі ён выпіў кубак опіюму і пачуў ягонае дзеяньне ў галаве, ён зьвярнуўся да свайго нявольніка:

– Ну, што, агідны нявольнік, – сказаў тэалёг, – скажы мне, як ты думаеш: ёсьць Бог ці няма?

– Ведама, што ёсьць! – адказаў нявольнік і тутжа дастаў з-за пояса маленькага балвана з дрэва. – Вось, – сказаў нявольнік, – вось той самы бог, які сьцеражэ мяне з тае пары, як пачаў я жыць на сьвеце. Бог гэны зроблены з сука таго самага сьвятога дрэва, якому ўсе аддаюць пашану ў нашай краіне.

Гэтую гутарку паміж тэалёгам і нявольнікам пачулі ўсе, што былі ў кавярні і зьдзівіліся.

Дзіўным выдалося ім пытаньне гаспадара і яшчэ болей дзіўным адказ нявольніка.

Прысутны брамін, пачуўшы словы нявольніка, зьвярнуўся да яго і сказаў:

– Бедны глупец! Ці-ж можна думаць, каб Бог мог

знаходзіцца за поясам чалавека? Бог ёсьць адзін – Брама. І гэты Брама большы за ўвесь сьвет, бо ён стварыў увесь сьвет. Брама зьяўляецца адзіным, вялікім Богам, тым Богам, катораму пабудованы сьвятыні на берагох ракі Ґанґэс, тым Богам, якому служаць яго адзіныя сьвятары – бráміны. Толькі гэтыя сьвятары ведаюць запраўднага Бога. Мінула ўжо дваццаць тысяч гадоў, і колькі ня было зьменаў на сьвеце, сьвятары гэтыя астаюцца заўсёды гэтакімі самымі, як і раней, затым што Брама, адзіны, запраўдны Бог, распасьцірае сваю апеку над імі.

Гэтак сказаў брамін, думаючы пераканаць усіх; але прысутны тут-жа жыдоўскі мяняльшчык грошай запярэчыў яму.

– Не, – сказаў ён. – Сьвятыня запраўднага Бога ня ў Індыі знаходзіцца!... І Бог распасьцірае сваю апеку не над кастаю бráмінаў! Запраўдны Бог ёсьць Бог ня бráмінаў, але Бог Абрагама, Ісаака і Якуба. І сваю апеку запраўдны Бог распасьцірае толькі над Сваім народам ізраільскім. Бог на пачатку сьвету, не перастаючы, любіў і любіць адзін наш народ. І, калі цяперака і расьцярушыў наш народ па зямлі,дык гэта толькі выпрабаваньне, а Бог, гэтак, як і прырок, зграмадзіць зноў народ свой у Ерузаліме, з тою мэтаю, каб аднавіць цуд старажытнасьці, Ерузалімскую сьвятыню, паставіць ізраіля валадаром над усімі народамі.

Гэтак сказаў жыд і заплакаў. Ён хацеў яшчэ далей гаварыць, але прысутны тут італіянец перабіў яго.

– Няпраўду ты кажаш, – сказаў італіянец жыду. – Ты прыпісваеш Богу несправядлівасьць. Бог ня можа адзін народ любіць болей за іншыя. Наадварот, калі Ён нават і распасьціраў сваю апеку раней над ізраілем, дык вось мінула ўжо 1800 гадоў з тае пары,як Бог разгневаўся і на знак Свайго гневу супыніў існаваньне гэтага народу і расьцярушыў яго па твару ўсенькае Зямлі, так што вера гэтая ня толькі не распаўсюджваецца, але дзе-ні дзе яшчэ захоўваецца. Бог не аказвае пяршынства ніякаму народу, а заклікае ўсіх тых, каторыя жадаюць быць збаўленымі, на лона адзінае рымска-каталіцкае царквы, за межамі якое нямашака збаўленьня.

Гэтак сказаў італіянец. Але прысутны тут протэстанцкі пастар, пабляднеўшы, адказаў каталіцкаму місыянеру:

– Як сьмееш ты гаварыць, што збаўленьне магчымым ёсьць толькі ў тваім веравызнаньні? Ведайце-ж, што збаўленымі будуць толькі тыя, што паводля Эвангеля

будуць служыць Богу ў духу і праўдзе паводля навукі Ісуса.

Тады турак, што служыў у сурацкай мытніцы, які тут-жа сядзеў, курачы люльку, прыняўшы важную паставу, зьвярнуўся да абодвух хрысьціян:

– Дарэмна вы гэтак упэўнены ў запраўднасьці вашае рымскае веры, – сказаў ён. – Вашая вера ўжо каля шасьці сот гадоў таму заступлена запраўднаю вераю Магамэта. І, як вы самыя бачыце, запраўдная вера Магамэта ўсё болей і болей распаўсюджваецца і ў Эўропе, і ў Азыі, і нават у асьвечаным Кітаі. Вы самыя сьцьвярджаеце, што жыды адкінуты Богам, і на доказ гэтага прыводзіце тое, што жыды знаходзяцца ў паніжэньні і вера іхная не распаўсюджваецца.Прызнайце-ж, затым, запраўднасьць веры Магамэта,бо яна знаходзіцца ў велічнасьці і стала распаўсюджваецца. Збаўленымі будуць толькі веруючыя ў апошняга прарока Божага, Магамэта. І то толькі прыхільнікі Омара, а не Алі, бо прыхільнікі Алі – няверуючыя.

Пры гэтых словах пэрскі тэалёг, які належаў да сэкты Алі, хацеў запярэчыць. Але ў кавярні ўжо паднялася вялікая спрэчка паміж усімі прысутнымі чужынцамі розных вераў і вызнаньняў. Былі тут хрысьціяне абісынскія, індыйскія лямы, ізмаіліты і тыя, што аддавалі пашану агню.

Усе спрачаліся адносна сутнасьці Бога і пра тое, як трэба аддаваць пашану Яму. Кажны цьвердзіў, што толькі ў ягонай краіне ведаюць запраўднага Бога і ведаюць як трэба аддаваць пашану Яму.

Усе спрачаліся, крычалі. Адзін толькі прысутны тут кітаец, вучань Конфуцыя, сядзеў спакойна ў кутку кавярні і ня прыймаў удзелу ў спрэчцы. Ён піў гарбату, слухаў тое, што гаварылі, але сам маўчаў.

Турак, спасьцярогшы яго ў часе спрэчкі, зьвярнуўся да яго і сказаў:

– Падтрымай хоць ты мяне, добры кітаец. Ты маўчыш, але ты мог-бы нешта сказаць на маю карысьць.Я ведаю, што ў вас у Кітаі ўводзяцца цяперака розныя веры. Вашыя купцы ня раз казалі мне, што вашыя кітайцы з усіх іншых вераў уважаюць магамэтанскую самаю лепшаю і ахвотна прыймаюць яе. Падтрымай-жа мае словы і скажы, што ты думаеш адносна запраўднага Бога і Ягонага Прарока.

– Вось, вось, скажы, што ты думаеш, – зьвярнуліся да яго і іншыя.

Кітаец, вучань Конфуцыя, закрыў вочы, падумаў і пасьля адчыніўшы іх, выпрастаў рукі із шырокіх рукавоў свае адзежы, склаў іх на грудзях і пачаў га-

варыць ціхім і спакойным голасам.

=

– Паважаныя мае, – сказаў ён, – мне здаецца,што эґоізм людзей болей за ўсё іншае перашкаджае іхнай згодзе ў прадмеце веры. І калі вы згодзіцеся мяне выслухаць, я паясьню вам прыкладам.

Я выплыў з Кітаю ў Сурат на ангельскім ваадпла-ве, які абыйшоў навакол сьвету.Па дарозе мы прыбе-разіліся да ўсходняга ўзьбярэжжа абтокі Суматры, каб набраць вады. А поўдні мы зыйшлі на зямлю і се-лі на беразе мора ў ценю какосавых пальмаў, неда-лёка ад сяла жыхароў абтокі. Нас сядзела некалькі чалавек з розных краінаў.

Пакуль мы сядзелі да нас падыйшоў сьляпы.

Чалавек гэты асьлеп, як мы пасьля даведаліся,ад таго, што празьмерна доўга і ўпорыста глядзеў на сонца, затым, што хацеў зразумець, што гэта такое сонца. Ён хацеў даведацца пра гэта, каб зрабіць сьвятло сонца сваею ўласнасьцю.

Кідаўся ён доўга, пускаў у ход усе навукі: ха-целася бо яму захапіць некалькі праменьняў сонца, злавіць іх і закупорыць у бутэльку.

Доўга ён тузаўся і ўсё ўглядаўся на сонца і ні-чога ня мог зрабіць, а зрабілася зь ім тое толькі, што ад сонца захварэлі ягоныя вочы і ён асьлеп.

Тады ён сказаў сабе:

– Сонечнае сьвятло – гэта не цякоміна, бо, ка-лі-б яно было цечаю, дык можна было-б пераліваць яго і яно хвалявалася-б ад ветру, як вада. Сьвятло сонечнае гэтаксама і не агонь, бо, калі-б яно было агнём, яно тухла-б у вадзе. Сьвятло гэтаксама і ня дух, бо-ж яго можна бачыць, і не матэрыя, бо нель-га яго перасоўваць зь месца на месца. І затым, што сьвятло сонечнае не зьяўляецца ані цякомінаю, ані агнём, ані духам, ані матэрыяю, дык сьвятло сонеч-нае – нічога.

Гэтак ён разважыў, і адначасна, дзелятаго, што ўсё ўзіраўся на сонца і ўсё думаў пра яго, згубіў ён і зрок, і розум.

Калі-ж ён зусім асьлеп, тады ўжо дазваньня пе-раканаўся ў тым, што сонца няма.

З гэтым сьляпым падыйшоў і ягоны нявольнік. Ён пасадзіў свайго гаспадара ў цень какосавага дрэва, падняў з зямлі какосавы гарэх і пачаў зь яго май-страваць сьветач. Ён змайстраваў кнот з какосавага валакна, выціснуў з гарэха аліўкавага алею ў шкар-

лупу і абмакнуў у яго кнот.

У міжчасе, пакуль нявольнік рабіў сьветач, сьляпы, уздыхнуўшы, сказаў яму:

– Ну, што, нявольнік, праўду я табе казаў, што няма сонца. Бачыш, як цёмна. А кажуць – сонца, сонца... Дый што такое сонца?

– Я ня ведаю што такое сонца, – адказаў нявольнік. Яно мяне ня цікавіць. А вось сьвятло я ведаю. Вось, я змайстраваў сьветач: і мне будзе сьветла, і табе ў ім магу аказаць услугу, і ўсё знайсьці ў будцы.

І нявольнік узяў у руку сваю шкарлупу:

– Вось, – кажа, – маё сонца.

Тут-жа сядзеў кульгавы з кастылём. Пачуўшя яго, ён засьмяяўся:

– Ты, мусіць, ад нараджэньня сьляпы, – сказаў ён сьляпому, – калі ня ведаеш што такое сонца. Я табе скажу што яно такое: сонца – гэта агнявая куля, і куля гэтая кажнае раніцы выходзіць з мора і кажны вечар садзіцца ў горах нашае абтокі; гэта мы ўсе бачым, і ты-б бачыў, калі-б ты ня быў сьляпы.

Рыбак, які сядзеў тут-жа, пачуўшы гэтыя словы, сказаў кульгаваму:

– Відаць, што ты нідзе ня быў далей твае абтокі. Бо, калі-б ты ня быў кульгавы ды паплаваў-бы па моры, дык ты даведаўся-б, што сонца зусім не садзіцца ў горах нашае абтокі, а проста, як выходзіць з мора, гэтак вечарам ізноў садзіцца ў мора. Я кажу праўду, бо кажны дзень я назіраю гэта сваімі ўласнымі вачыма.

Пачуў гэта індыец.

– Дзіўлюся, – сказаў ён, – як можа разумны чалавек гаварыць гэткую недарэчнасьць. Як гэта магчыма, каб агнявая куля апускалася ў ваду і ня тухла? Сонца зусім не агнявая куля, сонца – Боскасьць, і гэтая Боскасьць называецца Дэва. Боскасьць гэтая езьдзіць на калёсьніцы па небе навакол залатое гары Спэруўя.

Здараецца, што злосныя вужакі Рагу і Кету нападаюць на Дэва і праглытваюць яго, і тады робіцца цёмна. Але сьвятары нашыя моляцца аб гэтым, каб Боскасьць вызвалілася, і тады яна вызваляецца. Толькі гэткія цёмныя людзі, як ты, якія ніколі не адбывалі падарожжа далей свае абтокі, могуць уяўляць сабе, быццам сонца сьвеціць толькі на іх абтоку.

Тады загаварыў прысутны тут уласьнік ягіпецкага ваdаплаву.

– Не, – сказаў ён, – і гэта няпраўда: сонца ня

Боскасьць і ня ходзіць толькі навакол Індыі і яе залатое гары. Я шмат плаваў і па Чорным моры, і ўздоўж узьбярэжжаў Арабіі, быў і на Мадагаскары, і на Філіпінскіх абтоках, - сонца сьвеціць на ўсе землі, а не на адну Індыю; яно ня ходзіць навакол аднае гары, але яно ўзыходзіць на ўзьбярэжжы Японіі, затым бо і абтокі тыя называюцца Япэн, што на іхнай мове значыць Нараджэньне сонца, і заходзіць яно далёка на захадзе, за абтокамі Анґліі. Я гэта добра ведаю, бо і сам бачыў шмат і чуў многа ад свайго дзеда. А дзед мой плаваў да самых ускраінаў мора.

Ён хацеў яшчэ нешта гаварыць, але анґельскі мараплаўнік перабіў яго.

- Няма краіны, апрача Анґліі, - сказаў ён, - дзе ляпей ведалі-б аб тым, як ходзіць сонца. Сонца, мы ўсе гэта ведаем у Анґліі, нігдзе не ўстае і нідзе не садзіцца. Яно ходзіць бесперапынна навакол зямлі. Мы гэта добра ведаем, бо вось мы толькі што абыйшлі навакол Зямлі і нідзе не наткнуліся на сонца. Усюды яно гэтаксама, як і тут, раніцаю паказваецца і вечарам хаваецца.

І анґелец узяў палку, нарысаваў на пяску кола і пачаў паясьняць як ходзіць сонца па небе навакол Зямлі. Але ён ня мог паясьніць добра і, паказаўшы на стырнічага свайго вадаплаву, сказаў:

- Ён болей за мяне вучыўся і ляпей усё вам растлумачыць.

Стырнічы быў разумным чалавекам і слухаў гутарку моўчкі, пакуль яго не запыталі. Але цяпераka, калі ўсе зьвярнуліся да яго, ён пачаў гаварыць і сказаў:

- Усе вы ашукваеце адзін аднаго і самыя ашукваецеся. Сонца ня ходзіць навакол Зямлі, а Зямля ходзіць навакол Сонца, і сама яшчэ пры гэтым абяртаецца, пахіляючы да Сонца на працягу дваццаці чатырох гадзінаў і Японію, і Філіпінскія абтокі, і Суматру, на якой вось мы сядзімо, і Афрыку, і Эўропу, і Азыю, і цэлы рад іншых яшчэ абшараў. Сонца сьвеціць не для аднае гары, не для аднае абтокі, не для аднаго мора і нават не для аднае Зямлі, а для шматлікіх плянэтаў, падобных да Зямлі. Усё гэта кажны з вас мог-бы зразумець, калі-б глядзеў уверх на неба, а не сабе пад ногі, і ня думаў-бы, быццам Сонца сьвеціць толькі для аднаго яго або для аднае ягонае бацькаўшчыны.

Гэтак сказаў мудры стырнічы, які многа плаваў па сьвеце і шмат узіраўся ўверх на неба.

- Запраўды, блуд і нязгода людзей у прадмеце веры выводзіцца з самалюбства, - казаў далей кітаец,

вучань Конфуцыя. - Як рэч маецца з сонцам, гэтак-сама яна маецца і з Богам. Кажнаму чалавеку хочацца, каб у яго быў свой апрычоны бог,або прынамся, бог ягонага роднага краю. Кажны народ хоча ўціснуць у сваю цэркаўку Таго, Каго ня можа агарнуць сусьвет.

Ці-ж можа якая-небудзь сьвятыня быць параўнанаю з тою, якую Сам Бог пабудаваў дзелятаго, каб злучыць у ёй усіх людзей у вадно веравызнаньне, у вадну веру?

Усе людзкія сьвятыні пабудованы паводля наўзору гэтае сьвятыні - Божага сьвету. Ува ўсіх сьвятынях ёсьць купелі, ёсьць скляпеньні, ліхтары, абразы, надпісы, кнігі права, ахвяры, аўтары і сьвятары. У якой-жа сьвятыні ёсьць гэтакая купель, як акіян, гэтакае скляпеньне, як купал неба, гэтакія ліхтары, як Сонца, Месяц і зоры, гэтакія абразы, як жывыя людзі з любоўю ў сэрцы, ахвочыя памагчы адзін другому? Дзе-ж надпісы пра любоў Бога, гэтак зразумемелыя, як тыя добраслаўленьні, расьцярушаныя ўсюды Богам дзеля шчасьця людзей? Дзе гэтакая кніга права, нагэтулькі ясная кажнаму, як тая, якая выпісана ў сэрцы кажнага чалавека? Дзе ахвяры, падобныя да тых ахвяраў з выражэньнем самога сябе, якія добрыя людзі прыносяць сваім бліжнім? І дзе аўтар падобны да сэрца добрага чалавека, на якім Сам Бог прыймае ахвяру?

Чым вышэй будзе чалавек разумець Бога, тым ляпей ён будзе ведаць Яго. І чым ляпей будзе ведаць ён Бога, тым болей будзе набліжацца да Яго, насьлядаваць Яго дабрыню, літасьць і любоў да людзей.

Няхай, затым, той, хто бачыць усё сьвятло Сонца, што напаўняе сьвет, няхай той не пагарджае і не асуджае таго забабоннага чалавека, які ў сваім балване бачыць толькі адзін прамень таго самага сьвятла, няхай не пагарджае і таго няверуючага, які асьлеп і зусім ня бачыць сьвятла.

Гэтак сказаў кітаец, вучань Конфуцыя, і ўсе прысутныя ў кавярні змоўклі і не спрачаліся болей пра тое, чыя вера лепшая.

Бэрнардэн дэ Сэн-Пьер

РАЗГЛЯДАЙЦЕ ўсе вашыя здольнасьці і веду, як сродак, патрэбны вам дзеля дапамаганьня іншым.

Сільнаму і мудраму дадзены ягоныя дары не дзелятаго, каб уціскаць слабога, але каб кіраваць і падтрымліваць яго.

Джон Рёскін

Адна толькі добрая рэч - гэта веда; адна толькі дрэнная рэч - гэта іґноранцыя.

Недзе пачутае.

Навука малодзіць душу, і мудрасьць зьмяншае гаркоту старасьці.

"Божым Шляхам", 132

Веда шляхэтная і зьяўляецца кіруючым прынцыпам, якога ніхто ня можа асілець, і не дазволіць чалавеку,-калі толькі пазнаў ён розьніцу паміж дабром і злом, - рабіць нічога, што суроцьставіцца ведзе, а розум меціме даволі сілы, каб дапамагчы яму.

Сакратас
/<u>Протаґорас</u>,352/

Мудрасьць і веда зьяўляюцца найбольшаю магутнасьцю ў чалавеку.

Паводля Плятона

Ведамым ёсьць, што найболей здольны чалавек ужывае толькі прыблізна адну дзясятую сілы свайго розуму. Ужываньне нашага розуму залежыць ад стану нашае культуры і ступені, у якой мы прысьвячаем самых сябе ў напрамку разьвязваньня праблемаў. Людзі прымітыўных супольнасьцяў маюць аднолькавую сілу розуму, як і мы, але яны маюць за мала нагоды ўжываць яе. Некаторыя людзі падтрымліваюць нейкую хворму эўґенікі, дзеля ўзьняцьця магчымасьцяў нашага розуму. Але, як мне здаецца, гэта непатрэбным ёсьць, бо і так мы не выкарыстоўваем усяе тае сілы, якую ўжо маем.

Марґарэт Мід

Чуцца ніжэйшым за самога сябе - гэта нішто іншае, як няведаньне, а быць на вышыні свае годнасьці - нішто іншае, як мудрасьць.

Сакратас
<u>Протаґорас</u>, 358

Я не дазволю сабе гаварыць пра рэчы, якія яшчэ

не дасьледжанымі астаюцца або прыкідвацца, што я ведаю тое, чаго ня ведаю.

Сакратас
/Гіппіяс вялікшы,298/

Розум - добра, а два - яшчэ ляпей.

Зь беларускае мудрасьці

Бойся няведы, але яшчэ болей бойся хвальшывае веды.

Будыйская мудрасьць

Гора людзям, якія бачаць, ня ведаючы што, якія стаяць, ня ведаючы на чым.

Тальмуд

Памятайце, што няведаньне ніколі ня спрычыняе зла; згубным ёсьць толькі абмылковасьць. Памылаюцца, аднак, людзі не дзелятаго, што ня ведаюць, а затым, што выяўляюць сябе ведаючымі.

Жан-Жак Руссо

Запраўдная веда заключаецца ў тым, каб ведаць тое, што ведаеш, і ня ведаць таго, чаго ня ведаеш.

Конфуцы

Усё на сьвеце мае свае межы; бязьмежнаю толькі зьяўляецца людзкая глупота.

Эразм з Роттэрдаму

У справе ўводзінаў навінаў. І хто можа сумлявацца, што яно павядзе да найгоршых забурэньняў, калі Богам створаныя свабодныя розумы зьяўляюцца змушанымі панявольніцку падпарадкавацца навонкі стоячай волі? Калі нам кажуць, каб мы адмовіліся ад нашых пачуцьцяў і падпарадкавалі іх капрызу іншых? Калі людзей, ня маючых ніякіх здольнасьцяў, ставяць судзьдзямі над экспэртамі з надзелам уладаю абыходзіцца з апошнімі як ім падабаецца? Гэта вось і творыць сабою тыя навіны, якія зьяўляюцца ў стане давесьці да руіны агульнага дабра і заняпаду дзяржавы.

Напіс рукою Ґалілея на марґінэсе ягонага ўласнага паасобніка, ягонае працы п.т. Дыялёг у прадмеце сыстэмаў вялікага сусьвету.

Мы згаджаемся, што нічога няма горшага, як актыўная іґноранцыя.

Недзе прачытанае

Калі гаспадарства мае знайсьці сваю астою - ніхто ў ім не павінен аставацца нясьведамым.
Плятон
/Протаґорас, 327/

Ня бойся няведы, бойся хвальшывае веды. Зь яе ўсё ліха на сьвеце.
Л. Талстой

Веда, якая выклікае спрэчкі, хвальшываю ёсьць.
Л. Талстой

Якая аграмадная перавага на баку таго чалавека, які нічога ня ведае ў справе і, што вельмі рэдка,- ведае, што нічога ня ведае пра яе, перад тым, каторы запраўды тое-сёе ведае, але думае, што ён ведае ўсё! Якая аграмадная перавага на баку першага!
Гэнрі Д. Торо

Калі чалавек пачынае ведаць, што ён ня ведае, тады толькі пачынае ён ведаць шматлікае.
Робэрт Уэнлей

Няхай кажны з нас адважна і чэсна скажа: Як мала ёсьць з таго, што я запраўды ведаю.
Вольтэр

Няведаньне - гэта памылковы пагляд і самаашуканства ў прадмеце галоўных пытаньняў.
Сакратас

Кажны чалавек нагэтулькі ёсьць інтэлігэнтным - наколькі ён праяўляе цікавасьць.
Недзе прачытанае

Калі хто-небудзь можа з пэўнасьцю даказаць мне, што я няправільна сяджу або дзейнічаю, дык я з радасьцю папраўлюся. Бо я шукаю праўды, дзякуючы якой, ніхто яшчэ не дазнаў крыўды. Дазнае-ж крыўду той, хто ўпіраецца ў сваей памылцы і невуцтве.
Марк Аўрэліюс

Усе людзі, з прычыны свае натуры, жадаюць ведаць. Паказьнікам гэтага зьяўляецца прыемнасьць, якую мы дазнаем, дзякуючы нашым змыслам; бо, памінаючы нават іхную карыснасьць, яны зьяўляюцца любімымі для самых сябе; і перад усімі іншымі змысламі, любімым ёсьць змысл зроку. Бо ня толькі з прычыны бачаньня дзееньня, але нават, калі мы і не аддаемося ніяка-

му занятку, можна сказаць, мы аддаем перавагу бачаньню кажнае рэчы наагул. А гэта затым, што гэты найважнейшы з усіх змыслаў, чыніць нас ведаючымі і прыводзіць у вабсяг бачаньня шматлікія розьніцы паміж рэчамі.

Арыстотэлес
/Мэтафізыка, І/

П а з н а й с а м о г а с я б е - ёсьць асноўное правіла. Але няўжо вы думаеце, што можна пазнаць сябе, углядаючыся ў сябе? Не. Вы можаце пазнаць сябе, толькі прыглядаючыся да таго, што навонкі вас. Параўноўвайце вашыя сілы з сіламі іншых, вашыя справы зь іхнымі справамі; старайцеся думаць пра свае справы, як аб нечым другарадным, схіляйцеся перад годнасьцю іншых, выходзячы з перакананьня, што ў вас, магчыма, няма нічога асаблівага.

Джон Рёскін

Той, хто ведае іншых людзей, зьяўляецца разумным; той, хто ведае самога сябе, ёсьць асьвечаным.

Хто перамагае іншых, зьяўляецца мужным; той, хто перамагае самога сябе, зьяўляецца магутным.

Ляо-Тсэ

Чым разумнейшы і лепшы чалавек, тым болей спасьцерагае ён дабра ў людзях.

Улас Паскаль

Ніколі ня лічэце бескарысным падпарадкавацца ўплыву, які можа абудзіць у вас дабрародныя пачуцьці.

Джон Рёскін

Толькі чужымі вачыма можна бачыць свае недахопы.

Кітайская пагаворка

Кажны чалавек у іншым мае люстэрка, у якім ён можа ясна разгледзець усе свае ўласныя слабасьці, недахопы і ўсялякія дрэнныя стораны. Аднак у большасьці выпадкаў ён паступае пры гэтым як сабака, які брэша на люстэрка з тым меркаваньнем, што бачыць там не сябе, а іншага сабаку.

Шопэнгаўэр

Болей карысным ёсьць ведаць некалькі мудрых прынцыпаў, якія заўсёды маглі-б служыць табе, чымся вывучваць шматлікія рэчы, непатрэбныя табе.

Сэнэка

Фраґмэнт гутаркі Сакратаса з Файдонам у вязьніцы хутка перад паданьнем атруты, якую пераказвае апошні:

– Але перад усім, – сказаў Сакратас, – давай будзем асьцярожнымі адносна аднае небясьпекі.

– Якая небесьпека? – запытаў я.

– Каб нам ня стацца ненавісьнікамі да кажнага слова і разважаньня, гэтаксама, як іншыя стаюцца ненавісьнікамі людзей, бо нямашака большага няшчасьця, як нянавісьць да слова або нянавісьць да ідэяў. Родзіцца яна гэтаксама, як нянавісьць да чалавека. А нянавісьцю да чалавека прасякаемся мы тады, калі сьпярша з захопленьнем і бяз усякага крытызызму давяраем каму-небудзь і ўважаем яго за чалавека зусім праўдамоўнага, здаровага і надзейнага, але ў хуткім часе даведваемся, што ён няпраўдамоўны і хвальшывы. Той, каму давядзецца дазнаць гэта, не аднойчы, і асабліва ў выніку віны тых, каго ўважаў за самых блізкіх сваіх сяброў, той, напасьледак, з прычыны частых крыўдаў ненавідзіць ужо ўсіх адནолькава, і ні ў водным чалавеку ня бачыць нічога здаровага і чэснага. Табе, мусіць, даводзілася спатыкацца з гэтакімі людзьмі.

– Пэўна, што даводзілася, – сказаў я.

– Ці-ж ня ёсьць гэта брыдкаю рэчаю? – казаў далей Сакратас. – Ці-ж ня відна, што мы зьбліжаемся да людзей, ня маючы здольнасьці веданьня людзкае натуры? Бо, калі-б мы мелі гэткую здольнасьць, ведалі-б мы, што вельмі добрых або вельмі дрэнных людзей мала ёсьць, большыня людзей знаходзіцца паміж гэтымі.

– Не разумею, што ты маеш на ўвазе? – спытаў я.

– Я маю на ўвазе тое, – адказаў ён, – як рэч маецца зь вельмі малымі і вельмі вялікімі людзьмі. Падумай, – найболей рэдка спатыкаем вельмі вялікага чалавека або вельмі маленькага, гэтаксама сабаку ці што-небудзь іншае? Гэтаксама хуткае і павольнае, брыдкае і прыгожае, белае або чорнае. Ці-ж не заўважыў ты, што ўва ўсіх гэтых выпадках скрайнасьці бываюць рэдкімі і нешматлікімі?

– Заўважыў, – адказаў я.

– Калі-б было ўладжана спаборніцтва ў сапсутасьці, дык і тады першаклясных нягоднікаў ня так ужо многа-б знайшлося. Ці ня гэтак?

– Выглядае, што гэтак, – адаказаў я.

– Так, вельмі праўдападобна, – адказаў ён, – але ў гэтым выпадку арґумэнты не зьяўляюцца падобнымі да людзей. Я проста ішоў тваім сьледам, як да гэ-

тае пары, але, мне здаецца, што падабенства ляжыць вось дзе: Калі чалавек без адпаведнае здольнасьці ў словах, верыць, што нейкі довад зьяўляецца праўдзівым, а пасьля прыходзіць да пераканаханьня, што ён зьяўляецца хвальшывым, часамі тады, калі довад гэтакім ёсьць, а часамі тады, калі ён гэтакім зноў не зьяўляецца, і затым адзін чалавек пасьля другога - асабліва тыя, што праводзяць свой час у спрэчках між сабою, - ты ведаеш, што напасьледак яны думаюць, што яны зьяўляюцца найразумнейшымі людзьмі на сьвеце і, што яны толькі адны разумеюць, што нямашака нічога здаровага і бяссумліўнага ані сярод рэчаў, ані сярод довадаў, але, што ўсё парушаецца або ўніз, або ўверх, падобна, як воды Эўрыпосу, і ані на хвіліу не астаюцца на месцы.

- Запраўды, праўдзіва сьцьверджана, - сказаў я.

- Так, Файдон, - адказаў ён, - было-б гэта вельмі сумна, калі-б нехта пазнаў, што існуе довад праўдзівы, пэўны і зразумелы, а пасьля, спаткаўшыся з гэткімі довадамі, якія іншы раз выдаюцца праўдзівымі, а іншы раз памылковымі, і тады пачаў-бы вінаваціць не самога сябе і сваю няздольнасьць, але са згрызоты ахвотна пачаў-бы сьпіхаць уласную віну на довады як гэткія і на прышласьць, да канца сваіх дзён, зацята ненавідзеў-бы і папракаў кажнае разважаньне, і гэтым самым пазбавіў-бы самога сябе запраўднае веды адносна рэчаіснасьці.

- Так, была-б гэта вялікая шкода, - сказаў я.

- Перад усім, - сказаў ён, - будзем высьцерагацца гэтае небясьпекі і не дапусьцім думкі, быццам у разважаньнях наагул нічога няма здаровага. Барджэй будзем уважаць, што гэта мы самыя яшчэ ня зусім здаровыя і, што трэба мужна шукаць аздараўленьня розумаў: табе і іншым з увагі на вашае далейшае жыцьцё, а мне - з прычыны аднае толькі сьмерці. Абставіны цяперака гэтак укладваюцца, што я ня выступаю перад вамі ў характары філёзафа, а як зацяты спрачальнік, - а гэта ўжо прыкмета запраўдных невукаў. Бо яны, калі ўзьнікае разыходжаньне, не шманаюць пра тое, як рэч маецца ў запраўднасьці; як-бы накінуць прысутным свой пагляд - вось што яны маюць на ўвазе. У гэтых вось абставінах, як мне здаецца, я адрозьніваюся ад іх толькі тым, што ня прысутных стараюся пераканаць у праўдзівасьці маіх словаў - хіба што між іншым - але самога сябе, каб пераканацца да канца. І паглядзі, колькі я атрымліваю выгады гэтакім довадам: калі тое, што я ўтрымліваю, акажацца праўдаю, дык і добра, што трымаюся гэткага

перакананьня, а калі для памершага няма ўжо нічога, дык прынамся ня буду дакучаць прысутным сваімі нараканьнямі ў гэтую перадсьмяротную гадзіну, і, на рэшце, нямудрая мая выдумка гэтаксама не перахаваецца сярод жывых, але памрэ разам са мною.

Плятон

## ЖЫЦЬЦЁ

Жыцьцё - не цярпеньне і не асалода, а справа, якую мы павінны тварыць і чэсна працягваць да канца.

Токвіль

Заўсёды ідзі самым кароткім шляхам. Самы кароткі шлях - гэта шлях сузгоды з натураю: ён у тым заключаецца, каб перасьцерагаць праўду ўва ўсіх рэчах і паступках.

Гэтакая пастава выратуе цябе ад змучанасьці і змаганьня, супярэчнасьцяў і фанабэрыстасьці.

Марк Аўрэліюс

Выпроствай дрэўца пакуль маладое.

Паводля Плятона
Протаґорас, 325

Самае агіднае для чалавека ў жыцьці - гэта не забойства, не хвароба, ня беднасьць, ані гора, але н у д а ! Бо гэта яна якая вядзе да вылічаных злыбедаў.

Паводля "Божым Шляхам",
№ 132

- Я нічога не патрабую апрача часу, але яго ніхто ня можа даць мне, - сказала Місіс Імоґэн Куньніґгам на 92-гім годзе свайго жыцьця.

Ґэйнсвільл Сан, чыр. 26,76.

Жыцьцё чалавека падобна да літары ў абзацэдзе. - Яно можа ня мець ніякага значэньня. Або можа быць часткаю вялікага значэньня.

Аўтар няведамы

Тое, што дасканаленьне нашае несьмяротнае душы зьяўляецца адзінаю мэтаю жыцьця чалавека, можа быць ужо затым апраўдана, што ўсякая іншая мэта, у ваблічу сьмерці, недарэчнаю ёсьць.

Л. Талстой

Ня будзь зацікаўленым у колькасьці, але ўякасьці тваіх прыхільнікаў: калі меней падабаешся ты дрэнным, тым болей хвалы табе.

Сэнэка

Я радуюся ў маім жыцьці,
бо лямпа ўсё яшчэ пламянее;
Я ня шукаю цярністых дарог;
Я люблю малыя прыемнасьці жыцьця.
Калі дзьверы нізкія, я нагінаюся;
Калі я магу сапхнуць набок камень
на маёй сьцежцы, я раблю гэта;
Калі ён за цяжкі, я абыходжу яго.
У кажным дню я знаходжу нешта,
што радуе мяне.
Вуглавы камень - мая вера ў Бога,
што цешыць маё сэрца
і твар мой чыніць зіяючым.

Кацярына Э. Тэкстор

ІДЗІ БЯСТУРБОТНА сярод гоману і мітусьні, і памятай, што супакой можа быць знойдзены ў цішыні і без нарушэньня добрых суадносінаў зь людзьмі. Выказвай сваю праўду спакойна і ясна; і слухай іншых, нават простых людзей і неасьвечаных; яны гэтаксама маюць сваё апавяданьне. Абмінай крыклівых і нахабных людзей, яны зьяўляюцца турботнымі для духа. Калі ты параўноўваеш самога сябе зь іншымі, ты можаш стацца абескуражаным і расчараваным; бо заўсёды знойдуцца людзі большыя і меншыя, чымся ты. Радуйся з прычыны тваіх асягненьняў як і з прычыны тваіх замераў. Падтрымлівай зацікаўленьне ў выбранай галіне працы, усяроўна, як скромнаю яна можа быць; бо яна зьяўляецца запраўдным уладаньнем у зьменьваючым шчасьце часе. Перасьцерагай асьцярожнасьць у тваіх практычных справах; бо сьвет поўны здрады. Але няхай гэта не асьляпляе цябе перад тым, што зьяўляецца мужнасьцю ў ім; шматлікія зь людзей імкнуцца да высокіх ідэалаў; і жыцьцё напоўнена гераізмам. Астанься самым сабою. Асабліва ня прыкідвайся чупурным. Ня будзь цынічным адносна любові, бо перад тварам усяе абыдзённасьці і расчараваньня яна зьяўляецца сталым, як трава. Бяры дабразычліва навуку гадоў, ласкава паддаючыся няўхільнасьці ўступаючае маладосьці. Мацуй сілу духа, каб быць адпорным табе ў часе непрадбачанае нядолі. Але не абескуражвай самога сябе ўяўленьнямі. Страх ро-

дзіцца часта са змучанасьці і адзіноты. Пасьля здаровага самаздысцыплінаваньня будзь далікатным з самім сабою. Ты зьяўляешся дзіцем сьвету ня меней, як дрэвы і зоры; ты маеш права быць на гэтым сьвеце. І ўсяроўна, ясным гэта для цябе ці не, сусьвет астаецца неабсяжным, якім ён і павінен быць. Дзелягэтага будзь у сузгоднасьці з Богам, усяроўна, як ты ўяўляеш Яго сабе, і ўсяроўна, якою зьяўляецца твая праца і твае асьпірацыі; у гаманлівай зьбянтэжанасьці жыцьця падтрымлівай супакой са сваею душою. З усім ягоным сорамам і цяжкаю працаю, і са скрушанымі лятуценьнямі, сьвет усё-ж астаецца прыгожым. Будзь асьцярожным. Імкніся быць шчасьлівым.

/Рукапіс у ангельскай мове, датаваны 1692-м г., знойдзены ў старой Сьвятапаўлаўскай царкве ў Балтымор/.

Усё дасьледуй, і розуму давай першае масца.

Пітаґорас

У цэнтры ўсіх дзеяў народу стаіць чалавек - духова прабуджаны чалавек.

Ян Пятроўскі

На колькі пабольшыце і палепшыце душу вашую, на гэтулькі палепшыце правы вашыя і ўзбольшыце граніцы.

Адам Міцкевіч

Узьнялася-ж і спрэчка між імі, хто зь іх павінен лічыцца большым.

Ён жа сказаў ім: цары народаў пануюць над імі,і валадары іх дабрадзеямі называюцца;

Вы-ж ня гэтак: але большы сярод вас станься як меншы, і правадыр - як слуга.

Бо хто большы: той, што сядзіць за сталом, ці той, што паслугуе? Ці не супачываючы? А Я сярод вас, як паслугуючы.

Пав. Лукі, 22:24-27

## ЧАЛАВЕК

Мерaю чалавека ёсьць, як ён зносіць нядолю.
Плютарх

Чалавеча, ня шукай прычыны зла. Прычына зла – ты.
Ж.Ж.Руссо

Сьвет поўны цудаў, але нішто не зьяўляецца болей цудоўным, як сам чалавек.
Софоклес

Гордасьць ёсьць свайго роду прыемнасьцю, выкліканаю чалавекам, які думае як найляпей пра самога сябе.
Сьпіноза

Чалавек ёсьць мерaю ўсіх рэчаў.
Протаґорас

У старажытнай Пэрсыі галоўныя дзяржаўныя становішчы раздаваліся найболей шляхэтным пэрсам, якія вучыліся "езьдзіць конна, страляць з луку і гаварыць праўду".
Недзе прачытанае

Не кажы, я буду падлізвацца перад гэтым чалавекам, каб атрымаць ад яго ежу; перад гэтым чалавекам – каб атрымаць піцьцё; перад гэтым – каб абараніў мяне: бо ляпей табе несьці твой уласны сорам, чымся быць асаромленым іншымі.
Тальмуд

Доля чалавека ня ёсьць справаю прыпадку ці здарэньня, яна ёсьць справаю выбару; яна не зьяўляецца рэчаю, на якую трэба чакаць, гэта рэч, якая мае быць асягнута.
Вільліям Джэнінґс

У жыцьці можна спасьцерагчы дзіўнае зьявішча; – калі ты адмаўляешся ад прыняцьця ўсяго апрача найлепшага, вельмі часта здараецца, што ты можаш атрымаць гэта.
Сомэрсэт Манґгам

Кажны рух у напрамку дабра сярод людзей, што жывуць дрэнным жыцьцём, выклікае ня любоў, а прасьлед.
Л. Талстой

Як рэгула, усе асягненьні ў галіне духа і навукі, усе адкрыцьці і вынаходы, якімі мы сягоньня карыстаемся на кажным кроку штодзеннага жыцьця, саправаджаліся драматычнымі сцэнамі ў пустынях, лябараторыях, вязьніцах... Будзе гэта Сакратас ці Ґалілей, Архімэдэс ці Купала, Саванароля ці Ян Залатавусны, Тарашкевіч ці Эдісон, ап. Паўла ці Лінкольн, Ґандзі ці Гус... усе яны паддаюцца цяжкім пробам жыцьця і ў сьведамасьці свайго пасланіцтва змагаюцца з сабою, каб умагчыміць пераказаньне людзям таго, што́ ім выдаецца быць найважнейшым у жыцьці.

Ян Пятроўскі

Змаганьне чалавека з самым сабою, унутранае змаганьне, у якім крысталізуецца характар – гэта тая духовая рэвалюцыя, неабходная для беларускага народу. Нашая ўвага і натугі павінны быць зьвернуты на гэта. Як ніколі перад гэтым зь нізоў будзе разыходзіцца голас з дамаганьнем новага, лепшага чалавека

Ян Пятроўскі

Калі мы будзем прызнаваць тое, што рэчы ня могуць быць іншымі, чымся яны ёсьць, тады мы ўспамагаем мёртвую энэрґію сьвету, якая ўтрымлівае іх у папярэднім стане.

Калі мы не падпаракуемся, мы стаемося часткаю тых сілаў, якія зьіначваюць рэчы.

Сольтэр

Пісаныя рэфэраты, якімі мы перанасыціліся і падобныя літаратурныя творы, бяз сумліву маюць сваё значэньне. Але вялікія, сусьветнага засягу творы літаратуры сталіся клясычнымі і несьмяротнымі гэтаксама як і спадчынаю ня толькі тых народаў, скуль яны паходзілі, але ўласнасьцю ўсяго чалавецтва – затым толькі, што ў першую чаргу, у іх закранаюцца адвечныя зьявы быцьця чалавека, гэтакія, як змаганьне веры з пэсымізмам, праўды зь няпраўдаю, сьвятла зь цемраю, адважных характараў з апартунізмам, свабоды зь нявольніцтвам, беднасьці з багацьцем, жыцьця са сьмерцяю... Зьявам гэтым таварышыць перажытае аўтарамі змаганьне ўнутранае, цярпеньне духовае, што граніцыць з адчаем і вераю. Гэтак, як ветры ў прыродзе і навальніцы, катастрофы ў натуры з сіламі разбурэньня і тварэньня адначасна, вядуць да сталага прагрэсу ў хвармаваньні спасьцярожнага для нас сьвету, гэтак у змаганьнях

унутраных чалавека і ягоных цярпеньнях выяўляюцца новыя хвормы і глыбіня духовага росту.

Ян Пятроўскі

Важным ёсьць ня тое месца, якое мы займаем, але той кірунак, у якім мы крочым.

Гольмс

Я спадзяюся прайсьці праз жыцьцё толькі раз. Затым, калі існуе якая-небудзь далікатнасьць, якую я магу праявіць або якая-небудзь добрая рэч, якую я магу ўчыніць для чалавека, няхай тады мне дазволена будзе выканаць гэта зараз-жа і безадкладна - бо я ня буду праходзіць гэтым шляхам яшчэ раз.

Вільліям Пэнн

Чалавек адваяваў сабе ад натуры сілу, пры помачы якое ён зьяўляецца ў стане сьвет абярнуць у пустыню, або пустыню ў квітнеючы сад. Нічога няма дрэннага з атамам; толькі зь людзкаю душою.

Адляі Стэфэнсон

Пракляты той чалавек, каторы першы ўпаў на думку расшчапленьня атаму. Не хапала гэтаму чалавеку мужнасьці першы раз выпісаную ім формулу ў тую-ж самую хвіліну спаліць і попел яе разьвеець сярод безьлічу іншых атамаў, не сказаўшы нікому нічога з жывых людзей.

=

Я ня скаржыўся на свой лёс і не наракаў. Але аднойчы, калі я быў босы і ня меў за што купіць абутку, я ўзьняў голас скаргі. Я ўвайшоў тады зь цяжкім сэрцам у вялікую мячэць у Куфе; і вось, у мячэці я ўбачыў чалавека бяз ног. Я ўдзячны быў Богу, што ў мяне былі абедзьве ногі, а толькі ня было чаравікаў абуць іх.

Мадi

Сакратас першы, зводзячы філязофію зь нябёсаў, распаўсюдзіў яе між людзьмі, заахвочваючы іх пазнаваць навуку жыцьця, натуру людзей і пасьлядоўнасьць добрых і дрэнных справаў.

Цыцэрон

Займайся толькі тым, што́ духова ўздымае цябе і адначасна карысным для супольнасьці.

Гэндэрсон

# Ч А Л А В Е К

## /сэкстына/

Пылінка вечнасьці ты, чалавек,
Вянок тварэньня усямоцнай сілы;
Спыняеш бег грымотны горных рэк,
А сам сябе ня ўпыніш да магілы;
П'янееш з славы, пераносіш зьдзек,
Шукаеш праўды, шчасьця зь веку ў век.

У той далёкі дакаменны век
Зубамі грызься з зьверам чалавек,
Любіў раздольле, ненавідзеў зьдзек;
Над ім стыхіяў бушавалі сілы...
Вяшчаюць шмат што курганы, магілы,
Раскопаныя на ўзьбярэжжы рэк.

Па хвалях мора, паўнаводных рэк
Байдаркай, стругам у навейшы век
Туды, дзе вее холадам магілы,
Дзе джунгляў усьціж, пнуўся чалавек;
Тубыльцаў вольных перавагай сілы
Ў няволю браў, чыніў над імі зьдзек.

Прыроды дзеці, вам на зьдзіў і зьдзек
Бэтон і сталь скавалі грудзі рэк,
Трыножыць розум незямныя сілы;
Дарос да сотні чалавечы век,
І ён, праваобраз Боскі, чалавек
Ляціць на высьціг з гукам да магілы.

Ляці да сонца - ня мінеш магілы.
За што, Тварэц, такі над сынам зьдзек?
Гарылы брат вышэйшы, чалавек,
На Марсе сочыць скрыжаваньні рэк,
Махнуў крылом у атамовы век,
На штурм вышынь маланкі ловіць сілы.

Зыйшлі на зямлю процьмы чорнай сілы,
Разносіць вецер цяжкі дух магілы,
Імкне жыцьцё у дапатопны век;
Пакутнік славіць катаваньні, зьдзек,
І кроў людзей дыміць на хвалях рэк,
Сячэ галовы страшны чалавек.

Прадоньня жах, і кроў, і зьдзек - ня век.
Магілы ўстануць, лопнуць жылы рэк...
О! Джвагнуць сілы неба, чалавек!

9.І.1957 г. Міхась Кавыль

Людзі ствараюць сабе перашкоды, турбуюцца і хвалююцца толькі тады, калі яны заняты вонкавымі справамі, якія ад іх не залежаць. У гэтакіх выпадках яны трывожна пытаюцца сябе: "Што я пачну рабіць? што будзе? што з гэтага выйдзе? хоць-бы не здарылася тое ці іншае". Гэтак бывае з тымі, каторыя заўсёды рупяцца аб тым, што́ не залежыць ад іх.

І наадварот, чалавек, які заняты тым, што́ залежыць ад яго самога, і які абасноўвае сваё жыцьцё на працы самадасканаленьня, той ня будзе непакоіць сябе. Калі-б ён і пачаў непакоіцца аб тым, ці ўдасца яму трымацца праўды і ўхіляцца ад махлярства, дык я сказаў-бы: Супакойся, - тое, што́ непакоіць цябе, знаходзіцца ў тваіх уласных руках; сачы толькі за тваімі думкамі і чынамі, і старайся, як можаш, папраўляць сябе. Дык і не кажы: "Што будзе?" Усё, што́ здарыцца, ты здабудзеш сабе, як навуку і карысьць.

- А калі я памру ў змаганьні зь няшчасьцямі?

- Ну, дык што-ж? У такім выпадку, ты памрэш сьмерцяю чалавека чэснага, выконваючы тое, што́ ты павінен выканаць. Трэба табе ўсяроўна памерці і сьмерць павінна цябе застаць пры якой-небудзь справе. Я быў-бы рад, калі-б сьмерць застала мяне за чынам годным чалавека, за чынам добрым і карысным для ўсіх людзей; каб яна застала мяне ў тым часе, калі я стараюся папраўляць сябе. Тады мог-бы я падняць рукі да Бога і сказаць Яму: "Госпадзе, Ты ведаеш Сам, колькі я скарыстаў з таго, што́ Ты даў мне дзеля зразуменьня Тваіх правоў. Ці папракаў я Цябе? Ці абурваўся супроць таго, што́ са мною здарылася? Ці ўхіляўся я ад выконваньня сваіх абавязкаў? Дзякую Табе за тое, што я радзіўся, за ўсе Твае дары. Я карыстаўся імі багата; вазьмі іх назад і ўчыні зь імі, як Табе да спадобы, - бо-ж яны Твае!"

Ці можа быць лепшая сьмерць? Каб дажыць да гэткае сьмерці, табе ня трэба шмат пакінуць, хоць, што праўда, праз гэта ты многа здабудзеш. Калі-ж ты захочаш утрымаць тое, што́ не тваё, дык ты абавязкава згубіш і тое, што́ належыцца табе.

Хто хоча мець паважаньне ў сьвецкіх справах, той ня сьпіць цэлыя ночы, заўсёды турбуецца і рупіцца, прытарноўваецца да сільных людзей і наагул паступае, як подлы чалавек. І нарэшце, да чаго ён усім гэтым дабіўся? Ён дайшоў да таго, што яго акружваюць пэўнымі гонарамі, што яго баяцца і, што ён, стаўшыся старшынём, мае ўладу над іншымі людзьмі. Няўжо-ж ты не захочаш хоць крыху папрацаваць дзеля таго, каб

вызваліць сябе ад усіх гэтых турботаў і спаць супакойна, нічога не баючыся і нічым нямучыцца? Але ведай, што гэтакі супакой душы не даецца дарма.

Эпіктэтус

Там, дзе чалавек ёсьць патрэбны, старайся ты быць гэтым чалавекам.

Бабілёнскі тальмуд, трактат Абот, Мішна F

## ПРАВА

Ніякае гаспадарства ня можа ўстаяць у сваіх асновах, калі паасобныя ягоныя грамадзяне ня мецімуць абазнаньня ў праве.

Паводля Плятона
/<u>Протаґорас</u>, 322/

Першая труднасьць, якая выступае цяперака ў сувязку з зьдзяйсьненьнем права Бога, выяўляецца ў тым, што існуючыя людзкія правы зьяўляюцца супроцьлежнымі яму.

Л. Талстой

Устанаўляць правы ёсьць справаю толькі Бога; справаю-ж прававедаў – ёсьць зглыбляць гэтыя правы і справядліва ўжываць іх у штодзенным жыцьці.

Джон Рёскін

Права жыцьця мудрых людзей не яснае, але яно штораз болей і болей выясьняецца для тых, што імкнуцца жыць паводля яго. Права жыцьця сьвецкіх людзей яснае для кажнага, але штораз болей і болей зацямняецца як што раз болей людзей узгадняе жыцьцё сваё зь ім.

Конфуцый

Існуе толькі адно бясспрэчнае права – права Божае; права-ж людзкае, каб стацца правам, павінна стацца толькі дадаткам да права Бога ў жыцьці чалавека і павінна праводзіцца ня прымусам, але сваім сузгодзьдзем з правам Бога.

Л. Талстой

У часе, калі я зьбіраў гарэхі ў лесе, лясьнік высунуўся з-за кустоў і спытаў мяне, што я тут раблю. Я адказаў, што зьбіраю гарэхі.

– Зьбіраеш гарэхі? – сказаў ён. – Ці маеш ты права гэта рабіць?

– Маю, – адказаў я. – Чаму-ж ня зьбіраць? Ці-ж вы пазбавілі-б гэтага права малпу або вавёрку?

– Я кажу табе, – сказаў ён, – што лес гэты не агульны, што ён належыць да Партляндзкага гэрцоґа.

– Вось як?! – сказаў я. – Прывітаньні ад мяне гэрцоґу. Натура ведае аб ім гэтулькі сама, калькі і аба мне. А дзеля гэтага, для запасаў натуры правіла гэткае: хто першы прыйшоў, той і карыстайся; затым, калі гэрцоґу Партляндзкаму патрэбны гарэхі, няхай ён сьпяшаецца.

Томас Спэнс

Мы займаем абтоку, на якой жывем працаю нашых рук. Разьбіты ў часе буры вадаплаўнік, выкінуты на наш бераг. У чым заключаецца ягонае права? Ці можа ён сказаць: я гэтаксама чалавек, я гэтаксама маю натуральнае права абрабляць зямлю; ці я магу на той самай падставе, як вы, заняць кавалак зямлі, каб жывіцца сваею ўласнаю працаю?

Лявалэ

На пытаньне караля Ксэркса, ці Тэрмопілы будуць бароненымі, грэк адказаў:

"Жаданьне чыну заўсёды было нашым сябрам і жыхаром у нашай зямлі, тады як мужнасьць ёсьць нашым саюзьнікам, якога мы здабылі, дзякуючы мудрасьці і пісанаму праву".

--

Уладу і свабоду ў руках сваіх маем, а правы самі сабе творачы, як найболей можам вольнасьці свае ўва ўсім перасьцерагаць, бо ня толькі сусед і супольны наш грамадзянін у бацькаўшчыне, але сам Гаспадар пан наш ніякае ўлады над намі выконваць ня можа, адно толькі ў гэткім засягу, колькі яму права дапушчае.

Леў Сапега
Канцлер Вялікага Княжства Літоўскага

Усе людзі родзяцца свабоднымі і роўнымі адносна свае годнасьці і сваіх правоў. Яны абдораны розумам і сумленьнем і павінны адносіцца адзін да аднаго ў духу братэрства.

Ун. Дэкл. Правоў Чалавека
Артыкул I

## ПРАВА ДА ЖЫЦЬЦЯ

## I РОЗНАЯ ЯГОНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ

БЫЛО ГЭТА ўлетку, калі я добра памятаю, 1916 году. Зьявішча гэтак званага бежанства ў гэтым часе было ўжо шырака ведамае сярод нас, і ў Слуцак на Школішча прыбыла многа людзей, пераважна польскіх жыдоў. Сям-там спатыкаліся і польскія сем'і. Адна гэткая польская сям'я - муж, жонка і хлапец у веку каля васьмі гадоў - затрымалася ў Зосі Волат. /Зося Волат і яе два сыны, Болесь і Стась, тварылі сабою на нашай вуліцы беларускую каталіцкую сям'ю/.

Стаяў цёплы летні дзень. Здарылася, што на нашай Бычковай вуліцы каля Зосінае хаты схварамавала-

ся нейк болей людзей, чымся звычайна. Зьнічэўку пачуўся нейкі крык і піск каля Зосінае хаты. Жонка паляка, што знаходзілася разам зь іншымі, крычала, што нехта яе крыўдзіць і хутка зьвярнулася да свайго хлапца з наказам, каб гэты бег зваць бацьку. Я стаяў на супроць Зосінае хаты каля брамы Грынька, і, калі я скіраваў свой узрок у напрамку сукль даходзілі піск і мітусьня, я пабачыў хлапца, які бег ужо клікаць свайго бацьку, палячку наракаючую, што яе нехта б'е, іншых людзей каля яе і Мішу Грынько-вага, рослага юнака, гадоў каля васімнаццаці. Не прамінула можа і дзьве мінюты, як муж палячкі бег ужо. Ён хутка кінуўся ў васяродзьдзе зграмаджаных каля свае жонкі і, ня пытаючыся што і як, пачаў біць Мішу Грыньковага. Прысутныя, сярод іх ужо і сам Грынёк, які на крыкі выйшаў са свае хаты, і яго ная жонка, Марыля, што выглядала праз вакно, адным хорам пачалі крычаць паляку: Гэта ня ён! Гэта ня ён!, перасьцерагаючы таго, што ён б'е нявіннага чалавека. Але гэты ў міжчасе спагнаў ужо першую злосьць.

Мне было тады адзінаццаць гадоў. Я стаяў збоку і прыглядаўся гэтай дзіўнай сцэне, якая асталася ў памяці аж да сягоньня. Усё гэта мне выдалося і дзіўным, і да болю страшным: паводзіны паляка і, перад усім, нашых людзей. Я глядзеў на ўсіх прысутных, асабліва на старшых ад мяне, і я чуўся пакрыджаным і паніжаным. Ніхто з прысутных не праявіў ніякага сьледу абурэньня ці гневу з прычыны таго, што нейкі прыпадкавы чалавек, чужынец гэтак бескарна захоўваецца, бяручы права і выкананьне яго ў свае рукі, быццам ён быў усім тут, а людзі, якія жывуць тутака спакон вякоў, приймалі ўсё, быццам гэтак і павінна быць, а іхная беспрэтэнсыянальнасьць да жыцьця гаварыла: выбачайце, што жывем.

Я адыходзіў з месца выдарэньня з цяжкім сэрцам, ня могучы знайсьці адказу на свае думкі.

У пазьнейшых гадох, ідучы праз жыцьцё, я пераважна спатыкаў тое самае. Ціхамірнасьць да ступені нейкае хворасьці, абыякавасьць да правоў жыцьця, пахіленыя сьпіны ад селяніна да прафэсара ўключна.

Ян Пятроўскі

У 1928 ГОДЗЕ нашая кампанія Школы падхаронжых рэзэрвы 5а ў Цешыне ў летнім месяцы адбывае польнае цьвічэньне. Кампанія знаходзіцца ў хуткім маршы. Дарога на карце творыць сабою вялікую літару А. - Абазначма для яснасьці апавяданьня літарамі а -

для ніжняга левага пункту нашае літары А, б - для верхняга пункту і в - для ніжняга правага пункту. Нашая кампанія знаходзіцца на вышыні пункту в. Мэта нашага маршу - асягнуць пункт а. Каб асягнуць а, трэба ісьці на поўнач да пункту б, і тады з пункту б прыблізна на поўдзень да пункту а. Нашая літара А на карце мае свомую для сябе папярэчку, якая творыць сабою польную дарогу /абазначма яе: левы пункт сутыку літараю г і правы - літараю д/. Капітан Сломчыньскі, які крочыць на чале кампаніі, паясьняе першай чацьвёрцы, чаму мы ня можам выкарыстаць папярэчнае польнае дарогі /г - д/, але я, ідучы ў вадной з наступных чацьвёрак, ня добра чую яго. Пасьля хвіліны развагі, капітан рашаецца выкарыстаць польную дарогу, каб скараціць час маршу. Ідучы польнаю дарогаю /г - д/, я разглядаюся. Нічога асаблівага тут ня відна. Па левай старане поле, а далей - лясок. Па правай старане нешта падобнае да саду, за дрэвамі якога відзён дом. Дом гэты нічым ня розьніцца ад іншых падобных дамоў. Пры доме відзён нейкі чалавек. Чалавек, праўдападобна, пабачыўшы нас, мерна і спакойна ідзе нам напярэймы. Пасьля нейкага часу чалавек знайшоўся ўжо на дарозе якіх мэтраў 40 перад намі. Чалавек раскрыжаваў рукі на знак перагароды, і пачуўся голас:




- Не позвалям!

Я чую, што ён кажа, але я не разумею значэньня ягоных словаў. Чалавек і кампанія зьбліжаюцца да сябе і чутны тыя самыя словы:

- Не позвалям!
- Чоло, сту-у-й... - дае каманду капітан.
- Кампанія затрымалася. Чалавек зноў паўтарае:
- Не позвалям, ест то прыватна дрога на мэй власносьці...

Капітан нічога не адказвае чалавеку. І, зьвяртаючыся да нас, падае каманду:

- За мно ма-а-рш... - заварочваючыся пры гэтым

у напрамак,зь якога толькі што мы прыйшлі.

Мы маршыруем назад. Да мяне далятаюць асобныя словы капітана, які паясьняе:

– Міністэрство справ войсковых... скаргі...

Я іду, і ўсё яшчэ не магу ўпарадкаваць сваіх думак. Для мяне – гэта новы сьвет, новы парадак, у якім выразна выступае права і годнасьць чалавека, а перад усім, што, апіраючыся на права, можна супраціўляцца з паводжаньнем большай сіле. Бо перад правам усе роўныя.

Гэта-ж у жаўнернях бывала, у Лідзе, дзе станцыянаваў наш 77 полк, які ўваходзіў у склад 19-ае г. зв. Літоўска-беларускае дывізыі, мы, жаўнеры, на каманду нейкага старшага шэрэґовца маланкаю сыпаліся пад прычы і з-пад прычаў. Часта на рух толькі ягонага пальца, мы прысядалі і выпростоўваліся гэтак многа разоў, колькі яму, старшаму шэрэґовцу ці якому-небудзь падафіцэру, толькі падабалася.. А тут сам пан капітан, разам з кампаніяю школы падхаронжых на нейкае "не позвалям", нейкага хлопа мусіць з пакораю дзіцяці завярнуцца і ісьці назад... гэта-ж беларускі селянін, каб пабачыў, што гэткае войска ідзе праз ягоную дарогу, нават-бы з хаты ня выйшаў, і рад быў-бы, каб адно прайшло ціха і няспрычыніла яму ніякага ліха. І ніхто яго за ніякія скарбы не нагаварыў-бы, каб ён выйшаў і супроцьставіўся якому-небудзь войску і сказаў: "не пазваляю!"

Увесь сьветапагляд чалавека, уся ягоная пастава ў жыцьці, ягоная будучыня залежыць у значнай меры ад ягонага зразуменьня свайго месца на гэтай Зямлі, ад зразуменьня ягонага права, якое выток свой бярэ ад Таго, Хто стварыў і Зямлю,і чалавека, і права...

Ян Пятроўскі

Дынаміка – гэта веда ў сфэры права руху. Першае права Ньютона ёсьць простым сьцьверджаньнем, што: Кажнае цела ў стане супачынку знаходзіцца ў стане супачынку, або: Кажнае цела ў руху знаходзіцца ў руху на простай лініі ў нязьменнай хуткасьці. Гэта значыць, што цела ня мае сілы зьмяніць свой рух. І гэта трывае да тае пары, пакуль не пачынае дзейнічаць на яго вонкавая сіла.

///

Кажнае цела, пагружанае ў цякоміну або ґаз, губіць уяўна са свае вагі гэтулькі, колькі важыць цякоміна ці ґаз, выціснуты гэтым целам.

Архімэдэс

## ПРАЎДА

Ісус адказаў:
- Ты кажаш, што я кароль. Дзеля гэтае мэты я радзіўся і затым прыйшоў на сьвет, каб выявіць праўду.
Пілат кажа яму:
- Што ёсьць праўда?

Паводля Яна, 18.

Ня ў сіле Бог, а ў праўдзе.

Зь беларускае мудрасьці

Мова праўды простая.

Л. Талстой

Хлеб, соль еж, ды праўду рэж.

Зь беларускае мудрасьці

Усе шчасьці - нішто перад шчасьцем праўды; усе салодкасьці - нічога перад салодкасьцю праўды; шчасьце праўды бязьмерна перавышае ўсе радасьці.

З будыйскае мудрасьці

Дзе пачынаецца шуканьне праўды, там заўсёды пачынаецца жыцьцё; як толькі супыняецца шуканьне праўды, супыняецца жыцьцё.

Джон Рёскін

Тысячы шляхоў вядуць да заблуджэньня; да праўды - толькі адзін.

Ж.-Ж. Руссо

Праўда ні ў чым не пазнаецца дарогаю гутарак, а толькі натугаю іназіраньнем.

Джон Рёскін

Нічога не перашкаджае гэтак моцна распаўсюджаньню праўды, як упартасьць утрымаць старадаўны, авеяны сьвятасьцю часу, пераказ.

Марціно

Ня шукай праўды ў іншых, калі ў табе яе няма.

Зь беларускае мудрасьці

Не зьяўляецца дазволеным пярэчыць таму, хто праўду кажа

Сакратас
/<u>Гіппіяс вялікшы</u>, 304/

Звычайна, праўда знаходзіцца на вуснах паміраючага чалавека.

Маттью Арнольд

Мы ведаем праўду, ня толькі дзякуючы нашаму розуму, але гэтаксама, дзякуючы нашаму сэрцу.

Паскаль

Любіць праўду дзеля праўды - гэта і ёсьць аснаўная частка людзкае дасканаласьці на гэтым сьвеце.

Джон Лёкэ

Мець праўду - гэта яшчэ ня ўсё; істотным астаецца, каб праўда мела нас.

М. Мэтэрлінк

Я шукаю праўду, якая ніколі і нікому яшчэ ня спрычыніла шкоды.

Марк Аўрэліюс, 6.21

Мы маем праўду, якое ня могуць перамагчы ўсе скептыцызмы.

Паскаль

Калі праўда мае вартасьць, дык гэта не затым, што яна праўдзіваю ёсьць і не затым, што яна адважна гаворыць.

Недзе прачатанае

На сьвеце ўзьнікла-б вялікая цемра, калі-б праўда ня мела спасьцярожных довадаў.

Паскаль

Кажная праўда мае дзьве стораны; добра для чалавека, калі ён уважна прыглядзіцца абедзьвюм, перад тым, як далучыцца да аднае зь іх.

Эзопос

Праўда часта церпіць болей з прычыны запалу тых, каторыя бароняць яе, чымся з прычыны довадаў яе апанэнтаў.

Недзе прачытанае

Праўда мае прыгожы твар, але падзертую вопратку.

Нямецкая прыказка

Праўда зьяўляецца дзіцем часу.

Джон Форд

Гэтакім я ўжо ёсьць, ня гэтулькі далікатным, як баржджэй нязграбным, і пра нішто іншае ня турбуюся, як толькі пра праўду.

Сакратас
/Гіппіяс вялікшы,288/

Праўда не баіцца суду.

Томас Фільлер

Час выпрабоўвае праўду.

Ангельская прыказка

Тыя, што ведаюць праўду, не зьяўляюцца ўпадобненымі да тых, што любяць яе; а тыя, што любяць яе, не ўпадабняюцца да тых, што дазнаюць асалоду ў ёй.

Конфуцы

Крыніцы праўды могуць быць чыстымі, але воды іх забруджваюцца ў ручаёх і рэчках супярэчнасьцяў.

Байрон

Прапіханьне кажнае праўды за далёка, выклікае супроць-праўду.

Паводля Г.В. Бічэр

Бяз праўды няма свабоды, але толькі няволя.

"Божым Шляхам", № 132

У сфэры розуму няма абмежаваньняў. Свабодны чалавек толькі тады, калі ён знаходзіцца ў праўдзе.
Праўда выкрываецца розумам.

Л. Талстой

Праўда падобна да макавае млечы: у малых колькасьцях супакой нясе людзям; у большых - распальвае і дражніць іх; у неабмежаваных колькасьцях - забівае іх.

Вальтэр Савэйдж Ляндор

Праўда завучаная - адно прыліпвае да нас, як штучная частка: устаўлены зуб, васкавы нос і ў найлепшым выпадку - як рынапластычны нос з чужое скуры. Праўда-ж здабытая ў працэсе ўласнага думаньня, падобная да праўдзівае часткі цела; толькі яна адна належыць да нас.

Шопэнгаўэр

Праўда заўсёды пасылае дабро.

Л. Талстой

Пасьля таго, як два дамініканскія прапаведнікі, айцы Лёріні і Качіні, публічна выступілі супроць навукі "гэтага Іпэрнікуса, ці як ён там называецца", гэтым мала-памалу разгарэлася полымя гістэрыі і прасьледу супроць Ґалілея са стараны тагачаснае на Захадзе Рымска-каталіцкае царквы, што́ прывяло слаўнага італьянскага вучонага на калені перад вялікімі дастойнікамі сьв. Інквізыцыі. Пакуль да гэтага дайшло, Ґалілей бараніўся ўсімі годнымі і даступнымі яму сродкамі. У глыбокім непакоі, Ґалілей паслаў выпрацаваны ім мэмарандум у хворме ліста п. т. "Ліст да Вялікае Ґэрцоґіні", у якім ён цытуе айцоў царквы, у тым перакананьні, што сьв. Пісаньне ня вучыць нас пра натуру, але толькі пра звышнатуральныя рэчы; што "яно кажа нам аб тым, як ісьці ў неба, але не аб тым, як нябёсы ходзяць". Ён не прасіў, каб кніга Капэрніка ня была асуджанаю - ён быў гатовым падпарадкавацца пастанове найвышэйшых аўтарытэтаў - але ён прасіў, каб "яна ня была асуджана без зразуменьня яе, без праслуханьня яе, без таго нават, каб пабачыць яе".

///

Калі абодва [Плятон і праўда] зьяўляюцца дарагімі нам, пабожнасьць дамагаецца ад нас, каб мы праўду мелі ў пашане вышэй, чымся нашых прыяцеляў.

Арыстотэлес

Праўда вочы коле.

Зь беларускае мудрасьці

Першае права для гісторыка ёсьць, што ён ніколі не павінен казаць няпраўды. Другое - што ён ніколі не павінен прамоўчваць таго, што́ зьяўляецца праўдаю. І яшчэ болей - не павінна быць ніякага падазраньня, што да староннасьці ў ягоным пісаньні або зласьлівасьці.

Маркус Тульліюс Цыцэро

Няма большага няшчасьця ад таго, калі чалавек пачане баяцца праўды, каб яна не дакарыла яго.

Паскаль

Ня можна ўтрымліваць ніякае няпраўды, не далучыўшы да яе яшчэ іншую няпраўду.

Лессінґ

## ВЕДЫ, ВЕДА

Ня існуе на сьвеце нічога болей магутным, як веда.

Плятон
<u>Протаґорас</u>, 357

Веда - самае найдаражэйшае з усіх скарбаў. Яе нельга ўкрасьці, яе нельга аддаць, і яна ня можа быць растрачанаю.

Готопадэза

Веда - найбольшы дар, які толькі можна даць.

Фульлер

Жыцьцё ёсьць кароткае, а навука доўгаю; нагода - мінаючаю, дасьведчаньне - зманьваючым, а высnaў трапны - трудным.

Гіппократэс

Я ведаю, што ня ведаю.

Сакратас

Выдаецца табе, быццам ты шмат ведаеш і даволі добра разумееш? - Дык ведай-жа, што існуе яшчэ болей рэчаў, якіх ты ня ведаеш і не разумееш.

Паводля Х. Кэмпійскага

Веда ёсьць сіла.

Шопэнгаўэр

Ці няведаньне - гэта памылковы пагляд і самаашуканства ў прадмеце галоўных пытаньняў?

Сакратас
<u>Протаґорас</u>, 358

Кажная культурная супольнасьць заахвочвае сваіх грамадзян да дыскусыі.

Ян Пятроўскі

Устаць, калі шэсьць; абедаць, калі дзесяць,
Вячэраць, калі шэсьць, і спаць, калі дзесяць, -
Чыніць жыцьцё чалавека дзесяць раз дзесяць.

Інскрыпцыя над дзьвярыма
кабінэту Віктара Гюґо

Як чалавек думае, гэтакім ён і зьяўляецца.

Эмэрсон

Ня трымайся назаўсёды прынятага грамадзкага шляху, ідучы толькі туды, куды ўсе іншыя ішлі. Зыйдзі часамі з вытаптанага тракту і заглыбіся ў прыгожую пушчу. Ты можаш быць пэўным, што знойдзеш нешта, чаго ты ніколі ня бачыў перад гэтым.

Александар Ґрагам Бэльл

Думка зьяўляецца працаю інтэлекту.

В. Гюґо

Быць нясьведамым у тым, што здарылася перад тым, як ты радзіўся, значыць астацца назаўсёды дзіцянём.

Цыцэрон

Думаць - звычайна значыць - менш гаварыць.

Недзе прачытанае

У літаратуры спатыкаем тое самае, што і ў жыцьці. Куды не абернешся, напатыкаеш на непапраўны прымітывізм людзкасьці, - імя-ж яго леґіён, - які ўсюды кішыць, усё забруджвае, быццам тыя мухі летам. Згэтуль гэтакая шматлікасьць дрэнных кнігаў, гэтакі сваеасаблівы ўраджай на літаратурнае ліхазельле, якое заглушае добрае зерне. Гэтыя кнігі крадуць у людзей час, грошы і ўвагу, якія, у сутнасьці рэчы, павінны былі-б даставацца на долю выбраных твораў і чэсных мэтаў.

Дрэнныя кнігі ня толькі бескарысныя, але абсалютна шкодныя. Гэта-ж дзевяць дзесятых наплываючае літаратуры толькі затым і друкуюцца, каб выманіць з кішэні наіўнага чытача пару лішніх талераў; з гэтае прычыны аўтары, выдаўцы і друкары наўмысьня падтоўшчаваюць кніжкі.

Яшчэ болей шкоднае, наглае і бяссорамнае ашуканства даконваюць па-радковыя пісакі: бяручы па грашаку за радок свае выпацізны; гэтыя падзёншчыкі псуюць смак чытача і нішчаць запраўдную культуру.

Між іншым, немагчыма не абгаварыцца, што той, хто піша для глупцоў, той заўсёды знойдзе шырокае кола чытачоў; аднак людзям трэба было-б зьвярнуць асьлівую ўвагу на коратка і скупа адмераныя працы літаратуры і запазнацца з першаклясньмі майстрамі ўсіх стагодзьяў і нацыянальнасьцяў, з праўдзіва ґэніяльнымі мастакамі, якія ўздымаюцца быццам тыя вежы, над масаю, зь імёнамі, увенчанымі нямінаючаю славаю. Бо толькі пісьменьнікі гэткае якасьці зьяўляюцца здольнымі ўзгадоўваць і вучыць.

Дрэнных кнігаў ніколі мы не прачытаем за мала, а

добрых ніколі не давядзецца прачытаць за шмат. Дрэнныя кнігі - маральная атрута, якая тупым чыніць розум.

У выніку таго, што натоўп упорыста горнецца да чытаньня ня лепшых кнігаў усіх часоў, а адно творы апошняга выданьня сучаснае літаратуры, дык цяперашнія пісакі круцяцца ў цесным коле ўсё тых-жа паўторных ідэяў, усе перапаўтараюць адно і тое самае, і наш век ня вылазіць з уласнага балота.

Шопэнгаўэр

Дзякуючы філязофіі, я здабыў гэта: ня будучы пануканы загадам, я выконваю тое, што іншыя выконваюць са страху перад правам.

Арыстотэлес

Дайце мне апорышча для маіх ног, і я крану зямлю зь яе месца.

Архімэдэс<br>Паппус александрыйскі,<br>твор: <u>Зборнік</u>, кн.VIII,

Сьвет ня крочыць у напрамку ўчарашняга дня, але ў кірунку заўтрашняга. Затым, будзь гатоў сустрэць Заўтра.

Ян Пятроўскі

Далёка лепшым ёсьць аставацца бясчынным, чымся пабольшваць колькасьць дрэнных кнігаў.

Вольтэр

Чалавек не зьяўляецца бясчынным затым толькі, што пагружаны ў працэс думаньня. Існуе спасьцярожная праца, гэтаксама як і неспасьцярожная.

В. Гюґо

Я выбраў сьв. Хаму Блізьнеца як майго сьвятога патрона, каторы заўсёды дамагаецца ісьледаваньня сваімі ўласнымі рукамі.

Вольтэр

Я знайшоў!

Архімэдэс - ягоны воклік у часе знойдзеньня ім аднаго з фізычных правоў

Той, хто думае пра сябе, што ёсьць мудрым, о неба! зьяўляецца вялікім глупцом.

Вольтэр

Няма нічога болей небясьпечнага як перастаць працаваць над сабою.

Паводля В. Гюґо

Калі людзі перастаюць наракаць, яны перасатюць думаць.

Напалеон

Свабода думкі зьяўляецца жыцьцём душы.

Вольтэр

Я не згаджаюся з тым, што ты кажаш, але я да сьмерці буду бараніць тваё права сказаць гэта.

Вольтэр

Разьвіцьцё навукі ня спрычыняецца да ачышчэньня характараў. Сярод усіх народаў, жыцьцё якіх мы ведаем, разьвіцьцё навукаў спрычынялася да дэмаралізацыі народаў. Тое, што мы цяперака думаем супроцьлежнае, выток свой бярэ з таго, што мы блытаем нашыя пустыя і зманьваючыя нас веды з запраўднаю вышэйшаю ведаю. Навука як гэткая, у абстрактным разуменьні, навука наагул, ня можа ня будзіць сярод нас пашаны, аднак цяперашняя навука, тое, што бязмысныя называюць навукаю, годным толькі сьмеху і пагарды.

Ж.-Ж. Руссо

Толькі той навучаны, хто добра паступае.

Індыйская Готопадэза

Калі ты разумееш чым рэвалюцыя зьяўляецца, назаві яе праґрэсам; і, калі ты разумееш чым зьяўляецца праґрэс, назаві яго заўтрам.

В. Гюґо

Сабака брэша, але каравана ідзе наперад.

Арабская прыказка

Філязофія зьяўляецца мікраскопам думкі.

В. Гюґо

Тое дабро, якое дае нам мудрасьць, у параўнаньні з усімі іншымі ведамі, гэтак-жа важным астаецца, як важнай у пустыні судзіна з вадою ў параўнаньні з пудамі золата.

Л. Талстой

Заслуга вялікіх людзей заключаецца якраз у тым,

што яны, незалежна ад існуючых да іхнага часу кнігаў і вусных пераказаў, выказвалі тое, што́ самыя думалі, а ня тое, што́ думалі людзі, што жылі перад імі або тыя, што тварылі іхнае асяродзьдзе.

Гэтаксама і кажны з нас павінен падпільноўваць тыя сьветлыя думкі, якія, падобна іскрам, ад часу да часу ўспыхваюць і разгараюцца ў нашай сьведадамасьці: для кажнага з нас падобныя ўнутраныя праблікі маюць шмат болей значэньня, чымся ўяўленьне і пазнаньне цэлага сузор'я паэтаў і мудрацоў.

Эмэрсон

Там, дзе канчаецца тэлескоп, мікраскоп пачынае працу. Якая зь дзьвюх працаў мае большы ўгляд?

Віктар Гюґо

Я рэпрэзэнтую партыю, якая яшчэ ня існуе: партыя рэвалюцыі, цывілізацыі.

Гэтая партыя створыць дваццатае стагодзьдзе.

Яе першым творам будуць Злучаныя Штаты Эўропы, а пасьля – Злучаныя Штаты Сьвету.

Віктар Гюґо
Інскрыпцыя на сьцяне пакою,
у якім памер В. Гюґо

... жыцьцё дадзенага народу жыве і падтрымліваецца пры жыцьці ягонаю інтэлігэнцыяю. Увесь сакрэт, здаецца, гэтага жыцьця – гэта прадбачлівасьць інтэлігэнтных людзей, у якім напрамку будзе ўкладвацца агульна людзкае жыцьцё, якія мецімуць месца ў гэтым жыцьці тэндэнцыі, якія ідэалягічныя напрамкі будуць надаваць вартасьць гэтаму жыцьцю. Інакш кажучы, павінны быць наяўнымі здольнасьці ў адхіленьні, да пэўнае ступені, заслоны выдарэньняў прышлых стагодзьдзяў...

Ян Пятроўскі

Толькі пагляды ідыётаў і паліцэйскіх зьяўляюцца непахіснымі.

Бонгёфэр /бэрлінскі псыхіятрысты/.
/Фэрдінанд Заўэрбрух,
"Дас вар майн лейбэн",
1951, б. 473/.

Любеце ваш акт тварэньня, але ня любеце тое, што́ вы стварылі.

С. Макоўскі

Людзкасьць неспасьцярожна, але бязупынна крочыць у напрамку ўрэчаісьненьня свайго ідэалу адзінасьці і агульнага дабра.

Л. Талстой

Як кажны чалавек у апрычонасьці, падобна і ўся людзкасьць сумесна павінна ператварацца, пераходзіць са стану ніжэйшага да вышэйшага, не затрымліваючыся ў сваім росьце, межы якога ў самым Богу. Кажны стан зьяўляецца вынікам папярэдняга стану. Рост адбываецца бесперапынна і неспасьцярожна, падобна росту зародка, адбываецца гэтак, што нічога не нарушае ланцуга паступаючых па сабе станаў гэтага бесперапыннага разьвіцьця.

Лямэнэ

Не, слова ўсемагутнага Бога ўва ўсей сваей паўніні яшчэ ня выражана, і думка Ягоная яшчэ не адкрыта ўва ўсей вялічэзнасьці. Ён усё яшчэ творыць і будзе тварыць на працягу вечных вякоў, агарнуць якія розум людзкі не зьяўляецца ў стане. Мінулыя стагодзьдзі раскрылі перад намі адно акраўкі Ягонага тварэньня. Місыя наша яшчэ не закончана. Мы насілу толькі даведаліся пра яе выток і зусім ня ведаем яе апошняе мэты: Час, пазнаньні і адкрыцьці адно расшыраюць яе межы. Із века ў век яна ўздымаецца да няведамых нам суджанасьцяў, вызіраючы сваё права, нешматлікія радкі якога мы зьяўляемся ў стане расшыфраваць.

Язэп Мадзіні

Заўсёды дабаўляй, заўсёды імкніся наперад; ніколі ня стой і не вяртайся назад і ня зыходзь са шляху. Хто стаіць, той ня крочыць; хто ня крочыць, той ідзе назад; хто каламуціць супакой, той зыходзіць са сьцежкі.

Будзь заўсёды нездаволеным з таго, чым ты зьяўляешся, калі хочаш асягнуць тое, каб быць іншым ад таго, чым ты ёсьць, бо на чым ты затрымаешся, на тым ты і астанешся. А калі ты скажаш: хопіць мне – ты прапаў.

Сьв. Аўґустын

Агонь прыйшоў Я кінуць на зямлю, і як хацеў-бы, каб ён ужо загарэўся! Ці думаеце вы, што Я прыйшоў даць супакой на зямлі? Не, кажу вам, але барждзэй распадзел.

Ісус з Назарэту
Лк. XII, 49,51

Жыцьцё гэтак паасобнага чалавека, як і цэлае людзкасьці, - гэта бесперапыннае змаганьне цела і духа. У гэтым змаганьні дух заўсёды выходзіць пераможным, але перамога гэтая ніколі не канчатковая, змаганьне гэтае бясконцае, яно бо і творыць сабою сутнасьць жыцьця.

Л. Талстой

Паміж розумам і жаданьнямі ў чалавеку адбываецца ўнутраная вайна. Чалавек мог-бы займець які-небудзь ужо супакой, каб у ім быў толькі розум, без жаданьняў, або толькі жаданьні, бяз розуму. Але затым, што ў ім наяўным ёсьць адно і другое, дык ён ня можа ўхіліцца ад змаганьня, ён ня можа быць у стане згоды з адным з адначасным змаганьнем з другім. Ён заўсёды ў распадзеле і ў супярэчнасьці сам з сабою.

Паскаль

Сьведамыя людзі ў дадзеным прадмеце праяўляюць болей адвагі, чымся нясьведамыя.

Плятон
Протаґорас, 350

У сьвеце вартасьцяў старажытнае спадчыны "ўсё вымерваецца нормаю духа, для якога дакананая рэч зьяўляецца малою, і вартасьцю розуму, які праявіў сябе ў ёй гэтак многа, і які ня шмат рупіцца пра суму атрыманае веды, але барджджэй праяўленьнем любові да веды, меней зьвяртае ўвагу на добрае палітычнае самакіраўніцтва, чымся на свабодны акт гераізму чалавека".

Ґілбэрт Маррэй

Сьвет людзей стала дасканаліцца, і сьведамасьць працэсу гэтага дасканаленьня творыць адну зь лепшых радасьцяў чалавека, і радасьць гэтая памнажаецца для кажнага чалавека яшчэ і сьведамасьцю свайго ўдзелу ў гэтым дасканаленьні.

Л. Талстой

Пазнай самога сябе.

Плятон
Протаґорас, 343

Той, хто ведае сябе, зьяўляецца скромным і не вымагае для сябе пахвалы людзей.

Х. Кэмпійскі

# П А Р А Ц Э Л Ь С У С

## Чалавек навукі шаснаццатага стагодзьдзя

## I493? - I54I

У аналізе выдарэньняў і людзей першае паловы XVI стагодзьдзя, культурных, філязафічных і рэлігійных плыняў гэтага часу, нашую ўвагу зьвяртае на сябе малаведамая яшчэ сягоньня ў нас постаць нямецкага вучонага, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Парацэльсус.

Філіпус Тэофрастус фон Гогэнгайм, званы Аўрэолюс Бомбастус Парацэльсус, лекар у мэдыцыне, альхімік і хімік, радзіўся ў I493 г. ў Айнзідэльн у Швайцарыі.

Усё, што мы чытаем зь ягонае біяграфіі, зьвяртае на сябе нашую ўвагу. Ягоныя падарожжы, напрыклад, прыпамінаюць нам падарожжы Доктара Францішка Скарыны. Гэтак, як у Скарыны, у Парацэльсуса выступае непераможная цяга да ведаў, досьледу. Гады жыцьця Парацэльсуса пакрываюцца з жыцьцём др Скарыны /I485-I540/.

Скарына і Парацэльсус жывуць у тым самым часе; яны бадай-што равесьнікі. Ці яны чулі нешта адзін пра другога? Ці ведаліся асабіста? Ці спатыкаліся калі-небудзь?Якія іхныя ўзаемадачыненьні, калі,наагул, гэтакія былі? Ці існуе які-небудзь сьлед гістарычных дадзеных, якія адказалі-б на нашыя пытаньні?

У сваім нахіле да пазнаньня Парацэльсус вучыцца на ўнівэрсытэтах, спачатку ў Базылеі, пасьля ў Вене, Фэррары /Італія/ і іншых.

Маючы прыродны нахіл да крытыцызму існуючага стану рэчаў, ён не здавальняецца наяўнасьцю асягненьняў у мэдыцыне і аддаецца новым пошукам, шуканьню новага, як ён кажа, мастацтва ў мэдыцыне, вырываньнем новых спосабаў лячэньня, як і новых лекаў.

Трымаючы на ўвазе гэтыя мэты, ён адбывае падарожжа па Эўропе, адведвае цэлы рад краінаў. У гэтым падарожжы ён прыбывае і ў Вялікае Княжства Літоўскае. Усюды, куды ён прыбывае, ён навязвае кантакты з адпаведнымі школамі, адведвае людзей, якія маюць якое-небудзь дачыненьне да мэдыцыны. Ён вучыцца сярод цыганоў і прыглядаецца іхнай практыцы. На Літве, праўдападобна, ён стыкаецца са знахарамі,

практыцы якіх ён хоча прыглядзецца і пазнаць тайніцы іхнага мастацтва ў мэдыцыне. Адведвае ён бедных і багатых з тым меркаваньнем, што ў кажнай ступені разьвіцьця мэдычнага мастацтва і тасаваных лекаў, ёсьць нешта з таго ўкрытага, што можа быць перанесеным у галіну мэдычнае навукі.

Парацэльсус жыве ў часе, калі навука, як мы яе сягоньня разумеем, знаходзіцца ўсё яшчэ каля сваіх вытокаў. Кажны этап разьвіцьця гэтае навукі мае сваё табу, якога з зайздрасьцю сьцерагуць людзі, апранутыя ў тогі аўтарытэту і да кажнае інавацыі ставяцца з падазраньнем. Ягоныя новыя лекі будзяць сярод калегаў засьцярогі. Ягоныя новыя і трапныя ідэі выклікаюць буру супраціву. - Усё гэта ўзятае разам стварае навакол Парацэльсуса сваеасаблівую атмасфэру, у якой апінія адносна яго самога скрайна розьнілася, а сам Парацэльсус плоціць за гэта сваім жыцьцём.

Тымняменей у гадох 1526-1528 Парацэльсус стаецца прафэсарам фізыкі і хірургіі на Базылейскім Унівэрсытэце і здабывае славу вучонага.

Парацэльсус меў аграмадны ўплыў на сваё стагодзьдзе і стагодзьдзі наступныя. І, ня гледзячы на тое, што ягоная навука была насычана фантастычнаю філязофіяю ягонага часу, тымняменей, ён быў арыгінальным думаньнікам і дасьледвальнікам. Ён зьвяртаў увагу на хвальш існуючы ў мэдычнай тэорыі і супроцьставіўся гумаральнай тэорыі хваробаў. Ён навучаў тасаваньне адумысных лекаў замест няяснага і агульна прынятага ў тыя часы кроваспусканьня і паслабляючага сродка. Ён увёў новыя лекі - опіум, ртуць, сульфар, жалеза і аршэнік. Ягонае лячэньне было слаўным на тыя часы, якое ён прыпісваў вялікім людзям, сярод якіх, як кажыць, быў Эразм з Ротэрдаму.

Ён быў аўтарам лічных працаў з галіны мэдыцыны і окультызму, які ў тым часе ўважаўся за галіну навукі і вязаўся з мэдыцынаю.

=

Парацэльсус пражыў сваё жыцьцё ў шляхэтным высілку лячэньня іншых і выкрыцьця тайніцаў натуры, і ў тым самым часе, калі ён займаўся гэтаксама і окультызмам, ён меў чысьленыя ідэі, якія паказвалі ў правільным напрамку разьвіцьця мэдычнае навукі. Бяручы пад увагу ўсе ягоныя асягненьні і падтрымліваньне філязофіі праґрэсу, ён быў чалавекам вартым, каб увайсьці ў лік думаньнікаў рэнэсансовага веку.

Характэрнаю прыкметаю ўсіх праґрэсыўных людзей ёсьць тое, што ў думках сваіх, аналізе і высновах, яны выпярэджвалі сваіх сучасьнікаў на некалькі або і на некалькі дзесяткаў стагодзьдзяў.

Чытаючы спадчыну Парацэльсуса, асабліва тыя месцы, дзе ён гаворыць пра фірмамэнт, атрымліваецца ўражаньне, што жыве ён не ў шаснаццатым стагодзьдзі, але ў нашым часе і думае катэґорыямі гэтага часу.

Ісьледваньне сягоньня атмасфэрычнае прасторы зьвязана з асаблівымі натугамі са стараны чалавека і адбываецца яно ў духу прынцыпаў, пакінутых нам Парацэльсусам.

Як часта здараецца ў падобных выпадках, з прычыны сваіх паглядаў ён будзіў навакол сябе зайздрасьць, упярэджаньне і зьнеахвочаньне. У 1541 годзе ён наведаў аднаго лекара ў Зальцбургу ў Аўстрыі. У выніку ўзбуджанае гутаркі Парацэльсус быў папхнуты слугою гаспадара і выпаў праз вакно вышэйшага паверху. Акалечаньне аказалася паважным. Хутка пасьля гэтага Парацэльсус памер у Зальцбургу ў тым-жа 1541 годзе. 211 гадоў пазьней, бо ў 1752 г. жыхары Зальцбургу ўшанавалі памяць вучонага, ставячы яму помнік.

=

Парацэльсус кажа:

Я пастанаўляю сьледаваць за найболей шляхэтнаю і высокаю філязофіяю і не дапусьціць, каб што-небудзь магло адхіліць мяне ад яе... Я ня буду займацца тым, што ў чалавеку ёсьць сьмяротным, але я буду разважаць толькі аб тым, што ў ім не памірае: бо гэта ёсьць тым, што мы вызнаем за найвышэйшую філязофію.

З самых раньніх дзён майго жыцьця я сьледаваў за гэтымі рэчамі і пераймаў іх ад маіх вычыцяляў, якія поўнасьцю абаснованымі былі ў adepta philosophia+/ і дасьведчанымі ў гэтым мастацтве. Перш за ўсё, ад Вільгэльма Фон Гогэнгайма, майго бацькі, каторы ніколі мяне не пакідаў, а пазьней ад вялікае колькасьці іншых, якіх ня буду тут успамінаць, гэтаксама як і з старанна выпрацаваных твораў старажытных і сучасных пісьменьнікаў розных земляў.

---

+/ Ведамае калісьці сярод альхімікаў выражэньне. Адносілася да некага, хто думаў, што выйнашоў камень мудрасьці або панакею ці ўнівэрсальны сродак або лек.

На працягу многіх гадоў я студываваў на ўнівэрсытэтах Нямеччыны, Італіі і Францыі, шукаючы важнасьці асновапаложаньня мэдыцыны. Аднак я не знайшоў належнага заспакаеньня ў іхных навуках пісьменнасьці і кнігах, і адбываў мае падарожжы да Ґрэнады і Лісбоны, праз Гішпанію і Англію, праз Брандэнбурґію, Прусыю, Літву, Польшчу, Вугрыю, Валахію, Трансыльванію, Кроацыю, Вэнэдыйскую правінцыю і іншыя краіны, вылічваць якіх тут нямашака патрэбы, і ўсюды, кудыколечы я ішоў, я прагнаісьледаваў і прыглядаўся выпрабованым і пэўным захадам мэдыцыны. Я ня толькі ішоў да дактароў, але гэтаксама да цырулікаў, баншчыкаў, вучоных лекараў, жанчын, знахараў, якія займаліся мастацтвам лячэньня; я ішоў да альхімікаў, у манастыры, да шляхты, як і да простых людзей, да рэчазнаўцаў і звычайных... Часта я знаходзіў, што мэдыцына зьяўляецца няпэўным і прыпадкавым мастацтвам, насілу ганараваным у практыцы, вылечваючым аднаго, і забіваючым дзесяць...Некалькі разоў я пакідаў мэдыцыну і аддаваўся іншым заняткам, але пазьней зноў вяртаўся да яе. Бо я прыпамінаў сабе Хрыстовыя словы: Здаровы не патрабуе лекара, але хворы. Тады я нанова пастанаўляў вярнуцца, інтэрпрэтуючы Хрыстовыя словы ў тым сэнсе, што мастацтва мэдыцыны ёсьць правільнае, справядлівае, пэўнае, дасканалае і суцэльнае, і ў ім нічога няма, што павінна адносіцца да махлярства духаў або прыпадкавасьці, але што мэдыцына зьяўляецца мастацтвам, выпрабаванам у патрэбе,карысным для ўсіх церпячых і добраслаўленьнем у вярненьні ім здароўя.

Вось мая прысяга: Дасканаліць маё мэдычнае мастацтва і ніколі ня ўхіляцца ад яго гэтак доўга, як доўга Бог пасылае мне мой урад, і супроцьставіцца кажнай хвальшывай мэдыцыне і навуцы. Тады, любіць хворага, кажнага ў вапрычонасьці і ўсіх разам, болей чымся, калі-б ішло пра маё ўласнае цела. Ня судзіць нічога павярхоўна, але толькі на падставе сымптомаў, не даваць ніякіх лекаў без зразуменьня, ня прыймаць ніякіх грошай без пачуцьця запрацаваньня іх. Не давярацць ніякаму аптэкару, ня чыніць ніякага гвалту над дзіцем. Не здагадвацца, але ведаць...

=

Я не зьяўляюся апосталам або чым-небудзь падобным да апостала, але філёзафам у нямецкай манеры.

Тут я ня маю жаданьня філязафаваць або гаварыць пра пасьлясьмертнае жыцьцё, за выняткам таго, як

гэта можа быць чынена ў сьвятле натуры. Я чакаю на завяршэньне мае спадзеі; няхай перш даканаецца маё ўласнае збаўленьне праз маю веру ў Збаўцу, і тады будзе час пераказаць гэта іншым.

І хоць я выказаў тут у паганскі спосаб, як многія будуць думаць, хоць я і называю чалавека зьверам, ня ўкрытым астаецца перада мною, і ведаю вельмі добра, што розьніца паміж чалавекам і зьверам ляжыць выключна ў выражэньні твару і духа. У гэтым я мушу сьведчыць перад Богам.

=

Чалавек і праца.

Ня воля адна, але воля і чын твораць дасканалае асягненьне.

Усе рэчы на зямлі аддадзены ў рукі чалавека. І яны дадзены ў ягоныя рукі з мэтаю, каб ён прывёў іх да найвышэйшага разьвіцьця, гэтак, як зямля чыніць з усім, што яна выяўляе. Але гэтае найвышэйшае павінна быць для чалавека найніжэйшым; гэта зерне, якое ён трымае, каб ператварыць у нешта большае.

Нічога ня створана па-за людзкім зглыбленьнем. І кажная рэч створана з мэтаю, каб чалавек не аставаўся бясчынным, але хадзіў у сьцежцы Божай, інакш кажучы, у Ягонай працы, а не ў недахопе, не ў чужалостве, не ў газартнай гульні, і ня ў піцьці, не ў грабежніцтве, не ў здабываньні дабра, не ў награмаджаньні скарбаў для чарвей. Каб напасьледак ён мог дасьведчыць Божы дух, Ягонае сьвятло, і Ягоныя анельскія пуцьцявіны ўва ўсіх рэчах, якія маюць Божую натуру. Болей дабраслаўленым ёсьць пісаць пра німфы, чымся пра экклезыястычную герархію, болей дабраслаўленым ёсьць пісаць пра паходжаньне волатаў, чымся прадворскія этыкэты, болей дабраслаўленым ёсьць выслаўляць Мэлюзіну, чымся кавалерыю і артылерыю, і болей дабраслаўленым ёсьць гаварыць пра працуючых у капальнях вугля пад зямлёю, чымся пра турнамэнты і рыцарства. Бо ў першых дух дзейнічае ў боскіх працах, тады, як у вапошніх дзейнічае ў сьвецкіх рэчах, каб здаволіць сьвет у турбоце і брудзе.

Глядзеце на зёлкі! Іхныя добрыя якасьці зьяўляюцца неспасьцярожнымі, а ўсё-ж яны могуць быць выкрытымі. Глядзеце на зьвераў, якія ня могуць гаварыць і паясьніць ніякае рэчы, і ўсё-ж нічога не зьяўляецца ўкрытым у іх, каб чалавек ня мог навучыцца з гэтага. Нічога няма на зямлі або ў водах,

у хаосе або на фірмамэнце, што́ ня выявілася-б у адпаведным часе. Божаю волею гэта зьяўляецца, што нічога не астаецца ўкрытым перад чалавекам, калі ходзіць ён у сьвятле натуры; бо ўсе рэчы, якія належаць да натуры, існуюць для дабра чалавека. І дзелятаго, што яны створаныя для дабра чалавека, і дзелятаго, што ён патрабуе іх, ён мусіцьісьледаваць кажную рэч, якая знаходзіцца ў натуры.

Не ляжыць гэта ў волі Божай, каб Ягоныя тайніцы былі спасьцярожнымі; зьяўляецца гэта Божаю волею, што яны стаюцца выражанымі і пазнанымі дарогаю працы чалавека, каторы створаны дзеля таго, каб учыніў іх спасьцярожнымі. Гэтак, як Хрыстос, каторага ніхто не ўзнаваў за другую асобу Тройцы, быў уважаны кажным за чалавека, бо тое, чым Ён фактычна быў, аставалася неспасьцярожным... Бо Бог ёсьць выразіцелем усяго таго, што знаходзіцца ўкрытым ува ўсіх рэчах... Ня інакш дзеецца і з чалавекам. Ніхто ня бачыць, што́ ўкрыта ў ім, але толькі тое, што́ выражаецца ягонымі чынамі. Затым чалавек павінен працаваць бязупынна, каб адсланіць тое, што Бог даў яму... Гэтаксама і мы павінны выявіць тое, што́ Ён уклаў у нас, з мэтаю, каб няверыючыя маглі бачыць што́ Бог можа даканаць праз чалавека.

Хрыстос накладае на нас абавязак, які павінен быць для ўсіх нас дарагаўсказам і які мы заўсёды павінны імкнуцца выканаць. Ягоныя загады і навука адносяцца ня толькі да вечнага сьвятла, але гэтаксама і да сьвятла натуры. Ён узмацняе нас: "Шукайце, і знойдзеце". Нашаю задачаю ёсьць шукаць мастацтва, бо бяз шуканьня яго мы ніколі не пазнацімем тайніцаў сьвету. Хто можа пахваліцца, што смажаны галубок ляціць яму ў рот? Або, што вінаграднае віно цячэ за ім? Ты мусіш самісьці да яго. Шукаць мы можам рознымі спосабамі:... але шуканьне , якое зьяўляецца патрэбным тут, адносіцца да рэчаў, авеяных тайніцаю. Калі мэта шуканага сукрыта, дык і манера шуканьня гэтаксама зьяўляецца сукрытаю; дзелятаго, што веда зьяўляецца свомаю мастацтву; той, хто шукае мастацтва, гэтаксама шукае веду ў ім.

Усе рэчы дадзены ў рукі чалавека, хоць ён часта і ня чыніць стараньня атрымаць іх; яны растуць без ягонае помачы. Жалезная руда ўспрыймае хворму бяз людзкае помачы, гэтаксама і кветкі. Але, калі ён хоча карыстацца імі або радавацца, ён мусіць пашырыць працу над імі. Бо хоць жалеза ёсьць жалезам, яно не зьяўляецца ў самым сабе лямешам да плугу або цясьлярскаю сакераю. Хоць зярно і значыць хлеб,яно

ўсё-ж не зьяўляецца гатовым да спажываньня як хлеб. Гэтак рэч маецца з усімі прадуктамі; Бог даў іх нам, каб праз іх мы маглі абясьпечыць нас самых, і Ён гэтаксама даў нам мастацтва, якое мы патрабуем дзеля гэтае мэты. Дзелягэтага мы мусім быць дасьведчанымі ня толькі ўва ўсіх расьлінах натуры, але гэтаксама і ў мастацтве, якім Бог надарыў нас з мэтаю прыгатаваньня іх. У практыкаваньні гэтым мы мусім вытрымаць пробу, і, будучы натуральнымі целамі, мы мусім у часе нашага трываньня на зямлі быць ведзенымі сьвятлом натуры. Ня будзьма бясчыннымі або аддадзенымі мроям, але заўсёды пры працы, гэтаксама фізычнай як і духовай, гэтак, каб ніякая частка з нас ня была бясчынный. Гэтакая праца ў поце чала́ можа нават адагнаць дыявала і ягоныя сілы, бо дзе чалавек знаходзіцца пры працы, нічога з гэтага ня можа астацца пры ім.

=

Кажная рэч, якая знаходзіцца ў васяродзьдзі, можа быць пазнанаю тым, што ўвыпукляецца навонкі.

Воляю Божаю не зьяўляецца, каб усё, што Ён стварыў для дабра чалавека і перsucceedаказаў яму, як ягонае ўласнае, аставалася сукрытым... І нават, калі Ён і сукрыў нёкаторыя рэчы, Ён не пакінуў нічога неабазначаным, але вывеў усе рэчы навонкі, азнаменаваў спасьцярожнымі знакамі, адумыснымі сьледамі - гэтак, як робіць чалавек, які, схаваўшы скарб, абазначае знакам месца, каб можна было знайсьці яго зноў.

Мы можам знайсьці кажную рэч, якая ляжыць сукрытаю ў горах дарогаю вонкавых прыкметаў і паказьнікаў, гэтаксама, як мы знаходзім усе свомасьці ў зёлах, як і кажную рэч, якая знаходзіцца ў камяньні. Нічога няма ў морскіх глыбінах, нічога на вышынах фірмамэнту, чаго-б чалавек ня мог знайсьці. Ніякая гара́ ці скала не зьяўляецца гэтак аграмаднаю, каб магла схаваць ад вачэй чалавека або запячатаць тое, што знаходзіцца ў ёй; выкрываецца гэта перад ім адпаведнымі знакамі... Бо кажны плод зьяўляецца знакам... Падобна гэтаму нічога няма ў чалавеку, што-б ня было абазначаным навонкі, з тым, каб пры помачы вонкавага, чалавек мог выкрыць тое, што знаходзіцца ў натуры індывідууму, які носіць гэтыя знакі...

Я. Пятроўскі

ЛЮБОЎ

Воля Бога ў тым, каб мы жылі жыцьцём і шчасьцем адзін аднаго, а не ўзаемным няшчасьцем і сьмерцяю. Людзі памагаюць адзін аднаму сваею радасьцю, а не горам.

Джон Рёскін

Нічога гэтак не ўмацоўвае жыцьця, як успрынятая прывычка быць добрым.

Л. Талстой

Людзі народжаныя адзін для другога. Затым, або ўсьведамляй іх або знось цярпліва.

Марк Аўрэліюс

Сіла дадзеная чалавеку не затым, каб ён уціскаў слабога, але каб ён падтрымліваў яго і памагаў яму.

Джон Рёскін

Усё зьвязваецца і ўтрымліваецца дабром.

Сакратас

Найвышэйшым градусам лякарства зьяўляецца любоў. Гэта якраз любоў ёсьць, што вучыць мастацтва і паза межамі любові не народзіцца лекар. Шаптаць, саладка гаварыць – гэта заданьне вуснаў; але памагчы, быць карысным – гэта заданьне сэрца. Лекар расьце ў сэрцы, ён выводзіцца ад Бога; ён зьяўляецца натуральным сьвятлом набытага дасьведчаньня. І дзе-б мы ня шукалі большае любові сэрца, мы большае ад лекара ня знойдзем.

Парацэльсус

А цяпер трываюць гэтыя тры: вера, спадзея, любоў; але большая зь іх любоў.

І Кар. 13:13

Шчасьце людзей не ляжыць на дарозе веды, але на дарозе веды, плюс любоў.

Я. Пятроўскі

Вучоныя ў нашых днях паважна затрымліваюцца над тым, дзе і як перахаваць тое, што́ чалавек, дзякуючы сваей ведзе, стварыў. "Бо гэта ў пяршыню", як адзін з вучоных кажа, "чалавек творыць нешта, што́ ня можа быць зьнішчаным у неабходным часе – радыёактыўны матэрыял. Спаліць яго ці ўтапіць – нічога не паможа... Выкінутыя матэрыялы ў хворме розных

адпадаў, пераважна хутка раскладаюцца, але што рабіць з тымі, якія не раскладаюцца". Напрыклад, - "тэхнэтыюм - элемэнт №43 - толькі напалавіну пера-гарае пасьля чатырнаццаці тысяч гадоў, а радыё-актыўны вуглярод - пасьля пяці тысяч гадоў. Яго трэба пільнаваць, каб нічога ня згубілася. Калі яговая радыёактыўнасьць пранікне ў біялягічныя арганізмы, уключна з чалавечым, яна зьнішчыць іх".

Ян Пятроўскі

Тэалёгам немагчыма пагадзіцца з фактам унівэрсальнага скандалу: гутарка тут пра тое, як людзі могуць спакойна жыць на Зямлі, ведаючы, што яны жывуць пад абухам нуклеарнага расшчапленьня, атручаньня радыёактыўным сьмерцяносным пылам, вадародных бомбаў, саталітаў і міжплянэтарных ракетаў.

Мэрі МкКарті

Разумны чалавек любіць не затым, што гэта выгадна яму, а затым, што ў самой любові ён знаходзіць шчасьце.

Улас Паскаль

Хто запраўды любіць Бога, той ня будзе імкнуцца да таго, каб Бог любіў яго.

Сьпіноза

Найдасканальшы зь людзей той, хто любіць усіх бліжніх сваіх і робіць ім дабро бяз розьніцы, добрыя ці дрэнныя яны.

Ляо-Тсэ

Хто кажа: я люблю Бога, а брата свайго ненавідзіць, той хлус; бо хто ня любіць брата свайго якога бачыць, як можа любіць Бога, Каторага ня бачыць?

І Пасл. Іоана, 4:20

Людзкія існаваньні нішчаць адзін другога, але ў тым самым часе існаваньні любяць і дапамагаюць адзі аднаму. Жыцьцё падтрымліваецца не захопленьнем разбурэньня, але пачуцьцём супольнасьці, якое на мове нашага сэрца называецца любоўю.

Л. Талстой

Толькі ўзбольшаньне любові між людзьмі можа зьінначыць існуючы грамадзкі лад.

Л. Талстой

І іншае багацьце, як золата, серабро і гэтак далей, аб чым мы толькі-што гаварылі, яны часамі зьяўляюцца дабром, а часамі - злом; яны стаюцца карыснымі або шкоднымі у залежнасьці ад таго, як душа кіруе імі - правільна ці няправільна. Гэтак і рэчы самое душы зьяўляюцца карыснымі, калі знаходзяцца пад уплывам розуму, і шкоднымі - пад уплывам бязмыснасьці.

Плятон
<u>Мэнон</u>, 88

Сіла любові ў тарнаваньні да вялікіх пытаньняў людзкіх супольнасьцяў сталася ўстарэлаю і забытаю. У лічаных выпадках у гісторыі яна тасавалася зь вялікім посьпехам. Але надыйдзе час, калі любоў станецца агульным правам жыцьця людзей, і ўсе злыбяды растопяцца ўва ўсеагульным сьвятле сонца.

Эмэрсон

Перамагай разьюшанасьць любоўю, адказвай дабром на зло, скупасьць перамагай шчодрасьцю, хлуса - словам праўды.

З буддыйскае мудрасьці

Перад тым як чалавек знойдзецца ў стане любіць, гэта значыць, ахвяруючы сябе, тварыць дабро, ён павінен перастаць ненавідзець, г. зн. - чыніць зло, і перастаць уважаць адных людзей лепшымі за іншых, маючы на ўвазе сваю выгаду.

Л. Талстой

Любеце ворагаў вашых і ня будзе ў вас ворагаў.

Навука 12 Апосталаў

Найболей дасканалы зь людзей той, хто любіць усіх блізкаіх сваіх і творыць ім дабро бяз розьніцы на тое, добрыя яны ці дрэнныя.

Магамэт

Далікатнымі словамі і дабрынёю можна на валаску весьці слана.

Гулістан Садзі

Мудры чалавек сказаў: навука мая простая, і сэнс яе лёгка зразумець. Яна заключаецца ў тым, каб любіць бліжняга, як самога сябе.

Кітайская мудрасьць

## НІХТО ЦЯБЕ НЕ ЗАПЫНІЦЬ

Над Арлом бушавала мяцеліца. Заўчасна пацямнела.

Трамвай скавытаў на заваротах і пры стрыме, зь месца крануцца не хацеў, стагнаў і ўздрыгваў усім прамерзлым целам ды, падсьцёбваны электрычнай пугай, зрываўся ткі йсьці, але ледзь цягнуў чыгунныя ногі па засьнежаных рэйках. Пасажыры, пераважна работнікі і работніцы, што варачаліся з працы, сядзелі моўкна. Толькі час-часам хто-небудзь моцна кашляў ды пастукваў нагой аб ногу. На кажным прыпынку колькі чалавек, наставіўшы каўняры й сьцепануўшыся бы ў трасцы, пасьпешна скакалі праз дзьверы ў шэра-белую каламуту. У трамвай урываўся сьцюдзёны вецер і біў у твар калючым сьнегам. Трамвай хутка спаражняўся. У ім засталіся толькі двое пасажыраў: Кастусь Зімёнак і дзяўчына ў белай вязанай шапачцы. Кастусь рады быў, што ён не адзін, што мае спадарожніцу, але хутка й гэтая радасьць, бліснуўшы на Кастуся прыгожымі вачыма, подскакам забарзьдзіла да дзьвярэй. Кастусь астаўся адзін. Каб неяк разьвеяць самоту, адчапіцца ад цяжкіх думак, ён хукаў на замерзлую шыбіну, прыглядаўся да кандуктаркі, як тая лічыць грошы, пераводзіў пагляд на павадырку трамваю, маладзейшую за кандуктарку, без барадаўкі на носе, але не яны, а тая студэнтка зь інстытуту, стаяла перад вачыма, а ейныя словы зьвінелі ў Кастуся ў вушах: "Вольгі няма... Вольга паехала дадому... Вольгінага бацьку арыштавалі..."

Трамвай зноў заскрыгатаў і спыніўся.

– Вам куды, таварыш? – папыталася сіплым голасам кандуктарка.

– Мне куды?.. Ды мне, ведаеце... Куды-ж гэта мне?.. А як гэты спынак завецца?..

– Гэта Кальцо...

– А... Кальцо?.. А мне трэба ў Пэдінстытут... Ага, туды мне трэба...

– Пэдінстытут застаўся далёка, далёка ззаду. Вам трэба ехаць назад.

– Назад?.. Вось і добра... Я паеду назад. Дайце мне білет!

– Мы назад не паедзем... У трамвайны парк папхаемся...

- Дык я зьлезу... Я пайду пехатой... Я зьлезу...

Кастусь скочыў па калені ў сьнег. Вецер заскавытаў, шугануў халодным шротам у твар, грымануў магутным кулаком у грудзі. Кастусь падставіў ветру сьпіну й пайшоў паўз драўляны плот, сам ня ведаючы куды.

- Ня ў той бок ідзеш, таварыш!.. Інстытут ня ў тым баку...

Гэта гукала няпрыгожая, але спагадлівая кандуктарка трамваю. Кастусь падзякаваў у сэрцы за спагаду, але парады яе не паслухаўся, бо ў ніякі інстытут яму йсьці ня трэба было. Ён толькі адтуль... "Вольгі няма... Вольга паехала дадому... Вольгіна-га бацьку арыштавалі..." - зьвінела ў Кастуся ў вушшу. - "І трэба-ж так скласьціся? Ня суджана мне, мабыць, выбіцца ў людзі. Нешчасьлівая мая зорка-апякунка. Ах, лепей ня думаць, а йсьці да йсьці насупраць завірусе, насупраць ночы. А там? Нешта-ж будзе, недзе нешта будзе..."

Доўга йшоў Кастусь і перадам, і задам наперад, пакуль не напароўся на нейкую жэрдку. Трымаючыся левай рукой за яе, пайшоў у левы бок, але вецер так хвастаў сьнегам у вочы, што давялося перамяніць думку і йсьці ў правы бок. І добра зрабіў, што пайшоў управа. Жэрдка прывяла яго да якойсьці нізенькай, пахілай хаткі. Засыпаная сьнегам, яна суцьмяна паблісквала праз сьнежную шугу адным невялічкім ваконцам. Вецер бегаў наўкол хаткі подскакам, злаваў і пагражаў, быццам Кастусь перашкаджаў яму тынкаваць сьцены, маляваць дзьверы. Вось ён ускочыў на страху й шугнуў, бы з рукава малатарні, калючай пацярухай, перамешанай з горкім дымам і водарам нейкай стравы. Кастусь, ня доўга думаючы, перахрысьціў парог незнаёмай хаткі. У твар дыхнула цяплом, потым гноем.

- Добры вечар!

- Добры вечар, - азваўся мяккі напеўны жаноцкі голас. - Праходзьце на тую палавіну.

Кастусь працёр залепленыя сьнегам вочы. Цяпер ён бачыў печ, каля печы карову, а каля каровы жанчыну. Печ палілася. Сьветлы сноп сьвятла зь печы крыжаваўся з другім снапом, што выходзіў з падаўгаватага прастакутніка насупраць Кастуся. Праз гэты прастакутнік Кастусь прайшоў у другі пакой, асьветлены ліхтаром-"начніцай". Ліхтар стаяў на нізенькім століку, за якім сядзеў сухарлявы, няпрычэсаны рыжы чалавек з малатком у руцэ й шылам у зубах. Паміж каленаў ён трымаў бот. Заскарузлымі кароткімі

пальцамі ён брау з бляшанкі драуляныя цьвікі й спрытна заганяў іх у чорную гумовую падэшву, выкраеную з аўтамабільнай шыны. На прывітаньне шавец штось мармытнуў і страсянуў рыжай трасянкай на галаве. Відаць, ён вельмі сьпяшаўся скончыць падбіваць падэшву, бо на Кастуся ня браў увагі. Кастусь тым часам аглядаў пакой. Нічога ў ім ня было. Голыя, даўно ня беленыя сьцены, такая-ж брудная закураная столь; падлога чыстая, але старая, папрагніваная. У куце на падлозе добры ахапак перацёртай саломы. У другім куце стол, над сталом невялічкі абразок - Ісус Хрыстос нясе крыж... Галеча выглядала з кожнага кутка, але Кастусь рады быў, што трапіў сюды,у цяпло, вырваўся з халодных абдымкаў завірухі. Яна няўтомная, напаміналa аб сабе грукатам аканіцаў аб сьцяну ды прыглушаным стогнам і падвываньнем. Ногі Кастусёвы пазаходзіліся з пары, і ён пераступаў з нагі на нагу, варушыў пальцамі, але боль ня суніма ўся. Кастусю рабілася то горача, то зябка, ён сьціскаў зубы, корчыўся. Шавец спасьцярог, што Касстусю нядобра. Малаток павіс у паветры.

- Табе нядобра, хлопча? Што з табой?

Голас у шаўца грубаваты, але задушэўны. Словы ягоныя, быццам ёд па ране, прайшліся па Кастусёвым сэрцы.

- Нічога, ня турбуйцеся, - спыніў Кастусь шаўца, які памкнуўся ўставаць. - Ногі крых пазаходзіліся з пары.

- О, гэта не вялікая бяда. Цярплівасьці, і ніякіх лекаў. І ніякіх лекаў, - паўтарыў шавец, настаўляючы ў дзірачку цьвік. Неўзабаве ён паклаў бот на столік, устаў з услончыка й падаў яго Кастусю. З радасьцю Кастусь ня сеў, а паў на ўслончык. Яму адразу нейк палягчэла. Пальцы ног яшчэ пяклі, але ня гэтак, як раней.

Шавец падыйшоў да вакна, зірнуў на замураваныя лёдам шыбы, паглядзеў на абразок у куце і ўставіўся падсьлепаватымі вачыма ў Кастуся.

- Чым магу служыць? - выразна, з паўзамі пасьля кожнага слова, папытаў шавец.

- У мяне да вас адна толькі просьба, - стараючыся як мага быць спакойным, прагаварыў Кастусь: - Не выганяйце мяне, дазвольце пераначаваць...

- Добрых людзей ніхто ня выганяе, - усё гэтак-жа гледзячы на Кастуся й выразна сказаў шавец. Гэтыя словы ўскрылілі Кастуся, і ён пастанавіў расхрыстаць, як кажуць, перад гэтым добрым, як яму здавалася, чалавекам душу.

- Я ня ведаю, добры я ці не, але што я нешчасьлівы, гэта ведаю вельмі добра. Я ня...

- Тым болей, - перапыніў Кастуся шавец, - нешчасьлівым я рады дапамагчы, бо, як бачыш, і сам я ня вельмі з шчасьлівага дзясятку.

- Шчыра дзякую!

- А адкуль будзеш сам?

- Я ня тутэйшы. Радзіўся на Беларусі...

- Раскулачаны? - нейкім адменным, хітраватым голасам папытаў шавец. Кастусь крыху сумеўся. Хацеў зманіць, але перадумаў.

- Не, я не раскулачаны...Я -контррэвалюцыянер...

Рыжая трасянка зашумела, здалося Кастусю, на галаве шаўца. Кастусь думаў, што шавец адчыніць яму дзьверы й "папросіць", але памыліўся.

- Ого, - агаліў шавец шчарбатыя зубы, - які-ж ты контррэвалюцыянер, калі на табе, як кажуць, яшчэ пух не апырыўся...

- Не апырыўся, гэта праўда, але крыльле ўжо паабціналі...

Шавец схапіў боты пад паху, сказаў Кастусю пачакаць і выйшаў пасьпешна на кухню. Там ён штось гаварыў паціху з жонкай, але Кастусь ня мог расчуць іхных словаў. Пасьля невялікае паўзы зарыпелі прамерзлыя надворныя дзьверы."Пайшоў дакладаць,куды трэба, - падумаў Кастусь. - І няхай ідзе..Толькі-б далі чаго-небудзь зьесьці..."

Быццам адгадаўшы Кастусёвы думкі, з чыгунчыкам варанае неабіранае бульбы ў руках прыйшла невялікага росту жанчына. Худая, зморанай, яна ледзь соўгала нагамі ў пакрыўленых шэрых валёнках. Паставіўшы чыгунок на стол, яна неяк нязграбна, няўмела ўсьміхнулася й запрасіла Кастуся да стала. Кастусь не адмовіўся: ад раньня каліва ў роце ня меў. Гаспадыня прынесла талерку салёных гуркоў, акрайчык чорнага хлеба й конаўку сырадою.

- Ежце, не саромцеся! Будзьце, як дома! - ласкава сказала жанчына.

- А як-жа вы, ваш гаспадар? - папытаў Кастусь дзеля ветлівасьці, а болей, каб даведацца, куды пайшоў шавец.

- Мы пасьля павячэраем, як вернецца дамоў. Ён зараз і назад, аддасьць толькі боты суседу, бо таму заўтра няма ў чым на рабату выйсьці.

Пастаяўшы крышку, яна пайшла на кухню ізноў, вярнулася з каўдэркай і паклала яе на салому ў куце.

- Павячэраеце й кладзецеся адпачываць. Змарыліся, пэўна?

– Прызнацца, і добра стаміўся. Вельмі-ж вецер ня пушчаў ды сьнег за ногі прытрымваў, – спаэтызаваў Кастусь, абіраючы гарачую бульбіну. Жанчына паспачувала Кастусю, пажадала добрай ночы й зачыніла за сабою двупалавічныя дзьверцы. Кастусь вобміргам спаражніў чыгунок і талерачку, але малака й хлеба не зачапіў, бо не хацеў крыўдзіць гэтых бедных, а добрых людзей.

– Вось-бы цяпер зацягнуцца дымком, і болей нічога ня трэба было-б, – уздыхнуў, кладучыся на салому.

Гаспадыня шорхала на кухні валёнкамі, трашчэлі дровы ў печы, вецер намагаўся паваліць хатку. Шумы й колеры перамяшаліся, закружыліся, і Кастусь кудысь праваліўся...

Шырака, як вокам сягнуць, белае йскрыстае мора... Бягуць, пераліваюцца сьсіня-залацістыя хвалі. Мароз пячэ ў скроні, хапае за вушы, лезе ў рукавіцы, за каўнер. Ідуць сьнежныя дзяды, ідуць...

– Гэта Усурыйскі край, – кажа нехта.

– Вунь там бялеюць баракі, – чуваць слабы голас.

– Баржджэй-бы дабрацца да юрцаў...

– Хоць-бы баланды якой далі...

Галасы слабеюць, аддаляюцца. Кастусь ляжыць у сьнезе, ня можа ўзьняцца. Рыгор Грэчка бярэ яго пад пахі, падымае... – Давай уцякаць, – кажа Грэчка. – Тут нам канцы будуць. – Уцякаць, толькі ўцякаць!.. – І яны бягуць па сьнежных хвалях, праз тайгу дрымучую, праз рэкі шырокія... Невялічкая чыгуначная будыніна. "Тайга" – чытае Кастусь. Зьвіняць рэйкі, варушацца шпалы. "Цягнік", – крычаць людзі і бягуць, бягуць... І Кастусь бяжыць... Куды мы бягом? – пытае Кастусь у Рыгора. – У Маскву,браце, у Маскву... Глядзіць Кастусь – "Белорусский вокзал" – напісана на сьцяне чырвонымі літарамі. У вялікай чакальні няма ні душы, адно таўшчэзныя каменныя слупы трымаюць столь. – Переначуем тут, – кажа Рыгор, – а заўтра раненька я да роднай жынкі, а ты да матуленькі підэмо..."

Кастусь здымае чаравікі, кладзе пад галаву й абдымае калянаду... Моцны ўдар у сьпіну... Касматая рука хапае Кастуся за каўнер, падымае высака, высака й шпурляе ў вялізарныя дзьверы. "Чаравікі падайце, чаравікі я пакінуў пад каляндай!" – крычыць Кастусь. Празь дзьверы высоўваецца чорная галава зь вялікім гарбатым носам і чорнымі вусамі: "Ха-ха-ха-ха!.." – рагоча чорная галава. – Я думаў,мой камрад Адольф прыехаў, аж гэта шпана, шпана прыпер-

лася..." Галава зьнікае.

- Што гэта ён, гэты Еська казаў? - пытае Кастусь у Рыгора. Маўкліня. Глядзіць Кастусь - Рыгора нідзе няма, а сядзіць за сталом начальнік ГПУ...

- Сягоньня сьвята кастрычніцкай рэвалюцыі, - кажа начальнік. - Прыяжджаюць да нас замежныя госьці. Сам вялікі Сталін прыйшоў іх сустракаць, а вы, вуркаганы, хавіру на беларускім вакзале знайшлі, ці што? Каб за 24 гадзіны і нагі вашай тут ня было! - Кастусь рады, што гэтак параўнальна мякка зь ім абыйшоўся начальнік, што яго, контрыка, у вуркаганы залічыў... Але ня тут тое было. "Ты чаму утаіў пры залічэньні ў інстытут, што быў у канцлягеры? - пытае ў Кастуся начальнік. - Ты думаеш, што мы цябе ня знойдзем? Мы ўсё ведаем, мы й рэкі пад зямлёю бачым!.. Марш, контра, адсюль і на вочы мне не пападайся!.. - Бяжыць Кастусь, што сілы стае, на станцыю, а ногі ня слухаюцца, бег на месцы выходзіць.

- Бяжы барждзжэй у Арол! - чуе Кастусь Рыгораў голас. Азірнуўся - Мікола, ягоны сябра, студэнт пэдінстытуту стаіць, а Рыгора нідзе няма.

- У Арле табе дапаможа Вольга, мая дзяўчына... Барждзжэй бяжы!..

Кастусь ляжыць на рэйках, слухае, ці хутка прыйдзе цягнік... Маўчаць рэйкі. Падняўся Кастусь, каб далей бегчы, а цягнік ляціць за пару крокаў праcьцютка на яго...

- Ратуйце!..

Усхапіўся Кастусь і ачумела азіраецца...

- Цьфу, прападзі ты!.. І прысьніцца-ж такая чартаўня!

У хаце ціха й сьцюдзёна. Праз замерзлыя шыбы слаба прабіваюцца чырвоныя прамяні. "Завіруха ўляглася", - з задаваленьнем канстатуе Кастусь і піхае нагамі шэрую каўдэрку. На стале - акрайчык хлеба, конаўка... Кастусь памкнуўся да стала, але стрымаўся: моцна загаласілі прамерзлыя дзьверы. Прыйшоў шавец.

- Як чуешся, контрык?..

- Дзякую! Вельмі добра... Толькі сон якісь паскудны сьніўся...

- То-ж бо ты кідаўся з боку на бок, стагнаў ды крычэў усю ноч. Мы ўжо думалі, што ты захварэў на гарачку якую... Ай-я-яй! - пакруціў шавец галавою. Пасьля, прайшоўшыся з кута ў кут, папытаў: "А што гэта за Вольга, пра якую ты часта паўтараў - Вольгі няма, Вольга паехала дадому, у Вольгі бацьку арыштавалі?"

Кастусь расказаў шаўцу, як яго выгналі з Варонежа пры чыстцы гораду ад "ненадзейнага элемэнту", як яго сябра з пэдінстытуту Мікола Кандрашын параіў яму ехаць у Арол, дзе вучылася ягоная нарачоная Вольга, якая мелася дапамагчы яму ўладзіцца вучыцца.

– Я ўчора пад вечар прыехаў у Арол, – апавядаў Кастусь, – знайшоў інтэрнат інстытуту, дзе жывуць студэнткі, пастукаў у дзьверы, дзе мелася быць Вольга, але выйшла ня Вольга, а ейная сяброўка, і сказала: "Вольгі няма"... Мая апошняя надзея лопнула. Дзецца мне ня было куды, і я даехаў трамваем да Кальца ды, зьлезшы, пайшоў за вачыма... Дзякую яшчэ раз ад шчырай душы, што дазволілі мне пераначаваць!

– Няма за што дзякаваць. А скажы, што ты думаеш рабіць далей?

– Я й сам ня ведаю, што мне рабіць.

– Бацькі ў цябе ёсьць?

– Ёсьць, але я не магу да іх ехаць, бо яны жывуць у пагранічнай паласе. Без дазволу ГПУ мяне там арыштуюць.

– Дурніца! – нейк із злосьцяй адказаў шавец. – Можаш ехаць!

– Не магу, – запярэчыў Кастусь. – У Слуцку, на апошняй станцыі, заўсёды спраўджаюць пагранічнікі ў пасажыраў дакумэнты...

– Паедзеш на маю адказнасьць. Ніхто цябе не затрымае, – гэтак-жа пераканальна паўтарыў шавец і папытаўся: – Калі ты радзіўся?

– Трэйцяга сьнежня 1915 году.

– Ага, – мармытнуў шавец і палез у шуплядку стала. Дастаў ліст чыстае паперы, алавік і, сеўшы пад абразком на покуце, пачаў штосьць вылічваць, разважаючы ўголас: "Тры й дванаццаць – пятнаццаць. Пятнаццаць і пятнаццаць – трыццаць. Тысяча дзевяцьсот трыццаць восем без трыццацёх – восем... Сягоньня дзявятага сакавіка?.."

Шавец вылез з-за стала, паклаў у шуплядку паперу й алавік.

– Так, дарагі хлопча, – павярнуўся ён да Кастуся худым, нейкім нявыразнага колеру тварам. – Зорка твая нешчасьлівая, але сягоньня яна павярнулася да цябе добрым бокам... Яжджай дадому! Ніхто цябе не запыніць...

Кастусь глядзеў на шаўца, і яму здавалася, што перад ім стаіць не шавец, а Хрыстос, што нясе цяжкі крыж...

Кастусь апрануўся. Шавец паказаў пальцам на хлеб на стале: - Гэта ты зьеж, зло нам не пакідай...Мы лепшага й самі ня маем.

- Я не хацеў вас крыўдзіць, а таму й ня зьеў, - апраўдваўся Кастусь. Шавец нічога не сказаў, а паклаў на стол дзесяць рублёў. "Гэта табе на дарогу, - сказаў ён неяк сарамяжна, быццам быў вінен Кастусю сто рублёў, а аддаваў толькі дзесяць. - Даў-бы болей, але ня маю... - Пры гэтых словах ён разьвітаўся з Кастусём, пажадаў яму шчасьлівай дарогі. Ужо бяручыся за клямку, кінуў: "Я не магу цябе праводзіць на станцыю, бо трэба быць на працы... Адпрасіўся на пару часінак". Дзьверы заскрыпелі й змоўклі. Кастусь зьеў акрайчык хлеба з малаком, паклаў у кішэню грошы, перахрысьціўся, гледзячы на Ісуса Хрыста зь цяжкой ношай, і пайшоў на станцыю. За паўгадзіны цягнік імчаў Кастуся Зімёнка па засьнежаных палёх і лясох туды, дзе жыве ягоная старэнькая любая матуля, дзе зігціць блакітным лёдам вузенькая, а такая прыгожая Случ, дзе...

Пры ўспаміне пра тое, што на мосьце службоўцы ГПУ будуць спраўджваць дакумэнты, Кастуся кідала ў жар. Але-ж - "Ніхто цябе не запыніць..." Ён супакойваўся, ды ненадоўга. Чым бліжэй да Слуцку, - мацней грукацела сэрца, узрастала трывога. Кастусь, як малітву, як заклін, паўтараў тое, што сказаў шавец, але гэтае, паблеклае "ніхто цябе не запыніць" заступалі, выпіхалі два іншыя словы: "Прад'явеце дакумэнты!" Колы лязгаталі: "Прад'явеце дакумэнты!" ... Рэйкі скавыталі: "Прад'явеце дакумэнты!"...Вецер барабаніў у вакно: "Прад'явеце дакумэнты!"... Кастусь уставіўся асьцерплымі зрэнкамі ў шыбу. Замігацелі ў ваччу чорныя слупы... "Гэта-ж мост!.. Мост!.. Раз, два, тры, чатыры... Пяць, шэсьць, сем, восем..." Не пасьпеў Кастусь палічыць тыя слупы, ці зялезныя дугі на мосьце: цягнік праскочыў мост, набліжыўся да Слуцку. Не дачакаўшыся, пакуль цягнік стане, Кастусь зыскочыў на драўляны мост пэрону і незір папраставаў подбегам у Слуцак.

"Ніхто цябе не запыніць", - радасна паўтараў ён няраз прарочыя словы шаўца.

А сам нават прозьвішча ў таго нязвычайнага чалавека запамятаваў папытацца...

Міхась Кавыль

Конадні, №7, 1963

ЗАЛАТОЕ ПРАМЕНЬНЕ

## АПАВЯДАНЬНЕ АБ ІКОНЬНІКУ І ЗАЛАТАРУ, ЛЮДЗЯХ МУДРЫХ І КРАСАМОЎНЫХ, КНІГАЛЮБЦАМ НЕЙКІМ ДЗЕЛЯ СЛАВЫ БОЖАЙ ДЫ РАЗМНАЖЭНЬНЯ ДАБРА ПАСПАЛІТАГА ВЫКЛАДЗЕНАЕ

Дасюль яшчэ людзі дасьведчаныя і сталыя, а памяцьцю цьвёрдыя, тыя часы ў існаваньні слаўнага места Віленскага, зайздруючы, згадываюць, калі мыта салянічае на соль простую і ледаватую ў дзвакроць паменшана было. Тады-ж мяшчане віленскія з ласкі яго каралеўскай міласьці і прывілей атрымалі, каб тры дні штогод перад сьвятам Нараджэньня Ісуса Хрыста мёд варыць вольна, ні капшчызны, ані васковага да скарбу ня плоцячы.

Водлуг гэтага ў Вільні за звычай стала гадзінудругую ў бяседзе за келіхам мёду хатняга сьцерці. Таксама і залатар Антон Корж, майстар скрозь паважаны, да крамы сваёй, на Нямецкай вуліцы збудаванай, часам таго або іншага са знаёмых запрашаў,каб вечар зімовы прыстойна ўдвух скаратаць. Гэткім чынам і ў дзень сьвятой Харыціны, каралевы літоўскай, на покуці крамы залатарскай госьць, Раман Якубовіч, чалавек добры і рахманы, за карцом поўным ушчэрць сядзеў.

Яшчэ ў маладасьці ўзяўся ён постаці Пана Бога, яго прачыстае Маткі і розных сьвятых вучыцца маляваць, фарбы кволыя на дашчэчках кляновых, гладка выструганых і крэйдаю загрунтаваных, з малітвай у сэрцы накладаючы. Пяць год яму вучнем давялося быць ды два гады - падмайстрам; а як тэрмін гэты скончыўся, тады Якубовіч, звычай спаўняючы, са старшай дачкой гаспадара свайго, Агатай, жаніўся і, званьня майстра такім парадкам справядліва дайшоўшы, усягды цяпер заработак меў. Уважаючы на гэта, нават і пан Корж яго да сябе запрашаў, хоць, ведама, іконьнік залатару раўнёй быць ня можа і таксама ад яго розьніцца, як, прымерам кажучы, фарба трохграшовая ад золата ўгорскага, у агні пяць разоў ачышчанага. Але Корж, крамар заможны і паважаны, на сьвеце незамала пажыўшы і шмат чаго зьведаўшы, людзямі ніколі не пагарджаў, гонару свайго, аднак,ні

ў чым не зьмяншаючы. Так і цяпер ён, мёд цёмна-бурштынавы смакуючы, словы госьця свайго ўважліва слухаў.

– Чуткі да мяне дайшлі, – гэтак прамаўляў іконьнік Раман Якубовіч, – быццам Сальватор Роза, майстар умелы, а ў працы рупны і здольны, да нашага краю з зямлі Італійскай прыехаўшы, абразы на мурах цэркваў полацкіх з вучнямі сваімі малюе, старыну ў маляваньні гэтым рухаючы, а навіны ўводзячы. Дзеля таго абразы тыя ад даўнейшых шмат чым розьняцца, і гэтае людзям, у старыне цьвёрдым, а да царквы божай прыхільным, сталася вельмі не даспадобы. Ды яшчэ кажуць, быццам італіец той, аб красе толькі дбаючы, на збаўленьне душы сваёй забыўшыся, паганскіх багоў і шмат чаго іншага малюе, аб чым іконьніку добраму лепш нават і ня думаць. Нічога гэтага ў жоднага з майстроў часу старога, а нам у праклад стаўшага, пабачыць няможна. Найгорш-жа тое, што іконьнікі полацкія звычаю рускага, а ў працы здольныя і дасьведчаныя, навіны гэтыя пераймаюць ды да таго-ж і людзей усякіх, нават роду паспалітага, а таксама і рэкі , бары і лугі і шмат чаго іншага малююць, і час і працу сваю праз усё гэта марне трацячы. Бо, здаецца, кожны зразумець можа, што сьвятая ікона Пана Бога, хаця-б і зусім няўдала зробленая, бязьмерна больш варта, чым са пся якога-небудзь малюнак найлепшы. Але майстры тыя на гэта не ўважаюць, а таму іконапісь прыстойная і да старасьвецкіх звычаяў прыхільная ў Полацку падупала, праклятым недаверкам на радасьць, а ўсім людзям добрым на жаль і гора вялікае.

Тады, бачыўшы, што іконьнік гутарку сваю ўжо скончыў, пан Корж карэц зь мёдам на бок пасунуў і, не сьпяшаючыся, пачаў гаварыць:

– Можа стацца, лепей-бы мне аб гэтым не размаўляць, бо ня столькі я фарбы і пэндзлі, колькі рэчы свае залатыя і срэбныя ведаю, аздабнейшых ад каторых ні ў Вільні, ані ўва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім ня знойдзеш. Але ня варт, усягды мне здавалася, рэч якую-небудзь толькі таму ганіць, што яна для нас за навіну прызнацца павінна. Бо ўсё тое, што цяпер навінаю завецца, праз час які старою мае быць, для людзей усіх станаў звыклай, а ўшанаваньня і абароны годнай. Я дзеля працы сваёй незамала паезьдзіўшы, і ў чэхах, і ў немцах пабываўшы, шмат чаго на вяку сваім па краінах далёкіх бачыў. Малюнкі тыя, што Сальватор Роза зь іконьнікамі полацкімі робіць, там скрозь звыклы, і нікога ўжо я-

ны ня дзівуюць, людзям усім, дзеля красы сваёй, у спадобе стаўшы, а майстрам здольным славы і гонару прыдаючы. Тое-ж і ў нас, напэўна, мае стацца, калі навіна старыною зробіцца, так што, мабыць, тады людзі полацкія Сальватора Розу шанаваць будуць, хоць нам цяпер гэта і непадобным да праўды здаецца.

– Гэтак сама і думку, быццам ікона ўсягды вялікшую вартасьць ад іншага маляваньня мае, я за несправядлівую мушу ўважаць. Бо ня тое, каго майстра малюе, а толькі тое, як ён гэта робіць, толькі здольнасьць і ўлежнасьць яго могуць малюнку хвалу і каштоўнасьць надаваць. Ікону з Астрабрамскай Маткі боскай, майстрам рупным і добрым намаляваную, за восем або за дзесяць грошаў літоўскіх купляюць, а за тую-ж ікону працы вучня няўмелага нічога не даюць. Вось-жа вартасьць малюнку толькі ад хараства ў выкананьні яго залежыць, што, звычайна, кожны ікоўнік лепш ад мяне ведаць павінен.

Так гаворачы, залатар скрыню дубовую, жалезам акутую, адамкнуў і, дзьве ліхтарні срэбныя адтуль дастаўшы, на стол іх з каганцом поруч паставіў і тады сказаў:

– Чалавек разумны да прыкладаў розных ахвотна зьвяртаецца, думку сваю выкладаючы; іх-жа і цар Саламон ужываў, як аб гэтым пісьмо сьвятое нам кажа. Таксама і Цыцэро і Арыстотэль, людзі мудрыя і ў філасофіі да сьведчаныя, хоць верай праўдзівай і не асьвечаныя, да прыкладаў вельмі склад маючы, заўша зь іх карысталіся.

– Дзеля таго і я, думкі свае як сьлед растлумачыць жадаючы, ліхтарні гэтыя за прыклад узяць хачу. Роўную яны вагу маюць і з таго-ж самага срэбра адліты былі, але ўсё-ж-ткі адна зь іх у семкроць болей другой каштуе, бо аздоблена з умеласьцю надзвычайнай. Водлуг-жа таго, што ўмеласьць і здольнасьць тыя толькі ў выглядзе рэчы, або, як іншыя цяпер кажуць, у форме яе з'явіць можна, прызнаць мы мусім, што каштоўнасьць вырабаў прыгожых адно толькі праз красу іх формы ўзрастае, і толькі красою форм каштоўнасьць тую мераць можна.

– Ува ўсім гэтым праз працу залатарскую як найляпей павінны мы праканацца. Бо чым болей ад работы майстра формы рэчы прыгожасьці набіраюць, тым каштаўнейшай рэч гэтая пачынае рабіцца. Таксама і здольнасьць майстра тым большай трэба ўважаць, чым лепшую форму кавалку срэбра або золата прыдаць ён здолен. Вось чаму я, хрысьціянін ня згоршы ад іншых, рэчы свае выпрабляючы, адно толькі красу формы

пільную ды ня думаю аб тым, нашто нанізкі залатыя мае пойдуць: ці то на аздабленьне фігуры Маткі боскай, або піяка і распусьнік які на пакрасу сваю ўжываць іх будзе.

Так казаў Антон Корж, чалавек мудры і красамоўны. Але ўжо ноч настала, і варта па вулках ішла, усім загадываючы, з наказу пана войта, агні гасіць і дзьверы зачыняць. Таму іконьнік і залатар, вечар прыстойна ў бяседзе правёўшы, краму замком нямецкім моцна замкнулі і разьвіталіся між сабой, у думках жадаючы, каб дзеля спажытку сэрцу і розуму таксама і далей удвух сходзіцца.

Рукапіс гэты, пісаны гаворкай нашай старажытнай, адшукаў і словамі сучаснымі пераказаў Максім Багдановіч

=

## А П О К Р Ы Ф

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

2. Калі скончылася сем тысяч год ад стварэньня сьвету, Хрыстос зноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым казалі праракі.

3. І хадзіў ён па ўсяму нашаму краю: і па Меншчыне, і па Віленшчыне, і па Магілёўшчыне, і па Задзьвінскай зямлі.

4. І разам зь ім былі сьвяты Пётра і сьвяты Юры. Але ніхто зь людзей не пазнаваў яго.

5. Бо ішлі яны босымі нагамі, з непакрытымі галовамі, і былі адзеты ў белы кужаль. А не таго спадзяваліся людзі.

6. Таму ніхто не зьвярнуў увагі на іх, калі ў час жніва праходзілі яны між працуючых людзей.

7. Толькі музыка, катораму цяпер ня было што рабіць, падышоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоньня дзень працы і ўсе клапочуцца каля яе; адзін я нікчэмны чалавек.

8. І адказаў яму Ісус: Ня смуціся ў сэрцы сваім. Ці-ж не твае пісьні сьпяваюць яны цяпер у часе жніва? Таму ня схіляй нізка галавы тваёй і не хавай твар свой ад вачэй людзкіх.

9. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты –

лішні на зямлі. Сапраўды кажу я табе: вось надойдзе да яго гадзіна горычы – і чым ён разважыць смутак свой, апроч песьні тваёй? Таксама і ў дзень радасьці ён прызавець цябе.

10. І, паўчаючы яго, казаў: пад песьні кладуць чалавека ў калыску і са сьпевамі-ж апускаюць у магілу яго.

11. Штодзённымі клопатамі поўна людзкое жыцьцё. Але калі зварухнецца душа чалавека, толькі песьня здолее спатоліць яе. Шануйце-ж песьні свае.

12. Бо сьпяваюць нават жабы ў багне. А ці-ж ня лепшымі будзеце вы ад іх?

13. Так вучыў Хрыстос. Але Пётра, пачуўшы яго словы, сказаў: Вучыцелю, у гэтай старонцы ёсьць людзі, каторым няма чаго есьці. Ці-ж ня сьцісьнецца ад сораму сэрца гэтага чалавека, калі ён да іх,шукаючы скарынкі хлеба, прыдзе з песьняй сваёй?

14. І, адказваючы яму, сказаў Хрыстос: так, жыцьцё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму-ж ты хочаш яшчэ і красу адабраць у іх. Мала дадзена ім – няўжо-ж трэба, каб было яшчэ менш?

15. І, зьвярнуўшыся да музыкі, спытаў яго: калі пяюць песьні ў вас?

16. Музыка-ж адказаў: пяюць на Каляды, на запусты, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу,у пятроўку, на зажынках і дажынках.

17. Пяюць на радзінах і на хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць, гуляючы; пяюць на ігрышчах і вечарынках, і на вясельлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і ў працы, і ў маскалі йдучы і ўва ўсякай іншай прыгодзе. Так скрозь увесь год пяюць.

18. І прамовіў Хрыстос Пятру: ты, шкадуючы долі галодных людзей, асудзіў песьню, але галодныя людзі не асудзілі яе. Жыва яшчэ душа ў народзе гэтым.

19. Тады ізноў сказаў Пётра: але няхай-жа ў песьнях будуць думкі добрыя і паўчаючыя, каб, апроч красы, меўся ў іх і спажытак чалавеку.

20. І адказаў яму Хрыстос: няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсьць той спажытак дзеля душы.

21. І, паўчаючы іх прамовіў: аглянецеся навакол! Ці-ж ня ніва калыхаецца каля нас?

22. Цяжка працаваў ля яе гаспадар і вось бачыць: паміж збожжа ўзрасьлі васількі.

23. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі; бо поўныя вагі каласы маглі-бы ўзрасьці на месцы васількоў.

24. Але яшчэ з маленства краса іх прышлася мне да душы. Таму я ня вырву з каранём іх, як усякае благое зельле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца маё.

25. Так казаў гаспадар у сэрцы сваім і думках сваіх. І не падняў ён рукі на васількі.

26. Я-ж гавару вам: добра быць коласам; але шчасьліў той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?

27. І, кажучы так, пачуў ён песьню жнеек і прамовіў: слухайце, што кажуць словы гэтай песьні. Яе складалі людзі, каторыя ведаюць, чаго варты хлеб.

28. Яны-ж пачулі, што словы тэй песьні кажуць: няма лепш цьвяточка над васілёчка. І далей ужо моўчкі ішлі яны.

29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым і мяккім пылу дарогі сьляды.

30. Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх. Амін.

Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч

=

## М У З Ы К А

Жыў на сьвеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы. І плакала ў яго руках скрыпка, і такая была ў яго граньні нуда, што аж за сэрца хапала...

Плача скрыпка, льюць людзі сьлёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласьней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам сьлёзы: так і ўдарыўся-б грудзьдзю аб зямлю ды ўсё слухаў-бы музыку, ўсё плакаў-бы па сваёй долі...

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачох людзей, і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, звоніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець ён народ. І людзі падымалі апушчаныя голавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы.

Тады бляднелі і трасьліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народу. Многа іх хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому. І хадзіў ён далей між

беднымлюдам і граньнем сваім будзіў ад цяжкага сну.
Але прышоў час, і музыкі не стала: злыя і сільныя людзі кінулі яго ў турму, і там скончылася жыцьцё яго... І тыя, што загубілі музыку, узялі яго скрыпку і пачалі самі граць на ёй народу.
Толькі іхнае граньне нічога людзям не сказала. "Добра граеце", - гаварылі ім, - "ды ўсё ня тое!" І ніхто ня мог растлумачыць, чаму ад граньня музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто ня ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты ня мог так граць, як грала народнае гора.
Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разьбілася. Але памяць аб музыку ня згінула зь ім разам. І з-паміж таго народу, катораму ён калісь граў, вый дуць дзесяткі новых музыкаў і граньнем сваім будуць будзіць людзей к сьвету, праўдзе, брацтву і свабодзе.

М. Багдановіч

=

Апавяданьне месяца аб тым, што ён бачыў.

## ПЕРШЫ ВЕЧАР

Мінулае ночы, гэта ўласныя словы месяца, коўзаўся я ў ясным індыйскім паветры: я прыглядаўся ў Ґанґэс, а мае праменьні рабілі спробу пранікнуць праз густое сьпляценьне плятаны, якая тварыла сабою пастрэшша, падобнае да чарапахавых мушляў. І вось выскачыла з гушчару гіндуская дзяўчына, лёгкая, як ґазэля, прыгожая, як Эва. Гэта была вясёлая і адначасна ваблівая з вострымі кантурамі зьява, дачка Індыяў: праз далікатную шкуру я мог чытаць яе думкі. Цярністыя ліяны парвалі яе сандалы, але яна хутка крочыла наперад; зьвяр'ё, вяртаючыся з ракі, дзе яно заспакоіла смагу, боязна ўцякала, бо дзяўчына трымала ў руках запаленую лямпадку; у яе прыгожых пальцах, якімі яна ахінала агонь, я мог бачыць сьвежую кроў. Яна зьбліжылася да ракі, пусьціла лямпадку на ваду, і лямпадка паплыла ўніз; агонь мігацеў, быццам хацеў патухнуць; але ён усё-ж гарэў, і дзявочыя чорныя поўныя агню вочы пад павекамі доўгае ядвабнае бахрамы саправаджалі яго духовым узрокам. Яна ведала, што, калі лямпадка гарэла, як далёка яна магла саправаджаць яе вачыма, дык яе каханы яшчэ жыў; але, калі патухне ён раней, гэта значыць, што ён памёр. І лямпадка гарэла і пламянілася; яна апусьцілася на калені і малілася. Побач яе ў траве ляжала сьлізкая гадзюка, але яна думала толькі аб Браме і аб сваім жаніху. "Ён жыве!" радавалася яна. "Ён жыве!" разыходзілася рэхам ад гор, "ён жыве!"

Г. Х. Андэрсэн

ВЕРА

Ісус кажа ёй: павер мне, што надыйдзе час, калі не на гэтай гары, і не ў Еруcаліме будзеце пакланяцца Айцу; праўдзівыя паклоньнікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе.

Эв. Іоана, 4:23,24

Ісус, адказваючы ім, сказаў: - мая навука - не мая, але таго, хто паслаў мяне; хто хоча чыніць волю ягоную, той даведаецца праз гэтую навуку, ад Бога яна, ці я сам ад сябе кажу.

Эв. Яна, 7:16-17

Усе мы вельмі падобныя да дзяцей, якія паўтараюць непахісныя праўды сваіх бабаў, пасьля вучыцялёў, а ў меру, калі стаямося дарослымі - і іншых сваеасаблівых людзей, спатыканых на нашым жыцьцёвым шляху.

Зь якою натугаю стараемся мы вывучыць на памяць пачутыя намі словы! Калі-ж мы самыя даходзім да таго ўзроўню, на якім знаходзіліся гэтыя папярэднікі і пазнаем значэньне чутых словаў, нашае расчараваньне выступае з гэтакаю сіламоцаю, што мы ахвотна забыліся-б усё тое, што чулі ад іх.

Эмэрсон

Не дапускай пасрэднікаў паміж тваею душою і Богам. Ніхто ня можа быць бліжэй да цябе як Бог.

Л. Талстой

Існуюць дзьве веры: вера даверра да таго, што людзі кажуць - гэта вера ў чалавека або ў людзей, і гэтакіхвераў многа ўсялякіх, - і вера ў сваю залежнасьць ад Таго, Хто паслаў мяне на сьвет. Гэта вера ў Бога, і гэтая вера адна для ўсіх людзей.

Карлейль

Самая згубная нявера ня ў тым, што чалавек ня верыць, але ў тым, што чалавек вызнае тое, у што ён ня верыць.

Марціно

Запраўдная вера чалавека служыць не на тое, каб даць яму супакой, але, каб даць яму сілы да працы.

Джон Рёскін

Людзі гэтыя блізкія да Мяне вуснамі сваімі і шануюць Мяне языком; сэрца-ж іх далёка ад мяне.
Але дарэмна пакланяюцца Мне, навучаючы навук і запаведзяў чалавечых.

Эв. Мацьв. 15:8-9

Той хто знаходзіцца блізка царквы, часта зьяўляецца далёкім ад Бога.

Французская прыказка

Міталёгія - гэта веравызнаньне дзён адыйшоўшых у мінуўшчыну.
Веравызнаньне - гэта міталёгія сучаснага дня.

Ян Пятроўскі

Кажны стоік быў стоікам; але дзе ў хрысьціянстве ёсьць хрысьціянін?

Эмэрсон

Вера ня ўводзіцца большасьцю галасоў. Той, хто ў большасьці галасоў бачыць азнаку запраўднасьці веры, ня ведае, чым ёсьць вера.

Л. Талстой

З таго часу, як першыя сябры сабораў сказалі: "Спадабалася нам і Духу Сьвятому", г. зн. паставілі вонкавы аўтарытэт вышэй за ўнутраны, прызналі рэзультат сьмешных людзкіх разважаньняў на саборах важнейшым і сьвяцейшым за тое адзінае запраўды сьвятое, што знаходзіцца ў чалавеку: за ягоны розум і сумленьне, з таго часу пачалася тая няпраўда, што забівае душы людзей, якая загубіла міліёны людзкіх існаваньняў і да гэтае пары вядзе сваю страшэнную працу.

Кант

Падстава кажнае дзяржаўнае рэлігіі ёсьць уціск, падстава хрысьціянства - любоў. Дзяржава - гэта прымус, хрысьціянства - перакананьне. Меч і паліца пастуха супроцьлежны і ня могуць быць хаўрусьнікамі.

Кунінгам Гэйкей

Рэлігія, якая складаецца з палажэньняў і рухаў цела, ніжэй нават за практыкаваньні атлеты.

Індыйская Вэмана

Няма нічога болей нягоднага разумнага існаваньня, як тое, каб плакаць над тым, што тое, што нашыя бацькі ўважалі за праўду, аказалася няпраўдаю.

Марціна

Шукайма новае дарогі.

Гальляш Леўчык

Большай частцы людзей мы аказваем за шмат гонару, калі кажам пра іх, што яны вызнаюць тую ці іншую рэлігію. Бо яны ня ведаюць і ня шукаюць ніякае рэлігіі; устаўная царкоўная вера - вось усё, што яны разумеюць пад гэтым словам. І гэтак званыя рэлігійныя войны, якія гэтак часта сутрасалі сьветам і залівалі яго крывёю, ніколі ня былі нічым іншым, як толькі вядзеньнем спрэчак з прычыны царкоўнае веры, і ўціснуты скаржыўся, у запраўднасьці, не на тое, што яму перашкаджалі належаць да ягонае рэлігіі,бо гэтага ня можа зрабіць ніякая вонкавая сіла, але на тое, што яму не дазвалялі вызнаваць публічна ягонае царкоўнае веры.

Кант

Гэта была малая старая, часткава ўжо разваленая, хата, з прасторным дваром, абгароджаным пахілым плотам, якога ніколі не дакранаўся пэндзаль маляра.

Падарожны, які ішоў уздоўж запыленае дарогі,падыйшоў да сялібы, адкрыў фортку, і пайшоў па сьцежцы, што вяла да хаты. Падыйшоўшы да нізкіх дзьвярэй, ён пастукаў.

Жонка гаспадара адчыніла дзьвера. Яна думала,што гэта стукае нехта з суседзства, але перад ёю стаяў чужынец.

Ён запытаў:

- Ці жыве тутака Бог?

Жанчына стаяла зьдзіўленай і абязмоўленай, не адказваючы на пытаньне.

Падарожны паўтарыў пытаньне:

- Ці жыве тутака Бог?

Але зьдзіўленая жанчына і цяперака не магла адказаць.

Трэйці раз запытаў чужынец:

- Ці жыве тутака Бог?

Замест таго, каб адказаць на пытаньне, жанчына зачыніла хутка дзьверы і выбегла сенцамі на прыгуменьне.

Падарожны паківаў галавою, завярнуўся і пайшоў далей.

У гумне жанчына расказала мужу аб дзіўным падарожным. Гаспадар абурыўся і пачаў спрачацца. Нарэшце ён сказаў:

- Чаму ты не сказала яму, што мы належым да царквы?

- Не, - адказала жонка, - ён ня пытаўся пра гэта.

- Чаму ты не сказала яму, што я дыякан, а ты зьяўляешся сяброўкаю Місыянерскага Жаночага Таварыства ў царкве? - Яна адказала:

- Гэтаксама і пра гэта ён ня пытаў мяне.

Супольна разважылі яны здарэньне з госьцем і значэньне ягонага пытаньня і прыйшлі да высnаву, што ў іхнай хаце, запраўды, Бог ня жыў.

"Санляйт"

Сын Кеза з Талёну прыйшоў да Будды і пачаў скаржыцца:

- Вучыцель, - сказаў ён, - кажны сьвятар і манах хваліць сваю веру, кажа, што яна адна запраўдная, і праклінае чужую веру, называе яе няпраўдаю. Сумліў мучыць мяне, і я ня ведаю, чыіх словаў слухацца трэба.

Будда адказаў:

- Твой сумліў апраўданы, сын Кеза. Паслухай маіх словаў. Нічога ня вер па слыху, ня вер пераказам, бо яны, раней чымся да нас прыйсьці, перайшлі праз шмат пакаленьняў. Нічога ня вер на падставе слыху або затым, што людзі шмат гавораць пра гэта. Ня вер толькі затым, што табе пакажуць сьвядоцтвы якога-небудзь старадаўнага мудраца. Ня вер ні ў што, затым, што табе выгадна, або затым, што даўнейшая прывычка цягне цябе да прызнаньня гэтага за праўду. Ня вер нікому на падставе толькі аўтарытэту тваіх вучыцялёў ці духавенства.

- Толькі тое, што згаджаецца з тваім дасьведчаньнем і паводля твайго ўласнага дасьледжаньня згодна з розумам і вядзе да шчасьця і памыснасьці цябе і ўсіх жывых існаваньняў, толькі гэта прыймай за праўду і жыві ў ёй.

=

Падпарадкаваньне вымаганьням ілжывае веры - галоўная прычына няшчасьця людзей.

Л. Талстой

Верыць можна толькі ў тое, што бяссумліву ёсьць, але чаго мы ня можам агарнуць розумам.

Аґні Пурана

У каго рэлігія на другім месцы, у таго яе зусім няма.

Джон Рёскін

СВАБОДА

Агаласеце свабоду на зямлі ўсім жыхаром яе.
Інскрыпцыя на Зване Свабоды
ў Філядэльфіі, ЗША.

Я ня ведаю ў якім напрамку іншыя пойдуць, але што да мяне – дайце мне свабоду або дайце мне сьмерць.
Патрык Гэнрі

Контынэнтальны Конґрэс у 1775 годзе задэклараваў: Мы не знаходзім нічога болей агідным як дабравольнае паняволеньне. Гонар, справядлівасьць і чалавечнасьць забараняюць нам паслухмяна здаць свабоду.

=

Змаганьне за сваю свабоду, за годнасьць, за правы і справядлівасьць чалавек вядзе зь няпамятных часоў. Маючы перад сабою гэтак высокія мэты, чалавек у гэтым змаганьні не ашчаджвае сваіх сілаў і не адступае перад ніякімі перашкодамі, усяроўна як вялікімі яны могуць быць.
Я. Пятроўскі

Свабода розьніцца ад іншых не зьяўляецца абмежаванаю да рэчаў, якія не прадстаўляюць сабою асаблівае важнасьці. Гэта быў-бы толькі цень свабоды. Праўдзівае выпрабаваньне яе зьяўляецца правам розьніцца ў прадмеце, які закранае сэрца існуючага парадку.
Робэрт Г. Джаксон

Адзіная падрыхтова да свабоды – гэта сама свабода ў тваей існасьці.
Аўтар няведамы

Любоў да свабоды зьяўляецца свомай для кажнага жывога існаваньня на зямлі. Кудыколечы мы скіруем наш узрок, мы ўсюды назіраем любоў да свабоды і абарону яе, у шматлікіх выпадках, за кажную цану. Ёсьць птушкі, якія пяюць толькі на волі, і ніколі не пяюць у клетках. Ёсьць птушкі, якія ў абставінах няволі, ніколі ня прыймаюць ежы, ствараючы гэтым альтэрнатыву: жыцьцё на волі, або сьмерць.
Я. Пятроўскі

Бо вы да волі пакліканы, браты.
Ап. Паўла

Мы павінны сабе ўсьведаміць, што мы, Беларусы, не зьяўляемся народам зь нявольніцкаю псыхікаю.

Усевалад Радзевіч-Крывіч

Свабода зьяўляецца адзінаю рэчаю, якое ты ня можаш мець, хіба-што праяўляеш ахвочасьць падзяліцца ёю зь іншымі.

Вільліям Альлен Гвайт

Пакорнасьць Богу чыніць свабодным чалавека перад людзьмі.

Л. Талстой

Нявольнік здаволены са свайго палажэньня, двойчы нявольнік, бо ня толькі ягонае цела ў нявольніцтве, але і душа ягоная.

Буркэ

Чалавек, каторы пазваляе нарушаць сваю свабоду, здраджвае сваю натуру і ўздымаецца супроць загадаў Бога.

Мадзіні

Супакой прыгожы ў кажнай хворме, але паміж супакоем і нявольніцтвам вялікая розьніца. Супакой - гэта свабода, нічым непарушаная, нявольніцтва - гэта найбольшая загуба, супроць якой трэба змагацца ўсімі сіламі да самае сьмерці.

Цыцэрон

Памятай, што зьінначыць сваё перакананьне і сьледаваць за тым, што папраўляе тваю памылку, - болей адказвае свабодзе, чымся ўпорыстасьць у сваей памылцы.

Марк Аўрэліюс

Толькі тую душу назаву я свабоднаю, якая дзейнічае паводля ўтоеных у ёй матываў нязьменных першапачаткаў, свабодна ўспрынятых ёю. Я назаву свабодную тую душу, якая не падпарадкваецца нявольніцтву абычаяў, якая не здавальняецца старымі здабытымі мужнасьцямі, якая не хаваецца ў абрысаваныя правілы, якая забывае тое, што з-заду, а кіруе свой узрок і прыслухоўваецца заклікам сумленьня і радуецца з прычыны, што можа імкнуцца ў напрамку новых і вышэйшых задачаў.

Чаньнінґ

## ДАБРАВОЛЬНАЕ НЯВОЛЬНІЦТВА +/

Лекары радзяць не займацца невылячальнымі ранамі; і я баюся, што я пачынаю дзейнічаць нямудра, жадаючы даваць рады народу, які даўно згубіў усялякае разуменьне і які тым, што не спасьцерагае ўжо свае хваробы, паказвае, што хвароба ягоная сьмяротная.

Перад усім, бяссумніўным ёсьць, што, калі-б мы жылі паводля тых прынцыпаў і навукаў, якія дала нам натура, дык мы былі-б паслухмянымі сваім бацьком, падпарадкаваліся-б розуму і ня сталіся-б нічыімі нявольнікамі. Пра паслухмянасьць кажнага свайму бацьку і матцы сьведчаць усе людзі, - кажны сам у сабе і для сябе. Пра розум-жа я думаю, што ён натуральная свомасьць душы і, калі ён падтрымліваны сьвятлом і звычаем, дык расьцьвіце ў мужнасьць.

Але ў чым немагчыма сумнявацца і што зусім ясным ёсьць і наізральным, дык гэта тое, што натура ўчыніла ўсіх нас аднолькавымі, - быццам выліла з аднае хвормы, - з тым, каб мы ўважалі адзін аднаго за таварышоў або, барджджэй, за братоў, і, калі пры надзеле нас здольнасьцямі яна абдарыла некаторых фізычнымі, а іншых духовымі пяршынствамі, дык усё-ж яна не хацела пасеець гэтым варажнечу між намі, не хацела, каб болей сільныя і разумнейшыя, як бандыты ў лесе, напапалі-б на слабых; але барждждэй трэба ду-

+/ Яму было толькі шаснаццаць гадоў, калі ён напісаў у першай рэдакцыі сваё "Разважаньне пра дабравольнае нявольніцтва", вытрымка якога тут падаецца. Радзіўся ён у Сарлят на поўнач ад ракі Дордонь каля сарака кілямэтраў на ўсход ад Монтані І-га кастрычніка І530 г. у Францыі. Імя яго - Этьен дэ-ля-Боэці. Боэці займаў становішча сябры суду ў Бордо і быў блізкім прыяцелем і сябрам ведамага француcкага пісьменьніка і першага ассэістага, Монтэня. Мішэль Монтэнь высака цаніў Боэці як пісьменьніка, філёзафа і чалавека, і пакінуў нам апісаньне хваробы і сьмерці яго. Дэ-ля-Боэці памер у І563 годзе. Выдавец ягонага Развaжаньня, ведамага сягоньня як Дабравольнае нявольніцтва, выражаецца пра яго з захопленьнем і вобразна, што - чытаньне гэтакіх рэчаў ёсьць пажываю таго шпіку касьцей львоў, якога, на няшчасьце, пазбаўленыя сучасныя пакаленьні.

мацъ, што, абдарыўшы адных большымі здольнасьцямі ў параўнаньні да іншых, гэтым самым яна стварыла магчымасьць брацкае любові, у выніку чаго болей сільнейшыя памагалі-б тым, каторыя патрабуюць іхнае помачы.

І, калі гэтая добрая маці-натура дала нам адзін і той самы вонкавы від, дык гэта затым, каб кажны з нас мог бачыць і пазнаваць сябе ў іншым; калі яна наагул усім нам дала вялікі гасьцінец слова, дык гэта затым, каб мы, зрабіўшы звычай з узаемнае вымены думкі і супольнасьці нашых воляў, пазнавалі адзін аднаго і ўсё болей і болей узаемна набліжаліся-б; калі яна імкнулася ўсімі сродкамі аб'яднаць нас і ўшчыльніць рады нашае супольнасьці, зьвязаўшы яе пры помачы зносінаў быццам у моцны вузёл, і дзеля гэтага, нарэшце, гэтае імкненьне да аб'яднаньня знаходзіць сваё пацьверджаньне ў натуры ўсіх рэчаў на сьвеце, дык няма сумніву, што мы павінны быць узаемна сабе таварышамі, і, што ніхто не павінен думаць, быццам натура вызначыла адных быць нявольнікамі, а іншых - панамі.

І запраўды, зусім не патрэбна дашуквацца, ці пачуцьцё свабоды натуральным ёсьць, ужо хоць-бы з тае прычыны, што ніхто ня можа зьнесьці стану паняволеньня, не адчуваючы цярпеньня, і няма нічога на сьвеце гэтак нязноснага, як крыўда. Пасьлядоўна, трэба прызнаць, што свабода сярод жывых існаваньняў зьяўляецца натуральным зьявішчам, і, што нам ад нараджэньня свомаю ёсьць ня толькі свабода, але і неабходнасьць бараніць яе. Але, калі-б здарылася, што мы падпалі-б пад сумліў у гэтым, або да гэткае ступені агрубелі-б, што згубілі-б здольнасьць пазнаньня нашага дабра і нашых натуральных імкненьняў, дык гэтым самым займелі-б мы гонар навучыцца гэтага самага ў рознага віду зьвераў. Зьверы, калі толькі людзі ня знойдуцца вельмі глухімі, будуць крычаць ім: "Няхай жыве свабода!" І запраўды, шматлікія зь іх паміраюць зараз-жа, як толькі пазбаўляюць іх свабоды. Іншыя, - і большыя і малыя, - калі іх ловяць, бароняцца ўсімі сіламі: і зубамі, і дзюбам, і кіпцюрамі, і рагамі, паказваючы гэтым, як яны цэняць тое, што губяць; калі-ж яны злоўлены, паказваюць зусім нядвузначна, як далёка ўсьведамляюць яны сабе сваё няшчасьце і, калі і працягваюць сваё жыцьцё далей, дык толькі затым, каб сумаваць з прычыны страты, чымся дзеля таго, каб радавацца з нагоды ўласнага паняволеньня. Мы прывучаем каня да службы бадай-што з самага дня нараджэньня;

але як ласкава падыходзілі-б мы да яго, калі аднак надыходзіць мамэнт уціхамірыць яго і падпарадкаваць сабе, ён пачынае грысьці цуґлі і вырывацца, быццам хоча паказаць, што служыць ён не з прычыны ўласнае волі, але з прычыны нашага прымусу. Згэтуль усе жывыя існаваньні, якія маюць пачуцьцё, усьведамляюць сабе зло падпарадкаваньня, і імкнуцца да свабоды. Зьверы, якія астаюцца ніжэйшымі за чалавека, ня могуць прывыкнуць падпарадкавацца, і стаеца гэта ня інакш, як толькі супроць іхнае волі. І што за дзіўнае зьявішча, што адзін толькі чалавек да гэткае ступені здрадзіў сваю натуру, што, роджаны для таго, каб жыць свабодна, згубіў нават і ўспамін пра свабоду і жаданьне адзыскаць яе!

Ёсьць тры рады́ тыранаў /я гавару пра злосных валадароў/: адны пануюць на падставе выбару народу, іншыя – на моцы аружжа, яшчэ іншыя – на падставе спадчыны. Тыя, што пануюць на аснове права вайны, гэтак захоўваюцца, што відаць, што яны пануюць на падставе асягнутае імі аружнае перамогі. Тыя, зноў, каторыя роджаны царамі, ня лепшыя за першых: будучы ўзгадованымі ў лягэндах тыраніі, яны з малаком сваіх матак усмоктваюць характар тыранаў, карыстаюцца падпарадкаванымі сабе народамі, як атрыманымі ў спадчыне нявольнікамі, паводля свае сваволі, – прагавітыя яны ці марнатраўныя, – яны распараджаюцца гаспадарствам, як сваею спадчынаю. А той, зноў, што атрымаў сваё права ад народу, здавалася-б, павінен быў-бы быць болей церплівым; і я думаю, ён быў-бы гэтакім, калі-б ён ня чуўся вывышаным над іншымі, калі-б ня быў ён акружаны падхалімствам і тым, што́ называюць высакароднасьцю, з чым ён ня хоча расставацца, калі-б не карыстаўся сваею ўладаю дзеля таго, каб пераказаць яе сваім дзецям. І запраўды, дзіўна гэта выглядае, калі гэтыя самыя цары, што валадараць на падставе выбару народу, пераўвышаюць усіх іншых тыранаў усякага роду заганамі і нават бязьлітасьцю. Ня гледзячы на тое, што паняволеньне ўсіляецца, – укарочваньне свабоды ў сваіх падданых – тае самае свабоды, якое і без таго гэтак мала ў іх асталося, – яны ня бачаць ніякіх іншых сродкаў умацаваньня свае ўлады. Кажучы папраўдзе, хоць я і назіраю пэўную розьніцу мною паказанымі трыма рада́мі тыранаў, усё-ж, у сутнасьці, яны ўсе аднолькавыя, і хоць прыходзяць да ўлады рознымі шляхамі, аднак спосаб уладараньня ў іх заўсёды адзін і той самы. Што датычыцца заваёўнікаў, дык яны ўважаюць, што на заваёвыных яны маюць пра-

ва, як на сваю здабычу. Ïхныя спадкаемнікі паступаюць з падданымі, як са сваімі натуральнымі нявольнікамі.

Калі-б у нашым часе нарадзіліся зусім новыя людзі, ня ведаючыя ані падпарадкаваньня некаму, ані свабоды, - людзі, якія-б ня ведалі ані таго, ані другога і, каб гэтым людзям запрапанавалі адно з двох: або быць падданымі, або жыць свабодна, дык што-б яны выбралі? Ня цяжка здагадацца, што яны выбралі-б ляпей падпарадкавацца розуму, чымся служыць аднаму чалавеку. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі-б яны ня былі падобнымі да тых ізраільцянаў, катория бяз прымусу і бязь ніякае патрэбы паставілі над сабою тырана. Гісторыю гэтага народу я ніколі ня чытаю без пачуцьця прыкрасьці, якое даводзіць мяне да таго, што сам раблюся бязьлюднем, і цешуся з прычыны тых няшчасьцяў, якія ізраільцяне самыя наклікалі на сябе. Але што датычыцца ўсіх людзей, дык у той прапорцыі, у якой яны - людзі, патрэбна адно з двох, каб іх падпарадкаваць сабе, - трэба або змусіць, або ашукаць іх.

Гэта запраўды, годна нашае ўвагі, як народ, калі толькі пападзе ў няволю, зараз-жа пагружаецца ў гэтакае ашаламленьне забыцьця свабоды, што яму цяжка прачхнуцца, каб вярнуць яе назад. Ён гэтак ахвотна падпарадкваецца свайму лёсу, што, гледзячы на яго, ствараецца ўражаньне, быццам ён згубіў не свабоду сваю, а сваё паняволеньне. Праўдаю ёсьць і тое, што спачатку людзі бываюць змушанымі і пераможанымі сілаю; але наступнае пакаленьне, якое ніколі ня бачыла свабоды і ня ведае, што гэта такое, служыць ужо без нараканьня і дабраахвотна выконвае тое, што ягоныя папярэднікі рабілі толькі пад прымусам. З гэтае прычыны людзі, што радзіліся ў няволі і затым узгадованыя ў нявольніцтве, прыймаюць за нармальны той стан, у якім яны радзіліся, прыймаюць яго, ня ўзіраючыся наперад, і здавальняючыся жыцьцём у тым палажэньні, у якім яны радзіліся, і зусім ня думаюць дабівацца ані іншых правоў, ані палепшаньня абставінаў жыцьця, апрача тых абставінаў, якія яны назіраюць навакол. Бо якколечы марнатраўным і неахайным мог-бы быць спадчыньнік, усё-ж ён час ад часу пераглядзіць акты свайго спадку, каб, проста, даведацца, ці ўсімі сваімі правамі карыстаецца ён, ці не забралі чаго-небудзь ад яго або ад ягонага папярэдніка. Але прывычка, якая наагул мае вялікую ўладу над намі, ні ў чым ня мае над намі гэтакае сілы, як у тым, каб навучыць нас,

быць нявольнікамі і прывучыць зь лёгкасьцю каўтаць горкую атруту нявольніцтва, падобна, як Мітрыдатэс, па крышцы прывучыў сябе да самаатручаньня.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ува ўсіх краінах і пад кажным небам няволя агідная ёсьць, а свабода прыемная, затым бо трэба шкадаваць тых, каторыя радзіліся зь ярмом на шыі. Але трэба выбачыць і гэтым людзям, бо-ж яны ніколі ня бачылі нават і ценю свабоды і з гэтае прычыны не спасьцерагаюць усяго зла няволі. Бо-ж ніхто не шкадуе таго, чаго ніколі ня меў, а сумаваць пачынае толькі тады, калі спасьцеражэ згубленую прыемнасьць.

Для чалавека натуральным ёсьць быць свабодным і жадаць сабе быць ім, але адначасна ягоная натура гэтакая, што ён прывыкае да ўсяго.

Затым, мы кажам, што /для чалавека свомымі ёсьць усе рэчы, да якіх ён прывыкае. Згэтуль/ першая прычына дабраахвотнага паняволеньня ёсьць прывычка, - тая самая прывычка, паводля якое самыя лепшыя коні спачатку грызуць свае цуґлі, а пасьля забаўляюцца імі, спачатку вырываюцца з-пад сядла, і нарэшце быццам з гордасьцю гарцуюць у сваей збруі. Людзі кажуць, што яны заўсёды былі падданымі, што іхныя бацькі жылі гэтак, - думаюць, што павінны зносіць няволю, змушаюць сябе верыць у гэта і на падставе даўнасьці апраўдваюць уладу тых, каторыя іх тыранююць. Але сярод гэтакіх пакорлівых спатыкаюцца і шляхэтныя людзі, каторыя, адчуваючы цяжар ярма, імкнуцца скінуць яго і ніколі ня прывыкаюць да ўлегласьці. Гэтыя людзі, як Улісэс, каторы на моры і на зямлі жадаў бачыць дым коміну свайго роднага кута, маюць у памяці свае натуральныя правы і свабодных калісьці сваіх продкаў; кіруючыся ясным разуменьнем і праніклівым розумам, яны не здавальняюцца, як назіраем гэта сярод цёмнага натоўпу, толькі тым, што ў іх пад нагамі, але маюць голавы на плячох, - голавы, узгадованыя асьветаю і навукаю. І гэтыя людзі, калі-б свабода зусім пакінула сьвет, калі-б назаўсёды была згублена для людзей, усё-ж адчувалі-б яе ў сваім духу і любілі-б яе, затым, што паняволеньне для іх заўсёды абрыдласьцю ёсьць, усяроўна як-бы ўціск тырана не падхарошвалі.

Турэцкі султан здагадаўся пра гэта. Ён прыйшоў да пераканаґньня, што кнігі і навука болей за ўсё будзяць сярод людзей сьведамасьць самых сябе і нянавісьць да тыраніі. Кажуць, што ў ягоным валадар-

стве знаходзяцца толькі гэтакія вучоныя, якія патрэбныя яму. I з гэтае прычыны, як ня былі-б шматлікімі людзі, што аберагли ў сабе, ня гледзячы на ўсё, сваю адданасьць свабодзе, усё-ж, пры ўсім іхным жаданьні і запале, яны ня маюць ніякага ўплыву; а гэта затым, што, пры поўнай адсутнасьці свабоды гаварыць і нават думаць, яны ня могуць ведаць адзін аднаго. Дык галоўная прычына, паводля якое людзі дабраахвотна аддаюцца ў няволю - ёсьць тая, што яны родзяцца і ўзгадоўваюцца ў гэтых абставінах. А з гэтае прычыны родзіцца і іншая, - тая, пайменна, што пад уладаю тыранаў людзі хутка стаюцца запалоханымі і мягкацелымі. Тыран ніколі ня думае, што ягоная ўлада моцнаю ёсьць, затым бо і рупіцца ён, каб пад ягонаю ўладаю ня было ані воднага годнага чалавека.

Гэта тая хітрасьць, пры помачы якое тыраны чмуту наводзяць на сваіх падданых, ні на чым гэтак ясна ня выступае, як на тым, што зрабіў Кірос зь лідыйцамі пасьля таго, як ён захапіў іхнае галоўнае места Лідыю і ўзяў у палон Крэзоса, гэтага багатага валадара, і павёў яго з сабою. Калі яму сказалі, што лідыйцы збунтаваліся, ён хутка зноў перамог іх; але, ня хочучы разбурваць гэтак прыгожага места і заўсёды трымаць там армію, каб затрымаць места для сябе, ён прыдумаў іншы сродак: ён наладзіў там месцы забаваў, корчмы зь віном, публічныя дамы, відовішчы і падаў да ведама, каб усе жыхары карысталіся ўсім гэтым. I гэты спосаб аказаўся нагэтулькі скуткоўным, што пасьля гэтага яму ўжо не патрэбным было ваяваць зь лідыйцамі. Гэтыя няшчасныя людзі забаўляліся што-раз новапрыдуманымі гульнямі; згэтуль і рымляне прысвоілі сабе слова, якое мы называем праводжаньнем часу: ludi.

Тыраны ўкрываюцца з тым, што яны хочуць распусьнікамі зрабіць сваіх падданых, але тое, што Кірос адкрыта затасаваў, гэта ў запраўднасьці чыняць усе, бо свомасьць простага народу ў местах гэтакая, што ён адносіцца з падозраньнем толькі да тых, каторыя яго любяць, і простым астаецца і падатным у адносінах да тых, каторыя яго ашукваюць. Я ня думаю, каб знайшлася якая-небудзь птушка, каторая ляпей лавілася-б на прынаду, або рыба, якая ляпей пападалася-б на кручок, чымся ўсе народы пападаюцца ў паняволеньне з прычыны нейкага маленькага пярца, якім ім, як гэта кажацца, памажуць па вуснах /дык і дзівіцца трэба, як яны лёгка ідуць на прыманку, адно, каб толькі хто-небудзь паслакатаў іх/. Тэатры,

гульні, спэктаклі, штукарствы, ґлядыятары, дзіўныя зьверы, карцінкі і іншыя падобныя глупствы тварылі сабою для старажытных прынаду нявольніцтва, цану іхнае свабоды і аружжа тыраніі. Гэтакімі былі захады прынадаў старажытных тыранаў, якія тасаваліся імі з мэтаю закалыханьня падданых да сну пад іхным ярмом. Гэткім спосабам, абдураныя падобнымі забавамі, разрагатаныя пустымі відовішчамі, што наладжваліся перад іхнымі вачыма, народы прывыкалі панявольваць сябе зусім ня горай, чымся малыя дзеці, каторыя набіраліся штукі чытаньня толькі затым, каб ведаць зьмест блішчустых карцінак у кніжках.

Ассырыйскія цары, і пасьля іх мідыйскія, паказваліся народу ў меру магчымасьці рэдка, каб народ думаў,што яны прадстаўляюць сабою нешта надзвычайнае, вялікае, і каб аставаўся ў гэтай памылцы, бо людзям свома ёсьць перабольшваць у сваім уяўленьні тое, чаго яны ня могуць бачыць. Згэтуль народы, якія знаходзіліся пад уладаю ассырыйскага панаваньня, былі прывучаны панявольваца пры помачы гэтае тайніцы і тым болей панявольваліся, чым меней ведалі свайго гаспадара; а часамі і зусім ня ведалі, ці існуе ён, і ўсе ў самаперакананьні баяліся таго, каго ніхто ня бачыў. Першыя фараоны Ягіпту паказваліся ня інакш, як маючы часамі гольку, а часамі агонь на галаве, і выходзілі ў масках і гэтым узбуджалі ў сваіх падданых пашану і зьдзіўленьне; тады, як людзі, ня вельмі баязьлівыя і ня глупыя, як мне здаецца, уважалі-б іх толькі забаўнымі і сьмешнымі. Годным нашага жалю, проста, і мізэрныя тыя хітрыкі, якімі карысталіся тыраны старажытнасьці дзеля ўкараненьня свае тыраніі ў народзе, гэтак падатным на іхныя ашуканствы. Ня было гэтакае сеткі, у якую не пападаўся народ: і ніколі тыраны лягчэй не ашуквалі народ, лягчэй не падпарадкавалі яго сабе, як калі самыя сьмяяліся зь яго. Дык вось, ці быў гэтакі час, калі-б тыраны, дзеля замацаваньня свае ўлады, ня прывучалі-б народ ня толькі да паслухмянства і няволі, але і да выражаньня глыбокае пашаны сабе.

Усё, што я сказаў да гэтае пары пра тое, як тыраны вучаць людзей быць паслухмянымі ім, адносіцца да простага і грубога народу.

Цяпер-жа я падыходжу да пытаньня, якое творыць сабою тайніцу і галоўную прыладу тыраніі. Той, хто думае, што тыраны ахоўваюць сябе аружжам старожаў і гарматамі цытадэляў, той вельмі памыляецца: праўда, яны карыстаюцца гэтым, але найболей для хвормы

і дзеля страху, чымся ў запраўднасьці спадзяюцца на іх. Целаахраньнікі не дапускаюць у харамы ня тых людзей, што ствараюць небясьпеку, адно толькі тых без значэньня людзей, якія ня могуць спрычыніць тырану ніякае шкоды.

Калі мы падсумуем рымскіх імпэратараў, дык убачым, што іхныя целаахраньнікі ня гэтулькі ахоўвалі іх перад небясьпекаю, колькі самыя забівалі іх. Не аружжа і не азброеныя людзі - конныя ці пехатныя - ахоўваюць тыранаў, не, як ні трудна гэтаму паверыць, тры або чатыры чалавекі падтрымліваюць тырана і трымаюць для яго ўсю нацыю ў паняволеньні. Заўсёды кола надзейных людзей для тырана налічвала пяць ці шэсьць чалавек; людзі гэтыя або самыя пракрадваліся ў ягонае даверра, або ён іх зьбліжаў да сябе, каб яны сталіся супольнікамі ягоных жорсткасьцяў, таварышамі ягоных прыемнасьцяў, уладжвальнікаў ягоных насалодаў і супольнікамі ягонага грабежніцтва. - Гэтыя шасьцёра змушаюць свайго валадара быць злосным ня толькі ягонаю ўласнаю злосьцяю, але яшчэ і іхнаю злосьцяю. Гэтыя шасьцёра маюць шэсьцьсот, што знаходзяцца пад іхнаю ўладаю і яны адносяцца да шасьцярых гэтаксама, як шасьцёра адносяцца да тырана. Шэсьцьсот-жа маюць пад сабою шэсьць тысяч, якіх яны ўзьнялі, каторым далі кіраўніцтва правінцыямі або грашавымі справамі, - з тым меркаваньнем, каб яны служылі іхнай прагавітасьці і жорсткасьці і, каб спрычынялі зло, якое можа мець месца толькі пры іх і толькі імі выбаўляецца ад праўнага пакараньня. За гэтымі сьледуе яшчэ большы лік. І той, хто мае нахіл дасьледзіць гэтае зьявішча, - распутваць гэтую сетку, - той убачыць, што ня толькі шэсьць тысяч, але сотні тысяч, міліёны скованы гэтым ланцугом з тыранам. Дзеля гэтых людзей памнажаюцца пасады, мэтаю якіх ёсьць падтрымліваць тырана. І ўсе людзі, што займаюць гэтыя становішчы, маюць тут свае выгады і гэтымі выгадамі яны зьвязаныя з тыранам, і людзей, якім тыранія выгадна, гэткае мноства, што іх назьбіраецца бадайшто гэтулькі-ж, колькі тых, каторым свабода была-б прычынаю радасьці. І як лекары кажуць, што, калі ёсьць што-небудзь сапсутае ў нашым целе, зараз-жа да гэтага хворага месца прыплываюць усе дрэнныя сокі, гэтак і да валадара, як толькі ён станецца тыранам, сузграмаджваецца навакол яго ўсё дрэннае, - усё шумавіньне ў гаспадарстве, хэўра зладзеяў і куча нягоднікаў, няздольных на нішто - ані на добрае, ані на дрэннае ў рэспубліцы - але прагавітых і жа-

дзёных, - сузграмаджваюцца, каб узяць удзел у здабычы, каб быць пад вялікім тыранам маленькімі тыранятамі. Гэтак паступаюць большыя грабежнікі і ведамыя на ўвесь сьвет корсары. Адны робяць разьведкі, іншыя затрымліваюць падарожных; адны стаяць на варце, а іншыя ў засадзе; адны забіваюць, а іншыя грабяць, і, - хоць між імі ёсьць розьніца, бо адны служкі, а іншыя начальнікі, - усе яны ўчасьнікі ў здабычы.

Тады выходзіць, што тыран падпарадквае адных падданых пры помачы іншых і здараецца, што ахоўваецца тымі, каторых, калі-б яны ня былі нягоднікамі, ён павінен быў-бы сьцерагчыся. Але, як гэта кажацца, "каб калоць дровы, робяць кліны з таго самага дрэва", гэтак і ягоныя целаахоўнікі гэтакія-ж самыя, як і ён. Здараецца, што і яны церпяць ад яго; але гэтыя пакінутыя Богам, загубленыя людзі гатовы зносіць зло, адно толькі, каб быць у стане тварыць яго не таму, хто чыніць ім зло, але тым, каторыя зносяць яго і ня могуць інакш.

Этьен дэ-ля-Боэці

ГОРДАСЬЦЬ

Самалюбства - гэта пачатак гордасьці. Гордасьць - гэта непаўстрыманае, распушчанае самалюбства.

Л. Талстой

Ёсьць яшчэ розум у глупага, які ўсьведамляе сабе сваю неразумнасьць; але той неразумны, хто моцна перакананы ў сваей мудрасьці - гэты запраўды ўжо бязглузды.

Усё жыцьцё правядзе глупец каля мудрага і ані крышку не пазнаціме праўды, гэтак, як ніколі лыжка не пазнаціме смаку стравы.

З буддыйскае мудрасьці

Хто сам ня ўмее ані чытаць, ані пісаць, ня можа вучыць гэтага іншых; як-жа можа раіць людзям што ім рабіць той, хто ня ведае, што яму самому рабіць?

Марк Аўрэліюс

Саманадзейны чалавек заўсёды абмежаваны. Адно - зьяўляецца прычынаю другога. Ён заўсёды абмежаваны, затым што саманадзейны. І ён саманадзейны, затым што абмежаваны. Ён усьведамаляе сабе немагчымасьць выканаць добрае і затым запэўнівае сябе, што добрым ёсьць усё тое, што ён выконвае.

Л. Талстой

Недахоп шматлікіх людзей - гэта паставіць сябе вучыцелем над іншымі, тады калі ім самым трэба было-б яшчэ доўга быць вучнямі.

Усходняя мудрасьць

Садзіся на ніжэйшае месца, чымся табе належыцца. Бо ляпей, калі скажуць табе: сядзь вышэй, чымся: зыйдзі ўніз.

Хто ўзвышае сябе, таго Бог паніжае, а хто ўціхамірвае сябе, таго Бог узвышае.

Тальмуд

Няма гэткага нягодніка, які, пашукаўшы, не знайштоў-бы ў якім-небудзь дачыненьні горшых нягоднікаў ад самога сябе і каторы, з гэтае прычыны, ня мог-бы знайсьці нагоды ганарыцца і быць самаздаволеным.

Л. Талстой

Мудраму чалавеку гэтаксама нясвомым ёсьць развaжаць шмат адносна натуры існаваньняў, што знаходзяцца вышэй за яго, як і пра натуру існаваняў, што ніжэй за яго. Вельмі нясвома здагадвацца, быццам чалавек можа агарнуць першыя, як і вельмі паніжаючым для яго ўтрымліваць, што ён зьяўляецца ў стане бяз рэшты засяродзіць усю сваю ўвагу на другіх. Прызнаваць сваю адносную веліч і нязначнасьць, пазнаваць і самога сябе і сваё месца на сьвеце, быць здаволеным са свае падпарадкаванасьці Богу, ня маючы адначасна магчымасьці агарнуць Яго, і адносіцца зь любоўю і спагадаю да ніжэйшых тварэньняў, ня прыймаючы ўдзелу ў жаданьнях быдла і ня патураць яму, - вось што значыць быць ціхамірным і супакойным у прысутнасьці Бога, добрым адносна Ягоных тварэньняў і мудрым адносна самога сябе.

Джон Рёскін

Галоўнае прадпрыняцьце ў жыцьці - гэта самадасканаленьне. І якое-ж магчымым можа быць самадасканаленьне, калі чалавек уважае самога сябе нагэтулькі лепшым ад іншых, што можа ганарыцца перад імі.

Л. Талстой

Ёсьць дзьве групы людзей: адны - праведныя, але ўважаюць сябе за грэшнікаў; іншыя - грэшныя, але ўважаюць сябе за праведнікаў.

Паскаль

Чым лягчэйшае і меней шчыльнае рэчыва, тым болей займае месца. Гэтак і гордасьць.

Л. Талстой

Той, хто не адчувае абрыдласьці да свайго самалюбства, г. зн. да таго інстынкту, які змушае яго ставіць самога сябе вышэй за ўсё на сьвеце, той зусім сьляпы, бо нічога гэтак ня супярэчыць справядлівасьці і праўдзе. Гэта ілжыва само ў сабе, затым што немагчыма быць вышэй за ўсё на сьвеце, і апрача гэтага - несправядліва, бо-ж усе іншыя дамагаюцца для сябе падобнага.

Паскаль

Дрэннае калясо заўсёды голасна скрыпіць. Пусты колас вышэй стаіць.

Л. Талстой

## НОВАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ ВОПРАТКА

Шмат гадоў таму жыў кароль, які гэтак любіў новую вопратку, што выдаваў усе свае грошы на яе. Ён зусім не шманаў пра сваіх жаўнераў ці пра тэатр або, каб катацца ў брычцы, і ўсё гэта затым, каб паказацца перад людзьмі ў сваей кажны раз новай вопратцы. Ён меў вопратку на кажную гадзіну дня. Замест таго, каб, як гэта звычайна гаворыцца пра караля, што "ён знаходзіцца ў кабінэце сярод сваіх міністраў", тут людзі заўсёды гаварылі, што "кароль знаходзіцца ў сваім апранальным пакоі".

У вялікім месьце, дзе знаходзілася рэзыдэнцыя караля, жыцьцё было вельмі ажыўленае. Што дня вялікая колькасьць чужынцаў прыбывала ў места з адведзінамі, і аднойчы разам зь імі прыбыла двух ашуканцаў. Яны прыкінуліся добрымі ткачамі, і казалі, што ведаюць як ткаць найпрыгажэйшую тканіну на сьвеце. І ня толькі колеры і ўзоры былі сваеасабліва далікатнымі, але вопратка, выкананая з гэтае тканіны, атрымлівала цікавую свомасьць ставацца нябачанаю для кажнага чалавека, які быў глупы або няпрыдатным для займанага ім становішча.

– Гэта мусіць быць асабліва пышная вопратка, – думаў кароль. – Носячы гэтакую вопратку, я мецiму нагоду выкрыць, каторыя людзі ў маім каралеўстве зьяўляюцца няпрыдатнымі на сваіх становішчах. Я змагу адрозьніць мудрых людзей ад глупых. Так, я мушу загадаць саткаць сабе гэтакую тканіну.

Кароль даў ашуканцам многа грошай наперад, каб яны безадкладна пачалі працу.

Ашуканцы ўставілі двое кросен і прыкінуліся, быццам ткуць, хоць яны нічога ня мелі на асновах і ў чаўнаках. Спачатку яны зажадалі пэўную колькасьць нітак з найтанчэйшага шоўку і найшчырэйшага золата, і ўсё гэта ўклалі сабе ў мяшкі, працуючы далей да позна ночы на парожных кросных.

– Я хацеў-бы ведаць, колькі ткачы ўжо наткалі матэрыялу, – думаў кароль, але ён чуўся крыху зьбянтэжаным, калі ўспомніў, што ніхто, хто быў глупы або няпрыдатны ня сваё становішча, ня можа бачыць як тканіна робіцца. І хоць ён быў пэўны, што сам ён ня мае чаго баяцца, усё-ж для большае пэўнасьці, думаў, ляпей будзе перш паслаць каго-небудзь іншага, даведацца як рэч маецца. Кажны чалавек у месьце ведаў якую цудоўную свомасьць мае тканіна і, ведама,

кажны быў цікавы даведацца, як глупым ці разумным ягоны сусед мог быць.

– Я пашлю да ткачоў майго найболей вернага і старога міністра, – думаў кароль. – Ён будзе найболей здатным пабачыць як тканіна выглядае, бо ён зьяўляецца найболей кемным чалавекам і ніхто іншы ня выконвае сваіх абавязкаў ляпей, чымся ён.

Тады, гэты добры і стары міністар увайшоў у памяшчэньне, у якім два ашуканцы сядзелі, працуючы пры пустых кроснах.

– Памажэце нам Нябёсы, – думаў стары міністар, адкрываючы вельмі шырака свае вочы. – Чаму я нічога ня бачу! – Але ён чыніў надлюдзкія натугі, каб не сказаць гэтага голасна.

Ашуканцы прасілі яго быць добрым і падыйсьці крыху бліжэй, і запыталі яго, ці ня думае ён, што тканіна мае добры ўзор з прыгожым разьмежаваньнем хварбаў. Пры гэтым яны паказалі на пустыя кросны. Бедны стары міністар вытрэшчваў з натугаю свае вочы, каб што-небудзь убачыць, але ён нічога ня бачыў – і гэта зь вельмі простае прычыны. Там нічога ня было, што можна было-б бачыць.

– О, Неба! – думаў ён. – Ці-ж гэта магчыма, што я глупы? Мне і на думку гэта ніколі ня прыходзіла; але, калі я і зьяўляюся ім, ніхто не павінен ведаць пра гэта. Ці-ж бы я не зьяўляюся прыдатным на сваім становішчы? Не, я ніколі не скажу, што я не магу бачыць тканіны.

– Ну, што, гаспадару, вы нічога ня кажаце пра тканіну, – сказаў адзін з ашуканцаў, каторы прыкідваўся, што тчэ.

– О, цудоўная – проста не наглядзецца, – сказаў міністар, – пільна узіраючыся праз акуляры. – Што за ўзор, і што за колеры! З усёю пэўнасьцю я скажу каралю, што тканіна вельмі спадабалася мне.

– Мы цешымся, чуючы ад вас гэта, – сказалі ашуканцы, і пры гэтым яны пачалі называць усе ведамыя ім колеры і апісваць выняткавыя ўзоры. Стары міністар уважна прыслухваўся гаворанаму, каб пасьля мець магчымасьць усё перапаўтарыць каралю, калі ён вернецца ў каралеўскі палац.

Тады ашуканцы папрасілі болей грошай і болей шоўку, і болей золата, кажучы, што ўсё гэта яны патрабуюць для свае працы. Але, фактычна, усё гэта яны хавалі ў свае кішэні. Ані водная нітка ня была ўведзена ў кросны, а яны ўсё нібы старанна ткалі, як і раней.

Хутка кароль выслаў іншага свайго вернага ўра-

доўца, каб даведацца, як тчэцца матэрыял і ці хутка будзе гатовы. І з гэтым урадоўцам здарылася тое самае, што і зь міністрам. Ён глядзеў і глядзеў, і нічога ня мог бачыць апрача абрысаваньняў кроснаў.

– Ці-ж ня прыгожы гэты кусок тканіны? – сказалі разам ашуканцы, паказваючы і паясьняючы прыгожыя колеры і ўзоры, якіх там ня было.

– Я ведаю, што глупым я не зьяўляюся, – думаў урадовец, – тады, мусіць быць, што я не надаюся на маё добрае становішча. Гэта дзіўна, запраўды. Але, ніхто не павінен ведаць пра гэта. – Сказаўшы гэтак сам сабе, ён пачаў хваліць тканіну, якое ён ня бачыў, і запэўніў іх адносна свайго захопленьня з прычыны прыгожасьці колераў і арыгінальнасьці ўзору.

– Цудоўная тканіна, – сказаў ён каралю. – Кажны чалавек у месьце гаворыць пра пышнасьць яе.

Цяперака кароль вырашыў, што ён сам мусіць паглядзець на тканіну, калі яна яшчэ аставалася ў кроснах. У сапраўдджэньні адумысна выбраных прыдворных, у тым ліку і тых двух верных урадоўцаў, каторыя ўжо аглядалі ўяўленую тканіну, ён пайшоў адведаць старанных ткачоў. Ткачы, як і раней, працавалі цяпер акуратна пры пустых кроснах.

– Гэта-ж надзвычайна, – сказалі абодва чэсныя ўрадоўцы. Толькі паглядзеце Ваша Каралеўская Міласьць што за ўзор! што за колеры! І яны паказвалі ў бок пустых кроснаў, думаючы бяссумліву, што іншыя могуць бачыць тканіну.

– Як гэта? – думаў кароль. – Я нічога ня бачу. Гэта-ж страшна! Ці-ж, запраўды, зьяўляюся я глупым? Ці-ж зьяўляюся я няпрыдатным на караля? Як гэта, ці-ж можа што-небудзь горшае здарыцца са мною?

– О, якая прыгожая! – сказаў кароль. – Я з удзячнасьцю прыймаю яе! – І, ківаючы галавою, ён выражаў сваё зьдзіўленьне, узіраючыся адначасна на пустыя кросны. Ня было гэтакае рэчы на сьвеце, якая-б змусіла яго сказаць, што ён нічога ня бачыць. Усе прысутныя ўзіраліся і ўзіраліся, напружвалі свае вочы, спадзяючыся ўбачыць тое, што, як яны думалі, іншыя бачаць; але ніхто нічога ня бачыў. Але гэта не перашкаджала ім усклікваць разам зь Яго Каралеўскаю Міласьцю: "Якая прыгожая!" І яны раілі яму апрануць вопратку, пашытую з гэткага цудоўнага матэрыялу дзеля адумыснае вялікае працэсыі, якая хутка мае наступіць. "Надзвычайная! Прыгожая! Пышная!" І словы пераказваліся з вуснаў у вусны. Усе яны ў аднолькавай меры былі здаволены тым, чаго яны ня бачылі. Кажнаму ашуканцу кароль надаў тытул СПАДАР

ТКАЧ і грамату на права нашэньня на грудзях адзнакі рыцарства.

Напярададні дня вялікае працэсыі ашуканцы працавалі ўсенькую ноч. Спалілі яны шаснаццаць сьвечак, каб паказаць людзям, як стараннымі яны былі, каб выканчыць на час каралеўскую вопратку. Яны прыкідваліся, што быццам здымаюць тканіну з краснаў. Яны кроілі яе ў паветры вялікаю параю ножніцаў, і сшывалі голкамі, якія ня мелі зацягнутых нітак.

І напасьледак яны сказалі:

– Цяперака каралеўская вопратка гатова.

Кароль узяў з сабою найвышэйшых прыдворных і пайшоў асабіста да ткачоў, і ашуканцы ўзьнялі свае рукі ў паветра, быццам яны запраўды трымалі нешта наўзьверсе і сказалі:

– Глядзеце, вось нагавіцы! А вось плашч! Вось мантыя! Уся вопратка лёгкая, як павуціньне. Хтонебудзь можа падумаць, што чалавек нічога ня мае на сабе. Але ў гэтым і знаходзіцца прыгожасьць яе.

– Так, – сказалі ўсе прыдворныя, але яны нічога ня бачылі, бо там і запраўды нічога ня было, што можна было-б угледзець.

– Ці не захацела-б Вашая Каралеўская Міласьць быць ласкаваю і зьняць сваю вопратку, – сказалі ашуканцы. – Тады мы можам апрануць новую вось тут перад вялікім люстрам.

Кароль зьняў зь сябе ўсю вопратку, і ашуканцы, прыкідваючыся, быццам падаюць яму адну частку вопраткі за другою, якую яны нібы то пашылі. Яны прыкідваліся быццам зашпіляюць нешта навакол ягонае паясьніцы і зацягваюць нешта навакол ягонае шыі. Гэта быў трэн, і кароль абяртаўся ўсё навакол перад люстрам.

– Як прыгожа Ваша Каралеўская Міласьць выглядае ў новай вопратцы! Як прыгожа дапасавана яна! – крычэлі ўсе людзі навакол. – Што за крой, і што за колеры! Гэта найпрыгажэйшая каралеўская вопратка.

– Надвары ўжо чакае бальдахін, пад якім Ваша Каралеўская Міласьць будзе крочыць урачыста ў часе працэсыі, – сказаў майстра цырымоніі.

– Добра, – сказаў кароль, – я ўжо гатовы. Ці-ж ня прыгожа ляжыць на мне вопратка? – Сказаўшы гэта, ён зноў павярнуўся перад люстрам так, каб відна было, што яшчэ нейкі раз спраўджвае сваю новую вопратку.

Каммэргэры, якія несьлі трэн, нахіліліся да зямлі, быццам падымаюць яго дзьвюма рукамі. Яны крочылі паважна ззаду з рукамі паднятымі ў паветры,бо

яны не маглі выявіць таго, што яны нічога ня бачаць.

І кароль урачыста крочыў у працэсыі пад пышным бальдахінам, і людзі на вуліцы і ў вокнах апавяшчалі:

– Якая прыгожая каралеўская вопратка! Як дасканала дапасавана! І што за пышны трэн! Ніхто зь людзей ня мог дазволіць сабе прызнацца, што ён нічога ня бачыць, бо гэта азначала-б, што ён не зьяўляецца адпаведным на становішчы, якое займаў або, што ён глупы.

Ніякая каралеўская вопратка перад гэтым ня мела гэткага паводжаньня.

– Але-ж кароль нічога ня мае на сабе, ён голы, – сказала малое дзіця.

– О, слухайце што кажа нявіннасьць, – сказаў бацька дзіцяці. І тое, што сказала дзіця, шэптам падавалася ад аднаго чалавека да другога: "Ён нічога ня мае на сабе – ён голы!"

– Ён голы! – пачалі, нарэшце, крычаць усе людзі.

Кароль зьбянтэжыўся ад сораму, бо ён ведаў, што гэта была праўда. Але ён думаў: "Працэсыя мусіць ісьці далей". Затым, сам ён трымаўся паважна, як ніколі перад гэтым, і каммэргэры падтрымоўвалі неспасьцярожны трэн.

Ганс Хрысьціян Андэрсэн

МАЛІТВА

Нашто пазбаўляць сябе малітвы, гэтага сродка супроць нашае немачы? Усе імкненьні душы, якія набліжаюць нас да Бога, асвабаджаюць нас ад думак пра сябе. Просячы помачы ў Бога, мы навучымся як знайсьці гэтую помач. Ня Ён зьінaчвае нас, але мы зьінaчваем самых сябе, зьбліжаючыся да Яго. Усё, што мы просім у Яго, як належнае, мы даем самыя сабе. І, прызнаючы сваю слабасьць, мы ўзмацоўваем нашую сілу.

Руссо

Малецеся-ж вось гэтак: Ойча наш, Каторы ёсьць у нябёсах; няхай сьвяціцца імя Тваё;

Няхай прыйдзе гаспадарства Тваё; няхай будзе воля Твая, як на небе, так і на зямлі.

Хлеб наш штодзенны дай нам сягоньня.

І даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем даўжнікомнашым;

І ня ўводзь нас у спакушэньне, але захавай нас ад злога.

Бо Тваё ёсьць гаспадарства і сіла, і слава навекі. Амін.

Мацьв. 6:9-13

Малітва ня хворма, але сіла.

Г. Э. Фосдік

## МАГУТНЫ БОЖА

Магутны Божа! Ўладар сусьветаў
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменьні Свае хвалы.

Дый спор у працы штодзеннай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць – дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот!
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!

Н. Арсеньнева

Ёсьць людзі, якія кажуць, што Бог для іх няясны. Фактычна, Бог затым для іх няясны, што яны ня моляцца.

Г. Э. Фосдік

Калі чалавек хоча зразумець розумам, што Бог клапоціцца пра людзей, пра малых птушак, яму гэта даецца зь вялікаю натугаю. Аднак-жа ёсьць шмат іншага, што цяжка бывае зразумець на першы пагляд. Напрыклад, навука давяла, што, паводля права прыцяжэньня, кажная частка ўсякага рэчыва прыцягваецца ўсякаю часткаю іншага рэчыва. Дзіця кідае мяч, мяч імкнецца ўпасьці на зямлю, а на спатканьне мячу ў гэтым самым часе імкнецца ўся зямная куля. Калі-б мы мелі болей чулыя прылады, маглі-б мы нават вымерыць рух зямное кулі ў напрамку мяча. Гэта рэчаіснасьць, але ўявіць сабе гэткае ўзаемнае прыцяжэньне бадай-што немагчыма... Аднак адсутнасьць уяўленьня сабе зусім не мяшае нам прызнаць тое, што прызнана навукаю, - а навукі ня можна ня прызнаць, - што, калі існуе права прыцяжэньня, дык і аграмадная плянэта прыцягваецца рухам нязначнага мяча. Гэтаксама і ў сьвеце духа дзейнічае вышэйшае права любові, на моцы якога Бог ідзе на спатканьне Свайму тварэньню.

Г.Э.Фосдік

Аднойчы раніцаю аддаўся Сакратас разважаньню аб нечым і, пагрузіўшыся ў свае думкі, застыў на месцы. Ня могучы ў думцы ісьці наперад, ён ня супыніў сваіх разважаньняў і ўсё стаяў і стаяў на тым самым месцы. Зьбліжыўся ўжо поўдзень, і людзі, якім кінулася гэта ў вочы, зьдзіўлена гаварылі між сабою, што Сакратас з самае раніцы стаіць і ўсё аб нечым думае. Нарэшце, калі надыйшоў вечар і ўсе павячэралі, некаторыя іёнцы - рэч мела месца летам - вынесьлі свае пасьцелі пад голае неба, каб, з аднае стараны, паспаць у прахалодзе, а з другой - паглядзець, ці будзе Сакратас стаяць на тым самым месцы гэтаксама і ўночы. І вось, ён прастаяў там да золаку, аж да ўсходу сонца; тады скіраваў ён сваю малітву да сонца, а пасьля гэтага пайшоў.

Плятон
<u>Сымпозыён</u>, 220

МАЛІТВА

Я, Божа, дзякую Табе
За ўсё, што маем на стале:
За хлеб, за соль, за дары ўсе,
Бо гэта ўсё з рукі Твае.

Ян Пятроўскі

## СЬВЯТА ЎРАЧЫСТАГА МАЛІТВА

Там, дзе існуе нянавісьць – дазволь мне
праявіць любоў.
Там, дзе існуе абраза – дараваньне.
Там, дзе існуе сумліў – веру.
Там, дзе пануе адчай – спадзею.
Там, дзе залегла цемра – сьвятло.
Там, дзе пануе сум – радасьць.

Недзе прачытанае

І запраўды, на душы чалавека, што моліцца, становіцца спакайней, усе людзі здаюцца яму мілейшымі і розум працуе ясьней, і наагул ляпей.

Г. Э. Фосдік

## МАЛІТВА

Дазволь мне чыніць маю працу кажнага дня, і калі цёмныя гадзіны адчаю перамогуць мяне, дай не забыць мне сілу, што пацяшала мяне ў часе духовае пустэчы. Дай мне не забыць сьветлыя гадзіны, якія засталі мяне вандруючага праз ціхія ўзгоркі майго раньняга дзяцінства, ці лятуценьняў на ўзьбярэжжы супакойнае ракі, калі сьвятло зіхацела ўва мне, а я прыракаў майму Богу захаваць мужнасьць сярод буры заўсёды зьменных гадоў.

Дазволь мне не забыць, што ўбогасьць і багацьце выяўляюцца ў галіне духа. Уздымі мае вочы зь зямлі і ня дай мне забыць прыгожасьць і вымоўнасьць зораў. Не дапусьці мяне паддацца гоману сьвету, але сапраўваджай мяне ціхім шопатам на маіх сьцежках. Дай мне некалькі праўдзівых прыяцеляў, якія будуць любіць мяне такім, якім я зьяўляюся, і кіруй заўсёды сьвятлом спадзеі мае вандроўныя крокі. І хоць гады і немач асілеюць мяне, і хоць я і не ўвайду ў замчышча маіх лятуценьняў і мрояў, вучы мяне ўсё-ж быць удзячным за жыцьцё.

Гэльлен А. Нагільл

Найляпей маліцца дома, бо ў зграмаджэньні немагчыма ўхіліцца ад зайздрасьці, чаўпні, абгавораў, што зьяўляецца прычынаю пакараньня. Асабліва ў сьвятачныя дні, калі зьбіраюцца,каб пагутарыць,ляпей зусім тады не маліцца.

Тальмуд

Папярэджваючыя малітве дзеяньні таго, хто моліцца, павінны адказваць сутнасьці і мэце ягонае малітвы, а калі малітву не папярэджвалі ніякія добрыя ўчынкі /ня кажучы ўжо пра тое, калі папярэджвалі нядобрыя/, дык таму, хто моліцца перад усім трэба пакаяцца ў сваіх грахох і ачысьціцца ад іх, бо інакш было-б вялікім нахабствам стануць перад Богам з просьбаю адносна сваіх патрэбаў, у брудпай вопратцы.

Гэтаксама рэч маецца, калі чалавек моліцца Богу вуснамі, якія прывыклі гаварыць агіднасьці, абмовы, непатрэбныя прысягі, клятвенасьці і г.п., - гэта быццам гасьцінец Богу, пададзены ў нячыстым футляры. Затым чалавек павінен ачысьціць свой язык і свае вусны, а калі зграшыў імі, дык павінен старацца поўным сэрцам раскаяцца.

Тальмуд

І, калі ты прынясеш ахвяру тваю на ахвярнік, і там успомніш, што брат твой мае нешта супроць цябе, пакінь там ахвяру тваю перад ахвярнікам, і пайдзі, перш пагадзіся з братам тваім, а тады ўжо прыйдзі і прынясі ахвяру тваю.

Мацьв. 5:23-24

Малецеся кажную гадзі́ну. Самая патрэбная і самая трудная малітва - гэта ўспомніць сярод актыўнага жыцьця пра свае абавязкі перад Богам і Ягоным правам. Спалохаўся, раззлаваўся, засумаваў, зьбянтэжыўся, захапіўся - успомні, хто ты і што́ ты павінен рабіць. Гэта і ёсьць малітва. Спачатку гэта трудна, але прывычку гэтую можна вырабіць.

Л. Талстой

Ведай, што мы молімся Богу і кладзем перад Ім свае просьбы не затым, каб Ягоная воля мелася быць падпарадкавана зьіначаньню, але затым, што, молячыся да Яго адносна заспакаеньня нашых патрэбаў, гэтым самым мы прызнаем Яго, а прызнаючы Ягоную магутнасьць, душа нашая ачышчаецца і ўздымаецца.

Тальмуд

Як добра бывае чалавеку, калі ён у мітусьні дарэмнае пагоні за шчасьцем на сьвеце, змучаны, працягне свае рукі да Бога.

Паскаль

У ПЭРСПЭКТЫВЕ

Веліч чалавека знаходзіцца ў ягонай сіле думкі.
Паскаль

Кажны чалавек ёсьць іґнорантам толькі ў іншым прадмеце.
Недзе прачытанае

Ніхто зь людзей ня ведае ўсяго.
== ==

Калі якія-небудзь людзі ганьбяць цябе або ненавідзяць, або дрэнна гавораць пра цябе, дык падыйдзі найбліжэй да іхнае душы, пранікні ў яе і паўзірайся, кім гэтыя людзі зьяўляюцца. Ты ўбачыш тады, што табе няма чаго турбавацца пра тое, што гэтыя людзі думаюць пра цябе. Аднак-жа, адносіцца да іх трэба з дабразычлівасьцю, бо, паводля натуры, яны суродзічы табе.
Марк Аўрэліюс, 9:27

Калі ты бачыш, што чалавек памыляецца, ня гневайся на яго: зразумей, што нельга наўмысьня памыляцца. Ніхто ня можа хацець, каб розум ягоны зацямніўся. Памыляецца той, хто шчыра прыймае няпраўду за праўду.

Але бывае і гэтак, што людзі не памыляюцца, а наўмысьня ня прыймаюць праўды нават і тады, калі яна адкрыта перад імі ўва ўсей сваей наяўнасьці. Яны ня прыймаюць яе не дзелятаго, што ня могуць зразумець яе, а затым, што яна дакарае іх у іхных дрэнных паступках, адбірае ад іх апраўданьне іхных недахопаў. На гэтых людзей гэтаксама ня трэба гневацца, а трэба шкадаваць іх, бо іхнае сумленьне, можна сказаць, хворае.
Эпіктэтус

Калі маленькая рэч мае сілу раззлосьціць цябе, ці гэта часамі ня кажа пра памер твайго характару?
Недзе пачутае

Найлепшым чалавекам ёсьць той, хто найболей імкнецца ўдасканаліць самога сябе; і найболей шчасьлівым чалавекам зьяўляецца той, хто найболей дасканаліць самога сябе.
Гэнрі Л. Дрэйк

Нам нельга перашкодзіць птушкам пералётваць над нашаю галавою, але мы ў моцы не дазволіць ім гнязьдзіцца на ёй. Падобна, немагчыма нам перашкодзіць дрэнным думкам праходзіць праз нашую галаву, але мы ў моцы не дазволіць ім зьвіць сабе там гнязда, каб выседжваць і выводзіць дрэнныя паступкі.

Др. Марцін Лютар

Кажуць, што той зь людзей бывае вялікім, каго асягненьні зьяўляюцца роўнымі асягненьням некалькі чалавек.

Недзе прачытанае

Калі мы сядзімо на вадаплаве, які парушаецца і глядзімо на які-небудзь прадмет на гэтым вадаплаве, дык мы не спасьцерагаем нашага руху; калі, аднак, мы зірнем у сторану на які-небудзь прадмет, які не парушаецца разам з намі, напрыклад, на бераг, дык мы зараз-жа спасьцеражэм свой рух. Гэтаксама бывае і ў жыцьці. Калі ўсе людзі жывуць ня гэтак, як трэба, дык гэта неспасьцярожна, але няхай толькі адзін апамятаецца і пачне жыць па-Божаму, зараз-жа становіцца спасьцярожным, як дрэнна паступаюць усе іншыя.

Улас Паскаль

Не раздабэрваць-жа ўвесь час пра тое, якім добрым чалавек павінен быць, пара́ ўжо і стацца ім.

Марк Аўрэліюс, IO:I6

Чалавек не радзіўся слабым: ён стаўся гэтакім, як захварэў.

Вольтэр

Найболей шляхэтная помста - гэта даравацъ.

Томас Фульлер

Нічога не зьяўляецца гэтак распаўсюджаным, як насьлядаваньне практыкі ворага, і ўжываньне ягонае зброі.

Вольтэр

Ня бойся ніколі і нічога. Тое, што́ ў табе найболей дарагое, ня можа быць пашкоджаным кім-небудзь, ані чым-небудзь.

Л. Талстой

Апраўдай суд, выдадзены на цябе і асвабадзі самога сябе ад гневу.

Тальмуд

Чалавек, які ня мае ворагаў, ня мае гонару і ня варты мець прыяцеляў.

Божым Шляхам, № 132

Мы павінны сказаць кажнай індывідуальнасьці: "Памятай тваю годнасьць чалавека".

Вольтэр

Чалавек не зьяўляецца творам абставінаў. Абставіны зьяўляюцца творам чалавека.

Бэньямін Дісраэлі

Трыццаць шпіц злучаюцца ў вадной пустой калодцы, і ад таго, што ня існуе, ад пустэчы ў калодцы, залежыць карысьць кола.

З гліны робяцца пасудзіны, і ад таго, што ня існуе, ад пустэчы пасудзіны, залежыць яе карысьць.

Вырэзваюць дзьверы і вокны ў доме, і ад гэтага, што ня існуе, ад створанае пустэчы, залежыць карысьць дому.

Дзелягэтага, калі рэчы карысныя, дык толькі тое, што ў іх ня існуе, творыць іх гэткімі.

Ляо-Тсэ

Здароўе зьяўляецца рэчаю, пад уплывам якое чалавек адчувае, што цяперака ёсьць найлепшая пара году.

Недзе прачытанае

Ня лёгка паказаць на каго-небудзь, хто стаўся-б няшчасным з прычыны таго, што быў-бы няўважным да таго, што адбываецца ў чужой душы. Але няўхільна будзе няшчасным той, хто ня сочыць за праявамі свае ўласнае душы.

Марк Аўрэліюс, 2:8

Характар зьяўляецца рэзультатам дзьвюх рэчаў - мэнтальнае паставы і спосабу, у якім мы праводзім наш час.

Альбэрт Наббарт

Насьмешка ніколі ня шкодзіла праўдзе, але рост праўды затрымліваецца ў таго, хто сьмяецца зь яе.

Люсі Малёры

Лепшы спосаб абароны перад крыўдзіцелем - гэта не ўпадабняцца да яго.

Марк Аўрэліюс, 6:6

Мы трымаем жыдоў пад абухам жаху, і ўпарта дамагаемся, каб усё напісанае жыдамі і намі сабранае ў цэласьць, насіла адпячатак Боскасьці. Ніколі ня было на сьвеце болей яскравае супярэчнасьці, як гэтая.

Вольтэр

І няхай іншыя пагарджаюць табою, няхай уважаюць цябе за нямудрага, няхай крыўдзяць, калі яны хочуць, няхай нават б'юць цябе, на нябёсы, - усё цярпі спакойна - і сорам, і біцьцё, памятаючы, што з табою нічога ня здарыцца дрэннага, калі ты, запраўды, годны чалавек і аддадзены цноце.

Плятон
Ґорґіяс, 527

У нашым часе, філязофія сталася тэхнічным прадметам, яна практыкуе звычайную інтэлектуальную цікавасьць дзеля цікавасьці толькі. Для Плятона, філязофія азначала гэтаксама і шлях жыцьця. Чалавек зьяўляецца філёзафам не затым, што ведае тое ці гэтае, але перад усім, што ён зьяўляецца нейкім асаблівым чалавекам; бо "ўнутраное месца" - якое зьяўляецца ягонаю ўласнаю душою - самаўпраўляецца розумам. Філязофія зьяўляецца асабістым дасьведчаньнем; свайго роду шляхам збаўленьня - мудрасьцю. Із прычыны свайго інтымнага асабістага характару, цнота ня можа пераказвацца пры помачы друку, ані нават пры помачы гаворанага слова. Навучаньне тут можа быць памысным пад умоваю, што яно абасноўваецца на сяброўскасьці паміж вучыцелем і вучнем; вучань мусіць мець асабістую адпаведную сьпеласьць, каб разумець праўду. Ідэямі ня могуць быць завальваныя, калі гэтак можна сказаць, без разбору нашыя рынкі, як гэта робіцца сягоньня пры дапамозе кніжак. Ідэі пераказваюцца дарогаю датыканьня, асабістага кантакту, ад чалавека да чалавека. "Бо філязофія мая не дапушчае слоўнае фармуляцыі, але пасьля даўжэйшага і неспасьцярожнага тасаваньня адносна зацікаўленага і пасьля жыцьця супольна зь ёю, зьнічэўку родзіцца ў душы іскра зразуменьня, якая, калі запаліцца, гарыць сама сабою".

Б. Джоўітт

Нават і дзяцел мае свае асягненьні, дзякуючы таму, што ён працуе галавою.

Недзе прачытанае

– Гаспадарства,+/– сказаў я,– узьнікае, як я мяркую, калі кажны з нас не зьяўляецца ў стане абясьпечыць самога сябе, і патрабуе яшчэ шматлікае. А мо' ўяўляеш ты сабе які-небудзь іншы першапачатак закладзінаў гаспадарства?

– Не, ніякі іншы, – сказаў Адэімантос.

– Затым, калі нехта мае лічныя патрэбы, тады кліча таго і іншага, каб забясьпечыць гэтыя патрэбы; адзін бярэ сабе памочніка з аднае прычыны, а іншы – зь іншае; і калі гэтыя ўдзельнікі і памочнікі сузграмаджваюцца супольна ў вадно аселішча, тады гэтакую супольнасьць называем мы гаспадарствам. Ці ня гэтак?

– Так, – адказаў той.

– Яны ўзаемна ўдзельваюцца сабе, адін дае, а іншы атрымлівае; і атрымліваюць, маючы на думцы, што вымена іхная будзе дабром для іх?

– Ведама.

– Тады, – сказаў я, – давайце займемся ў думцы пабудоваю гаспадарства з самага пачатку. Як выяўляецца, яго творацъ нашыя патрэбы?

– Натуральна,–адказаў ён.

– Цяперака, першая і найбольшая з усіх патрэбаў – гэта ежа, неабходная для падтрыманьня існаваньня і жыцьця.

– Бязумоўна.

– Другая патрэба – памешканьне, і трэйцяя – вопратка і падобнае.

– Гэтак яно ёсьць.

– А цяперака паглядзімо, – сказаў я, – як нашае гаспадарства можа абясьпечыць сябе гэтымі вялікімі патрэбамі: ці ня так, што хто-небудзь будзе земля-

---

+/ Разважаньне Сакратаса з Адэімантосам на тэмат гаспадарства, якое тут падаецца, узята з Плятонавае Політэйі /369с–371е/ – з аднаго найболей важнага дыялёгу, напісанага філёзафам у пазьнейшых і дасьведчаных гадох ягонага жыцьця. У дыялёгу гэтым Плятон займаецца паняцьцем гаспадарства, паўстаньнем яго, суадносінамі грамадзяніна да грамадзяніна, суадносінамі грамадзяніна да гаспадарства, жыцьцём дзяржаўных мужоў, правам у гаспадарстве, правам грамадзяніна як і справядлівасьцю і несправядлівасьцю. Абавязкам кажнага чалавека прачытаць уважна гэты дыялёг, каб стацца ня толькі патрыётам свайго народу, але стацца сьведамым і асьвечаным патрыётам.

робам, іншы - будаўнічым, яшчэ іншы - ткачом? Ці мамем мы яшчэ дадаць сюды шаўца і яшчэ каго-небудзь з тых, што абслугоўваюць нашае цела?

- Зусім трапна.

- Што найменей, гаспадарства павінна складацца з чатырох або пяці чалавек.

- Выглядае гэтак.

- Тады, як маюць яны пастулаць? Ці кажны зь іх павінен выконваць сваю працу з разьлікам на ўсіх наагул? Напрыклад, земляроб, хоць ён і адзін, павінен гадаваць хлеб на чатырох, затрачваць учэцьвера болей часу і працы і выдзельваць іншым з таго, што ён выпрадукаваў, а мо, не шманаючы пра іх, павінен здабываць толькі чацьвертую частку гэтага хлеба выключна для самога сябе і затрачваць на гэта адно толькі чацьвертую частку свайго часу, а рэшту ягонага часу - тры часткі - зужыць на пабудову хаты, выраб вопраткі, абутку і не клапаціцца пра іншых, але прадукаваць усё сваімі ўласнымі сіламі і выключна для самога сябе?

- Я думаю, Сакратас, - адказаў Адэімантос, -што ён павінен прадукаваць толькі ежу і не вырабляць нічога іншага.

- Вельмі магчыма, - адказаў я, - што гэта будзе лепшы спосаб; і, чуючы як ты выражаеш сваю думку, я і сам сабе ўсьведамляю, што мы ўсе не зьяўляемся аднолькавымі; існуюць натуральныя розьніцы між намі, і людзі ўспрыймаюць нахіл да розных заняткаў. Ці ня гэтак і ты думаеш?

- Я гэтаксама думаю.

- Затым як? Хто будзе ляпей працаваць - ці той, хто займецца кажным мастцтвам, ці той, хто толькі адным?

- Той, хто займецца толькі адным.

- Ясным ёсьць, як мне здаецца, што, калі нехта страціць час над неадпаведным для яго выкананьнем пэўнае рэчы, ён згубіць добрую нагоду.

- Ясным ёсьць.

- Бо, як мне здаецца, ніякая праца не захоча чакаць, пакуль у работніка знойдзецца свабодны час; наадварот, чыніцель павінен праявіць усякае стараньне над тым, што ён робіць, і сачыць, каб дадзеная праца была першым аб'ектам ягонае ўвагі.

- Абавязкава.

- І, калі гэтак, дык трэба ўчыніць выснаў, што ўсе рэчы прадукуюцца ў большай колькасьці, лягчэй і лепшае якасьці, калі чалавек выконвае адну рэч у сузгоднасьці са сваім натуральным нахілам і займаец-

ца ёю ў абазначаным часе з канцэнтрацыяю свае ўвагі толькі на ёй.

- Бяссумліву.

- Затым, мы патрабавацімем, Адэімантос, болей як чатырох грамадзян. Бо-ж земляроб ня будзе майстраваць патрэбнае для яго добрае сахі ані гэтаксама выраблянь матыкі ці іншыя земляробскія прылады. З другое стараны, і будаўляны майстра ня будзе рабіць для сябе інструманты працы, бо-ж і ён патрабуе рознае з гэтага; гэтаксама рэч маецца з ткачом і шаўцом.

- Праўду кажаш.

- Калі, зноў, цесьляры, кавалі і шматлікія іншыя майстры прымуць удзел у нашым маленькім гаспадарстве, дык яно пачне разрастацца.

- Напэўна.

- Але нават калі мы дадамо валапасаў, аўчароў і тых, што даглядаюць быдла на пашы, і іншых пастухоў, каб земляробы мелі валоў да гараньня, будаўнічыя разам зь земляробамі - упражное быдла для перавозкі цяжараў, а ткачы і шаўцы - шкуру і воўну, дык і тады гаспадарства нашае ўсё яшчэ ня будзе вельмі вялікае.

- Гэта праўда; але і ня вельмі малым будзе гаспадартсва, калі меціме ўсё гэта.

- Але, - сказаў я, - закласьці гэтакае гаспадарства ў мясцовасьці, дзе яно не патрабавацiла-б давозу звонку, бадай-што немагчымым ёсьць.

- Запраўды немагчыма.

- Тады, му́сяць быць іншыя людзі, якія будуць увозіць зь іншае краіны тое, што́ патрэбна.

- Мусяць быць.

- Але гэтакі ўвозчык /διάκονος/ толькі тады ня вернецца з парожнымі рукамі, але з тым, што́ тут патрабавалася, калі ён адсюль выйдзе не парожны, з даставаю таго, што́ спадзяюцца там атрымаць.

- Гэтак і мне выдаецца.

- Затым, трэба будзе прадукаваць дома ня толькі тую колькасьць, якая патрэбна для забесьпячэньня самых сябе, але ў аднолькавай колькасьці і якасьці ўсё тое, што́ патрабавацімуць тыя, што заспасабляюць іхныя патрэбы.

- Так, трэба будзе.

- Тады, спатрэбіцца болей земляробаў і рамесьнікаў у нашым гаспадарстве.

- Болей, запраўды.

- Гэтаксама трэба ўспомніць тых, што будуць займацца экспортам і імпортам, каторых называюць куп-

цамі. Ці ня так гэта?

– Але́.

– Затым, і купцы нам спатрэбяцца.

– Ведама.

– А калі спатрэбіцца весьці заморскі гандаль, патрэбнымі будуць у значнай колькасьці гэтаксама і вадаплаўнікі, што ведаюць штуку морскага плаваньня.

– О так, у значнай колькасьці.

– Ну, а як рэч маецца ў самым месьце+/? Як яны будуць праводзіць абмен уласнае прадукцыі? Запэўненьне гэтага абмену і было, як ты напэўна памятаеш, адно з снаўных мэтаў хвармацыі людзкае супольнасьці, якую мы назвалі гаспадарствам.

– Ясна, – адказаў ён, – дарогаю куплі і прадажы.

– Згэтуль, яны патрабавацімуць рынак і манэту, каб умагчыміць сабе абмену.

– У кажным выпадку.

– Калі земляроб ці хто-небудзь з рамесьнікаў прынясе свой выраб на рынак і прыбудзе ў такім часе, калі ня будзе з кім даканаць абмену, дык ці-ж ня ста́нецца, што ён, седзячы на рынку, будзе траціць час, патрэбны яму для працы?

– Зусім не, – адказаў ён, – бо знойдуцца людзі, якія, бачучы гэта, запрапануюць яму свае паслугі. У добра ўладжаных гаспадарствах, гэта звычайна людзі слабыя целам і няпрыдатнымі астаюцца да ніякае іншае працы; іхная задача – быць на рынку, і даць грошы ў замен за тое, што́ нехта хоча збыць, і атрымаць грошы ў замен ад таго, хто хоча купіць.

– Гэтая патрэба, – сказаў я, – стварае ў нас у месьце дробных гандляроў. Ці-ж "гандляр" ня ёсьць тое слова, якім мы называем таго, хто сядзіць на рынку і пасярэднічае ў куплі і прадажы, тады як тых, што падарожнічаюць зь места ў места, называем мы купцамі?

– Ведама.

– Гэтаксама ёсьць, як я думаю, яшчэ іншыя службістыя /διάκονοι/, якія з прычыны іхных духовых вартасьцяў, ня вельмі заслугоўваюць, каб быць уцягнутымі ў супольнасьць, але яны цешацца з прычыны свае фізычнае сілы, дастатковае для выконваньня цяжкіх працаў. Гэтыя прадаюць у наймы сваю сілу і называюць узнагародаю цану за наймы; затым, калі я не памыляюся, і называюць іх наймітамі. Ці ня так гэта?

– Так.

---

+/ У старажытных грэкаў нашае паняцьце места і гаспадарства абазначалася словам по́ліс /πόλις/.

- Для дапаўненьня нашага гаспадарства, як відаць, патрэбнымі ёсьць і найміты.

- I мне гэтак здаецца.

- Дык ці-ж не разраслося у нас, Адэімантос, гэтак ужо гаспадарства, што можна яго ўважаць за дасканалае?

- Бадай-што.

- Тады, дзе-ж у ім ёсьць месца для справядлівасьці і несправядлівасьці? I ў чым з таго, пра што мы гаварылі, яны ўзьнікаюць?

Плятон
Політэйя

Каб вас ня вучылі заўсёды іншыя - вучэцеся самі: нашая Бацькаўшчына патрабуе лепшых людзей, чым мы ёсьць. Каб ня спыніцца - пазнавайце новае. Каб вас успаміналі па сьмерці, ня будзьце мёртвыя пры жыцьці. Ведаючы куды ісьці, не забывайцеся, адкуль вы прыйшлі.

Масей Сяднёў

Той будзе пабітым, хто, асягнуўшы перамогу, астаецца на полі бітвы.

Парацэльсус
/Ф. Заўэрбрух, "Дас вар майн Лебэн", 1951, б. 5/

Насупраць вакна, пры якім я пішу, аграмадны бык прывязаны за пе́рсьцень, прадзеты праз ноздры. Пашчыпваючы траву, ён абкруціў сваю вяроўку навакол слупа і, як вязень, стаіць цяперака, мучаны голадам, пазіраючы на раскошную зелень травы, пазбаўлены магчымасьці нават ускінуць галаву, каб сагнаць мух, якія кусаюць ягоныя плечы. Ён неаднакратна прадпрыймаў дарэмны высілак, каб асвабадзіцца, але кажны раз, жаласна прамычаўшы, заціхаў, каб моўчкі цярпець.

Гэты бык, абдораны магутнаю сілаю, але з адсутнасьцю дастатковага зразуменьня, каб сьцяміць, як яму можна асвабадзіцца, які церпіць ад голаду сярод дастаку і які стаецца бязрадна ахвяраю значна слабейшых тварэньняў, - узьдымаецца парада мною быццам эмблема працоўных людзей.

Ува ўсіх краінах людзі, працаю каторых творыцца дабрабыт і багацьце, кі́даюцца ў галечы. У тым самым часе, калі прагрэсыўная цывілізацыя распашырае гарызонт думкі і будзіць новыя асьпірацыі, гэтыя людзі апушчаюцца, толькі дзеля заспакаеньня сваіх

першых жыцьцёвых неабходнасьцяў, да ўзроўню жывёлінага існаваньня. Асансоўваючы ўсю горыч няпраўды, адчуваючы на дне душы, што яны створаны зусім не дзеля гэтакага няшчаснага жыцьця, - людзі гэтыя часамі змагаюцца і пратэстуюць. Але да тае пары, пакуль яны не навучацца бачыць павязаньня паміж наступствам і прычынаю; да тае пары, пакуль яны не зразумеюць, якім гэта спосабам яны спутаны і як яны могуць вызваліцца, - да тае пары іхныя натугі і пратэсты будуць і далей дарэмнымі, гэтак як натугі і жалоснае мычэньне таго быка, што запутаўся, - і яшчэ нават будуць болей дарэмнымі. Я выйду з пакою і адганю быка, накіроўваючы яго гэтак, каб адкруцілася вяроўка, тады як людзей ніхто не накіруе ў напрамку свабоды. Да тае пары, пакуль яны не пачнуць карыстацца розумам, якім яны абдораны, ніхто не паможа ім, ніхто ня ўчыніць іх вольнымі.

Апошняя палітычная ўлада, пры розных хвормах урадаваньня, заўсёды знаходзіцца ў руках масы. І ў запраўднасьці зусім не каралі або арыстакраты, зусім не абшарнікі ці капіталістыя паняволььваюць народ. Яго паняволььвае ягоная ўласная цемра.

Гэнрі Джордж

Помні, моладзь, хто прывыкне згінаць шыю, ужо вачэй ня ўзьніме ўгару.

Натальля Арсеньнева

Мы жывем у эпоху дысцыпліны, культуры і цывілізацыі, але зусім не ў эпоху маралі. Пры сучасным стане людзей можна сказаць, што шчасьце гаспадарстваў расьце разам зь няшчасьцем людзей. І астаецца яшчэ пытаньне, ці ня былі-б мы болей шчасьлівымі ў стане першабыту, калі ў нас ня было-б гэтай культуры, якую назіраем у сучасным стане.

Бо як гэта магчыма ўчыніць людзей шчасьлівымі, калі іх ня чыняць маральнымі і мудрымі!

Кант

Працоўныя людзі і капіталістыя перад тым, як упарадкаваць свае суадносіны, павінны адкінуць старавечны Майсеевы закон "вока за вока і зуб за зуб" і правесьці ў жыцьцё права любові: - абыходзіцца зь іншымі так, як хочаш, каб іншыя абыходзіліся з табою.

Люсі Малёры

Сусьвет мае свае правы. Калі мы жывем у сузгоднасьці зь імі, дык правадаўца праяўляе да нас сваю прыхільнасьць; калі-ж не, дык наадварот. Скажэце: якімі правамі і галасаваньнем вырашыце вы, напрыклад, гэтакае пытаньне: "займець шляхэтнае завяршэньне справы, як прадукт супольнае дзейнасьці нягоднікаў". Кажнаму ведама, што гэта нявырашальная дылема. І колькі-б вы не пералічвалі яго на найболей хітра пабудаваных кампутарах, у падсумаваньні атрымаецца ўсё-ж нягоднасьць, магчыма ў новай вопратцы, у новым падхарошаньні. Як доўга мы астаемося прастакамі і халопамі, як можа кіраўніком нашым быць герой. Ведама, будзе намі кіраваць, але не праўдзівы, але здадуманы герой, імя якому - шаленства; і яно пад маскаю прыстойнасьці будзе напоўнена крывадушнасьцю і махлярствам, на якое натура адкажа заўсёды: не і не.

Карляйль

Памыснасьць краіны не залежыць ад надмернага багацьця гадавога прыходу гаспадарства, ані ад сілы яго ных фартыфікацыяў, ані ад прыгожасьці публічных будынкаў; памыснасьць гэтая зьмяшчаецца ў ліку духова ўзрастаючых грамадзян, у людзях навукі, асьветы і характару; тут мае быць знойдзена праўдзівае зацікаўленьне, яе галоўная сіла, яе фактычная магутнасьць.

Марцін Лютар

ПРАЦА

Недзе ў першай палове 30-ых гадоў нашага стагодзьдзя прыехала ў Вільню ў адведзіны да маесястры блізкая сваячка па мужу, Ганна Ляпеша, якая ўсё сваё жыцьцё жыла ў вёсцы Дварчаны і ніколі ня выходзіла са свайго роднага кута далей, як да Васілішак у Лідзкім павеце. Ганна была каталічкаю і, як усе ў вёсцы, гаварыла толькі пабеларуску.

Сястра мая, гэтаксама з прозьвішчам Ляпеша, жыла на Новым Сьвеце, тут-жа пры асабовай цягніковай станцыі недалёка ад другога канца віядукту,што злучаў Калеёвую вуліцу з Новым Сьветам пры Другім Сьняговым Завулку.

Назаўтра сястра павяла Ганну ў цэнтр Вільні,каб паказаць госьці ўсё тое, што можна бачыць у вялікім месьце. І ўсё, што Ганна бачыла па дарозе, займала яе ўвагу: доўгі і высокі віядукт, а пад ім ува ўсе кірункі нязьлічаная колькасьць чыгуначных рэек, на каторых стаялі або вольна рухаліся вагоны, злучаныя ў цягнікі; чутнымі былі гудкі паравозаў і ляскацьне між вагонамі. Прайшоўшу хутка частку Каляёвае вуліцы, яны ўвайшлі на Вастрабрамскую і сястра зьвярнула Ганьніну ўвагу на касьцёл Вастрабрамскі зь ведамаю Цудоўнаю іконаю Божае Маці Вастрабрамскае, пра якую Ганна калісьці ўжо ці раз чула. Хутка, увайшоўшы праз вузкія вароты брамы, яны знайшліся перад самаю іконаю, што памяшчалася ў капліцы над брамаю і,з глыбокім рэлігійным пачуцьцём памаліўшыся перад іконаю, пайшлі ў напрамку Вялікае вуліцы. Ганна са зьдзіўленьнем першы раз у сваім жыцьці бачыла гэтак вялікія мураваныя дамы, пабудаваныя шчыльна адзін да другога,надаючы вуліцам від нейкіх глыбокіх праходаў, што разыходзіліся ў розныя напрамкі - а на вуліцах тых народу болей, як ёй здавалася, чымся на кірмашы ў Васілішках; і ніхто зь людзей не стаяў, а ўсе пераважна ішлі, кудысьці сьпяшаючыся. І раптам, у галаве ў яе ўспыхнула праўдзіва філязафічнага значэньня і бясхітраснае пытаньне, зь якім яна зьвярнулася да свае спадарожніцы:

- Панічка, - азвалася яна, - скажы мне, з чаго гэтыя людзі жывуць? дзе іхнае поле?

Ян Пятроўскі

З усіх ведамых нам працаў самая радасная - гэта праца земляробства.

Л. Талстой

Чым зьяўляецца жыцьцё, калі ня выконваць працы падчас ягонага трываньня?

Карляйль

На вялікую пашану заслугоўвае той, хто жыве з працы рук сваіх, чымся той, хто пахваляецца адно сваею богабойнасьцю.

Сорамна чалавеку, калі яму ра́дзяць у працавітасьці сваей браць прыклад з мурашкі; шмат болей сорамна, калі ён ня ідзе за гэтая ра́даю.

Тальмуд

Запраўды, самая найлепшая ежа тая, якую вы або вашыя дзеці запрацавалі.

Магамэт

Я ніколі нічога не рабіў, што́ было вартым майго чыну, прыпадкава, гэтак як і ніякі з маіх вынахадаў ня стаўся прыпадкава; усе мае вынахады прайшлі да быцьця, дзякуючы працы.

Т. Э. Эдісон

Тыя, што не працуюць у летнюю сьпякоту, будуць галадаць у часе студзённае зімы.

Джон Гэйвуд

Добра жыць - значыць добра працаваць, праявіць належную актыўнасьць.

Тамаш Аквінскі

Сума мудрасьці атрымліваецца тады, калі ніколі ня губіцца часу, прысьвечанага працы.

Р. У. Эмэрсон

Добрая праца творыць прыгожыя рэчы, і прыгожая праца трывалкаю ёсьць.

Лёрд Дансані

Багаты і бедны, сільны і слабы, і кажны чалавек, які не працуе - гэта нягоднік. Затым, кажны чалавек павінен навучыцца рамяства, праўдзівага рамяства, ручное працы. I гэта затым патрэбна, каб зьнішчыць забабон пагарды фізычнае працы. Працуйце з прычыны прынцыпу, калі ў вас няма патрэбы працаваць. Зыйдзеце да ўзроўню рамесьніка, каб знайсьціся вышэй за бязьдзейную групу людзей.

Ж.-Ж. Руссо

Адна з радасьцяў, якая не паддаецца сумліву, - гэта радасьць адпачынку пасьля дакананае працы.

Кант

Былі два браты. Адзін служыў у караля, а другі жыў з працы рук сваіх. Аднойчы багаты брат сказаў беднаму:

- Чаму ты ня ідзеш на службу да караля, гэтым ты ўхіліўся-б ад ліхалецьця працы?

На гэта бедны адказаў:

- Чаму ты не працуеш, каб ухіліцца ад паніжэньня і няволі? Разумныя людзі даўно ўжо казалі, што ляпей спакойна есьці хлеб свае працы, чымся насіць залаты пояс і быць слугою іншага. Ляпей мясіць рукамі вапну і гліну, чымся складваць іх на грудзях на знак свайго паняволеньня. Ляпей радавацца з куска хлеба, чымся паняволыіцку гнуць сьпіну.

Садзі

Трэба было-б уключыць у мучэньні пекла вечнае нічога-нявробленьне, а яго, наадварот, умясцовілі сярод радасьцяў раю.

М. Монтэнь

Пры самай звычайнай рабоце душа чалавека супакойваецца, як толькі чалавек бярэцца за працу. Зьнеахвочаньне і сум, злосьць і адчай - усе гэтыя чарцяняты падпілноўваюць беднага як і кажнага чалавека; але ён з ахвотаю бярэцца за працу, і ўсе чарцякі не адважваюцца дасупіцца да яго і толькі здалёк бурчаць. Чалавек стаўся чалавекам.

Карляйль

Існуе адпаведная годнасьць і прапорцыя, якія трэба перасьцерагаць пры выкананьні кажнага чыну ў жыцьці.

Марк Аўрэліюс

Праца - выраблецьне сваіх фізычных сілаў ёсьць неабходнаю прадумовінаю жыцьця. Чалавек можа асвабадзіць сябе ад вонкавае патрэбы працы, можа змусіць іншых рабіць тое, што́ яму патрэбна, але ён ня можа асвабадзіць сваё цела ад неабходнасьці працы. Калі ён ня будзе выконваць патрэбнае для яго, разумнае, тады ён будзе рабіць непатрэбнае і дурное.

Л. Талстой

Нямудры чалавек працуе, каб піць і есьці, тады як разумны - п'е і есьць, каб працаваць.

Паводля Сакратаса
/Дыяґэнэс Ляэртыйскі, <u>Сакратас</u>, I4/

Чалавек зьяўляецца вытокам свайго чыну.

Арыстотэлэс

Любі тое малое рамяство, якога ты навучыўся, і знайдзі ў ім задаволеньне. Рэшту жыцьця пражыві, як чалавек, каторы аддаўся ўсенькаю душою, ува ўсім тым, што адносіцца да яго, не жадаючы быць ані нявольнікам, ані тыранам у адносінах да каго-небудзь зь людзей.

Марк Аўрэліюс, 4/3I

Запраўды, ляпей кажнаму з вас узяць вяроўку і пайсьці ў лес па дровы і прадаць вязку іх, каб купіць яды, чымся прасіць людзей, каб яны далі вам. Калі яны не дадуць вам, вам будзе брыдка і няпрыемна, а калі дадуць - будзе яшчэ горай: вы будзеце маральна ўзалежненымі ад даючага.

Магамэт

Праца толькі тады радасная, калі яна бяз сумліву патрэбная.

Л. Талстой

Кажная праца важнаю ёсьць, бо яна чыніць чалавека шляхэтным. Не навучаць сына якога-небудзь рамяства - роўназначна падрыхтоўваньню яго да грабежы.

Тальмуд

Жыцьцё аркадзкіх пастушкоў і нашае гэтак пажаданае прыдворнае жыцьцё абодва недарэчныя і ненатуральныя, хоць і прывабныя. Бо ніколі ня можа быць запраўдная радасьць там, дзе прыемнасьці перайначваюцца ў занняткі. Толькі рэдкія адпачынкі ад працы, кароткія і без падрыхтовы, бываюць моцныя і вырозьніваюцца запраўдным смакам.

Кант

Працуй стала, не ўважай працу для сябе за гора і не жадай сабе за гэта пахвалы і спагады. Агульнае дабро - вось што павінна быць тваім жаданьнем.

Марк Аўрэліюс

Добры пачатак - ёсьць палова ўчыненага.

Арыстотэлес

Ці ўзіраліся вы калі-небудзь на ганчарскае кола, рэч, якая карыстаецца сваеасаблівою павагаю і болей старажытная, чымся прарок Язэкіель. Тоўстыя камякі гліны, у выніку хуткага абяртаньня, стаюцца цудоўнымі судзінамі. Паўзірайцеся цяперака на самага стараннага ганчара, але бяз кола; уявеце сабе, што ён змушаны вырабляць начыньні, надаваць ім хворму рукамі. Гэтакім ганчаром быў-бы сам лёс, калі-б людзкая душа заўсёды супачывала ў самаздаволеньні, не жадаючы ані працаваць, ані хвалявацца. З гультаяватага, павольнага чалавека найболей добразычлівы лёс не даканае нічога добрага; гэтаксама як і самы старанны ганчар бяз кола, колькі-б ён ні стараўся, апрача камяка гліны нічога не атрымае; і колькі-б ён не размалёўваў гэты камяк і не акладаў яго золатам і эмальлю, - камяк астанецца камяком.

Няхай гультаяватыя і самаздаволеныя не забываюць гэтага.

Карляйль

Калі ня хочаш працаваць, - гні сьпіну або гвалтам бяры.

Л. Талстой

Пачатак зьяўляецца найболей важнаю часткаю працы.

Плятон
/Політэйя, 377/

"Калі хочаш асягнуць духовы супакой", кажа філёзаф, "дык абмяжуй сваю дзейнасьць да нешматлікага",і ці-ж не ляпей было-б сказаць да "небходнага" і да таго, што загадвае розум?

Марк Аўрэліюс

Некаторыя людзі чыняць сьвет лепшым, дзякуючы прысутнасьці сваей у ім.

Ґ.В.Даўґляс

Меней часу займае зрабіць рэч добра, чымся высьняць, чаму ты зрабіў яе дрэнна.

Гэнрі Ўадсўворд Лёнґфэльлёў

Фізычная праца ня толькі што не адкідае магчымасьцяў разумовае працы, ня толькі палепшвае яе годнасьць, але і падбадзёрвае яе.

Л. Талстой

Калі табе ня хочацца ўстаць на золаку, дык зараз-жа скажы сабе: "Я ўстаю, каб узяцца за працу чалавека. Няўжо-ж я пачну наракаць, што іду да працы, дзеля якое я пакліканы да жыцьця ў сьвеце! Няўжо-ж маё наканаваньне - грэцца, расьцягнуўшыся на ложку?"

Марк Аўрэліюс

Ручная праца ёсьць абавязак і шчасьце для ўсіх; дзейнасьць розуму і выяўленьня ёсьць дзейнасьцю вынятковага характару. Яна стаецца абавязкам і шчасьцем толькі для тых, каторыя пакліканы да яе. Пакліканьне можна распазнаць і давесьці толькі ахвяраю, якую прыносіць адданы духовай працы чалавек і мастак сваяму супакою і дабрабыту, каб аддацца сваяму пакліканьню.

Л. Талстой

Калі шчасьце зьяўляецца дзейнасьцю ў сузгоднасьці з мужнасьцю, дык ёсьць зразумелым, што яна павінна быць у сузгоднасьці з найвышэйшаю мужнасьцю.

Арыстотэлес

Бяссумніўнаю прадумовінаю шчасьця ёсьць праца: па-першае, свабодная праца, якую чалавек любіць; па-другое, фізычная праца, якая дае апэтыт і моцны сон, што нясе з сабою супакой.

Л. Талстой

Калі хто ня хоча працаваць, той няхай і ня есьць.

Ап. Паўла
2 да Тэссалонікійцаў,
3:10

# ЗЯРНО З КУРЫНАЕ ЯЙЦО

Знайшлі аднойчы дзеці ў рове штучку з курынае яйцо, са сьцежкаю пасярэдзіне і падобную на зярно. Убачыў у дзяцей штучку падарожны, купіў за траяк і павёз у места, і прадаў каралю як рэдкую рэч.

Паклікаў кароль мудрацоў, загадаў ім даведацца, што гэта за штука такая – яйцо ці зярно? Думалі, думалі мудрацы і не маглі нічога адказаць. Ляжала гэтая штучка на вакне, узьляцела курыцца, пачала клявацъ, выклявала дзюрку; усе і ўбачылі, што – зярно. Прыйшлі мудрацы, сказалі каралю: гэта – жытняе зярно.

Зьдзівіўся кароль. Загадаў мудрацам, каб даведаліся, дзе і калі гэтае зарно радзілася? Думалі, думалі мудрацы, шукалі ў кнігах, – нічога не знайшлі. Прыйшлі да караля і кажуць: ня можам даведацца. У кнігах нашых нічога пра гэта не напісана; трэба ў мужыкоў запытацца, ці ня чуў хто ад старых людзей, калі і дзе гэтакае зярно сеялі?

Паслаў кароль, загадаў да сябе старога мужыка прывесьці. Знайшлі старога мужыка, прывялі да караля. Прыйшоў адрахлелы старэча, бяззубы, насілу ўвайшоў на двух кастылях.

Паказаў яму кароль зярно, ды ня бачыць ужо стары; сяк-так напалову разглядзеў, палову рукамі абмацаў.

Пачаў кароль яго пытаць: Ці ня ведаеш ты, стары, дзе гэтакае зярно радзілася? Ці ня сеяў сам на сваім полі гэтакага хлеба? Ці ня купляў дзе-небудзь на сваім вяку гэтакага зярна?

Глухім быў стары, ледзь-ледзь расслухаў, насілу сьцяміў пра што ходзе. Шамкаючы бяззубым ротам, пачаў адказваць: Не, кажа, на сваім полі ніколі гэтакага хлеба сеяць ня сеяў і жаць ня жаў, і купляць ніколі не даводзілася. Калі і куплялі зярно, дык заўсёды гэтакае дробнае было, як і цяперака. Найляпей, кажа, трэба ў майго бацькі запытаць; магчыма ён будзе ведаць, дзе гэтакае зярно радзілася.

Паслаў кароль, каб прывялі бацьку гэтага старога. Знайшлі ягонага бацьку, прывялі да караля. Прыйшоў старэчы на адным кастылю. Пачаў яму кароль зярно паказваць. Старэча яшчэ бачыць вачыма, паўзіраўся добра. Пачаў кароль пытаць яго: Ці ня ведаеш ты, старэча, дзе гэтакае зярно радзілася? Сам

ты на сваім полі ня сеяў гэтакага хлеба? Ці не даводзілася табе на сваім вяку купляць гэтакага зярна?

Хоць і амшалы на вуха быў стары, але расслухаў ляпей за сына.

- Не, - кажа, - на сваім полі гэтакага зярна сеяць ня сеяў і жаць ня жаў. Дый купляць не даводзілася, а гэта затым, што ў маім веку, людзі нават і грошай ня ведалі. Усе елі свой уласны хлеб, а калі патрэба знаходзілася - адзін з адным дзяліліся. Ня ведаю я, дзе гэтакае зярно радзілася. Хоць нашае зярно і большым было ад цяперашняга і болей спорнае ў малацьбе, але гэтакага з роду ня бачыў. Чуў я ад свайго бацькі - што ў ягоным часе хлеб радзіўся лепшы за наш і быў болей умалотны, і вялікі быў. Яго запытаць трэба.

Паслаў кароль па бацьку гэтага старога. Знайшлі і дзеда; прывялі да караля. Увайшоў дзед да караля без кастылёў; увайшоў лёгка, - вочы сьветлыя, добра чуў і гутарыць выразна. Паказаў кароль зярно дзеду. Паглядзеў дзед, пакруціў. "Даўно я, - кажа, - ня бачыў старадаўнага хлеба". Адкусіў дзед зярна, пажаваў.

- Але́, гэта яно, - кажа.

- Скажы мне, дзядуля, дзе гэтакае зярно радзілася? Ці ня сеяў ты часамі гэтакі хлеб на сваім полі? А мо' купляў ты на сваім вяку дзе-небудзь у людзей?

І стары адказаў:

- На маім вяку хлеб гэтакі ўсюды радзіўся. Гэтакім хлебам, - кажа, - увесь свой век я карміўся і іншых карміў.

І запытаў кароль:

- Дык скажы-ж мне, дзядуля, купляў ты дзе-небудзь гэтакае зярно, ці сам на сваім полі сеяў?

Усьміхнуўся стары.

- У маім часе, - кажа, - і прыдумаць ніхто ня мог гэтакага грэху, каб хлеб прадаваць або купляць. І пра грошы нічога ня ведалі: хлеба гэтакага кажны меў уволю. Я сам гэтакі хлеб сеяў, жаў і малаціў.

І запытаў кароль:

- Тады скажы мне, дзядуля, дзе ты гэтакі хлеб сеяў, дзе было тваё поле?

І дзед адказаў:

- Маё поле было - зямля Божая. Дзе ўзараў, там і поле. Зямля была вольная. Свае зямлі ня ведалі. Сваім толькі сваю працу называлі.

- Скажы мне, - кажа кароль, - яшчэ дзьве рэчы: адна рэч - чаму раней гэтакае зярно радзілася, а

сяньняка ня родзіцца? А другая рэч, - зь якое прычыны твой унук ішоў на двух кастылях, сын твой увайшоў на адным кастылю, а ты, вось, увайшоў зусім лёгка, вочы ў цябе сьветлыя, і зубы крэпкія, і гутарка твая ясная і ветлівая? Зь якое прычыны, скажы, дзядуля, гэтыя дзьве рэчы сталіся?

І стары адказаў:

- А гэта з тае прычыны гэтыя дзьве рэчы сталіся, што людзі перасталі жыць з працы сваіх рук, - на чужую сталі азірацца. У старадаўныя часы ня гэтак жылі: у старадаўнасьці жылі па-Божаму; сваім валодалі, чужым не карысталіся.

Л. Талстой

---

АДНО

ПАРМЭНІДЭС: Пяпер-жа, ці можа нейкая рэч, якая знаходзіцца ў пэўным стане, ня быць у гэтым стане, без дазнаньня зьіначаньня?

АРЫСТОТЭЛЕС: Ня можа.

ПАРМЭНІДЭС: Тады, кажная рэч, якая знаходзіцца і не знаходзіцца ў пэўным стане, зьмяшчае ў сабе зьіначаньне.

АРЫСТОТЭЛЕС: Дый як-жа інакш?

ПАРМЭНІДЭС: І зьіначаньне ёсьць рухам; а мо' назавем гэта як-небудзь інакш?

АРЫСТОТЭЛЕС: Так, рухам.

ПАРМЭНІДЭС: І адно выявілася як тое, што́ ёсьць і ня ёсьць?

АРЫСТОТЭЛЕС: Так.

ПАРМЭНІДЭС: Дык з гэтага, ёсьць і ня ёсьць - гэта ў гэткім і іншым стане?

АРЫСТОТЭЛЕС: Выходзіць гэтак.

ПАРМЭНІДЭС: Гэтым, адно, якое ня ёсьць, выявілася гэтаксама як тое, што́ знаходзіцца ў руху, бо яно зьіначваецца са стану быцьця ў стан нябыцьця.

Плятон
"Пармэнідэс", 162

Ёсьць існаваньне, якое агортвае сабою ўсё і папярэдзіла наяўнасьць неба і зямлі; яно спакойнае; яно бесцялеснае; ягоныя свомасьці называюць розумам. Калі трэба назваць яго, я называю яго Вялікім, Неагортвальным, Адыходзячым і Надыходзячым.

Ляо-Тсэ

Жыцьцё стала зьіначвае сваю вонкавасьць. Толькі не́вук, які бачыць ледзь паверхню рэчаў, думае, што жыцьцё нішчыцца, калі яно зьнікае ў вадной якой-небудзь са сваіх хвормаў. Бо, калі яно шчазае ў вадной якой-небудзь хворме, дык толькі дзеля таго, каб зноў выявіцца ў іншай. Гусенца шчазае і нанова выяўляецца ў выглядзе матылька; дзіцянё шчазае, але замест яго выступае юнак; жывёлавы чалавек прападае, каб даць месца духоваму чалавеку.

Люсі Малёры

Усё на сьвеце зьіначваецца і рухаецца быццам тое кола. Чалавек гэтаксама зьіначваецца, але ён ня бачыць усяго кола зьіначаньня, якое ён адбывае, бо, адбываючы яго, ён знаходзіцца на адным пункце кола.

Л. Талстой

Што такое жолуд, як ня дуб, пазбаўлены сваіх галінаў, лістоў, карэньняў, г. зн. усіх хвормаў,усіх апрычонасьцяў, але які засяроджаны ў сваей існасьці, у сваей творчай моцы, які зноў можа адваяваць усё, што яна адкінула? Гэтае ў сваім выглядзе агалочаньне, якраз і ёсьць толькі вонкавае скарачэньне. Вярнуцца да свае вечнасьці – гэта і ёсьць памерці, але ня зьнішчыцца, гэта значыць вярнуцца да свае моцавае магчымасьці.

Аміель

Няўжо палохае цябе зьінaчаньне? Гэта-ж нічога на сьвеце ня творыцца бяз зьінaчаньня. Фактычная сутнасьць натуры – гэта перайначаньне. Немагчыма нагрэць вады, каб не заіснавала перайначаньне з дровамі; немагчыма жывіцца без перайначаньня ежы. Усё сусьветнае жыцьцё зьяўляецца нічым іншым, як зьінaчаньнем. Зразумей, што яно неабходным ёсьць з прычыны самое натуры рэчаў. Трэба праяўляць стараньні пра адно, як-бы гэта ня ўчынць нічога, што магло-б быць супярэчным запраўднай натуры людзкай, і сьледаваць ува ўсім гэтак, як і калі яна наказвае.

Марк Аўрэліюс

Усё на сьвеце расьце, цьвіце і вяртаецца да свайго карэньня. Вяртаньне да свайго карэньня значыць супакоеньне, сузгоднасьць з натураю. Сузгоднасьць з натураю гэта тое самае што вечнасьць; затым разбурэньне цела ня крые ў сабе ніякае небясьпекі.

Ляо-Тсэ

Павінна існаваць нейкая мяжа самога жыцьця, падобна, як плады дрэваў і зямлі, як поры году; усё павінна пачынацца, трываць і мінаць. Разумныя людзі ахвотна падпарадкваюцца гэтаму пастаноўленаму парадку.

Цыцэрон

Апошні дзень не нясе нам зьніштажэньня, а толькі зьінaчаньне.

Цыцэрон

Сьмерць – гэта зьінaчаньне тае хвормы, зь якою злучаны нашы дух. Ня трэба ўтоесамліваць хвормы з тым, што злучана зь ёю.

Л. Талстой

# ДЭКЛЯРАЦЫЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

Несьмяротны дакумэнт, Дэклярацыя Незалежнасьці, зрэдагаваны найбольшым дзяржаўным мужам Злучаных Штатаў, Тамашам Джэффэрсонам, які пазьней стаўся трэйцім прэзыдэнтам гэтага краю, і падпісаны прадстаўнікамі 13-ці першапачаткавых штатаў /калёніяў/, быў урачыста агалошаны дня 4-га ліпеня 1776 г. на Канґрэсе ў Філядэльфіі. З гэтага часу ўспомненыя калёніі стварылі сабою Злучаныя Штаты Амэрыкі.

Яе поўны тэкст гучыць:

Калі ў бегу гістарычных падзеяў стаецца неабходнаю рэчаю, каб які-небудзь народ парваў палітычную сувязь, якая лучыць яго зь іншым, і заняў сярод гаспадарстваў сьвету роўнапраўнае і апрычонае месца, да чаго ўпаўнаважваюць яго натуральныя і Божыя правы, тады пашана для апініі людзкасьці вымагае, каб народ гэты выказаў, якія прычыны змусілі яго да гэтага кроку.-

Мы ўтрымліваем гэтыя праўды за самадаводзячыя: што ўсе людзі створаны роўнымі; што яны абдораны Стварыцелем пэўнымі непазбыўнымі правамі, сярод якіх ёсьць права да жыцьця, права да свабоды і права імкненьня да шчасьця.-

Што для абесьпячэньня гэтых правоў, сярод людзей творацца ўрады, справядлівая ўлада якіх абасноўваецца на згодзе тых, якімі яны кіруюць.-

Што, нарэшце, калі ўрад стаіць на перашкодзе да гэтых мэтаў, народ мае права зьмяніць яго або скінуць і ўстанавіць новы, кладучы, як фундамэнт, гэтакія прынцыпы, якія, паводля ягонае думкі, будуць болей памысна весьці да бясьпекі і шчасьця народу. Запраўды, мудрасьць не наказвае зьменьваць дзеля малых і мінаючых прычынаў урады, здаўна ўстаноўленыя; і адпаведна да гэтага дасьведчаньне вучыць,што людзкасьць барджджэй склонная ёсьць цярпець,як доўга нявыгаду можна зносіць, чымся здабываць правы дарогаю ўхіленьня хвормаў, да якіх яна прывыкла. Калі, аднак, доўгі рад зьнявагаў і надужыцьцяў па-

казвае на ста́лы замер стварэньня абсалютнага дэспатызму, дык народ мае права і абавязак скінуць гэтакі ўрад і пастарацца паставіць новых стражнікаў прышлае бясьпекі.-

Гэтакімі былі балючыя цярпеньні гэтых калёніяў; і цяперака неабходнасьць змушае іх зьмяніць папярэднюю сыстэму ўраду. Гісторыя сучаснага караля Вялікабрытаніі зьяўляецца гісторыяю ста́ла паўтаральных крыўдаў і бяспраўнага захопніцтва, што маюць на ўвазе простую мэту - стварэньня над гэтымі штатамі неабмежаванае тыраніі. На довад гэтага, няхай будуць добразычліваму сьвету прадложаны факты:-

Ён адмовіўся даць сваю згоду на правы, якія былі зусім мэтазгоднымі і для агульнае памыснасьці неабходнымі.-

Ён забараніў сваім губэрнатарам выдаваць правы беспасярэдняе і сьпешнае важнасьці, калі яны ня будуць суспыненыя ў сваей дзейнасьці да часу пакуль ня будзе выражана ягоная згода; і як доўга яны былі суспыненымі, ён зусім занядбаў заняцца імі.-

Ён адмовіўся выдаць іншыя правы, маючы на ўвазе заспасабленьне большых абшараў заселеных людзьмі, пакуль гэтыя не адмовяцца ад права рэпрэзэнтацыі ў правадаўчай установе, права, якое для іх неацэненым, і толькі для тыранаў зьяўляецца страшным.-

Ён склікваў правадаўчыя ўстановы на асабліва нявыгадных мясцох і на аддаленых ад месцаў перахоўваньня іхных урадавых актаў, і толькі з тою мэтаю, каб іх абясьсіліць і, каб учыніць іх паддатнымі для сваіх прадпрыняцьцяў.-

Ён неаднакратна распускаў прадстаўніцтвы народу, бо яны з мужнаю стойкасьцю супроцьставіліся ягонаму захопніцтву на народныя правы.-

Пасьля гэтакіх роспускаў, ён праз доўгі час супроцьставіўся новым выбарам; у рэзультаце чаго правадаўчая моц, якая не магла быць ухіленаю, зноў у сваей сіле вярталася ў народ для свайго затасаваньня; тады, як у міжчасе, гаспадарства было паддадзена ўсім небясьпекам нападу звонку і сутрасеньням унутры.-

Ён чыніў спробы перашкодзіць далейшае засяленьне гэтых штатаў; з гэтаю мэтаю перашкаджаў выдаць правы для натуралізацыі чужынцаў; адмаўляючыся выданьня іншых правоў з мэтаю заахвочаньня іміграцыі сюды, і ўзьняцьця ўмоваў для пача́ткавага атрыманьня зямлі.-

Ён спаралiжаваў адміністрацыю справядлівасьці, праз адмову даньня свае згоды на правы для стварэньня праўнае моцы.-

Ён учыніў залежнымі выключна ад свае волі судзьдзяў на іхных становішчах, час трываньня іхнага ўраду, высокасьць і выплату іхных пэнсыяў.-
Ён паклікаў да жыцьця безьліч новых установаў, наслаў масу ўрадоўцаў сюды, каб трывожыць наш народ і сыціцца ягонаю жыцьцёваю сілаю.-
Ён утрымліваў сярод нас, у часе супакою, сталае войска бяз згоды нашых правадаўчых установаў.-
Ён імкнуўся вайсковую ўладу ўчыніць вышэйшаю і незалежнаю ад цывільнае.-
Ён лучыўся зь іншымі, каб падпарадкаваць нас юрысдыкцыі чужой для нашае канстытуцыі, і няпрызнанай нашымі правамі; даючы сваю згоду на іхныя акты, быццам выплываючыя з правадаўства:-
Каб мець магчымасьць раскватараваць сярод нас большую масу збройных жаўнераў:-
Каб ахоўваць іх падрыхтаванымі судовымі працэсамі, перад карою за дакананыя імі забойствы на жыхарах гэтых штатаў:-
Каб адрэзаць наш гандаль ад усіх частак сьвету:-
Каб накладаць на нас падаткі бяз нашае згоды:-
Каб пазбавіць нас у шматлікіх справах прывілегіяў прысяжных судоў:-
Каб вывозіць нас за мора з мэтаю пастаўленьня перад судоваю адказнасьцю за здуманыя праступкі:-
Каб зьнесьці вольную сыстэму ангельскага правадаўства ў суседняй правінцыі, устанаўляючы там самавольны ўрад і пашыраючы яе межы, даючы гэтым прыклад як годнае прылады для ўвядзеньня гэтакага самага абсалютнага панаваньня ў гэтых калёніях:-
Каб адабраць ад нас нашыя прывілейныя граматы, зьнесьці нашыя найболей вартасныя правы і фундамэнтальна зьіначыць хвормы нашага ўрадаваньня:-
Каб суспыніць нашыя ўласныя правадаўчыя ўстановы, і самым аб'явіцца перад намі ў моцы выдаваць ува ўсіх выпадках для нас правы.-
Ён адмовіўся ад ураду тут, аб'яўляючы нас па-за межамі ягонае аховы і пачаў вайну супроць нас.-
Ён аграбіў нашыя моры, апустошыў нашыя ўзьбярэжжы, спаліў нашыя месты і зьнішчыў жыцьцё нашых людзей.-
Ён перавозіць у гэтым часе аграмадныя войскі чужых наёмнікаў, каб завяршыць твор сьмерці, апусташэньня і тыраніі, і ўжо пачаў у абставінах бязьлітаснасьці і пэрфідыі, падобных якім насілу ці можна знайсьці ў найболей барбарскіх часох, што зьяўляецца зусім нягодным галавы цывілізаванае нацыі.
Ён змусіў нашых грамадзян, узятых у палон на ад-

крытым моры, падняць аружжа супроць свае бацькаўшчыны і стацца катамі сваіх прыяцеляў і братоў або пасьці з уласных рук.-

Ён ушчынаў хатнія бунты між чамі, і падбухторваў супроць жыхарства нашых прымежных абшараў бязьлітасных дзікіх індыйцаў, ведамы спосаб вядзеньня вайны якіх заключаецца ў нішчэньні кажнага бяз розьніцы веку, роду і кажнага палажэньня ў жыцьці.-

На кажнай ступені гэтага ўціску ў найпаданшых выражэньнях прасілі мы выраўнаць крыўду: нашыя неаднакратныя просьбы былі адказваны толькі сталымі зьнявагамі. Князь, якога кажны ягоны чын гэтак панура характэрызуе як тырана, зьяўляецца неадпаведным, каб быць валадаром свабоднага народу.

Гэтаксама не адсутнічала ў нас пашана адносна нашых брытанскіх братоў. Мы перасьцерагалі іх час ад часу перад спробамі пашырыць на нас іхным правадаўствам нічым неапраўданую юрысдыкцыю. Мы прыпаміналі ім абставіны нашае эміграцыі і тутэйшага асяленьня. Мы адклікваліся да іхнае прыроджанае справядлівасьці і іхнага вялікадушша; і мы заклікалі іх на цесную сувязь нашага супольнага паходжаньня пакінуць гэтае захопніцтва, якое няўхільна разарве нашую сувязь і добрыя суадносіны. Яны асталіся глухімі гэтаксама і на голас справядлівасьці і супольнасьці крыві. Дзеля гэтага мы мусім злучыцца ў бязумоўнай неабходнасьці, якая дамагаецца нашага разьдзяленьня, і абыходзіцца зь імі гэтак, як абыходзімся мы з рэштаю людзкасьці: як з ворагамі ў часе вайны, і прыяцелямі ў часе супакою.-

Дзеля гэтага, мы, прадстаўнікі Злучаных Штатаў Амэрыкі, зграмаджаныя на Гэнэральным Кангрэсе, клічам да Найвышэйшага Судзьдзі сьвету дзеля чэснасьці нашых замераў, у імя і ў паўнамоцтве добрага народу гэтых калёніяў, урачыста падаем да ведама і дэкляруем, што гэтыя Злучаныя Калёніі зьяўляюцца, і паводля права маюць быць Свабоднымі і Незалежнымі Штатамі; што яны звальняюцца ад усякага абавязку падданства перад брытанскаю каронаю, і, што ўсякая палітычная сувязь паміж імі і Вялікабрытанскаю Дзяржаваю ёсьць і поўнасьцю разьвязаная мае быць; і, што яны, як Свабодныя і Незалежныя Штаты маюць паўную ўладу весьці вайну, заключаць мір, уступаць у саюзы, навязваць гандлёвыя зносіны, і прадпрыймаць усе іншыя акты і рэчы, якія Незалежныя Штаты могуць паводля права чыніць.-

І дзеля пацьверджаньня гэтае Дэклярацыі, у моцным даверры на апеку Божага Провіду, мы ўзаемна даем у залог нашае жыцьцё, нашую památнасьць і нашую сьвятую чэсьць.

## ПРАГРЭС

Запраўдны прагрэс - гэта прагрэс духовага прабуджэньня.

Я. Пятроўскі

Чалавек, каторы думае, што мы павінны затрымацца на той ступені рэлігійнага прагрэсу /рэфармацыі/, якую мы цяперака назіраем праз нашае сьмяротнае шкелца, гэтым самым паказвае, што ён знаходзіцца вельмі далёка ад праўды. Сьвятло, якое мы атрымалі, было нам дадзена не дзеля таго, каб мы, бесьперапынна глядзелі на яго, але затым, каб, дзякуючы яму, адсланяць далейшыя рэчы, якія яшчэ сукрытыя для нас.

Мільтон

Самае важнае ў гісторыі чалавека - гэта тое, да чаго ён імкнецца. Усё дакананае ім, заўсёды ў значнай ступені залежала ад прыпадкавых абставінаў і, у найлепшым выпадку, было толькі далёка недасканалым выкананьнем ягоных замераў. І жыцьцё ўсіх вялікіх людзей выражалася пераважна ў іхных імкненьнях і натугах барждзэй, чымся ў завяршэньні гэтых імкненьняў. Дзеля гэтага, трапна ацэньваць іх можна толькі паводля іхных імкненьняў і жаданьняў, але не паводля таго, што́ ім ўдалося даканаць.

Джон Рёскін

Не ўтаесамлівай запраўднага прагрэсу духа з прагрэсам тэхнолягічным, навуковым, мастацкім. Асягненьне тэхнолягічнае, навуковае, мастацкае можа быць вельмі вялікім з адначаснаю адсталасьцю духоваю, як гэта і маецца рэч у нашым часе.

Л. Талстой

Элізабэт Блекуэльл /1821-1910/ першая зламала забабон, які не дапушчаў жанчыну ў сьвет мэдыцыны. Будучы студэнткаю, не магла знайсьці сабе пакою. Фа культэт прафэсараў быў перакананы ў тым, каб выключыць яе з унівэрсытэту за тое, што яна дамагалася мыцьця рук і стэрылізацыі інструмэнтаў перад апэрацыяю.

---

Зарукаю свабоды для народу - духовы прагрэс адзінак, якія твораць сабою нацыю.

Я. Пятроўскі

Бэнджэмін Франклін быў першым, каторы прапанаваў францускім лідарам кліч: "Свабода, роўнасьць, братэрства".

---

Тут, на зямлі, няма і не павінна быць супакою. Жыцьцё - гэта мэта, да якое можна наблізіцца, але якое немагчыма асягнуць. Супакой амаральны. Я не адважваюся паказваць, у чым заключаецца гэтая мэта; але якою-колечы яна можа быць, яна ёсьць або павінна быць. Без яе жыцьцё ня мае сэнсу; дапусьціць гэтакую магчымасьць - гэта бязбожніцтва; і гэта яшчэ ня ўсё, гэта значыла-б прызнаць яе гіроніяю і зманам.

Язэп Мадзіні

Большасьць людзей жыве, ня думаючы; большасьць людзей гэтак марнуе свае сілы ў барацьбе за існаваньне, што ў іх няма часу, каб падумаць; яны проста прыймаюць тое, што ёсьць, за тое, што павінна было-б быць. Тут ляжыць прычына, чаму гэтакай труднай бывае задача грамадзкага рэфарматара і гэтак камяністым ягоны шлях. Вось чаму на людзей, каторыя першыя ўздымаюць голас у вабароне якое-небудзь вялікае праўды, звальваюцца кпіны г. зв. лепшых людзей і праклянцьці натоўпу, чыму іх гоняць і мучаць, змушаюць піць атруту, і ўпрыгожваюць цярністымі вянкамі.

Гэнрі Джордж

Болей сьветлыя адзінкі падтрымліваюць перакананьне, што, ня гледзячы на ўсе злыбеды, зьмены ў абставінах людзкага жыцьця адбываюцца ў кірунку лепшага. Гэтыя самыя людзі выражаюць думку, што, калі людзкія супольнасьці маюць ацалець, дык толькі тыя, якія праявяць дастатковую здольнасьць трымаць крок з агульна людзкім прагрэсам.

---

Без свабоды думкі ня будзе гэтакае рэчы, як мудрасьць, гэтакае рэчы, як публічная свабода без свабоды слова.

Бэнджэмін Франклін

Бэнджэмін Франклін меў толькі два гады школьнае адукацыі і, маючы 10 гадоў, ён ужо памагаў свайму бацьку ў малой хвабрыцы сьвечак і мыла.

---

Хто хоча дасьледзіць гісторыю філязофіі і натуразнаўства, той пабачыць, што найбольшыя адкрыцьці былі дакананыя людзьмі, каторыя ўважалі праўдападобным тое, што́ іншыя апавяшчалі як бяссумніўнае.

Ліхтэнбэрґ

Каб скончыць з духам досьледу, які характэрызуе заходнюю цывілізацыю, зусім ня трэба спальваць кнігаў. Усё, што мы маем зрабіць, - гэта пакінуць іх ня чытанымі на працягу некалькі пакаленьняў. З другое, аднак, стараны, прабуджанае зацікаўленьне да гэтых кнігаў час ад часу на працягу гісторыі, узбагачвала Захад новымі імкненьнямі, і новымі асягненьнямі.

Робэрт М. Гатчынс
Вялікая канвэрсацыя, Вялікія кнігі
Энцыкляпэдыя Брытаніка, 1952

Ёсьць людзі, каторыя ў сваім павольным духовым прагрэсе астаюцца далёка з-заду паступаючага наперад сьвету. Не далёкі ўжо час, калі гмах іхных перакананьняў мала памалу сам асядзецца да ўзроўню зямлі. І толькі ў гістарычнай летапісі астанецца запісь, які будзе будзіць успамін жывых паступаючых пакаленьняў, што былі калісьці людзі, якія верылі ў тое, у што яны верылі.

Я. Пятроўскі

У тым часе, калі народы вызіраюць толькі на знак затым, каб пачаць найбольшае змаганьне, якое калі-небудзь мела месца на зямлі паміж дабром і злом, - калі ўва ўсіх частках сьвету ўжо чутны глухія водгульлі грому, калі кажны чуе, што набліжаецца час, калі судырацца між сабою абедзьве арміі - армія Бога і армія дыявала, што будучы лёс людзкасьці - свабода або паняволеньне залежаць ад гэтага судыраньня, у гэтым урачыстым часе перад усім трэба стойка ведаць, што годнасьць ваяра Божае арміі можна заслужыць толькі, ідучы за прыкладам ягонага правадыра, каторы ўпадобніўся да бедных, якіх ён прыйшоў ўратаваць: адракчыся ад усяго паводля прыкладу Сына чалавечага, ня мець месца, дзе прыхінуць галавы, каб не распешчвацца, каб займець поўную магчымасьць быць сягоньня тут, заўтра там, быць усюды, дзеколечы існуе небясьпека, дзе адбываецца змаганьне і пакінуць памершым хаваць памершых. Памершыя-ж гэта тыя, што, загразшы ў штодзенных турботах, ня ведаюць нават, што яны маюць душу, якая дамагаецца вы-

звaленьня, што жыць - значыць змагацца, значыць паміраць дзеля таго, каб гэтае вялікае вызваленьне завяршылася.

Лямэнэ

Хто зь людзей можа ўважацца за рэлігійнага? Я думаю, што ніхто гэтага ня ведае. Але я маю цьвёрдую веру ў Бога. Вы ведаеце, што рэлігія ёсьць гэтаксама і вераю ў вартасьць чалавека. Рэлігія ў маім разуменьні - гэта дбаньне пра людзей і вера ў вартасьць іншых людзей.

Пастарства ёсьць працягам гэтае веры ў вартасьць людзей - памагаючы ім, памагчы сабе.

Пастар Джаквэлін Мінс

Прагрэс значыць пасьпех у кірунку навукаў, маральнае або інтэлэктуальнае палепшаньне або адно і другое разам.

-

Прагрэс як гэткі ня зносіць пануканьня; ён як тое дрэва, навакол якога можна капаць і капаць, але няма ніякае патрэбы крычаць на яго. Прагрэс, як растучае дрэва, ня прызнае ніякіх загадаў. Ён мусіць адбыць дарогу натуральнага росту; гэта ягоная натура. Тайніца гэтага росту, аднак-жа, ляжыць на лініі простае праўды, выражанае аднойчы Сакратасам:- "Я ведаю, што я ня ведаю".

-

У сучасным сьвеце інтэлігэнцыя публічнае апініі зьяўляецца адной зь неабходных прадумовінаў сацыяльнага прагрэсу.

Аўтар няведамы

Калі ў якім-небудзь пэрыядзе часу дадзеная супольнасьць перажывае заняпад прагрэсыўнае думкі, а што з гэтым ідзе - заняпад эканамічны і палітычны, тады наступаючыя пакаленьні мусяць праяўляць надзвычайны высілак і натугі, каб надрабіць занядбаньні сваіх папярэднікаў.

-

Гэтак чынім мы прагрэс - ад пазнаньня да прыняцьця.

Япіскап Ф. Ґэральд Энслей

Праблема звычайнага прагрэсу ўзалежніваецца ад справы асыміляцыі што да пашырэньня ўласнага гарызонту, і культуры наагул.

---

Прагрэс - гэта рост, які разьвіваецца знутра. Ён знаходзіць сваё выражэньне ў росьце і дыктуецца правам ягонае ўласнае натуры.

Паводля Яп. Ф. Ґэральда Энслейя

Прагрэс культурны - гэта арганічны рост. Як кажны арганічны рост, ён вымагае часу. Супольнасьці, пра якія мы выражаемся як пра культурныя, прайшлі доўгі шлях часу, часу некалькі пакаленьняў.

---

Хай сабе неспасьцярожным ёсьць і бяз большага значэньня твой удзел у агульным прагрэсе, але ён неабходны, бо з гэтакіх малазначных, неспасьцярожных натугаў шматлікіх творыцца ўвесь той прагрэс у напрамку шчасьця, якім ты карыстаешся. Затым, не ашуквай самога сябе, а нацягвай пастронкі, хоць ніхто гэтага ня бачыць і не паганяе.

Л. Талстой

Прагрэс ёсьць наяўнасьцю сярод людзкае расы. Ён азначае:

- поступ або крочаньне наперад;
- у напрамку болей дасканалага стану;
- гэта зьмена дадзенага стану на лепшы;
- пераход на вышэйшую ступень разьвіцьця.

---

Некаторыя з дасьледчыкаў сьцьвярджаюць, што ў мінуўшчыне /дый часта сягоньня яшчэ/ маса людзей верыла, што будучыня паўтарае толькі мінулае. І запраўды, сярод шматлікіх супольнасьцяў падтрымлівалася перакананьне, што калі абставіны людзкага жыцьця ў бегу гістарычным і зьіначваюцца - зьіначваюцца толькі на горшае. Вельмі характэрна адцеміць, што, калі чалавек верыў у г.зв. залаты век, дык ён заўсёды ўмясцоўліваў яго ў часе мінулым. У запраўднасьці-ж,- наўсуперак усякім пэсымізмам і нашэптам, - пэрспэктыва праўдзіва залатога веку знаходзіцца ў будучыні чалавека.

---

# ЛЮДЗІ НАВУКІ

У нашых барбарскіх вяках, калі франкі ґэрманцы, брытанцы, ламбардцы і гішпанскія музарабы ня ўмелі ані чытаць, ані пісаць, узьніклі школы і ўнівэрсытэты, зложаныя бадай што суцэльна з экклезіястых, якія ня ведалі нічога апрача іхнага ўласнага жарґону, і вучылі гэты жаргон тых, што жадалі сабе вучыцца яго. Акадэміі былі пакліканы да жыцьця значна пазьней; яны з пагардаю адносіліся да бязмыснасьці школаў, але не заўсёды маглі ўздымаць голас супроць іх, бо існуюць людзі інтэлектуальнае слабасьці, да якіх іншыя адносіліся з пашанаю пры наяўнасьці сярод першых зацікаўленьня рэчамі годнымі людзкае ўвагі.

Людзі навукі, каторыя аказалі найбольшую службу малой колькасьці думаючых людзей, расьцярушаных па сьвеце, гэта адасобленыя пісьменьнікі, праўдзівыя навукоўцы, закрытыя ў сваіх памешканьнях, каторыя ані спрачаліся зь іншымі на ўнівэрсытэцкіх лавах, ані выказвалі і паловы сваіх праўдаў у акадэміях; і бадай што ўсе зь іх былі прасьледванымі. Наш няшчасны людзкі род гэтак створаны, што тыя, што крочаць па аддаўна вытаптаных сьцежках, заўсёды кідаюць каменьні на тых, што пракладваюць новы шлях.

Монтэск'е кажа, што сцыты выдзіралі вочы сваім нявольнікам, каб апошнія ня бачылі масла, якое яны білі для сваіх гаспадароў. Гэта ёсьць ілюстрацыя як працуе інквізыцыя, і ў краю, дзе страшыдля гэтае пануе, бадай што кажны ёсьць сьляпы. У Англіі на працягу болей як двух стагодзьдзяў людзі мелі па два вокі; у Францыі пачынаюць адчыняць адно вока. Але часамі існуюць людзі пры ўладзе, каторыя ня хочуць, каб суродзічы мелі нават гэтае адно адчыненае вока.

Гэтыя бедныя людзі пры ўладзе, падобныя да доктара Балюарда зь італьянскае камэдыі, каторы ня хоча, каб яму ніхто іншы ня прыслужваў як толькі дурань Гарлеквін, і баіцца гэтаксама мець нават паслугуючага праніклівага слугі.

Укладзі трохі одаў на чэсьць майго Гаспадара Суперцбуса Фадуса, трохі мадрыґалаў для ягонае наложніцы; прысьвяці ягонаму прыдзьвернаму кніжку на тэмат ґэоґрафіі, і ты будзеш добра бачаным, але пач-

ні асьвячаць людзкасьць, і ты будзеш зьнішчаным.

Дэскартэс быў змушаны пакінуць сваю краіну. Гасэндзі быў абкінуты паклёпам, Арнаўльд у ягоных днях быў выкінуты ў экзыль; кажнага філёзафа спатыкае той самы лёс, які спатыкаў калісьці прарокаў сярод жыдоў.

Хто мог-бы паверыць, каб у васемнаццатым стагодзьдзі філёзаф мог быць пастаўленым перад сьвецкім трыбуналам, і быць абвінавачаным у бязбожніцтве толькі затым, што сказаў, што людзі ня могуць выконваць мастацтва, калі яны ня маюць рук. Я зусім ня буду зьдзіўленым, калі першага лепшага чалавека, нагэтулькі наглага, - каб сказаць, што людзі ня могуць думаць, калі яны ня маюць галаваў, - засудзяць зараз-жа на ґальлеры. "Бо", нехта з маладых людзей пасьля заканчэньня школы скажа яму, "душа зьяўляецца чыстым духам, а галава - толькі матэрыя; Бог можа ўмясцовіць душу ў пяту, гэтаксама як і ў мазґі; з гэтае прычыны я ўважаю цябе за бязбожніка".

Вельмі магчыма, што найбольшае няшчасьце чалавека навукі заключаецца ня ў тым, што ён стаецца аб'ектам зайздрасьці са стараны сваіх калегаў, ахвяраю палітычнае інтрыґі або быць зьненавіджаным людзьмі, што маюць уладу; але толькі ў тым, што ён суджаным ёсьць глупцамі. Глупцы часамі ідуць далёка, асабліва, калі біґотэрыя дадаецца да нядзольнасьці, і да нядзольнасьці - дух помсты. Іншым яшчэ вялікім няшчасьцем для чалавека навукі ёсьць тое, што, звычайна, ён стаіць адзін. Буржуй купляе сабе маленькую пазыцыю ў супольнасьці, і ў ёй ён падтрымліваецца сваімі калегамі. Калі здараецца, што ён церпіць з прычыны несправядлівасьці, ён зараз-жа знаходзіць абаронцаў для сябе. Чалавек навукі астаецца бездапаможным; ён упадабняецца да лётаючае рыбы; калі яна ўздымаецца крышку з вады, птушкі пажыраюць яе; калі яна заглыбляецца ў ваду - іншыя рыбы зьядаюць яе.

Кажны грамадзкі дзеяч мусіць плаціць даніну шкоднасьці, але яму адплочваецца з узнагародаю ў хворме гонару і золата.

Вольтэр
Філязафічны слоўнік

РЭЛІГІЯ

Радаснае служэньне чалавеку ў імя Добра - гэта рэлігія.

---

Ня зьмест ведамых навукаў як боскіх аб'яўленьняў /бо гэта называецца тэолёгіяю/, але зьмест усіх нашых абавязкаў наагул, як запаветаў Бога, - вось яны і твораць сабою рэлігію.

Кант

Рэлігія можа асьвяціць філязафічныя разважаньні. Філязафічныя разважаньні могуць пацьвердзіць рэлігійныя праўды. Затым шукайце супольнасьці з праўдзіва рэлігійнымі людзьмі і з запраўднымі філёзафамі, гэтак з жывымі як і памершымі.

Л. Талстой

Рэлігія не затым запраўдная, што яе прапаведвалі апосталы, але апосталы прапаведвалі яе затым, што яна запраўдная.

Ґ. Э. Лессінґ

Рэлігія - гэта для ўсіх зразумелая філязофія, філязофія даводзіць рэлігію.

Л. Талстой

Адносна рэлігіі мы ўважаем, што кажны чалавек павінен верыць паводля свайго сумленьня.

"Божым Шляхам", №86, 1964

Адчуваць сябе маленькаю часьцінкаю Вялікага Жыцьця ад зямлі да найдалей паложанае зоркі, цешыцца, дабраслявіць і дзякаваць - гэта і ёсьць рэлігійнае пачуцьцё.

Сьвятлана Альлілуева
"Религия и Атеизм в СССР", №7

МЭНОН: Але-ж яшчэ данядаўна выдавалася нам, што мы развважа́ем правільна.

САКРАТАС: Так; адно, што тут вымагаецца ня толькі, каб выдавалася нашае развважаньне правільным, але, каб яно і цяпераka, і на прышласьць гэтакім асталося, калі вы́ражаная думка ма́е супачыць на сваіх здаровых асновах.

Плятон
Мэнон, 89

Перад усім, я прыймаю наступны аснаўны выходны пункт, які не вымагае ніякіх довадаў: усё тое, што звыш добрага спосабу жыцьця чалавек уважае магчымым даканаць, каб стацца лепшым у вачох Бога, зьяўляецца рэлігійнаю памылкаю і блудным служэньнем Богу.

Кант

Заўсёды, ува ўсіх стагодзьдзях людзі жадалі даведацца або займець хоць якое-небудзь уяўленьне пра пачатак або пра апошнюю мэту свайго існаваньня на зямлі; і рэлігія выступала, каб навучыць іх і даць агульны прынцып, кіруючы людзкасьцю і, каб азіяць тую сувязь, якая лучыць усіх людзей, як братоў, што маюць адну агульную крыніцу іхнага паходжаньня, адну агульную задачу жыцьця і агульную апошнюю мэту.

Язэп Мадзіні

...У травені 1962 году я паддалася акту хрышчэньня... Я верыла ў "не забівай", верыла ў праўду бяз прымусу і кровапраліцьця. Я верыла, што Найвышэйшы Розум кіруе сьветам...

Сьвятлана Альлілуева
"Религия и атеизм в СССР", №7

Чуешся млявым у тваіх саракавых гадох? Або думаеш, што ўсяму канец у шасьцідзесятых? Калі прыводзіш ты на ўспамін твае добрыя старыя часы, мей на ўвазе наступных людзей і іхныя асягненьні:

Бут Таркінґтон напісаў 16 раманаў пасьля таго як яму споўнілася 60 гадоў. Даніэль ДэФо напісаў "Робінзон Крузо", калі быў у 61 годзе свайго жыцьця. Гіппократэс стварыў сваю ведамую прысягу на 97 годзе свайго жыцьця. Ґлядстон стаўся прэм'ерам Вялікабрытаніі чацьверты раз, маючы 83 гады. Вінстон Чэрчыльл стварыў сваю шасьцітомную гісторыю Другое сусьветнае вайны на 79 годзе свайго жыцьця, тады, як Бэрнард Шоў напісаў <u>Ст. Жоан</u>, маючы 67 гадоў.

Недзе прачытанае

Штодзенная мудрасьць у тым, каб жыць, як усе жывуць; запраўдная мудрасьць у тым, каб жыць у сузгоднасьці з розумам, нават і тады, калі-б гэткае жыцьцё сталася аб'ектам папрокаў са стараны ўсіх іншых людзей.

Л. Талстой

Багаты чалавек можа гаварыць пра філязофію, а бедны чалавек выконвае яе.

Паводля Аляксандры Попа

Калі мая гіпатэза і не зьяўляецца праўдаю, дык усё-ж яна ёсьць шчыраю; бо я ніколі зь некаторымі нашымі сучаснымі вучонымі не пераапранаю сваю бязглузьдзіцу ў грэцкую мову, упрыгожваю альгебраю або ганарую сталымі выкрутасамі з палажэньня.

Бэнджэмін Франклін

Рэлігія ёсьць найвышэйшы і найболей шляхэтны чыньнік дзеля ўзгадаваньня чалавека, найбольшая сіла цывілізацыі, як супроцьстаўленьне вонкавым праяўленьням веры і палітычнай эґоістычнай дзейнасьці, якія зьяўляюцца галоўнымі перашкодамі прагрэсу людзкасьці. Існасьць рэлігіі, вечная і боская, аднолькава дзейнічае ў сэрцы чалавека ўсюды там, дзе толькі яно адчувае і б'ецца. Лягічны выснаў нашых разважаньняў кіруе наш узрок на адзіную аснову ўсіх вялікіх рэлігіяў, на адзіную навуку, якая разьвіваецца з самага пачатку жыцьця людзкасьці аж да сяголньняшняга дня.

У глыбіні ўсіх вераў цячэ крыніца адзінага вечнага аб'яўленьня, адзінае рэлігіі слова Божага, скіраванага да чалавека.

Няхай сабе пэрсы носяць свае таовіды, жыды свае філяктэрыі, хрысьціяне свой крыж, музульманы свой поўмесяц, але няхай усе яны памятаюць, што гэта толькі хвормы і эмблемы, тады як аснаўная існасьць усіх рэлігіяў - гэта любоў да бліжняга - аднолькава вымагаецца Ісусам, Паўлам, Ману, Зароастрам, Буддам, Майсеем, Сакратасам, Гільлелем, Магамэтам.

Морыс Флюґэль

Толькі тады можна будзе з поўным абаснаваньнем сказаць, што прыйшло да нас гаспадарства Божае, калі дзе-небудзь адкрыта замацуецца прынцып, хай сабе павольнага, але сталага пераходу царкоўнае веры ў агульную разумную рэлігію. Няхай сабе поўнае ўрэчаісьненьне гэтага гаспадарства будзе бясконца аддалена ад нас; але ў гэтым прынцыпе, як у зародку, які перш разьвіваецца, а пасьля размнажаецца, зьмяшчаецца ўжо ўсё тое, што павінна асьвяціць сьвет і заўладаць ім.

Кант

Каб зьнішчыць людзкую апінію, патрэбны стагодзьдзі.

Вольтэр

Кажная сэкта, бяз розьніцы на яе хворму, зьяўляецца пунктам прыцяжэньня для сумніву і памылкі. Скоцісты, томісты, рэалісты, номіналісты, папісты, кальвіністы, моліністы як і янсэністы, – гэта толькі псэўдонімы. У ґэомэтрыі, напрыклад, няма сэктаў. Ніхто тут ня кажа я зьяўляюся эўклідыстым, архімэдыстым. Калі праўда гэтак ясна выступае, тады няма месца для партыяў і распадзелаў. Ніколі ня было дыспуты і спрэчкі што да таго, ці існуе ў нашым краю дзеннае сьвятло ў часе поўдня. Галіна астраноміі, якая дакладна вылічвае курс нябесных целаў і паварот аддаўна сьцьверджаных зацьменьняў, ня выклікае дыспуты сярод астраномаў.

У Англіі ніхто ня кажа: "Я зьяўляюся ньютоністым, лёкістым або гальлеістым". Чаму? А гэта затым, што кажны, хто чытаў, ня можа не згадзіцца, што да праўдаў, навучаных вялікімі людзьмі, як: Ньютон, Лёк, Гальлей. Чым болей Ньютон знаходзіць для сябе пашану, тым меней людзі ўважаюць сябе за ньютоністых; бо інакш, гэта азначала-б, што існуюць антыньютоністыя ў Англіі. Магчыма ёсьць некалькі картэзцаў у Францыі, але гэта толькі затым, што Дэскартэзавая сыстэма зьяўляецца тканінаю памылковых і сьмешных спэкуляцыяў.

Вольтэр
Філязафічны слоўнік

Ты зьяўляешся магамэтанінам; з гэтага вынікае, што ёсьць людзі, каторыя ня ёсьць магамэтанінамі; з гэтае прычыны ты гэтаксама можаш памыляцца.

Якою была-б праўдзівая рэлігія, калі-б хрысьціянства не існавала? Рэлігія, у якой ня было-б сэктаў, рэлігія, у якой усе розумы былі-б у неабходнай сузгоднасьці.

Добра; які гэта мае быць доґмат, што да якога ўсе розумы згодзяцца? Хваліць Бога і быць чэсным. Усё філёзафы сьвету, каторыя вызнавалі рэлігію, казалі на працягу ўсіх стагодзьдзяў: "Існуе Бог, і чалавек мусіць быць справядлівым". Гэтым угрунтаванаю ёсьць рэлігія для ўсіх вякоў, і для ўсяе людзкасьці. З гэтае прычыны, тое, у чым яны згаджаюцца, ёсьць правільнае, і з гэтае самае прычыны, сыстэмы, дзякуючы якім людзі разыходзяцца, зьяўляюцца хвальшывымі.

"Мая сэкта ёсьць найлепшаю", кажа мне брамін. Мой дружа, калі твая сэкта ёсьць добраю, дык гэта неабходна; бо, калі-б гэта ня было абсалютна неабходным, тады ты мусіў-бы згадзіцца са мною, што гэ-

та бескарысным ёсьць. Калі гэта ёсьць абсалютна неабходным, тады гэта ёсьць для ўсіх людзей. Чаму, тады, назіраем, што ўсе людзі ня прызнаюць таго, што абсалютна неабходным для іх? Як гэта магчыма для ўсяе рэшты сьвету сьмяяцца з цябе і з твайго Брамы?

Вольтэр
Філязафічны слоўнік

"У часе хваробы", кажа Эпікурос, "маю ўвагу не займалі фізычныя цярпеньні, і з тымі, што наведвалі мяне, я ня вёў гутаркі на гэтую тэму. Я і далей выконваў свае раней пачатыя навуковыя працы, цікавячыся галоўна тым, як думка, ня гледзячы на сваё ўсуадношваньне да падобных рухаў у целе, тым ня меней утрымлівае свой унутраны супакой, маючы на ўвазе свамае для яе дабро". "І для лекараў", кажа ён далей, "я не стварыў прычыны стацца гордымі, быццам яны ня ведама што чыняць для мяне,але жыцьцё маё мінала добра і шчасьліва". Вазьмі яго сабе за прыклад, калі здарыцца табе захварэць або трапіць у якое-небудзь іншае пагражаючае палажэньне. Усе школы згодны ў тым, што ня трэба выракацца філязофіі ў ніякіх абставінах, ані падтакваць неўвукам, нічога ня ведаючым пра натуру, але ўсю сваю ўвагу кіруй у напрамку справы, якою ў дадзены мамэнт займаешся, і сродкаў, дзякуючы якім, яна станецца рэчаіснасьцю.

Марк Аўрэліюс

Ёсьць толькі адна запраўдная рэлігія, хоць можа быць шмат розных вераў.

Э. Кант

Р о з н ы я  Р э л і г і і - якое дзіўнае выражэньне! Натуральна, могуць быць розныя в е р ы ў гістарычныя падзеі, якія мелі месца не ў рэлігіі, а ў гісторыі, для ўмацаваньня рэлігіі, і якія адносяцца да галіны пазнаньня сродкаў, гэтаксама могуць быць розныя рэлігійныя кнігі /Зэндавэста, Вэды, Каран і г.п./. Але запраўдная для ўсіх стагодзьдзяў р э л і г і я можа быць толькі адна. Усе-ж розныя веры ня могуць зьмяшчаць у сабе нічога іншага, як толькі дапаможны сродак для рэлігіі, які зьяўляецца прыпадкова, і можа быць рознаякім, у залежнасьці ад розьніцы часу і месца.

Э. Кант

# ЯПІСКАП МІРЫЭЛЬ

Віктор Мары Гюґо /1802-1885/ францускі паэта, драматурґ і выняткава здольны ў прозе пісьменьнік. З прычыны ягонае паэтыцкае творчасьці многімі быў уважаны за найлепшага паэта ягоных дзён. Апрача драматычных твораў напісаў значную колькасьць вялікіх і глыбокіх у сваей тэматыцы раманаў, у якіх, сярод іншага, зьвяртаў увагу на тыя духовыя вартасьці, якія крыюцца сярод усялякага роду пакрыўджаных людзей: пагарджаных, няшчасных, забытых, адкінутых... "Япіскап Мірыэль" - гэта вынятак з аднаго зь ягоных найлепшых раманаў, ведамага п.т. "Няшчасныя"/Les Misérables/. Тут выступаюць два матывы: Кажны няшчасны чалавек, паніжаны, патоптаны, які, здаецца, загубіў сваю чалавечнасьць, адчувае цягу да свае прыроджанае годнасьці, што Гюґо выражае кароткім афорызмам - "Паніжэньне дамагаецца пашаны". Другі матыў - гэта адтварэньне патрэбы практычнага затасаваньня эвангельскіх прынцыпаў у штодзенным жыцьці. Япіскап Мірыэль - наўзор гэтае патрэбы. Жан Вальжан увайшоў у дом япіскапа як катаржнік, выйшаў зь яго - як адроджаны чалавек, каб пачаць новае жыцьцё.

--

У 1815 годзе правялебны Шарль Франсуа Біэнвэню Мірыэль быў япіскапам у Д.

Аднойчы ў дзьверы япіскапскага дому нехта пастукаў.

- Увайдзеце, - адклікнуўся япіскап.

Дзьверы расчыніліся насьцеж адным махам, быццам нехта звонку пхнуў іх з усяе сілы.

Увайшоў чалавек, паддаўся наперад адзін крок і затрымаўся, не закрываючы за сабою дзьвярэй. За плячыма ў яго быў ранец, у рукох ён трымаў кій. Твар ягоны быў адважны, злосны, змучаны і нахабны. Агонь з каміна асьвятляў яго.

Япіскап спакойна глядзеў на ўвайшоўшага чалавека. Ён толькі расчыніў рот, з замерам запытаць,што ён хоча, як увайшоўшы, апіраючыся дзьвюма рукамі на кій і, зьмерыўшы вачыма старога, хутка пачаў гаварыць:

- Вось. Маё імя Жан Вальжан. Я катаржнік. 19 гадоў правёў я на ґальлерах. Чатыры дні як мяне асва-

бадзілі, і вось іду ў Понторлье, куды мяне назначылі. Чатыры дні іду з Тулёну. Сягоньня прайшоў трыццаць кілямэтраў. Тут у карчме мяне выгналі з прычыны майго жоўтага паспарту. Пайшоў у другую карчму, і тамака мяне ня прынялі. "Ідзі вон!" кажуць. Пайшоў у вастрог - сторож ня пусьціў. Пайшоў у сабачую будку - сабака ўкусіў мяне і выгнаў, быццам і ён - чалавек, быццам і ён даведаўся, хто я. Хацеў перанакачаваць у полі, але цёмна, падумаў - сабярэцца на дождж, і вярнуўся ў места, каб прылегчы дзе-небудзь пад варотамі. Зусім ужо сабраўся легчы спаць на каменнай лаўцы, як нейкая старая жанчына паказала мне вашыя дзьверы, кажучы, "Пастукайся туды!" Я і пастукаўся. Што тут у вас? Карчма? У мяне грошы, сто дзевяць франкаў ёсьць, тыя, што запрацаваў на катарзе. Я заплачу. Ёсьць грошы. Я змучыўся, гэта-ж я прайшоў трыццаць кілямэтраў, дый галодным. Дык што, аставацца?

- Мадам Маґлюар, - сказаў япіскап сваей хатняй дапаможніцы, - пастаўце яшчэ адно накрыцьце на стол.

Падарожны зрабіў тры крокі наперад і падсунуўся да лямпы, што стаяла на стале.

- Паслухайце, - сказаў ён, быццам не зразумеўшы дакладна загаду. - Вы недачулі, што я катаржнік? Проста з катаргі, - пры гэтым ён дастаў з кішэні і разгарнуў жоўты ліст. - Вось мой паспарт. Жоўты - бачыце. З прычыны яго мяне і выганялі адусюль. Хочаце, прачытайце. Я ўмею чытаць, на катарзе навучыўся. Там ёсьцека школа для тых, што жадаюць. Паўзірайцеся, што напісана: "Жан Вальжан, звольнены з катаргі, народжаны"... для вас гэта ўсё роўна. "Пра быў у катарзе 19 гадоў. Пяць гадоў за крадзежу з узломам; чатырнаццаць за чатыры спробы ўцёкаў. Вельмі небясьпечны". Дык вось усе і выганяюць мяне; а вы ўпусьціце мяне? А мо' ёсьць у вас канюшня?

- Мадам Маґлюар, пасьцялеце чыстую бялізну на пасьцель у алькове.

Мадам Маґлюар выйшла, каб выканаць загад.

Япіскап зьвярнуўся да наведвальніка.

- Сядайце і абагрэйцеся, гаспадару мой. Мы зараз будзем вячэраць, падчас вячэры вам прыгатоўлена будзе пасьцель.

Падарожны, здаецца, зразумеў. Выражэньне ягонага твару, панурае і жорсткае, перайначылася ўзьдзіўленьне, няпэўнае, радаснае, і ён пачаў мармытаць, як чалавек зьбянтэжаны:

- Дык вось як? Бачыш ты! Значыць аставацца? Ня гоніце мяне! Катаржніка! Называеце "гаспадару мой".

Кажаце вы, а ня ты! Ня кажаце: ідзі вон, сабака, як чуў я гэта ад усіх людзей. Я спадзяваўся, што вы вытурыце мяне. Затым бо я ўжо адразу і сказаў вам, хто я такі. А вы клічаце мяне вячэраць і пасьцель зь бялізнаю, як усе людзі маюць! 19 гадоў я ня спаў у пасьцелі! Добрыя вы людзі! Выбачайце, спадар карчмар, як ваша імя? Я заплачу, колькі-б вы не зажадалі. Вы чэсны чалавек. Вы-ж бо карчмар?

- Я сьвятар, - адказаў япіскап.

- Сьвятар! - адказаў катаржнік. - Вы, мусіць, сьвятар гэтае вялікае царквы? Здурэў-жа я, запраўды, што не спасьцярог вашае скуф'і.

Кажучы гэта, ён паклаў у куток ранец і кій, схаваў пашпарт у кішэню і сеў.

Пакуль ён гаварыў, япіскап устаў і закрыў дзьверы, якія аставаліся расчыненымі.

Мадам Маґлюар вярнулася. Яна прынесла яшчэ адно накрыцьце і паставіла яго на стол.

- Мадам Маґлюар, - сказаў япіскап, - пастаўце накрыце бліжэй да агня, - і, зьвяртаючыся да гасьца, дадаў: - ночны вецер халодны ў Альпах. Вы, мусіць, прамерзьлі, гаспадару мой?

Кажны раз, калі ён вымаўляў слова "гаспадару мой" сваім паважным, ласкавым голасам, твар катаржніка зіяў.

Сказаць катаржніку: "гаспадару мой" - гэта тое самае, што падаць кубак вады сасмагламу. Паніжэньне дамагаецца пашаны.

- Як гэтая лямпа цьмяна гарыць! - заўважыў япіскап.

Мадам Маґлюар зразумела і накіравалася ў спальню япіскапа па сярэбраныя падсьвечнікі, якія прынесла з запаленымі сьвечкамі і паставіла на стол. Яна ведала, што япіскап любіў, каб іх запальвалі, калі ў яго былі госьці.

- Добры вы, - сказаў катаржнік, - не пагарджаеце мною. Прынялі мяне. Я не схаваў ад вас, скуль я і хто я.

Япіскап ветліва ўзяў катаржніка за руку: "Вы маглі і не гаварыць мне, хто вы. Гэты дом - ня мой, а Божы. Гэтыя дзьверы ня пытаюцца ў таго, хто пераступае парог, ці ёсьць у яго імя, а ці мае ён гора. Вы церпіце, вас мучыць голад і смага, тады - калі ласка, заходзьце. Я прыймаю вас не ў сябе, тут гаспадар той, хто патрабуе прытулішча. Усё, што тут ёсьць - усё вашае. Нашто мне ведаць ваша імя? Перад тым, як вы назвалі сябе, я ўжо ведаў як вас назваць.

Са зьдзіўленьнем госьць паўзіраўся на яго.

– Запраўды? Вы ведалі як мяне завуць?

– Так, – адказаў япіскап, – я ведаў, што вас завуць маім братам.

– Але, я быў галодны, калі ўвайшоў сюды, – сказаў госьць, – але вы гэтак зьдзівілі мяне, што і голад мінуў!

Япіскап акінуў яго ўзрокам і запытаў:

– Вы вельмі цярпелі?

– Ах, чырвоная куртка, ядзерная калода, прывязаная да нагі, дошка замест пасьцелі, холад, гарачыня, праца, удыраньні палкі, падвойныя ланцугі за кажную дробную рэч, карцэр за слова адказу і ланцугі ў пасьцелі, нават у шпіталю. Сабакі, сабакі і тыя болей шчасьлівыя! І гэта 19 гадоў. Цяперака мне 46 гадоў. Ідзі і жыві з жоўтым паспартам!

– Так, – сказаў япіскап, – вы выйшлі з месца суму. Але паслухайце, на небе будзе болей радасьці дзеля заплаканага твару грэшніка, што пакаяўся, чымся дзеля незаплямленае рызы ста праведнікаў. Калі вы вынесьлі з гэтага дому цярпеньня злосьць і ненавісьць супроць людзей, дык вы годны літасьці; калі-ж вы вынесьлі пачуцьцё лагоднасьці, супакою і дараваньня – вы лепшы за нас усіх.

У міжчасе мадам Маґлюар прынесла вячэру.

Твар япіскапа прыняў раптам вясёлае выражэньне гасьціннага гаспадара.

– Калі ласка да стала, – сказаў ён з ажыўленьнем, зь якім звычайна запрашаюць гасьцей садзіцца за стол.

Япіскап прачытаў малітву, пасьля разьліў суп. Госьць з прагнасьцю накінаўся на яду.

– Мне здаецца, што нечага не хапае на стале, – раптам сказаў япіскап.

І запраўды, мадам Маґлюар падала на стол толькі тры неабходныя накрыцьці; тады, як ужо звычаем сталася ставіць на стол усе шэсьць сярэбраныя накрыцьці, калі вячэрае хто-небудзь зь непрадбачаных гасьцей.

Мадам Маґлюар зразумела заўвагу, нічога ня кажучы, выйшла, і за хвіліну накрыцьці, жаданыя япіскапам, блішчэлі ўжо на белым настольніку, сымэтрычна разложаныя перад кажным седзячым за сталом.

Пасьля вячэры япіскап узяў са стала адзін з сярэбраных ліхтароў, другі падаў свайму госьцю і сказаў:

– Я правяду вас у ваш пакой.

Катаржнік пайшоў за ім. У часе, калі яны праходзілі праз спальню, мадам Маґлюар хавала серабро ў

сьценную шафку, што знаходзілася над узгалоўем пасьцелі япіскапа. Рабіла яна гэта кажны вечар перад тым як ісьці спаць.

Япіскап правёў гасьця ў альковy, у якой была прыгатоўлена чыстая пасьцель, паставіў ліхтар на столік і, пажадаўшы яму добрае ночы, пайшоў да сябе.

Калі на саборнай звойніцы выбіла другую гадзіну, Жан Вальжан прачхнуўся. Яго разбудзіла тое, што пасьцель была празьмерна мягкаю. Ён ужо дваццаць гадоў ня спаў на дабрай пасьцелі і, хоць лёг ён не распрануўшыся, аднак вельмі няпрывычнае успрыймо перашкаджала яму моцна заснуць. Праз ягоную галаву праходзіла шмат розных думак, але адна зноў і зноў вярталася і засланяла іншыя: ён заўважыў шэсьць сярэбраных сталовых накрыцьцяў і вялікую супавую ложку, што мадам Маґлюар паклала на стол. Гэтыя рэчы не давалі яму супакою. Цяпераказ яны ляжалі тут, толькі некалькі крокаў ад яго. Праходзячы праз спальню, ён бачыў, як старая жанчына хавала іх у шафку над узгалоўем пасьцелі. Ён добра прыкмеціў шафку. Яна знаходзілася на правай старане, выходзячы са сталовага пакою. Усе рэчы былі масыўныя са старасьвецкага серабра; прадаўшы іх, ён мог атрымаць два разы болей ад таго, што ён запрацаваў на працягу ўсяго свайго дваццацілетняга пабыту на катарзе.

Цэлую гадзіну ён правёў у нерашучасьці і змаганьні.

Выбіла трэйцюю гадзіну. Ён расчыніў вочы, падняўся крыху на пасьцелі, працягнуў руку і вобшчупам знайшоў ранец, кінуты ім у куток альковы, пасьля спусьціў ногі і сеў.

У гэткім палажэньні ён астаўся нейкі час у разважаньні, пасьля ўстаў на ногі, яшчэ некалькі мінют пастаяў у нерашучасьці, прыслухоўваючыся; у доме стаяла цішыня. Пасьля ўсунуў чаравікі ў кішэню, зацягнуў ранец рэменем і ўзяў яго на плечы. Паўстрымліваючы дыханьне і асьцярожна ступаючы, ён накіраваўся ў суседні пакой, які служыў спальняю япіскапу. Дзьверы спальні былі лёгка прыкрытыя: япіскап нават не зачыніў іх за сабою. Жан Вальжан насунуў на лоб шапку і хутка, не зьвяртаючы ўвагі на япіскапа, падыйшоў проста да шафкі. Ключ стырчэў у дзьверцах; ён адчыніў іх; першая рэч, якая кінулася яму ў вочы, быў кошык з серабром; ён узяў яго, і хуткім крокам, і без захаваньня якое-небудзь асьцярожнасьці, і, не зьвяртаючы ўвагі на спрычыняны ім шум, прайшоў праз пакой і апынуўся

каля вакна, і, схапіўшы свой кій, перакінуў нагу за нагою праз падаконьнік, усунуў серабро ў ранец і, хутка перабегшы сад, пералез праз плот і шчэз.

---

На наступны дзень, пры ўзыходзе сонца, япіскап спацыраваў па садзе. Мадам Маґлюар прыбегла да яго спалоханая.

– Ваша вялебнасьць! ён пайшоў і забраў нашае серабро. Глядзеце, вось тут ён пералез!

Япіскап стаяў хвіліну моўчкі, пасьля, узьняўшы поўны задумы ўзрок, спакойна сказаў:

– Перад усім, трэба яшчэ запытацца, ці наша гэта было серабро? Я даўно няправільна трымаў яго ў сябе; яно належыць да бедных. І чалавек гэты бедны.

Крыху пазьней япіскап сеў сьнедаць пры тым самым стале, пры якім напярэдадні сядзеў Жан Вальжан.

Ён толькі зьбіраўся ўстаць із-за столу, як у дзьвярох пачуўся стукат.

– Калі ласка, увайдзеце, – адклікнуўся япіскап.

Дзьверы адчыніліся. Трое людзей трымалі за каўнер чацьвертага. Трое людзей былі жандармы, чацьверты – Жан Вальжан.

Япіскап падыйшоў да іх з усёю жывасьцю, якую дазваляў яму ягоны стары век.

– Ах, гэта вы! – сказаў ён, гледзячы на Жана Вальжана. – Вельмі прыемна вас бачыць. Паслухайце, аднак-жа, я падараваў вам і ліхтары, яны сярэбраныя, як і ўсё іншае. Чаму-ж вы не ўзялі іх разам з усім іншым?

Жан Вальжан падняў вочы і паглядзеў на япіскапа з выражэньнем, якога ня можа пераказаць ані водная з людзкіх моваў.

– Дык гэты чалавек казаў праўду, ваша вялебнасьць? – запытаў жандарм. – Мы спаткалі яго; ён рабіў уражаньне, што ўцякае. Мы затрымалі яго, абшукалі і знайшлі серабро.

– І ён сказаў вам, – загаварыў япіскап, усьміхаючыся, – што гэта падараваў яму стары сьвятар, што прыняў яго на начлег? І вы прывялі яго сюды? Гэта непаразумленьне.

– Значыцца, мы можам пусьціць яго?

– Бяз сумніву, – адказаў япіскап.

Жандармы выпусьцілі Жана Вальжана, каторы са зьдзіўленьня адступіўся назад.

– Ці праўда гэта, што мяне асвабаджаюць? – сказаў ён бязгучна, як гавораць людзі спрасонку.

- Так, цябе пушчаюць, ці-ж ня чуў ты, - сказаў адзін з жандармаў.

- Дружа мой, - зьвярнуўся да яго япіскап, - перад тым як вы пойдзеце вазьмеце-ж вашыя ліхтары. Вось яны.

Ён падыйшоў да каміну, узяў сярэбраныя ліхтары і падаў іх Жану Вальжану.

Жан Вальжан дрыжэў усім целам. Ён бязмысна ўзяў ліхтары і, нічога не разумеючы, узіраўся на іх.

- Ідзеце ў супакою! - сказаў яму япіскап. - Дарэчы, мой дружа, калі вы яшчэ прыйдзеце, дык зусім ня трэба ісьці праз сад. Вы заўсёды можаце ўваходзіць і выходзіць праз дзьверы з вуліцы. Яны запіраюцца днём і ноччу на шчыкалатку.

Пасьля, зьвяртаючыся да жандармаў, ён дадаў:

- Калі ласка, вы можаце ісьці.

Жандармы адыйшлі. Жан Вальжан чуўся блізкім да няпрытомнасьці.

Япіскап падыйшоў да яго і сказаў шопатам:

- Не забывайце, не забывайце ніколі вашага прырачэньня; вы далі слова выкарыстаць гэтыя грошы на тое, каб стацца чэсным чалавекам.

Жан Вальжан, не памятаючы ніякіх прырачэньняў, ссумеўся. Япіскап сказаў гэтыя словы з асаблівым націскам. Ён далей працягваў урачыста:

- Жан Вальжан, брот мой, з гэтае хвіліны вы перастаеце быць прыналежным злу і пераходзіце пад уладу дабра. Я купіў вашу душу. І выганяю зь яе духа цемры і пераказваю яе Богу.

Віктор Гюґо

МУЖНАСЬЦЬ

Як далёка людзі выяўляюць зайздрасьць або якое-небудзь праяўленьне нянавісьці супроць адзін другога, гэтак доўга стаяць яны ў варажнечы між сабою, і ў выніку, яны яшчэ болей баяцца, ведаючы, што яны маюць болей сілы, чымся іншыя індывідуумы ў натуры.

Б. Сьпіноза

Тым ня меней, розумы не перамагаюцца аружжам, але любоўю і вялікадушнасьцю.

Б. Сьпіноза

І перад усім, для людзей карысным ёсьць хвармаваць супольнасьці і лучыцца самым у сувязі, якія могуць учыніць іх як аднаго чалавека; і бязумоўна, карысным для іх рабіць усё, што можа быць патрэбным, каб магутнела іхнае сяброўства.

Б. Сьпіноза

Няхай кажны золак дня будзе для нас быццам пачаткам жыцьця, а кажны захад сонца - быццам канцом яго, і няхай кажная з гэтых кароткіх жыцьцяў пакіне па сабе сьлед добрага чыну, дакананага для іншых, і добрага высілку над сабою.

Джон Рёскін

Ня шукай любові людзей і ня сумуй з прычыны іхнае нялюбасьці. Бо часта любяць за нешта дрэннае і ня любяць за добрае. Імкніся дагаджаць ня людзям, а Богу.

Л. Талстой

Сем свомасьцяў служаць перад тронам Ласкі: Вера, слушнасьць, справядлівасьць, далікатнасьць, міласэрдзьдзе, праўда і супакой.

Тальмуд Бабілёнскі

Калі чалавек заслугоўвае на пахвалу, імкнецеся не адмаўляць яму ў гэтым, бо інакш, вы ня толькі рызыкуеце зьнеахвоціць яго на ягоным шляху, адмаўляючы яму падтрымкі і ўзнаньня, у якім ён адчувае патрэбу, але і самыя вы пазбаўляеце сябе лепшае прывілегіі - сплаціць чалавеку належнае за ягоную працу.

Джон Рёскін

Што датычыць жанімства, дык тут ясна, што яно знаходзіцца ў сузгоднасьці з розумам, калі жаданьне зносінаў, выклíканае ня толькі вонкавою хвормаю, але любоўю зачацьця дзяцей і мудра ўзгадоўваць іх; асабліва, калі любоў абаіх мужа і жонкі знаходзіць сваю прычыну ня толькі ў вонкавай хворме, але галоўна ў прыгожасьці характараў.

Б. Сьпіноза

Каб учыніць лепшымі людзей, што робяць зло, ня трэба гаварыць ім пра іхныя недахопы, якія ўжо і бяз гэтага ўрэзаліся ў іхныя душы, а пра глыбака сукрытую ў іх цягу да мужнасьці.

Люсі Малёры

Нашыя дзеяньні, або жаданьні, якія пастанаўляюцца сілаю і розумам чалавека, зьяўляюцца заўсёды добрымі; іншыя могуць быць добрымі гэтаксама як і дрэннымі.

Б. Сьпіноза

Супольнасьць гаворыць чалавеку: "Думай, як мы думаем; вер, як верым мы; еш і пій, як мы едзімо і п'ем; апранайся, як мы апранаемся, - або будзь праклятым". Калі-ж хто не падпарадкуецца ёй, дык яна аберне жыцьцё яго ў пекла сваімі кпінамі, упіканьнямі, абмовамі, лаянкамі, байкотам і остракізмам, але будзь мужным.

Люсі Малёры

Усе нашыя натугі або жаданьні выток свой бяруць у неабходнасьці нашае натуры гэтакім спосабам, што яны могуць быць зразуметымі толькі ёю, як іхная прычына, паколькі мы зьяўляемся часткаю Натуры, часткаю, якая ня можа быць дастаткова агорнутаю сама сабою бяз удзелу іншых індывідуумаў.

Б. Сьпіноза

Не рабі нічога таго, у чым дакарае цябе тваё сумленьне, і не кажы таго, што нясузгодна з праўдаю. Гэта вось, самае галоўнае і перасьцерагай, і ты выканаеш усю задачу твайго жыцьця.

Ніхто ня можа змусіць тваю волю; на яе няма ані злодзея, ані разбойніка; не жадай неразумнага, жадай агульнага дабра, а не асабістага, як большыня людзей чыніць гэта.

Задача жыцьця ня ў тым, каб быць на старане большасьці, але ў тым, каб жыць у сузгоднасьці з унутраным табою вызнаваным правам.

Марк Аўрэліюс

Тыя хрысьціяне, што "блудзяць" і тыя "праўдзівыя" - дзеці аднаго Бога.

Паводля Ф. Скарыны

panem et circenses, хлеба і ігрышчаў; /ведамы кліч у старажытным Рыме ў часох імпэрыі; сынанім заніку мужнасьці/.

---

Калі мы, жывучы нормамі мужнасьці, становімся аб'ектам прасьледу са стараны дрэнных людзей і за прыхільнасьць да мужнасьці церпім ад іх асьмейваньне, ня будзем сумаваць і тужыць. Гэтакаю бо ёсьць свомасьць мужнасьці, што яна, звычайна, у людзях дрэнных уздымае да сябе нянавісьць. Зайздрошчучы тым, што хочуць жыць багабойна і, мяркуючы самым сабе падрыхтаваць апраўданьне, калі зьняславяць добрае імя іншых, дрэнныя людзі ненавідзяць добрых,як крочучых супроцьлежным шляхам, і ўсімі сродкамі імкнуцца абясчэсьціць іхнае жыцьцё. Але ня будзем смуткаваць, затым, што нянавісьць дрэнных служыць азнакаю мужнасьці.

Ян Залатавусны

Таму што, паводля натуры, зьверы, што ходзяць у пустыні, ведаюць логвы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, вычуваюць месцы віраў сваіх; пчолы і ім падобныя бароняць вульлі свае, - гэтак і людзі, дзе нарадзіліся і ўзгадованы паводля волі Бога, да месца таго, г. зн. да свае Бацькаўшчыны,вялікую любоў адчуваюць.

Ф. Скарына

Перашкода на шляху да дабра, пераможаная натугаю духа, дадае мне новая сілы; затым тое, што пагражала быць перашкодаю ў напрамку да асягненьня дабра, само стаецца дабром, і сьветлы шлях распасьцірае гарызонты неспадзявана там, дзе да нядаўна ня відна было разьвязкі.

М. Аўрэліюс

Мужнасьць чалавека ня вымерваецца ягонымі асаблівымі натугамі, але ягонаю штодзеннаю паставаю.

Паскаль

Немагчыма... крывёю цялят і казлоў ачысьціцца ад грахоў.

Ф. Скарына

Хрысьціянства нашае ня толькі іменем і хрышчэньнем, але братэрскаю любоўю і лагоднасьцю завяршаецца.

Ф. Скарына

Я павінен паступаць гэтак, як я думаю, а ня так, як людзі думаюць. Прынцып гэты, аднолькава неабходны як у штодзенным жыцьці, гэтак і ў разумовым, можа быць мернікам паміж велічнасьцю і ўсім нізкім. Прынцып гэты трудны, бо заўсёды сустрэнеце вы людзей, якія думаюць, што яны ведаюць вашыя абавязкі ляпей, чымся вы самыя іх ведаеце. У сьвеце лягчэй жыць у сузгоднасьці са сьвецкім перакананьнем, а ў вадасобленасьці лёгка сьледаваць за сваім уласным; але вялікі той чалавек, каторы сярод натоўпу прытрымліваецца незалежнасьці свае адасобленасьці.

Эмэрсон

Мы лучымся з вамі ў выражэньні нашае веры ў зьдзейсьненьне Беларускіх Ідэалаў вольнасьці, братэрства і роўнасьці сярод людзей і народаў.

Мы верым і падтрымліваем перакананьне, што "Усе людзі родзяцца свабоднымі і роўнымі адносна свае годнасьці і сваіх правоў; што яны абдораны розумам і сумленьнем і павінны адносіцца адзін да аднаго ў духу братэрства". -

Выпала нам на долю жыць у выняткавым часе, часе вялікага перагляду ўсіх дасюляшніх вартасьцяў. У аналізе гэтага зьявішча мы прыходзім да выснаву, што "розумы не перамагаюцца аружжам", што пры наяўнасьці нават нуклеарнага аружжа, існуе непераможнае аружжа веры ў слушную справу, сьведамасьці чалавека што да сваіх правоў, якія толькі, і яны толькі зьяўляюцца чыньнікам пастановаў, рэґулюючых суадносіны між народамі. Зарукаю ёсьць тут толькі нашая сьведамасьць.

Будзем, затым:

Жыць спадзеяю, што час цудаў мінуў, і астаюцца вялікія магчымасьці пазытыўнае арганізаванае і плянаванае працы;

Падтрымліваць зьнеахвочаных у нашых радох;

Заахвочваць адсталых і змучаных;

Бараніць несправядліва пакрыўджаных сярод нас;

Забываць усё тое, што нас дзеліць;

Не забываць, што ў нашай еднасьці крыецца магутнасьць і зарука сілы на шляху да волі.

---

Прытарнаваньне да звычаяў, што да якіх вы знаходзіцеся ў ніякіх суадносінах, - вось на што расьцярушваюцца вашыя сілы, забіраецца ўвесь ваш вольны час, і нішчыцца самабытнасьць вашае натуры. Адзін раз вы падтрымліваеце аджыўшыя свой век установы, падаеце голас за і супроць розных партыяў, іншым разам, як наёмны карчмар, абкормліваеце сябру як і ворага. Калі час ваш запоўнены гэткімі справамі, тады трудна распазнаць, што вы такое запраўды, ня кажучы ўжо нічога пра трату на рэчы без значэньня найлепшых вашых здольнасьцяў. Гэтакае жыцьцё губіць душу і цела.

Эмэрсон

Людзі гэтаксама перамагаюцца лібэральнасьцю, асабліва тыя, што ня маюць сродкаў абясьпечыць неабходнага дзеля падтрыманьня жыцьця. Але памагчы кажнаму аднаму, хто знаходзіцца ў патрэбе далёка перавышае магчымасьць і засобы прыватнага чалавека, бо багацьце прыватнага чалавека зьяўляецца наагул недастатковым, каб завяршыць гэтакія патрэбы. Апрача таго, сіла якога-небудзь чалавека ёсьць далёка абмежаванаю для яго, каб займець прыхільнасьць кажнага іншага зь ім у сяброўстве. Апека, затым, над бедным ёсьць абавязкам наагул супольнасьці, якая дбае толькі пра агульнае дабро.

Б. Сьпіноза

Не прасі, каб здарэньні ўкладваліся паводля твае волі, але каб воля твая прыймала здарэньні гэтак, як яны прыходзяць, і ты займееш супакой.

Эпіктэтус
"Навучаньне", 8

З гэтае прычыны болей выгадным для нас у жыцьці дасканаліць інтэлект або розум гэтак многа, як толькі гэта магчымым ёсьць, і ў гэтай адной рэчы зьмяшчаецца найвышэйшае шчасьце і добраслаўленасьць чалавека; бо добраслаўленасьць ёсьць ні чым іншым, як супакой розуму, які выток свой бярэ з інтуіцыйнага пазнаньня Бога, і дасканаліць інтэлект ёсьць ні чым іншым, як разумець Бога, разам з атрыбутамі і дзеяньнямі Бога, якія выплываюць зь неабходнасьці Ягонае натуры. Затым, апошняю мэтаю чалавека, які кіруецца розумам, інакш кажучы, найгалаўнейшым жаданьнем, пры помачы якога ён імкнецца кіраваць усе іншыя жаданьні, ёсьць тое, пры помачы чаго ён ёсьць ведзеным адпаведна да разуменьня самога сябе і ўсіх

рэчаў, якія могуць быць агорнутымі ягонаю інтэлігэнцыяю.

Б. Сьпіноза

Шукай, каб жыць жыцьцём неспасьцярожным.

Эпікурос

Уся мужнасьць кіруецца ў напрамку справядлівага чыну.

Арыстотэлес

Тое, што чалавек хоча - гэта незалежнасьць,ўсяроўна, колькі-б гэтая незалежнасьць каштавала і куды-б яна не завяла яго.

Дастаеўскі

Хочаш ты навучыцца і пазнаць тое, што для цябе карысным, дык вучыся быць для ўсіх няведамым і скромным.

Паводля Х. Кэмпійскага

Тое, што моры і рэкі пануюць над далінамі, па якіх яны цякуць, дзеіцца затым, што яны ніжэй за іх.
Затым, сьвяты чалавек, калі ён хоча быць вышэй за народ, ён павінен у сваіх рэчах быць ніжэй за яго. Калі ён хоча кіраваць ім, дык ён павінен быць з-заду яго.
Затым, сьвяты чалавек жыве вышэй за народ, але народ не адчувае гэтага. Ён знаходзіцца наперадзе народу, але народ ня церпіць з гэтае прычыны. Затым-жа, сьвет не перастаючы, аддае яму пашану. З тае прычыны, што ён ні з кім ня сварыцца, ніхто на сьвеце ня сварыцца зь ім.

Ляо-Тсэ

Шмат я навучыўся у сваіх вучыцялёў, яшчэ болей у сваіх калегаў, але болей за ўсё ў сваіх вучняў.

Тальмуд

Плятон, сын Арыстона, гледзячы на аплываючыя роскашшу дамы жыхароў Акрыґэнты /Акраґас/ і на іхныя гэтулькі-ж раскошныя баляваньні, заўважыў: акрыґэнтцы будуюць дамы гэтак, быцца зьбіраюцца вечна жыць, а ядуць, быццам разлучаюцца з жыцьцём. Сыцылійскі гісторык, Тымэос, падае, што яны карысталіся сярэбраным начыньнем для пахашчаў, сярэбранымі грабенямі, і ложкамі, змайстраванымі выключна са слановае косьці.

Айліян, 12:29

Калі якія-небудзь людзі ганьбяць цябе або ненавідзяць, або дрэнна выражаюцца пра цябе, дык падыйдзі бліжэй да іхнае душы, пранікні ў яе і паўзірайся, што яна сабою выяўляе. Тады ўбачыш ты, што табе няма чаго турбавацца пра тое, што гэтыя людзі думаюць пра цябе. Аднак-жа адносіцца да іх трэба з добразычлівасьцю, бо, паводля натуры, яны суродзічы табе.

Марк Аўрэліюс, 9:27

Бо я ведаю ў маім сумленьні, што я не зьяўляюся мудрым у ніякай рэчы, вялікай ці малой.

Сакратас

Існуюць людзі, якія маюць разьвязку на ўсе пытаньні; аб чым аднойчы прыпадкавы чалавек здаровага рассудку і гумару сказаў пра панурага доктара:"Гэты чалавек мусіць быць вельмі цёмны, бо ён мае адказ на кажнае пытаньне, якое ставіцца яму".

Вольтэр

Канвэрсацыя - гэта выражаная хворма твае здольнасьці не згадзіцца, і ўсё-ж працягваць канвэрсацыю.

Дўвайт Мэкдональд

Толькі чужымі вачыма можна бачыць свае недахопы.

Кітайская пагаворка

Трэба жыць кароткі час гэтага існаваньня паводля права вечнага жыцьця.

Торо

Выкананьне права Бога ёсьць сутнасьць жыцьця.

Л. Талстой

Той, хто ўпаў са свае ўласнае прычыны, ніколі ня плача.

Турэцкая прыказка

Прыгожасьць - гасьцінец Бога.

Арыстотэлес

Гэта ляжыць у характары вельмі не шматлікіх людзей, паважаць бяз зайздрасьці прыяцеля, каторы знаходзіцца ў працэсе свайго паводжаньня.

Айсхілёс

Мы павінны гэтак адносіцца да нашых сяброў, як мы хацелі-б, каб яны адносіліся да нас.

Арыстотэлес

На першай чары ён прачытаў інскрыпцыю: налпавае віно; на другой - ільвінае віно; на трэйцяй - авечае віно; на чацьвертай - сьвінячае віно. Гэтыя чатыры інскрыпцыі выражаюць чатыры ступені ўпадку чалавека з прычыны п'янства: першая ступеня - гэта ступеня бадзёрасьці; другая - гэта тая, якая выклікае раздражненьне; трэйцяя ступеня - тая, якая выклікае адурманеньне; і напасьледак апошняя - якая прыводзіць да зьверападобнасьці.

В. Гюґо

Мей на ўвазе свае сучасныя добраслаўленьні, якімі абдораны многія людзі - а не свае злыбеды ўчарашняга дня, якія, з усіх людзей, не шматлікія дазнаюць.

Чарльс Дікэнс

Сацыяльная заможнасьць значыць - чалавек шчасьлівы, грамадзянін свабодны, нацыя вялікая.

В. Гюґо

Чаму мы павінны турбавацца з прычыны таго, што́ думае большасьць людзей; людзі гэтыя гавораць тое, што́ ім толькі нада́рыцца.

Плятон
Протаґорас, 353

Я не заслугоўваю на тое, каб крыўдзіць самога сябе, бо сьведама ніколі я ня крыўдзіў каго-небудзь іншага.

Марк Аўрэліюс

Часамі можна пачуць думку: Неабавязкава, як той казаў, ведаць, трэба адно ў шчырасьці сэрца верыць. Шчырасьць сэрца бязумоўна патрэбна, але сутнасьць хрысьціянства ня толькі ў шчырасьці сэрца. Хрысьціянства павінна напоўніць зьместам і наш розум і загартаваць нашую волю.

а. Зьмітро Дудка

Тыя, што могуць даць істотную свабоду дзеля атрыманьня малое часовае бесьпекі, не заслугоўваюць ані на свабоду, ані на бясьпеку.

Бэнджамін Франклін

"Ἔσεσθε οὖν ὑμεῖς τέλειοι ὡς ὁ πατὴρ ὑμῶν ὁ οὐράνιος τέλειός ἐστιν. Будзьце-ж тады беззаганымі, як беззаганны Ацец ваш, што ў нябёсах.

/Пав. Мацьв., 5:48/

Аддавай чэсьць несьмяротнаму Богу — гэта твой першы абавязак.

Паводля Пітаґораса

Калі грошы зьяўляюцца тваею адзінаю спадзеяю для незалежнасьці, дык ты ніколі не здабудзш яе. Адзіным абесьпячэньнем, якое чалавек можа мець на гэтым сьвеце — гэта награмаджэньне веды, дасьведчаньня і здольнасьці.

Гэнры Форд

Першаю прадумоваю шчасьця ёсьць розум.

Софоклес

Поступ рэкаў да мора не зьяўляецца гэтак хуткім, як той, што вядзе чалавека ў блуд.

Вольтэр

Спадзея ёсьць мроею прабуджанага.

Арыстотэлес

Пры кажным прабуджэньні раніцаю стаў сабе пытаньне: што добрага можна выканаць сягоньня? і думай: бо-ж сонца, заходзячы, панясе з сабою частку праднзначанага мне жыцьця.

Індыйскае выслоўе

Мы вельмі прывыклі да разважаньняў над тым, як нам уладзіць жыцьцё іншых людзей — людзей наагул. І нам гэтакія разважаньні зусім ня выдаюцца дзіўнымі. А між іншым, гэтакія разважаньні не маглі-б ніколі існаваць у васяродзьдзі рэлігійных і гэтым самым свабодных людзей. Гэтакія разважаньні зьяўляюцца наступствам дэспатызму, — кіраваньня адным чалавекам ці маленькаю групаю людзей іншымі людзьмі.

Гэтак разважаюць і самыя дэспаты, і людзі, разбэшчаныя імі.

Л. Талстой

Ня хопіць шмат ведаць, каб быць мудрым.

Гэраклітос

Слова ёсьць толькі ценем чыну.

Дэмокрытос

ФІЛЯЗОФІЯ

Нашае слова філязофія выводзіцца з двух грэцкіх словаў: φῖλέω – люблю і σοφία – мудрасьць, што можа быць перакладзена на беларускую мову як любоў мудрасьці.

Мудрасьць – гэта кемнасьць, разуменьне, веда. Але ў разуменьні першых філёзафаў – Сакратаса і Плятона – гэта яшчэ ня ўсё. Можна бо кемнасьць, разуменьне і веду ўжываць з дрэнным намерам, на некарысьць людзей і самому сабе. Затым апошняя і найлепшая дэфініцыя будзе: Мудрасьць – гэта "ўжываньне найлепшых сродкаў дзеля асягненьня найлепшых мэтаў".

Затым, філёзаф – гэта чалавек, каторы ўжывае найлепшыя сродкі дзеля асягненьня найлепшых мэтаў.

Мужнасьць і этыка ідуць у пары.

---

Для грэкаў, якія стварылі гэтае слова, філязофія была любоўю да мудрасьці. Сакратас, майстра філёзафаў, ня цьвердзіў, што ён асягнуў мудрасьць або веду, але, што ён шукаў гэтую мудрасьць як і веду. Ягоная філязофія заўсёды была шуканьнем і ніколі агорнутаю ўжо хвормаю веды або дактрыны... Грэкі ня мелі нахілу да фармуляваньня і не накідалі вострых абмежаваньняў што да самое філязофіі.

Найболей агульная дэфініцыя, якая можа быць дадзена, ёсьць, што Філязофія Гісторыі, значыць нічога іншага, як поўнае думкі разважаньне пра яе. Думка зьяўляецца, запраўды, неадлучнаю для людзкасьці. Гэта ёсьць тое, што розьніць нас ад бруталяў. У адчуваньні, здольнасьці пазнаньня і дзейнасьці розуму; у нашых інстынктах і волевых актах, як далёка яны зьяўляюцца праўдзіва чалавечнымі, Думка ёсьць нязьменным элемэнтам.

Гэґэль

Філязофія зьяўляецца найболей агульнаю навукаю адносна правоў разьвіцьця натуры, людзкае супольнасьці і думаньня.

=

Філязофія, як канцэпцыя, гістарычна, зьяўляецца посьпехам наперад, працягам ягоным, канцэпцыя мэнтальнага разьвіцьця наагул і навуковае культуры ў апрычонасьці. Канцэпцыя, звычайна, зьменьвае сваю хворму ў залежнасьці ад сваеасаблівага характару тае ці іншае сыстэмы філязафічнае; аднак-жа, ува ўсім гэтым, філязофія ўключаецца пад агульнае паняцьце навукі, і, як рэґула, вылучаецца сваім характарам ад іншых навукаў дарогаю спэцыфічных розьніцаў, якімі яна не займаецца, як кажнаю зь іх, і ніякаю адумыснаю, выдзеленаю галінаю рэчаў, ані гэтаксама сумаю гэтых галінаў, узятых разам у іхным засягу, але займаецца натураю, правамі і сувязямі таго, штоколечы фактычна існуе. Гэтая агульная і фундамэнтальная характарыстыка розных ґістарычных канцэпцыяў філязофіі адказвае нашай дэфініцыі: Філязофія зьяўляецца навукаю прынцыпаў.

Др. Фр. Юбэрвэґ

Спасярод усіх філёзафаў Сакратас займае чаловае месца і стаецца крыніцаю гісторыі філязофіі ў сучасным значэньні гэтага слова. Гэтым мы ня хочам сказаць, што ўсе ідэі і высновы досьледаў ранейшых мудрацоў зводзяцца да нічога, але ў найлепшым выпадку ўплыў іхны на пазьнейшы сьвет быў пасяродкавы, праз Сакратаса і Плятона. Сакратас быў першым, каторы ўвёў навуковую індукцыйную арґумэнтацыю, хвармуючы сусьветныя канцэпцыі, каторы вымагаў дакладных дэфініцыяў і вывучаньня прынцыпаў этыкі. Фармальная лёгіка бярэ пачатак ад яго. Гэта ня значыць, што перад ім людзі не спасьцерагалі і ня думалі, або не дэфініявалі, або не апісвалі бачанага і ня прыдавалі значэньня мужнасьці, але яны не вывучалі дакладна правоў думкі або рацыянальнага абснаваньня мужнага паступаваньня. Сакратас ня быў тым, каторы, проста, прапаведваў маральнасьць ягонага веку і места. Ён дабіваўся зразуменьня інтэлектуальных асноваў для маральных прынцыпаў. Ён не аддзельваў веды ад правільнага чыну. Чалавек, каторы ведае, – ён казаў, – што́ ёсьць правільным – заўсёды будзе чыніць тое, што́ ёсьць правільным. Той, хто паступае правільна, аднак-жа, бяз яснае веды гэтага, знаходзіцца ў небясьпецы кажнае хвіліны ўпасьці ў памылку, і Сакратас параўноўвае яго да сьляпога чалавека, што крочыць па правільнай сьцежцы. Тут Сакратас праводзіць выразную мяжу паміж ведаю і правільным чынам.

Паводля Плятона і Цэльлера

Кажны вялікі пісьменьнік, пасьля прачытаньня працы свайго папярэдніка, пакідае сабе права выказаць свой пункт гледжаньня на дазеную тэму і чуцца адказным за выражаную думку толькі і выключна перад сваім сумленьнем і разуменьнем рэчы.

---

Грэцкае выслоўе, якое сталася асноваю сучаснага досьледу ў навуцы, гучыць: кажная рэч мае сваю прычыну.

---

Калі тваім жаданьнем ёсьць зьвярнуць увагу на філязофію, ты зараз-жа мусіш быць гатовым спаткаць абсьмейваньне і гірканьне са стараны многіх тых, каторыя гатовы сказаць: "Тут ён зноў, навернуты філізаф. Скуль ён набраўся гэтае гордае паставы?" Не, ня прыймай гордую паставу, але трымайся моцна таго, што́ ўважаеш за найлепшае для сябе, у спадзеі, што Бог паставіў цябе на гэтым месцы. І памятай, што, калі ты астанешся на сваім месцы, тады тыя, што раней сьмяяліся зь цябе, будуць аднойчы падзіўляць цябе, і зноў-жа, калі паддасіся ім, тады яшчэ болей будуць сьмяяцца зь цябе.

Эпіктэтус, 22

Няма нічога болей адчужанага і гэтак непраўдападобнага, чаго-б не сказалі пра тога ці іншага філёзафа.

Дэскартэс

Няхай ніхто з маладых людзей не адкладвае вывучаньне філязофіі, і старшы чалавек няхай ніколі не адчуе змучанасьці з прычыны ея; бо ніколі ня рана і ніколі за позна мець стараньне адносна душы.

Эпікурос

Разумныя людзі вучацца затым, каб ведаць; мізэрныя - затым, каб іх ведалі.

Усходняя мудрасьць

Трыма шляхамі можам мы прыйсьці да мудрасьці: першы - гэта шлях разважаньняў, і гэта самы шляхэтны шлях; другі - гэта шлях перайманьня мужнасьці ад іншых, і гэта самы лёгкі шлях; трэйці - шлях дасьведчаньня, і гэта самы цяжкі шлях.

Конфуцы

Сафістыя падавалі голас за падтрымку атмасфэры пануючага стану рэчаў. Яны апавяшчалі адноснасьць усіх вартасьцяў. Прыватны інтэрас зьяўляецца адзіным паказьнікам паводзінаў; права зьяўляецца нічым іншым як толькі сілаю. Тое, што зьяўляецца добрым тутака або цяперака, зьяўляецца дрэнным на іншым месцы або ў іншым часе."Чалавек зьяўляецца мераю ўсіх рэчаў" - не чалавек супольнасьці, але прыватны індывідуум. Праўда залежыць ад пункту гледжаньня адзінкі; мужнасьць і вера зьяўляюцца дамоўленасьцю; яны ня маюць асновы ў натуры рэчаў. Плятон выступіў рашуча супроць сафістых. Ня толькі ён супроцьставіўся ім; ён высунуў выбар. Плятонавая філязофія зьяўляецца, магчыма, найболей сваеасаблівым высілкам у гісторыі заходняе думкі ўкладу дактрыны абсалютных і мэтанакіраваных вартасьцяў. Паводля Плятона, існуе дабро і зло, што зьяўляецца ўнівэрсальным прынцыпам усіх часоў. Мы не ствараем вартасьцяў або праўды; мы знаходзім іх; яны не пакрываюцца з расаю, месцам або з багацьцем. Згэтуль, існуюць два сьветы; сьвет абсалютнае прыгожасьці,і сьвет утрымліванага пагляду, зь ягонаю дамоўленасьцю і ашуканствам. Тут ляжыць корань дуалізму Плятонавае філязофіі - дуалізм, які зьяўляецца фундамэнтальным і пранікаючым у ягонай думцы. Плятон супроцьставіўся дэспатызму, бо дэспатызм не кіраваўся вымогамі справядлівасьці, але брутальнаю сілаю. Ён супроцьставіўся прысутнасьці паэтаў у супольнасьці і ў урадзе, бо гэта азначала кіраваньне сьляпое пасыі і фанатызму. Ён супроцьставіўся дэмакрацыі, бо дэмакратычная супольнасьць ня мае сталых нормаў; мераю тут зьяўляецца самавыражэньне. Дэмакратычнае жыцьцё - гэта жыцьцё без належытага ўзору, у якім кажнае жаданьне ганаруецца затым, што яно праявілася, але не затым, што яно справядлівае. Плятонавая альтэрнатыва заключалася ў жыцьці кіраваным розумам; і розум аставаўся ў яго якраз тою сьведамасьцю з галіны абсалютнае праўды. Важнасьць і значэньне ягонае праслаўленае дактрыны ідэяў стаецца ясьнай у сьвятле сказанага.

=

Калі ты турбуешся пра заўтрашні дзень, ты акрадаеш сягоньняшні.

Недзе прачытанае

Чалавека, каторы шукае мудрасьці, можна назваць разумным, але, калі ён думае, што знайшоў яе, ён бязмысны.

Пэрскі Альбіціс

Філязофія ёсьць небясьпечнаю для тваіх ворагаў, бо яны ведаюць, што яна вучыць цябе думаць правільна і самастойна.

---

Мудрасьць - прынцыповая рэч; затым, здабудзь мудрасьць; і за ўсё, што́ маеш, здабудзь кемнасьць.

Кніга выслоўяў, 4:7

У першую чаргу мая краіна, а пасьля нашае сяброўства - парафраза, узьніклая з Арыстотэлесавага выказу: Памылковым ёсьць класьці сяброўства перад праўдаю.

---

Мэтафізыка існуе ў запраўднасьці, калі нават і не як навука, дык як натуральны нахіл, бо людзкі розум, крочучы непахісна наперад, заахвочаны да гэтага не адным толькі парожным жаданьнем шматзнайства, але і ўласнаю неабходнасьцю, даходзіць да гэткіх пытаньняў, на якія ня можа знайсьці адказу ніякае дасьведчанае дзеяньне розуму і выснутыя зь яго прынцыпы. Гэткім спосабам, запраўды, усе людзі, у якіх розум пашырыўся да межаў абстрактнага думаньня, заўсёды мелі якую-небудзь мэтафізыку; і яны заўсёды будуць мець яе.

Кант

Доля спрыяе адважным.

Вэрґіліюс

Вялікую задачу трудна вырашыць гэтак, каб усіх здаволіць.

Солён

Тое, што́ брыдка, ня чыні гэтага; і што́ ня ёсьць праўдаю - не кажы.

Марк Аўрэліюс

Культура гэтаксама прыносіць і перамогу, хоць перамога часамі абніжае культуру.

Плятон

# АПАВЯДАНЬНЕ ПРА ДОБРАГА БРАМІНА

У часе майго падарожжа я спаткаў аднаго старога браміна, вельмі мудрага чалавека, выдатнага інтэлектам і вялікае вучонасьці. Апрача таго, ён быў багаты і, пасьлядоўна, яшчэ болей мудрым, бо, не адчуваючы нястачы ні ў чым, ён ня меў патрэбы ўводзіць каго-небудзь у блуд. Ягоны дом быў вельмі добра ўтрымліваны трыма прыгожымі жанчынамі, якія рабілі ўсё, каб дагадзіць яму. Калі ён ня радаваў сваё сэрца сваімі жанчынамі, ён праводзіў час, аддаючыся філязофіі. Блізка каля ягонага дому, які быў прыгожа адэкараваны і акружаны чароўнымі садамі, жыла простая і бедная старая індыйская жанчына.

Аднойчы брамін зьвярнуўся да мяне:

- Ляпей для мяне было-б, калі-б я ніколі не радзіўся! - На маё пытаньне, чаму? ён адказаў:

- Я вучыўся і дасьледваў сорак гадоў, і гэта сорак страчаных гадоў. Я вучыў іншых, тады, як я сам астаюся ў няведаньні адносна кажнае рэчы. Гэтакі стан рэчаў напаўняе маю душу паніжэньнем і абрыдласьцю, да такое ступені, што жыцьцё маё стаецца нясьцерпным. Я радзіўся ў часе, і жыву ў часе, і ўсё-ж я ня ведаю чым час ёсьць. Я знаходжуся, як нашыя разумныя людзі кажуць, у месцы паміж дзьвюма вечнасьцямі, тады, як я ня маю ніякага ўяўленьня аб вечнасьці. Я створаны з матэрыі: Я думаю, але я ніколі ня быў здольным пазнаць што вытварае маю думку. Я ня ведаю ці маё разуменьне зьяўляецца простаю здольнасьцю ўнутры мяне, як напраклад, хаджаньне і траўленьне, або, ці я думаю маею галавою, калі я хватаю рукою. Ня толькі прычына мае думкі ня ведамая мне; прычына маіх рухаў гэтаксама зьяўляецца тайніцаю для мяне. Я ня ведаю дзеля чаго я існую, а людзі кажны дзень ставяць мне пытаньні адносна ўсіх гэтых рэчаў. І я мушу адказваць, і, калі я, запраўды, ня маю нічога вартаснага сказаць ім, тады я пачынаю найболей гаварыць, і я асаромлены перад самым сабою пасьля ўсяго сказанага ім.

Яшчэ горай тады, калі мяне пытаюцца, ці Брама быў роджаным з Вішны або, ці яны абодва зьяўляюцца вечнымі. Бог мне сьведкаю, што я ня маю найменшага паняцьця, і мая няведа сама выяўляецца ў маіх адказах. "О, сьвяты чалавеча", людзі кажуць мне, "скажы нам, чаму зло распашыраецца на сьвеце". І я знаходжуся ў гэтакай самай вялікай труднасьці, як і тыя, што ставяць мне гэтыя пытаньні. Часамі я ка-

жу ім, што ўсё на сьвеце зьяўляецца гэтак добрым, як толькі гэта можа быць, але тыя, што засталі зруйнаванымі або акалечанымі ў войнах, ня верацъ ані аднаму слову з гэтага - дый я сам ня веру. Я адыходжу ў цішыню дому ўдыраны маею ўласнаю цікавасьцю і няведаньнем. Я чытаю нашыя старавечныя кнігі, і яны падвойваюць маю цемру. Я пачынаю гутарку з маімі сябрамі: адны зь іх адказваюць мне, што мы павінны ўжываць жыцьцё і не рабіць сабе нічога з людзкасьці; іншыя думаюць, што яны ведаюць многа і губяцца ў лябірынце дзікіх ідэяў. Кажная рэч множыць мае мучэньні. Часамі я зьяўляюся на парозе адчаю, калі я падумаю, што пасьля ўсіх маіх пошукаў, я ня ведаю скуль я прыйшоў, і куды я іду, чым я зьяўляюся або чым я стануся.

Стан гэтага добрага чалавека запраўды непакоіў мяне. Ніхто болей ня быў гэтак разумны або болей шчыры, як ён. Я спасьцерагаў, што ягоная нешчасьлівасьць узрастала прапарцыянальна да ўзрастаньня ягонага зразуменьня і ягонага ўнутранага росту.

Гэтага самага дня я спаткаўся з старою жанчынаю, што жыла блізка каля яго. Я запытаўся яе, ці яна калі-небудзь непакоілася ў думках з прычыны няведаньня натуры душы. Яна нават не разумела майго пытаньня. Ніколі на працягу ўсяго свайго жыцьця яна не выяўляла ані на хвіліну нічога з таго, што мучыла брагміна. Яна верыла ўсім сваім сэрцам у ператварэньне Вішну, і, спадзяючыся атрымаць крышку вады з Ґанґэсу дзеля ачышчэньня самое сябе, была пэўная, што яна найболей шчасьлівая з жанчын.

Удыраны простае жанчыны шчасьцем, я вярнуўся да майго разьбітага філёзафа.

- Ці ня брыдка табе, - сказаў я, - быць нешчасьлівым, калі вось каля тваіх дзьвераў жыве простая жанчына, якая ні аб чым ня думае, і, ня гледзячы на гэта, зьяўляецца здаволенаю.

- Ты праўду кажаш, - адказаў ён, - я гаварыў сабе тысячу разоў, што я быў-бы шчасьлівым, калі-б я быў гэткім бязмысным, як вунь тая мая суседка, і, ня гледзячы на гэта, я не жадаю сабе гэтакага шчасьця.

Адказ майго брагміна ўчыніў на мяне большае ўражаньне за ўсе папярэднія. Я пачаўісьледваць самога сябе, і я прыйшоў да перакана्ньня, што, запраўды, я не хацеў-бы быць шчаслівым за цану бязмыснасьці.

.....................................................

Вольтэр

СВАБОДА

Бог, Каторы дараваў нам жыцьцё, даў нам адначасна і свабоду.

Томас Джэффэрсон

Чалавек не зьяўляецца свабодным, калі ён не зьяўляецца гаспадаром над самым сабою.

Эпіктэтус

"Гэта зьяўляецца справаю, якая будзе і надалей існаваць у гэтай краіне нават тагды, калі бедныя языкі судзьдзі Даўгляса і мой замоўкнуць. Гэта адвечнае змаганьне паміж гэтымі двума прынцыпамі - справядлівасьці і несправядлівасьці - на ўсім сьвеце. Гэта яны, гэтыя два прынцыпы, якія сталі тварам у твар з першых дзён існаваньня чалавека; і назаўсёды астануцца ў змаганьні між сабою. Адзін зьяўляецца звычайным правам людзкасьці, а другі боскім правам каралёў. Гэта той самы прынцып, ня глядзячы на хворму, у якой ён можа праяўляцца. Гэта той самы дух, які кажа: "Ты гаруй і працуй, і здабывай хлеб, а я буду есьці яго". Гэта без значэньня, у якой хворме ён прыходзіць, ці будзе гэта з вуснаў караля, які імкнецца сесьці на людзей свае ўласнае нацыі, каб жыць самому пладамі іхнае працы, ці пэўнае расы людзей з замерам паняволеньня іншае расы; гэта заўсёды астаецца той самы прынцып тыраніі".

А. Лінкольн

Мы вызіраем той дзень, калі права грамадзяніна крытыкаваць свой урад будзе загварантавана на ўсім сьвеце.

Джоді Паўэльл

Будзем верыць, што права чыніць моцным, і ў гэтай веры вытрываймa да канца, выконваючы наш абавязак гэтак, як мы разумеем яго.

А. Лінкольн

Мы ніколі не зьяўляемся пэўнымі, што апінія, якую мы хочам здушыць, ёсьць хвальшываю апініяю; і, калі-б мы былі пэўнымі, здушэньне яе ўсё-ж аставалася-б злом.

Джон Стюарт Мільл

Я буду прабаваць папраавіць памылкі, калі выявіцца, што яны памылкамі зьяўляюцца; і я ўспрыйму новыя пагляды гэтак хутка, як хутка яны выявяцца мне праўдзівымі паглядамі... Я ня маю замеру зьнішажаць маіх часта выказваных жаданьняў, у тым сэнсе, што ўсе людзі, на ўсім сьвеце, павінны быць свабоднымі.

А. Лінкольн

Першага дня, месяца студзеня, у годзе, Госпада нашага, тысяча васемсот і шэсьцьдзесят трэйцяга, усе асобы, трыманыя як нявольнікі ў межах якоганебудзь штату, або ў абазначанай частцы штату, людзі, затым зь якіх могуць быць у бунце супроць Злучаных Штатаў, хай будуць тады, з гэтае пары і надалей, і назаўсёды свабоднымі.

А. Лінкольн

Вызвалін той дадждэцца дня,
Хто вызвалены ў сваей волі.

Напіс, у будынку Школы Падхаронжых Рэзэрвы №5а ў Цешыне, Польшча, 1928 г.

... Дэклярацыя Незалежнасьці дае свабоду ня тольқі людзям гэтае краіны, але спадзею для цэлага сьвету на ўсе прышлыя часы. Яна была тым, што дае прыгачэньне, што з часам цяжар будзе зьняты з плеч усіх людзей, і што ўсе мецімуць аднолькавую магчымасьць. Гэтакае пераканаaньне дыша з Дэкларацыі Незалежнасьці...

А. Лінкольн

Быць высокамужным - значыць быць свабодным душою. Людзі, якія заўсёды гневаюцца на каго-небудзь, бесьперапынку баяцца чаго-небудзь і зусім аддаюцца пачуцьцёваму цярпеньню, ня могуць быць свабоднымі душою. Той, хто ня можа засяродзіцца ў сабе або захопліваецца чым-небудзь, той, узіраючыся - ня ўгледзіць, слухаючы - не пачуе, прымаючы ежу - не дазнаціме смаку.

Конфуцы

Трудна ўчыніць чалавека няшчасным, калі ён чуецца поўнавартаснаю адзінкаю сам у сабе, і стаіць у пераканаaньні, што знаходзіцца ў суроднасьці зь вялікім Богам, Каторы стварыў яго.

А. Лінкольн

Нявольніцтва зусім магчымым ёсьць, як доўга існуюць нявольнікі.

---

І чаму-б ня мела быць цярплівае даверра да ўльтыматыўнае справядлівасьці народу? Ці існуе якаянебудзь лепшая або роўная спадзея на сьвеце?

А. Лінкольн

Чым меней годнымі зьяўляюцца сваіх высокіх пасадаў тыя, што займаюць іх, тым пэўнейшымі яны чуюцца і тым болей пышуцца глупотаю сваею і нахабнасьцю.

Дэмокрытос

Калі... вы займелі перавагу ў сарваньні людзкае годнасьці зь негра; калі вы прыціснулі яго да зямлі і ўчынілі няздольным быць нічым іншым, як толькі рабочаю скацінаю на полі; калі вы патушылі ягоную душу на гэтым сьвеце і ўмясцовілі яго там, куды праменьне спадзеі не даходзіць, быццам у цемры праклятых, - ці зьяўляецеся вы пэўнымі, што той дэман, якога вы прабудзілі, адночы не абернецца супроць вас і адплоціць вам падобным? Што станецца з астоею нашае свабоды і незалежнасьці? Ёю не зьяўляюцца нашыя адстрашваючыя востранаежаныя сьцены, нашыя ашчаціненыя морскія ўзьбярэжжы, нашая армія і наш ваенна морскі флёт. Яны не зьяўляюцца нашаю пэўнасьцю супроць тыраніі. Усё гэта можа абярнуцца супроць нас, ня чынячы нас слабейшымі да змаганьня. Нашая пэўнасьць супачывае ў нашай любові свабоды, якую Бог укараніў у нас. Нашая абарона знаходзіцца ў нашым духу, які праслаўляе свабоду, як спадчыну ўсіх людзей, у кажнай краіне, усюды. Папробуйце зьнішчыць гэты дух, і вы пасееце насеньне дэспатызму перад вашымі ўласнымі дзьвярыма. Абазнайцеся вы толькі з ланцугамі паняволеньня, тады будзеце падрыхтоўваць вашыя ўласныя рукі і ногі, каб насіць іх. Асвойцеся з таптаньнем правоў іншых, тады вы згубіце геній вашае ўласнае незалежнасьці і станецеся падрыхтаванымі людзьмі для першага лепшага падпільноўваючага вас тырана, які паўстане з вашага ўласнага асяродзьдзя.

А. Лінкольн

Выбарчая картка сільнейшаю ёсьць ад кулі.

А. Лінкольн

Тая ўлада запраўды ёсьць сільнаю, паслухмяныя людзі якое зьяўляюцца радаснымі.

Лівіюс, рымскі гісторык

Ніякі чалавек не зьяўляецца нагэтулькі добрым, каб упраўляць іншым чалавекам, бяз згоды гэтага іншага.

А. Лінкольн

Калі-б уся людзкасьць, мінус адзін, мела сваю апінію, і толькі адзін чалавек меў-бы сваю супроцьлежную апінію, людзкасьць ня была-б болей усправядліўленаю змусіць маўчаць гэтага аднаго чалавека, чымся ён, калі-б ён меў сілу, быў-бы апраўданым у сьцішэньні людзкасьці.

Джон Стюарт Мільл

Краіна, зь ейнымі інстытуцыямі, належыць да людзей, каторыя засяляюць яе. Калі людзі ў якім-небудзь часе чуюцца змучанымі з прычыны існуючага ўраду, яны могуць выкарыстаць сваё канстытуцыйнае права, каб палепшыць урад, або сваё рэвалюцыйнае права распусьціць або скінуць яго.

А. Лінкольн

Людзі, якія запярэчваюць свабоду, падобны да сьляпых, што запярэчваюць колеры: яны ня ведаюць таго абшару, у якім людзі чуюцца вольнымі.

Л. Талстой

Я не зьяўляюся Няведаючым-Нічога; і гэта пэўным ёсьць. Як гэта можа быць? Як можа гэта быць, каб нехта, хто жывіць агіду адносна неграў, мог быць прыхільнікам распадзелу на клясы белых людзей. Наш праґрэс у звырадненьні, як мне выдаецца, вельмі хуткім. Як нацыя, мы пачалі, дэкляруючы, што "ўсе людзі створаны роўнымі". Практычна цяперака мы чытаем: "усе людзі створаны роўнымі, апрача неграў". Калі Няведаючыя-Нічога здабудуць кантролю, тады трэба будзе чытаць: "усе людзі створаны роўнымі, апрача неграў, чужынцаў і каталікаў". Калі-б да гэтага дайшло, я ўважаў-бы за лепшае вызміграваць барждзэй у якую-небудзь іншую краіну, дзе людзі жывуць без прэтэнсыі да любові свабоды – да Расеі, напрыклад, дзе дэспатызм прыймаецца за чыстую манэту, і без пазалоты крывадушнасьцю.

А. Лінкольн

Пазнаеце праўду, і праўда ўчыніць вас свабоднымі.

Эв. пав. Яна, 8:32

Калі зьнішчэньне ёсьць нашым удзелам, тады мы самыя мусім быць аўтарамі яго і завяршальнікамі. Як нацыя свабодных людзей, мы мусім жыць па вечныя часы, або памерці на дарозе самагубства.

А. Лінкольн

Свабодным той толькі зь людзей бывае, з каторым здараецца ўсё гэтак, як ён гэтага сабе жадае. Але, ці гэта значыць, што зь ім абавязкава здарыцца ўсё тое, што толькі прыйдзе яму на думку? Ніколі. Бо-ж граматa, напрыклад, вучыць нас пісаць літарамі і словамі ўсё, што мы захочам; але, каб напісаць хоць-бы сваё імя, я не магу пісаць гэтакія літары, якія толькі мне спадабаюцца: гэтак я ніколі не напішу сваё імя. Я павінен мець жаданьне пісаць якраз гэтакія літары, якія патрэбны, і паводля таго парадку, які ў дадзеным выпадку вымагаецца. І гэтак ува ўсім. Мы ніколі і нічога не навучыліся-б, калі-б рабілі так, як толькі нам уздумаецца. З гэтага: каб быць свабодным чалавекам, ня трэба жадаць сабе ўсяго таго, што толькі прыйдзе ў галаву. Наадварот, свабодны чалавек павінен вучыцца жадаць і згоджвацца з усім тым, што зь ім здараецца, затым што, што з чалавекам здараецца, здараецца толькі паводля волі Таго, Хто кіруе ўсім сьветам.

Эпіктэтус

Памятай, што разуменьне тваё, якое мае свомасьць жыцьця ў самым сабе, чыніць цябе свабодным, калі ты не падпарадкваеш яго служэньню цела. Душа чалавека, асьвечаная разуменьнем, свабодная ад схільнае пачуцьцёвасьці, якая цьмянаю чыніць гэты сьвет, ёсьць праўдзівая крэпасьць, і няма прыпынішча для чалавека, якое было-б болей пэўнае і недаступнае для зла. Хто ня ведае гэтага, той сьляпы, а хто, ведаючы, не ўваходзіць у крэпасьць, той няшчасны.

Марк Аўрэліюс

Зло ня існуе для рэчавае натуры, але зло існуе для кажнага чалавека, катораму дадзена веданьне дабра і свабода выбару паміж дабром і злом.

Марк Аўрэліюс

СВАБОДА /і няўхільныя яе абмежаваньні/ +/

Я засьцярог сабе апошняе месца на большы лік пытаньняў, што адносяцца да абмежаваньняў урадавага ўмешваньня, якія хоць і лучацца сьцісла з тэмаю гэтага эссэю, аднак, з пункту гледжаньня дакладнасьці, не належаць да яго. Гутарка тут ідзе пра выпадкі, у якіх разважаньні супроць умешваньня не абяртаюцца супроць самога прынцыпу свабоды: пытаньне не адносіцца да паўстрыманьня ад акцыі людзкіх адзінак, але, каб дапамагчы ім; трэба разважыць, ці ўрад павінен рабіць або спрычыняцца да дзеяньня на іхную карысьць, замест пакінуць гэта да выкананьня ім самым, індывідуальна або ў дабравольнай камбінацыі.

Супраціў да ўрадавага ўмешваньня, калі яно не зьяўляецца праўным нарушэньнем свабоды, можа быць траякае ў сваім родзе.

Першы выпадак - калі рэч, якая мае быць учыненаю, можа быць праўдападобна выкананаю ляпей індывідуумамі, чымся ўрадам. Агульна кажучы, ніхто гэтак не зьяўляецца датарнаваным у выкананьні якоенебудзь справы або вырашыць, як або кім будзе справа выканана, як тыя, што асабіста зацікаўлены ў ёй. Прынцып гэты ганіць умешваньні, калісьці гэтак частыя, правадаўчых уладаў або дзяржаўных урадоўцаў, у галіне звычайных працэсаў, назіраных у індустрыі. Але гэтая частка тэмы дастаткова пашырылася на палітычных эканамістых, і не зьяўляецца ў васаблівых суадносінах да прынцыпаў гэтага эссэю.

Другая засьцярога ёсьць болей збліжанаю да нашае тэмы. У шматлікіх выпадках, хоць індывідуумы і ня

---

+/ Джон Стюарт Мільл /1806-1873/, ангельскі філёзаф і эканамісты; ужо з дзіцячых гадоў вырозьніваўся асабліваю інтэлігэнцыяю. Маючы тры гады, для прыкладу, ён вывучаў матэматыку, лаціну і грэцкую мову. Эўклідэса, Плятона і Гэродотоса чытаў у арыгінале, маючы восем гадоў. Чатыры гады пазьней стаўся рэчазнаўцам у прадмеце інтэрпрэтацыі Арыстотэлесавага пагляду на лёгіку. Навуку атрымліваў пад адумысным сыстэмам, распрацаваным і праводжаным ягоным бацькам, Джэймсам Мільл'ям. Актыўным быў на полі культурным і грамадзка-палітычным. Сярод ягонай багатай пісьменьніцкай спадчыны ўвагу чытача прыцягвае эссэй "Пра Свабоду", вынятківі зь якога гэтым падаюцца.

выконваюць дадзенае рэчы добра, у сярэднім, як дзяржаўныя ўрадоўцы, тым ня меней астаецца рэчаю пажаданаю, каб яна выконвалася барджэй імі, чымся ўрадам, як сродак іх уласнае мэнтальнае адукацыі - спосаб узмацняньня іхных дзеючых здольнасьцяў, набіраючы практыкі ў ацэне, і даньня ім набліжаных ведаў прадмету, зь якім яны астаюцца з мэтаю выкананьня яго. Гэта ёсьць прынцыповая, хоць і не апошняя, прапанова для прысяжных у судзе /для не-палітычнае справы/; свабодных і папулярных лёкальных і муніцыпальных інстытуцыяў; індустрыяльных прадпрыняцьцяў, ведзеных дабравольнымі зьвязамі. Пералічаныя выпадкі не зьяўляюцца пытаньнямі свабоды, і астаюцца ў сувязі з нашаю тэмаю на дарозе толькі адлеглых тэндэнцыяў; але яны астаюцца пытаньнямі разьвіцьця. Гэта адносіцца да розных выпадкаў, пачынаючы з сучаснасьці, да вытрываньня ў гэтых рэчах, як частквасьці нацыянальнае адукацыі; як гэта і ёсьць, папраўдзе кажучы, своеасаблівае школеньне грамадзян, практычная частка палітычнае адукацыі свабодных людзей, вывесьці іх з вызкага кругу асабістага і сямейнага эґоізму і прывучэньня іх да агарненьня супольных інтарэсаў, кіраваньне супольнымі натугамі турботаў - падрыхтоўваць іх дзеяць, кіруючыся грамадзкімі або поў-грамадзкімі матывамі, і накіроўваць іхную гатовасьць дарогаю сродкаў, якія будуць аб'ядноўваць іх, замест дзяліць. Бяз гэтакіх звычаяў і сілаў, свабодная канстытуцыя ня можа ані дзеяць, ані ацалець; пра гэта кажуць нам частыя выпадкі пераходнае натуры палітычнае свабоды ў краінах, дзе яна не супачывае на дастатковых асновах лёкальных свабодаў........................

.................................................

Трэйцяю і найболей пераконваючаю прычынаю абмежаваньня ўмешваньня ўраду ёсьць тое вялікае зло, якое непатрэбна дадаецца да ягонае ўжо наяўнае сілы. Кажны элемэнт, зьверхдададзены да ўжо практыкаваных урадам функцыяў, спрычыняе выклік спадзеяў і страхаў, што ён можа быць яшчэ болей распасьцертым, і зьіначваць болей і болей, актыўную і амбітную частку насельніцтва ў залежнікаў ад ураду, або пэўнае людзкае часткі, якая плянуе стацца ўрадам. Калі-б шляхі, чыгуначныя дарогі, банкі, іншурансавыя ўстановы, вялікія аб'едналыя акцыянерныя кампаніі, унівэрсытэты і публічныя харытатыўныя арганізацыі сталіся галінамі ўраду; калі-б, у дадатку, муніцыпальныя карпарацыі і лёкальныя рады, з усім тым, што разьвіваецца, дзякуючы ім, сталіся адзеламі цэнт-

ральнае адміністрацыі; калі-б урадоўцы ўсіх гэтых прадпрыняцьцяў вызначаліся і аплочваліся ўрадам, і агляда́ліся на ўрад, каб займець кажнае павышэньне ў жыцьці - тады ўся свабода прэсы і народныя ворганы праваўдаўства ня ўчынілі-б ані гэтае, ані якое-небудзь іншае краіны свабоднаю інакш, як толькі з назову. І зло будзе нагэтулькі большым, наколькі болей падрыхтаваны і навукова болей будзе разбудаваны адміністрацыйны апарат - болей прадуманыя спосабы дзеля атрыманьня найболей кваліфікаваных рук і галаваў, пры помачы якіх будзе праводзіцца завяршэньне. У Анґліі апошнім часам высунута прапанова, што ўсе сябры цывільнае службы ўраду павінны выбірацца адумысным экзамінацыйным целам, каб гэткім спосабам атрымаць для выконваньня ўрадавых працаў найболей інтэлігэнтных і выінструктованых людзей, якіх толькі можна знайсьці; і шмат было напісана і сказана за і супроць падобнае прапановы. Адзін з арґумэнтаў, найболей упорысты, уздыманы яе апанэнтамі, быў той, што сталая праца афіцыяльных службоўцаў гаспадарства ня мае дастатковае пэрспэктывы адносна высокае ўзнагароды і важнасьці, каб стацца сілаю прыцяжэньня для найвышэйшых талянтаў, якія заўсёды будуць здольнымі знайсьці болей запрашаючую іх кар'еру ў дадзенай прафэсыі, або ў службе для кампаніяў і іншых публічных установаў........
.................................................

Зусім іншы аспэкт выяўляецца сярод людзей, што прывыклі выконваць свае ўласныя заняткі. У Францыі, вялікая частка людзей, выконваючы вайсковую службу, - шматлікія зь якіх знаходзяцца ў ранзе -падафіцэраў, - і ў частых бунтах некалькі асоб спаборнічае ў здабыцьці ўлады і тут-жа наладжвае плян працы, магчымы ў сваім выкананьні. Чым французы зьяўляюцца ў вайсковай службе, гэтым амэрыканцы ў розным цывільным бізнэсе; няхай прытрапіцца апошнім астацца бяз ураду, кажнае цела амэрыканцаў зьяўляецца здольным наладзіць урад, выканаць тыя ці іншыя грамадзкія абавязкі з дастатковым праяўленьнем інтэлігэнцыі, парадку і пастановаў. Гэта якраз ёсьць тое, чым свабодныя людзі павінны быць: і людзі, здольныя да гэтага, напэўна зьяўляюцца свабоднымі; людзі гэтакія ніколі не дазволяць, каб іх хто-небудзь зь людзей - адзінка ці група людзей - паняволіў, бо яны здольнымі астаюцца ўзяць у свае рукі ўладу і выконваць яе пры дапамозе цэнтральнае адміністрацыі. Ніякая бюракрацыя ня можа лічыць на тое, каб узгадаваць людзей падобнае ініцыятывы, або пра-

водзіць нешта такое, чаго яны ня любяць. Але дзе кажная рэч выконваецца на дарозе бюракрацыі, нічога наагул ня можа быць выкананым з таго, супроць чаго бюракрацыя выступае. Канстытуцыя падобных краінаў – гэта арганізацыя дасьведчаньня і практычнае здольнасьці нацыі ў здысцыплінаваным целе з мэтаю кіраваньня рэштаю людзей; і, чым болей дасканалаю гэтая арганізацыя ёсьць у самой сабе, тым болей пасьпешнаю яна зьяўляецца ў прыцягваньні да сябе і ўзгадоўваньні для сябе людзей большае здольнасьці з усіх напластаваньняў супольнасьці, тым болей дакананым ёсьць паняволеньне ўсіх, уключна зь людзьмі бюракратычнага нахілу. Бо губэрнатары ў гэтакай ступені зьяўляюцца нявольнікамі іхнае арганізацыі і дысцыпліны, колькі кіраваныя імі зьяўляюцца нявольнікамі губэрнатараў. Кітайскі мандарын зьўляецца ў гэтакай самай ступені прыладаю і крыатураю дэспатызму, колькі зьяўляецца найболей просты земляроб.

Джон Стюарт Мільл

---

Для чалавека, як жывёльнага існаваньня, ня можа быць гутаркі пра свабоду. Усё жыцьцё абумоўліваецца сьцягам прычынаў. Але, калі чалавек сьведамы таго, што ён духовае існаваньне, дык для яго ня можа быць гутаркі пра абмежаваньне. Паняцьце абмежаваньня зьяўляецца нясвомым для розуму, сьведамасьці, любові.

Л. Талстой

Выбарчая картка сільнейшаю ёсьць ад кулі.

А. Лінколь

Свабода ёсьць дазволам чыненьня таго, што́ чыніць права дазваляе.

Шарль Монтэск'е́

Свабодны чалаек пануе толькі над тым, над чым можна панаваць баспэрашкодна. А панаваць зусім беспэрашкодна можна толькі над самым сабою. Затым, калі ты ўгледзіш, што чалавек хоча панаваць не над самым сабою, а над іншымі, тады і ведай, што ён не свабодны: ён стаўся нявольнікам свайго жаданьня панаваць над людзьмі.

Эпіктэтус

Там, дзе нямашака свабоды, жыцьцё зводзіца да арганічнае функцыі.

Язэп Мадзіні

## А Р О Л

Жыў у нас гэтаксама нейкі час у вастрозе і арол /Карагуш/, пароды стэпавых невялікіх арлоў. Нехта прынёс яго ў вастрог пакалечанага і змучанага. Уся катарга абступіла яго; ён ня мог лётаць: правае крыло ягонае зьвісала да зямлі, адна нага была вывіхнутая. Памятаю, як ён разьюшана азіраўся навакол, аглядаючы цікаўскі натоўп, і разьзёўваў свой гарбаты дзюб, прыймаючы вымоўную паставу дорага прадаць сваё жыцьцё.

Калі на яго панаўзіраліся і пачалі разыходзіцца, ён адкульгаў, хістаючыся з падскокамі на адной назе і махаючы здаровым крылом, у самы далёкі канец вастрогу, дзе забіўся ў кіток, шчыльна тулячыся да паляў. Тут ён пражыў у нас зь месяцыў тры, і праз увесь час ані разу ня выйшаў са свайго кутка. Спачатку прыходзілі часта ўзірацца на яго, наскоўвалі на яго сабаку. Шарык кідаўся на яго са свомаю для сабакі разьюшанасьцю, але, відаць, баяўся падступіцца бліжэй, што вельмі забаўляла арыштантаў.

– Зьвер, – казалі яны, – не даецца!

Пасьля і Шарык пачаў па-сабачы крыўдзіць яго; страх мінуў, і ён, калі наскоўвалі, ухітраўся хваціць яго за хворае крыло. Арол бараніўся з усенькаю моцаю кіпцюрамі і дзюбам і горда і дзіка, быццам ранены кароль, забіўшыся ў свой куток, вачэй ня зводзіў зь цікаўскіх, што хацелі паўзірацца на яго. Нарэшце, для ўсіх ён ужо перастаў быць цікавым, усе яго пакінулі і забылі, і ўсё-ж, кажны дзень можна было бачыць каля яго кавалачкі сьвежага мяса і чарапок з вадою. Нехта-ж даглядаў яго. Спачатку ён і есьці не хацеў, некалькі дзён ня еў; нарэшце, пачаў прыймаць ежу, але ніколі з рук або пры людзях.

Часамі я меў нагоду здалёк узірацца на яго. Ня бачучы нікога і, думаючы, што ён адзін, ён часамі адважваўся недалёка выходзіць са свайго кута і кульгаў уздоўж паляў, крокаў на дзьвянаццаць ад свайго месца, пасьля вяртаўся назад, пасьля зноў выходзіў, быццам ён выконваў спацыр.

Заўважыўшы мяне, ён зараз-жа з усенькае моцы, кульгаючы і падскокваючы, уцякаў на сваё месца і, захіліўшы назад галаву, разьзявіўшы дзюб, натапырыўшыся, зараз-жа прыймаў паставу да змаганьня. Ніякімі ласкавасьцямі я ня мог зьмякчыць яго: ён агрызаўся і біўся, ялавічыны ад мяне ня браў, і ўвесь час, здаралася, калі я стаю над ім, ён уваж-

на і чуйна ўзіраецца проста мне ў вочы сваім злосным і пранізваючым позіркам. У сваей самотнасьці ён злавесна чакаў на сваю сьмерць, нікому не даваряючы, трываючы стала ў стане гатоўнасьці да вайны.

Нарэшце, арыштанты быццам успомнілі пра яго і, хоць ніхто не турбаваўся, ніхто ня памятаў пра яго месяцаў з два, але раптам ува ўсіх быццам прабудзілася да яго спагада. Загаварылі, што трэба вынесьці арла.

– Няхай хоць і скончыць жыцьцё, але не ў вастрозе, – казалі адны.

– Ведама, птушка вольная, суворая, да вастрогу, брат, ня прывучыш, – падтаквалі іншыя.

– Мусіць, ён ня гэтак, як мы, – дадаў нехта.

– Вось табе і ўпёк: гэта-ж птушка, а мы,значыцца, чалавекі.

– Арол, браткі, ёсьць кароль лясоў... – пачаў гаварун Скуратаў, але яго ўжо ніхта ня слухаў.

Аднойчы пасьля поўдня, калі прагудзеў барабан да працы, узялі з сабою арла, сьціснуўшы яму дзюб рукою, бо ён пачаў адчайна біцца, і панесьлі з вастрогу.

Дайшлі да валу. Чалавек дзьвянаццаць, што былі ў вадной партыі, зь цікавасьцю хацелі пабачыць, куды пойдзе арол. І дзіўна: усе былі нечым здаволены, быццам часткава яны самыя ішлі на волю.

– Бачыш, сабачае мяса: дабро яму чыніш, а ён яшчэ кусаецца! – казаў той, што трымаў яго, з пачуцьцём любові, гледзячы на злосную птушку.

– Дык-жа пушчай яго Мікітка!

– Ты там, ведама, не капашыся зь ім доўга. Яму волю давай, запраўднаўскую волю-волейку.

Арла спусьцілі з валу ў стэп. Здарылася гэта ў часе глыбокае восені, у халодны хмурны дзень.Вецер сьвістаў у голым стэпе і шуршэў у пажоўклай высахшай зьмятай стэпавай траве. Арол падаўся проста, махаючы скалечаным крылом і, быццам сьпяшаючыся ўцякаць ад нас куды вочы глядзяць.

Арыштанты зь цікавасьцю сачылі, як мільгацела ў траве ягоная галава.

– Бачыш ты яго! – прагаварыў адзін у глыбокай задуме.

– І не аглядваецца! – дабавіў іншы.

– Ані разу, браткі,не аглянуўся, адно бяжыць сабе.

– А ты думаў што? вернецца да цябе? каб падзякаваць, – зазначыў трэйці.

– Ведамая рэч, гэта-ж воля! Волю пачуў.

– Слабода, значыць.
– І нявідзён ужо, браткі...
– Дый чаго тут стаяць? Марш! – закрычалі канвойныя, і ўсе моўчкі папляліся да працы.

Хв. Дастаеўскі

---

## Арла бачыў я...

Арла бачыў я. Быццам мечам, крылом
Ён рэзаў вятроў выгінастыя сьпіны;
Ракетай нізрынуўся ў хмараў пралом
Ды йзноў узьвіваўся між горных вяршынаў.

А лебедзь бялюткая ціха плыла
Па возеры сінім і роўным.
І я заглядзеўся, забыў пра арла,
Палонены чарам князёўны.

Ды вочы у высь ірвануліся ўзноў.
Арла я ўжо там не пабачыў.
І доўга блукаў па нажох валуноў,
Засмучаны гэтай няўдачай.

Ля глыбы гранітнай праменьні піў гад,
Ляжаў ён бяз мэты, бяз мары...
І думка кальнула: – каму зь іх я брат:
Арлу ў вышыні, ці вось гэтай пачвары?

Міхась Кавыль

---

РОЎНАСЬЦЬ

Мы дзівімся з таго, як зьінaчана было хрысьціянства, як мала яно, а нават і зусім ня зьдзейсьнілася ў жыцьці; з другое стараны, ці-ж магло стацца інакш з навукаю, якая ў сваім прынцыпе паставіла запраўдную роўнасьць людзей: усе сыны Бога, усе браты, жыцьцё ўсіх аднолькава сьвятое. Запраўдная роўнасьць вымагае ня толькі зьнішчэньня каст, тытулаў, прывілегіяў, але зьнішчэньня галоўнае прылады няроўнасьці - гвалту. Ня можна ўрэчаісьніць роўнасьці, як гэта думаюць, грамадзкімі загадамі, яна прыводзіцца ў стан быцьця толькі любоўю да Бога /Дабра, Праўды/ і да людзей. Любоў да Бога і да людзей перaказваецца людзям не грамадзкімі загадамі, але запраўднаю рэлігійнаю навукаю. Тое, што людзі маглі ўпасьці ў грубую памылку адносна таго, што свабода, братэрства і роўнасьць могуць быць уведзены карамі, гвалтам, зусім не гаворыць пра тое, быццам ідэалы гэтыя няправільныя, а толькі пра тое, што быў выбраны памылковы шлях, якім заблуджаныя людзі імкнуліся ўрэчаісьніць іх.

Аўтар няведамы

Справядлівасьць зьяўляецца роўнасьцю; чыненьне несправядлівасьці ёсьць запярэчаньнем роўнасьці.

Паводля Плятона
"Ґорґіяс", 489

Ня вер, што быццам роўнасьць ня можа быць асягнутаю, або, што калі і можа быць асягнутаю, дык толькі ў далёкай будучыні. Вучыся ў дзяцей. Яна цяперака ўжо можа быць асягнута табою не дарогаю ўстановаў і пісанага права /права заўсёды абыходзіца/, але тваім жыцьцём, тваімі суадносінамі да ўсіх людзей, з каторымі ты стыкаешся, не праяўляючы выняткавае пашаны для тых, што ўважаюць сябе за вялікіх і высокіх, а галоўна, праяўляючы гэтакую-ж, як усім, пашану для тых, каторых уважаюць за маленькіх і нізкіх.

Л. Талстой

Усе людзі родзяцца свабоднымі і роўнымі адносна сваe годнасьці і сваіх правоў. Яны абдораны розумам і сумленьнем і павінны адносіцца адзін да аднаго ў духу братэрства.

Унівэрсальная Дэкларацыя Правоў Чалавека, Артыкул I

Узважваючы канцэпцыю роўнасьці, назіранае ў натуры і, усуадношваючы яе са зьявішчамі маральнага сьвету, старажытныя грэкі, у сваіх разважаньнях, выводзілі тры фундамэнтальныя атрыбуты: I. Натура ўсюды зьяўляецца тою самаю; для прыкладу, агонь гарыць у Грэцыі падобна, як гарыць ён і ў Пэрсыі. 2. Яна хіліцца ў напрамку роўнасьці, ці, выражаючыся стылем фізыкі, упарадкаваньня ўласнае сыстэмы, ў якой кажная дзеючая сіла або элемэнт зьяўляецца абмежаваным да свае ўласнае сфэры. 3. Яна дзейнічае на падставе прынцыпу ўнівэрсальнае компэнсацыі, г. зн., што асягненьні ў адным кірунку роўнаважацца стратамі ў іншым, і кажны закалот у вапошнім падсумаваньні прыводзіцца ў парадак дарогаю роўнавагі. Запраўды, гэта бяз сумліву было задзіўляючым, што праўды, якія былі абагульненыя дасведчаньнем грэцкага сацыяльнага жыцьця, цяперака маюць вярнуцца, каб пацьвердзіць акуратнасьць гэтага жыцьця з усімі пасьлядоўнасьцямі ўсёагортваючага права роўнасьці.

Эўрыпідэс падае́ нам годны нашае ўвагі прыклад стылю, у якім гэтае этычнае затасаваньне фізычнае навукі можа быць практыкаваным. Мы назіраем як Этэоклес выражае сваю наважанасьць сьмець і праводзіць усё дзеля найвышэйшага /маральнага/ загаду. Ягоная маці, Іёкаста, далікатна папракае яго:

Роўнасьць шануй, што ўсё разам трымае:  
Месты, сяброў і супольствы народаў,  
Бо справядлівасьць ёсьць права, а права – парадак;  
Меншасьць ёсьць большасьці вораг;  
Сварка заўсёды бярэ свой пачатак, нявыгада месца дзе мае.  
Тут пачынаюцца нашыя меры і вагі, і лікі,  
Роўнасьць бо лад вызначае і спраўнасьць;  
Ноч асьляпляе нам вочы, а сонца ясьнейшым дзень чы́ніць.  
Роўнаю сьцежкай хай дзень твой пачнецца,  
Болю, затым, у душы не дазна́е ніхто між жывымі;  
Разам, і цемра, і сонца сьвятло чалавеку карысьцю бываюць: –  
Ці-ж не захочаш для роўнасьці дзьверы раскрыць твае хаты?

Паводля Альф. Б. Бэнна

Права, ў сваей маестатычнай роўнасьці, забараняе багатаму як і беднаму спаць пад мостам, жабраваць на вуліцах і красьці хлеб.

Анатоль Франс

Француская рэвалюцыя сто і пяцьдзесят гадоў таму паступова агаласіла век палітычнае роўнасьці, але час улёг зьмене, і гэта ў самым сабе не зьяўляецца дастатковым сягоньня. Межы дэмакрацыі маюць быць пашыраныя да ступені гэтаксама і да эканамічнае роўнасьці.

Джавахарлял Нэру

Роўнасьць - гэта прызнаньне ўсім людзям сьвету аднолькавых правоў на карыстаньне натуральным даб-ром сусьвету, аднолькавых правоў на шчасьце, выцякаючага з агульнага працэсу жыцьця, і аднолькавых правоў ня пашану і годнасьць чалавека.

Л. Талстой

Я веру ў Злучаныя Штаты Амэрыкі як народны Урад, пакліканы народам і для народу; якога справядлівая ўлада абасноўваецца на згодзе кіраваных; дэмакрацыя ў рэспубліцы, суверэнная нацыя суверэнных штатаў; дасканалы саюз адзін і непадзельны; абасновааны на прынцыпах свабоды, роўнасьці, справядлівасьці і гуманнасьці, для якіх амэрыканскія патрыёты ахвяроўвалі сваё жыцьцё і памыснасьць. З гэтае прычыны я веру, што мой абавязак перад краінаю - любіць яе, ахоўваць яе канстытуцыю, быць паслухмяным яе правом, мець у пашане яе сьцяг, і бараніць яе перад ворагамі.

Вільліям Т. Пэйдж

...Дэмакрацыя, якая зьяўляецца цудоўнаю хвормаю ўраду, поўная разнароднасьці і бязладзьдзя, і распадзяленьнем свайго роду роўнасьці, аднолькава паміж роўнымі як і няроўнымі.

Плятон
"Палітэйя", 8,558с

Кажуць, роўнасьць немагчымая, бо заўсёды адны людзі будуць сільнейшымі, разумнейшымі ад іншых. Вось-жа затым бо, што адны людзі сільнейшымі, разумнейшымі за іншых, кажа Ліхтэнбэрґ, асабліва патрэбным ёсьць права роўнасьці сярод людзей. Бо, калі-б апрача няроўнасьці розуму і сілы, была-б яшчэ няроўнасьць права, тады паняволеньне слабых сільнымі было-б яшчэ большае.

Л. Талстой

Я веру ў аднаго Бога і ня болей, і я спадзяюся шчасьце займець пасьля сьмерці; я веру ў роўнасьць чалавека, і я веру, што рэлігійныя абавязкі зыходзяцца ў тым, каб рабіць справядлівасьць, ласку ў любові, і імкнуцца ўчыніць людзей шчасьлівымі.

Томас Пэйн

Ніхто гэтак ня ўводзіць у жыцьцё запраўднае роўнасьці, як дзеці. І як праступнымі зьяўляюцца дарослыя, якія нарушаюць у іх гэтае сьвятое пачуцьцё, навучаючы іх, што існуюць каралі, міліянеры, ведамыя людзі, да якіх трэба адносіцца з пашанаю, і ёсьць слугі, фізычныя работнікі, жабракі, да якіх трэба адносіцца з паблажлівасьцю! "І хто зьвядзе аднаго з малых гэтых..."

Л. Талстой

Роўнасьць і справядлівасьць - дзьве характэрныя рысы дэмакрацыі, выплываючыя няўхільна з канцэпцыі чалавека, усіх людзей, як разумных і духовых існаваньняў.

Робэрт М. Гатчынс

Няроўнасьць мае сваю натуральную і неабходную прычыну ў васяродзьдзі сучасных абставінаў матэрыялізацыі нашае вышэйшае клясы, вульгарызацыі нашае сярэдняе клясы і бруталізацыі нашае ніжэйшае клясы.

М. Арнольд

Трэба толькі паўзірацца на жыцьцё хрысьціянскіх народаў, разьдзеленых на тых людзей, што вядуць усё жыцьцё ў ашукваючай, забіваючай і непатрэбнай для іх працы, а з другое стараны, людзей перанасычаных бязьдзейнасьцю і ўсякага роду прыемнасьцямі, каб быць ашаломленым тою жахліваю ступеняю няроўнасьці, да якое дайшлі людзі, што вызнаюць запавет хрысьціянства, і ў апрычонасьці тою няпраўдаю пропавядзі роўнасьці пры ўладжаньні жыцьця, якая кідаецца жахам у вочы самаю бязьлітаснаю і яскраваю няроўнасьцю.

Л. Талстой

Калі свабода і роўнасьць, як некаторыя навучаюць, галоўна знаходзіцца ў дэмакрацыі, тады найляпей яны рэалізуюцца, калі ўсе людзі аднолькава ўдзельнічаюць у кіраваньні.

Арыстотэлес

Людзі культуры зьяўляюцца праўдзівымі апосталамі роўнасьці.

М. Арнольд

## СПРАВЯДЛІВАСЬЦЬ

Я не кажу, што справядлівасьць ёсьць вышэйшаю прадумоваю маральнага жыцьця, але яна ёсьць прадумовінаю першаю. Усё, што знаходзіцца вышэй за яе, павінна абасноўвацца на ёй, павінна агортваць яе сабою, і можа быць асягнутым толькі празь яе... Пакуль ня возьмуць пад увагу вечнае справядлівасьці, недаступнаю станецца для іх вечная любоў. Гэтак, як чалаек павінен стацца справядлівым, перад тым, чымся станецца ён вялікадушным, гэтак і людзкая супольнасьць павінна стануць на аснову справядлівасьці перад тым, як уздымецца яна на ўзвышша добрадзеяньня.

Гэнрі Джордж

Нам трэба было-б жыць гэтак, быццам мы знаходзімся на вачох усіх. Нам трэба было-б думаць гэтак, быццам найболей запаветныя часьцінкі нашае душы былі даступнымі воку кажнага чалавека. Бо і якая-ж карысьць у сукрытасьці чаго-небудзь ад людзей? Нічога немагчыма схваць ад Бога... Хочаш ты займець ласку Неба? – будзь добрым. Багоўшануе той, хто насьлядуе іх: іхнаму болей высокаму ідэалу. І як-жаж мы паступаем? Якімі прынцыпамі кіруемся мы? Ці-ж ня прызнаем, што мы павінны паўстрымлівацца ад праліцьця крыві людзкае? Ці-ж гэтак ужо трудна паўстрымацца ад спрычыненьня шкоды таму, да каго ты павінен быць добрым? Уся боская і людзкая навука зводзіцца да таго прынцыпу, што ўсе людзі – часткі аднаго вялікага цела. Натура злучыла нас у вадну аграмадную сям'ю, калі яна ўжо стварыла нас з адных і тых самых элемэнтаў, на якія ў адпаведным часе мы зноў распадземся. Яна ўвасяродзіла ў нас любоў адзін да аднаго і стварыла для супольнага жыцьця ў грамадзе. Яна ў васнову паклала правы справядлівасьці і праўды, і паводля гэтых правоў болей нягожым ёсьць крыўдзіць, чымся быць крыўджаным; а паводля ейных уладжаньняў, рукі дадзены нам дзеля ўзаемнае дапамогі... Мы павінны глядзець на запраўдную існасьць рэчаў, а не на тое, як яны завуцца. Будзем ценіць усё паводля запраўднага значэньня, а не ў сузгоднасьці з апініяю сьвету. Будзем любіць паўстрыманьне, і ў першую чаргу будзем рупіцца пра справядлівасьць... Нашыя чыны да тае пары ня будуць правільнымі, пакуль ня будзе гэтакаю-ж і нашая воля, затым, што ёю пастанаўляюцца дзеяньні.

Сэнэка

Справядлівасьць - дзеючая праўда.
Бэньямін Дісраэлі

Абсалютная справядлівасьць гэтаксама неасягальнаю ёсьць, як і абсалютная праўда; але справядлівы чалавек розьніцца ад несправядлівага сваім імкненьнем і спадзеяю асягнуць яе, як праўдзівы ад ілжывага - сваім жаданьнем праўды і вераю ў яе.
Л. Талстой

Я думаю, што парадак для цела называецца здароўем, зь якога родзяцца ў целе і дужасьць, і з цнотаю ўсе іншыя лепшыя свомасьці.

Парадак і складнасьць душы зьяўляюцца правам і правамоцнасьцю, дзякуючы якім, людзі стаюцца чэснымі і паважаючымі права, што́ і ёсьць справядлівасьць і паўстрыманасьць.

І ці ня будзе праўдзівы і чэсны красамоўца, які разумее сваё мастацтва, кіраваць свой узрок у напрамку тых людзей, да душаў каторых ён прамаўляе, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на сваё дзеяньне, на тое, што́ ён дае і што́ ён хоча атрымаць? Ці ня будзе ягонаю мэтаю ўкараняць у душах сваіх суродзічаў справядлівасьць і выганяць адтуль несправядлівасьць, укараняць паўстрыманасьць і выкарэньваць распушчанасьць, прышчапляць кажную цноту і выганяць усякія заганы?

Плятон
"Ґорґіяс", 504

Разуменьне, вымаганае дзеля вырашэньня грамадзкіх праблемаў, не зьяўляецца толькі справаю рацыянальных здольнасьцяў. Яно павінна быць прасякнута рэлігійным пачуцьцём і жывым спаўчываньнем адносна людзкіх цярпеньняў. Яно павінна пайсьці далей за ўласныя інтарэсы асобных людзей або групаў насельніцтва.

Яно павінна шукаць справядлівасьці, бо ў васнове кажнае з сацыяльных праблемаў мы заўсёды знойдзем якую-небудзь грамадзкую крыўду.
Гэнрі Джордж

Той, хто грэшыць - грэшыць супроць самога сябе; той, хто творыць несправядлівасьць, спрычыняе яе самому сабе, чынячы сябе дрэнным.
Марк Аўрэліюс, 9:4

Трэба зьвярнуць увагу, Сакратас, на тое, што справядлівы чалавек усюды выходзіць са стратамі ў супроцьстаўленьні да несправядлівага. У першую чаргу, у ўзаемадачыненьнях паміж людзьмі: калі адзін і другі маюць нейкую супольную справу, - тутака ты ніколі не спаткаеш, каб пры апошнім падсумаваньні справядлівы чалавек атрымаў болей, чымся несправядлівы, - наадварот, ён заўсёды атрымлівае меней. Пасьля, у ўзаемадачыненьнях з гаспадарствам, калі трэба плаціць якія-небудзь падаткі: пры роўным маемасным прыходзе справядлівы плоціць болей, а несправядлівы меней, і зноў-жа, калі трэба атрымліваць, справядліваму нічога не дастаецца, а несправядлівы выкіруецца, каб атрымаць шмат. Калі нават яны і займаюць якое-небудзь дзяржаўнае становішча, дык справядлівы, калі нават і не агарнула яго якоенебудзь іншае гора, церпіць з прычыны недагляду сваіх хатніх справаў, а гэта затым, што ён ня мае магчымасьці прысьвяціць ім дастаткова ўвагі, а з грамадзкіх справаў ён ня мае ніякае карысьці і гэта з прычыны, што ён зьўляецца чалавекам справядлівым. Да гэтага даходзіць яшчэ нездаволеньне ягоных сваякоў і гэта затым, што ён ня хоча апекавацца імі, калі гэта супярэчыць справядлівасьці. А ў чалавека несправядлівага ўсё гэта выходзіць наадварот.

Плятон
"Палітэйя",I,343de

Я не згаджаюся, Кальліклес, што быць выбітым па твару несправядліва, зьяўляецца найболей ганебнаю рэчаю на сьвеце; гэтаксама не зьяўляецца гэтакаю рэчаю папасьці ў рукі ліхадзеяў або быць абакрадзеным з маемасьці ці нават панесьці шкоду на целе, не, біць і рэзаць несправядліва мяне і маіх блізкіх, зьяўляецца болей ганебнаю рэчаю і горшаю. Грабіць, прадаваць у няволю, уломлівацца ў мой дом і наагул чыніць якую-небудзь несправядлівасьць адносна мяне ці маіх блізкіх - вось што зьяўляецца найболей ганебным і горшым для таго, хто гэта чыніць, чымся для мяне, каторы церпіць з гэтае прычыны.

Плятон
"Ґорґіяс", 509e

Несправядлівасьць дзе-небудзь ёсьць пагрозаю справядлівасьці ўсюды.

Марцін Лютар Кінґ, Мал.

Гэта, затым, ёсьць месца, дзе я павінен выканаць прырачэньне, дадзенае ў другой кнізе гэтае працы, і выясьніць, гэтак коратка і ясна, як толькі гэта магчымым ёсьць, што, калі маем мы прыняць дэфініцыі, выложаныя Сцыпіёнам у Цыцэронавай "Рэспубліцы", ніколі не існавала рымская рэспубліка; бо ён падае́ кароткую дэфініцыю, што рэспубліка – гэта народ у дабрабыце. І, калі гэтая дэфініцыя ёсьць правільнаю, тады ніколі ня існавала рымская рэспубліка, бо дабрабыт народу ніколі ня быў асягнуты сярод рымлянаў. Бо народ, паводля гэтае дэфініцыі, – ёсьць зграмаджэньне людзей, аб'еднаных агульным прызнаньнем права і супольнасьцю зацікаўленьняў. І тое, што́ ён разумее пад выражэньнем "агульным прызнаньнем права", ён поўнасьцю паясьняе, зьвяртаючы ўвагу, што рэспубліка ня можа быць кіраванаю без справядлівасьці. Там, затым, дзе адсутнічае праўдзівая справядлівасьць, там ня можа быць права. Бо тое, што́ ўчынена паводля права, учынена справядліва, і тое, што́ даканана несправядліва, ня можа быць даканана ў сузгоднасьці з правам. Бо несправядлівыя вынахады людзей ня могуць быць падаванымі ані ўважанымі за правы; бо яны нават самыя кажуць, што права ёсьць тым нечым, што́ крыніцаю б'е са справядлівасьці, і пярэчаць дэфініцыі, якая агульна даецца тымі, каторыя памылкова разумеюць справу ў тым сэнсе, што права ёсьць карысным для наймацнейшае партыі. Затым, там, дзе адсутнічае праўдзівая справядлівасьць, там ня можа быць зграмаджэньня аб'еднанага агульным прызнаньнем права, і дзеля гэтага ня можа быць народу, як разумелі Сцыпіён і Цыцэрон; і, калі няма народу, тады няма народу ў дабрабыце, але толькі нейкі разнародны натоўп, нягодны імя народу. Пасьлядоўна, калі рэспубліка ёсьць народам у дабрабыце, і нямашака народу, калі ён не аб'еднаны агульным прызнаньнем права, і ня існуе права там, дзе адсутнічае справядлівасьць, тады з усёю пэўнасьцю выходзіць, што рэспубліка ня існуе там, дзе адсутнічае справядлівасьць.

Сьв. Аўґустын
"Божае Места", кн.XIX, разьдз. 21

Адно толькі ў жыцьці дарагацэнным ёсьць – беспярапынна судырвацца з людзкім махлярствам і несправядлівасьцю, – не супыняцца самому быць лагодным.

Марк Аўрэліюс

Памылка ўсіх добрых людзей у нашым часе заключаецца ў тым, што, далікатна працягваючы руку злым, падтрымліваючы іх у іхным зьле і часта нават і супрацуючы зь імі, яны спадзяюцца адхіліць наступствы зла, побач усяго стараючыся направіць шкоду, спрычыненую гэтым злом.

Раніцаю яны, каб здаволіць дамаганьні сэрца, памагаюць дзьвюм або тром зьнішчаным сем'ям, а вечарам абедаюць з тымі, што зьнішчылі гэтыя сем'і, зайздросьцячы ім і падрыхтоўваюцца сьледаваць за прыкладам багатага спэкулянта, які эканамічна зьнішчыў дзьве ці тры тысячы людзей. Гэткім чынам яны нішчаць у межах некалькі гадзінаў болей, чымся зьяўляюцца ў стане направіць на працягу дзесяткаў гадоў, або ў найлепшым выпадку, дарэмна кормячы галоднае насельніцтва ў тылох усёнішчачай арміі, імкнуцца ўсё болей пабольшыць лік гэтае арміі і хуткасьць яе рухлівасьці.

Джон Рёскін

Душы ўсіх людзей зьяўляюцца несьмяротнымі, але душы справядлівых астаюцца несьмяротнымі і боскімі.

Сакратас

Як затым, каб папасьці ў мэту, трэба біць далей яе, гэтаксама і дзеля таго, каб быць справядлівым, трэба быць самаадданым, г. зн. несправядлівым адносна самога сябе. Калі будзеш жадаць быць толькі справядлівым, дык будзеш небесстаронны адносна сябе і несправядлівым адносна іншых.

Л. Талстой

Я буду бязьлітасны, як праўда і стойкі, як справядлівасьць.

Вільліям Л. Ґаррысон

# П Е Р Ш А Е  Г О Р А

## /Апавяданьне/

Калі Міхась выходзіў на балькон, яму трэба было толькі прыжмурыць свае вялікія сінія вочы, каб бачыць за адчыненымі варотамі коннае стайні круглы сьветлы зад Спрытнага ў ягонай стойле, рад аброцьцяў на перагародзьдзі і фурмана Ігната ў ягонай старой камізэльцы. Звычайна Міхась ня доўга супроцьставіўся спакусе: ён усоўваў дзьве рукі ў кішэні сваіх кароценькіх портачак, зьбягаў па сходах балькону і ішоў напрасткі праз вялікі зарослы двор проста ў стайню.

- Ну, што? - пытаў ён Ігната, агладваючы знаёмы і мілы яму спазор карэтнае падпаветкі, - левая ўсё яшчэ кульгае?

- Кульгае яшчэ, кульгае! - з поўнаю гатоўнасьцю падтрымаць гутарку адказваў Ігнат.

- А хамут паправіў?

- Дык вось-жа пачыняю.

- Глядзі: сягоньня майго Каралька нікому не давай!

- Ды ці-ж мая воля? Скажуць: "Трэба на станцыю ехаць, або ў сяло, запрагай Каралька"... дык я і запрагу.

- Дый што гэта, запраўды! усё майго каня, усё майго... - бурчліва дадаваў хлопчык. - А аўса яму ўсыпаў?

- Скуль-жа я вазьму, калі мне не загадана? - адказваў Ігнат, і барадаты, звычайна пахмурны твар ягоны прыймаў хітравае выражэньне. - Татачка не загадаў.

- Без аўса! - адчайна выкрыкнуў Міхась, і гнеўныя сьлёзы наварочваліся ў яго на вачох.

Ігнат весела і ветліва сьмяяўся.

- Бачыш, порах які: зусім порах, - гаварыў ён, успакойваючы хлапца. - Ды будзьце-ж спакойны: не пакрыўджу я вашага Каралька. У іншых забяру, а Каралёк у мяне заўсёды ў поўным здаволеньні.

Ён ветліва зазглядваў у вочы хлапчука і вёў па ягонай галаве сваею шурпатаю, грубою рукою. Міхась уціхаміраўся і пачынаў як звычайна свой абход. Па чарзе ён садзіўся на эквіпажы, улазіў на казлы і рабіў пры гэтым свае заўвагі.

- До-обры возік! - казаў ён у тоне знаўцы.

– Дрэннага ў ім няма! – спагадліва адзываўся Ігнат.

– І моцны?

– Дзёгцем папэцкаешся, свавольнік! – перасьцерагаў фурман. – Нянячка будзе злавацца.

Ігнат служыў у маёнтку першы год, але вельмі хутка зыйшоўся з маленькім панічом, і між імі вывязалася дзіўнае, але шчырае сяброўства.

– Вось, як я ў панства Лухоўскіх жыў, – пачынаў Ігнат. – Быў у іх конь...

– Ты ў іх да нас жыў?

– Не. Да вас жыў я тут у ваднаго купца... Ведама, неабходнасьць... Без патрэбы і дня не пражыўбы ў яго. Гэтаксама ў суд!... І за што мяне ў суд? Або я чужое браў?

– Ці-ж бы купец хацеў цябе судзіць?

– Дый што там хацеў! проста, значыцца, падаў скаргу. Быццам я ў яго каня і воз забраў. Запрацаваных грошай не плаціў цэлы год, а звольніць гэтаксама не звальняе. Жыві. Мы з бабаю і так і гэтак. Карыстаецца, значыцца, што пачпарта ня было. І што ты тут зробіш! Узялі мы з Матронаю, з бабаю маею, уночы каня ў воз запраглі, дый... дахаты. Ня пешкі-ж нам было ісьці, ды яшчэ зь дзіцем малым, а да хаты вёрст 60 будзе. Агледзеўся купец, а нас і сьлед прапаў. Каня, дык я-б яму вярнуў. Ці-ж узяўбы я? А ён, бачыш, разьюшыўся, што дармовы работнік пайшоў, ды ў суд, ды скаргу: так і так, як той казаў, значыцца, абакралі.

– І судзілі цябе?

– Кажуць – судзілі.

– Як гэта?

– А вось так гэта! – нявыразна адказаў Ігнат, і густыя бровы ягоныя клапатліва хмурыліся, а твар увесь даўжэйшы час прымаў панурае, бадай-што цярпеньнем адцемленае выражэньне.

– А ты-б сказаў, што ты ня вінаваты, – паважна раіў Міхась.

– Ды ці-ж мяне пыталі? Суды ў нас, якія-ж? Дзе-ж яна, саколік, тая праўда? Судзілі, судзілі, ды злодзеем мяне і зрабілі. Вось як!

– Як гэта зрабілі? – прагна дапытваўся хлапчук.

– А вось так! – сумуючы і горка ўсьміхаючыся, адказаў Ігнат.

Часамі гутарка іхная прыймала іншы характар.

– Ці Матрона твая жонка? – пытаўся Міхась.

– А то чыя-ж? – дабрадушна адзываўся Ігнат.

– Чаму-ж яна не з табою, а ўсё ў замлянцы хлеб

пячэ?

Ігнат усьміхнуўся.

- А чаго-ж ёй тут са мною? Казкі тут мне баіць, ці што?

- Пашто казкі? - горача пярэчыў хлопчык. - Мама для таты казкі не расказвае, так жыве... А Полька, значыць, твая дачка?

- Значыць, дачка.

- А яшчэ ў вас дзеці былі?

- Не, толькі ўсяго.

- А чаму ў вас болей ня было?

Ігнат сьмяяўся і круціў галавою.

- Ну-ж, дык дзіця! - казаў ён.

- Чаго сьмяешся? - зълёгка крыўдзячыся і паясьняючы сваю думку, далей казаў Міхась. - Вось ў таты і мамы трое дзяцей... Ігнат! - ветліва прасіў ён тут-жа, узіраючыся ў вочы свайго прыяцеля, - калі паедзем у места, папільнуй ты ўжо майго Каралька.

- Папільную! папільную! - прыракаў Ігнат. - Ды толькі, даражэнькі, каб мне раней за вас не паехаць.

- Куды? - зьдзіўлена пытаўся хлапец.

- А вось... туды! - са сваею звычайнаю патаёмнаю манерою адказваў Ігнат.

Часта інтымную гутарку сяброў супыняла старая нянька.

- Міхаська! ці ты тутака? - пытала яна, зазіраючы ў стайню. - І што гэта, запраўды, - буркліва казала яна далей, - панскае дзіця, а з канюшні ня выходзіць. Вось, паскаржуся маме! Бачыце, прыяцеля сабе знайшоў. Ідзі, зараз-жа ідзі! А ты, шалапуты, - зьвярталася яна да Ігната, - замест таго, каб хлапца прывесьці да розуму, ты яго яшчэ болей заманьваеш.

- Ды я што-ж, Ганна Герасімаўна? я нічога, - зьбянтэжана бараніўся Ігнат. - Калі-б я яго дурніцы якой вучыў...

- Яшчэ-б цябе толькі ў вучыцялі! - пагардліва дакідала нянька. - Ідзі, свавольнік, ідзі!

Бацьку і маці Міхась бачыў пераважна толькі пры стале. Бацька заўсёды быў заняты, маці цэлымі днямі сядзела ў сябе ў спальні і ўважалася нездаровая. Калі ёй не балела галава, дык балела што-небудзь іншае, і гэта, зноў, не дазваляла ёй зносіць шумнае прысутнасьці дзяцей і нават празьмернага сьвятла дня. Калі Міхасю прыходзіла ў галаву думка забегчы да мамы, яна песьціла яго, парывіста цалавала безьліч разоў і зараз-жа прасіла выйсьці і не турбаваць яе.

- Мама, - казаў ён, - я буду сядзець ціха, зусім ціха. - І ён садзіўся ў крэсла і складваў рукі на каленях.

- Ты здаровы? - з трывогаю пытала маці.

- Так, - няўважна адказваў ён, заняты якою-небудзь іншаю думкаю, і зараз-жа пераходзіў да цікавячага яго пытаньня.

Гаварыў ён шопатам, каб не нарушыць агульнага настрою цішыні і супакою.

- Мама, - шаптаў ён, - чаму, калі горача, абавязкава спацееш?

- Табе горача? - пытала маці.

- Горача... Ты думаеш, што я маю на сабе дзьве сарочкі?

- Ці-ж ты ў вадной?

- Ведама, што ў вадной! Во! - звонка азваўся Міхась і, расшпіліўшы каўнер паркалёвае касавароткі, паказаў свае голыя грудзі.

Маці хваравіта моршчылася.

- Чаму ты крычыш? - папракала яна.

- Ах, я забыў! - вінавата гаварыў хлопчык і сьціхаў. - Мама! - шаптаў ён зноў, зь мінуту пачакаўшы, - скажы мне: пашто хвост?

- Які хвост?

- У коней, у сабак?

- Як, пашто? Так, проста хвост. Гэтак ужо ўладжана.

- Ён ня проста! а мух махаць. Чым-бы яны махалі мух?

Баўбатня хлопчыка пачынала раздражняць нэрвовую жанчыну, але яна яшчэ цярпела моўчкі, у поўным перакананьні, што Міхасю самому наскучыць паўцемра пакою, і ён выйдзе. Але Міхась сасьлізгваўся па сьпінцы крэсла, укладваўся сьпіною на сядзэньні і задзіраў ногі, закладваючы іх адну на другую.

- Мама, - азваўся ён зноў, - ці ведаеш ты, дзе заводзяцца блохі?

Маці з абрыдласьцю моршчылася і закрывала вочы.

- Ну, запраўды, Міхаська! Што гэта за гутарка!

- У гужох. Калі завядуцца блохі, трэба гужы выкінуць і ўжо новыя...

- Вось што значыць, што ты ўсё па канюшням! З восені найму табе ґувэрнантку. Мне сорамна за цябе!

- І чаму-ж сорамна? - пытаў хлопчык.

- Ну, добра. Ну, ідзі! Ідзі да нянькі і сёстраў. Ты ўсё або адзін, або з мужыкамі.

Міхась глыбака ўздыхаў, неахвотна падымаўся з крэсла і зноў уздыхаў: яму яшчэ не хацелася выхо-

дзіць з прахалоднага пакою, ад свае сумнае, хворае, але ўсё-ж далікатна любімае мамы.

- Пацалуй мяне! - ціха сказала маці.

Ён пацалаваў, цёрся тварам аб яе твар, а яна нашчупвала пад сарочкаю ягоныя вострыя плечыкі і ўпадала ў жалосны тон:

- Худы ты ў мяне! бледненькі! Міхаська, чаму-ж ты гэтакі?

- Дурэю! - адказваў як заўсёды хлопчык, але спаўчувальная далікатнасьць мацяры ўзьдзейвала ня яго-ныя нэрвы і расчуляла яго.

- Ты ў мяне дрэненькі! І табе ня лёгка! І ў цябе часта сумна на душачцы, мой хлопчык!

І здаралася, што крануты яе жалем і незразумелымі яшчэ для яго словамі, Міхась раптам пачынаў плакаць на яе плячу.

- Што ты? пра што ты думаеш? - спалохана дапрашвала яго маці і дакраналася да ягонае галоўкі, каб даведацца, ці ня мае гарачкі.

Але Міхась тут-жа супакойваўся і выходзіў. І, не пасьпяваў ён дайсьці да дзьвярэй, як ужо забываўся пра свае бяспрычынныя сьлёзы, заняты якою-небудзь новаю цікаваю думкаю. Нешта яшчэ ўздрыгвала і ўсхліпвала ў грудзях, але ўжо ён радасна вошчупам дакранаўся да забытае вяроўкі ў кішэні і ўжо ўзважваў у думцы, якім спосабам найляпей яе выкарыстаць.

---

А між тым першае паважнае гора ўжо вісела над ягонаю галавою.

Аднойчы раніцаю бацька, не адрываючыся ад газэты, сказаў маме праз стол:

- Так... ты ведаеш? Прыехалі па Ігната.

- Прыехалі? ужо? - спалохана перапытала мама і, абмяркоўваючы нешта, апусьціла на стол недапітую чашку.

- Ці-ж запраўды, нічога ня можна было зрабіць? гэта-ж у іх дзеці, - ціха сказала яна.

- Што ты зробіш? - сказаў бацька, пажымаючы плячыма. - Ты-ж ня будзеш зьвязвацца з гэтым нягоднікам... ну, як яго там? з купцом, гэтым... Я яго крыху ведаю: кулак і круцель.

- Ну, вось бачыш, тым болей, - сказала мама.

- І чаму-ж тым болей? Забраў каня ды яшчэ замок зламаў, ну, значыцца, крадзежа з узломам... Справа простая.

- І што-ж ім асталося рабіць? - запытала мама. -

Ён-жаж бо выкарыстаў нейкую затрымку з паспартам, нічога не плаціў за працу, хацеў, каб дарма працавалі... Ігнат проста ўцёк зь няволі...

– А забіраць каня яму ўсё-ж ня трэба было! Ну, хопіць; што цяперака раздабэрваць! – з прыкрасьцю адказаў бацька і зноў заглыбіўся ў газэту.

Міхась прагавіта слухаў і нічога не разумеў.

– Мама, куды вязуць Ігната? – запытаў ён, шырака раскрываючы вочы.

Маці беззасяроджаньня паглядзела на яго, але раптам прыгадала, што хлапец знаходзіцца ў сяброўстве з фурманам, няпрыкметна нахмурылася і адвяла вочы.

– Хто прыехаў па Ігната, мама? – далей дапытваўся Міхась.

– І чаму-б не сказаць яму? – у тоне нездаволеньня загаварыў бацька. – Што гэта за вечны жах засмуціць, выклікаць здэнэрваваньне? І выйдзе нейкая мокрая курыца, гануча, а не чалавек...

– Божа мой, дык гавары сам, ці-ж я перашкаджаю! – са сьлёзамі на вачох ускрыкнула мама, падняла рукі да скроняў і адыйшла ад стала.

– Вечныя сцэны, вечныя сцэны! – закрычаў за ёю ў сьлед бацька.

– Твайго Ігната вязуць у вастрог за крадзеж з узломам. Разумееш!? – сказаў ён жорстка. Міхась пабляднеў. – Ігната за крадзеж, а ягоную жонку Матрону за тое, што памагала яму. Яго на тры гады, а яе на паўтара.

– А Польку? – запытаў Міхась.

– А Польку... Ну, што-ж Польку? Ведама, яе не ў вастрог... Я ўжо ня ведаю, куды яе... Польку.

Міхась упорыста глядзеў на бацьку, і вочы ягоныя станавіліся бліскучымі і злоснымі. Ён бляднеў усё болей, але ён баяўся бацькі і стараўся панаваць над сабою, як мог.

– Гэта за што-ж? – у тоне выкліку запытаў ён.

– Ён украў, чуў ты? І ўсё роўна, што ён украў.

– Зусім не ўсё роўна!... І сам-жа ты сказаў, што купец круцель. – Дык што-ж гэта? Як-жа гэта? Ці-ж можна гэтак?

Бацька раптам раззлаваўся.

– Калі ласка, калі ласка! без капрызаў. Распесьцілі гэтак, што сілаў нямашака болей.

Паўстрымліваючыся наколькі магчыма, Міхась ўстаў і выйшаў з пакою. Але, як толькі ён апынуўся за дзьвярыма, крыўда і гнеў на некага сьціснулі яму горла. Ён пабег уздоўж калідору і выскачыў на балькон. Першаю ягонаю думкаю было, пабачыцца з Ігна-

там, але вароты канюшні былі запертымі, і гэта казала, што Ігната там няма. Міхась пабег у дзявоцкі пакой. Там за сталом нянька піла гарбату; супроць яе сядзеў нейкі няведамы для Міхася мужчына ў вайсковай вопратцы. Вайсковы, манерна адстаўляючы локаць, даставаў са слоіка канфітуры і еў, запіваючы гарбатаю. Міхась зараз-жа пазнаў няньчын слоік і зразумеў, што нянька частуе вайсковага, але ён гэтак быў заняты неспадзяванаю весткаю пра ад'езд Ігната, што не зьвярнуў увагі на прысутнасьць няньчынага госьця.

- Няня, хто прыехаў па Ігната? - дрыжачым голасам запытаў ён.

Нянька не адразу адказала.

- Але́, завязуць цяперака твайго галубчыка: ня будзеш болей уцякаць ад нянькі.

- Хто прыехаў, няня?

- Цяперака ўжо ня выкруціцца... Хто прыехаў? ды вось хто прыехаў.

Міхась сьцяміў ня хутка. Той, хто павінен быў везьці Ігната і Матрону ў вастрог, выяўляўся для яго вялічэзным, страшным і агідным у сваім выглядзе, а тымчасам на яго ўзіраўся загарэлы, дабрадушны твар няньчынага госьця і ўсьміхаўся ні то сумніўнаю, ні то проста глупаю ўсьмешкаю. Апрача яго і нянькі, нікога болей у пакою ня было. Нарэшце, Міхась зразумеў.

- Ты? - зьдзіўлена і сумніўна запытаў ён, гледзячы проста ў вочы вайсковаму.

- Я! - вышчэрваючыся ў шырокую ўсьмешку, адказаў той, здаецца хістаючыся ў нерашучасьці, устаць яму перад маленькім панічом, ці далей сядзець.

- Ты? Ты... ты, нягоднік!... я табе... я цябе разаб'ю! - крыкнуў ён і кінуўся наперад.

Але раптам твар ягоны перахапіўся нэрвовасьцю, куты рота задрыжэлі, і ён заплакаў голасна і жаласна, як плачуць бясьсільныя, пакрыўджаныя дзеці. Ураднік зьбянтэжана сьмяяўся і азіраўся навакол, разводзячы рукамі...

Міхась пабег у дзіцячы пакой, забіўся ў кут каля свайго ложка і прыціснуўся да сьцяны, трымаючыся абедзьвюма рукамі за грудзі. Бездапаможнае абурэньне ўсё яшчэ клекатала ў ім і шукала для сябе выхаду. Ён убачыў на падлозе сястрыную ляльку, пачаў таптаць яе нагамі і, нарэшце, адкінуў яе ў другі канец пакою. На сьцяне вісеў ягоны ўласны абразок; ён сарваў яго і кінуў на падлогу. З прычыны гэтакае натужанае дзейнасьці ягоная нэрвовая напру-

жанасьць крыху паслабла: ён сеў, прыцісьнуўся ілбом да жалеза ложачка, сьціх і пачаў думаць... Ён думаў пра сілу.

Яму патрэбна была сіла, каб адпомсьціць, каб пакараць усіх тых жорсткіх і вінаватых людзей: судзьдзяў, каторыя судзілі Ігната; ураднікa, што павінен быў павезьці яго; няньку за тое, што частавала канфітурамі, і нават бацьку. На бацьку Міхась гневаўся за ягоную выразную абыякавасьць што да Ігнатавае долі. Ён павінен быў заступіцца, павінен быў выгнаць ураднікa, а ён тымчасам заставаўся спакойным, чытаў свае газэты і нават сказаў, што Ігнат "усё роўна, што злодзей".

Міхасю хацелася адпомсьціць усім людзям, якія гэтак жорстка крыўдзілі ягонага сябру.

Ён думаў пра тое, як ён пакарае бацьку, няньку, ураднікa і, абдумваючы пакараньне, калупаў кіпцем хварбу, што адставала на жалезе. Раптам ён насьцярожыўся: яму здалося, што чуе ён голасную гутарку бацькі і спалоханы голас адказаў Ігната. Ён хутка скочыў і пабег у дзявочы пакой. Сярод пакою, нізка пахіліўшы галавы, стаялі Ігнат і Матрона і пераступалі з нагі на ногу. Каля Матроны, уваткнуўшыся носам у хвальбанкі ейнае сукенкі, стаяла Полька, а маці глядзела на яе зьверху, і на твару яе было болей тупога зьдзіўленьня, чымся страху і гора. З-заду іх, з-за дзьвярэй вызіралі твары цікаўскае дворні.

– Ну, добра, – голасна гаварыў Міхасёвы бацька, – цяпераka ўжо позна і нічога ня можна зрабіць. Адносна Полькі ня турбуйцеся. Дрэнна ёй ня будзе, у жыцьці і сьмерці адзін толькі Бог праяўляе волю. Прыракаем сьцерагчы яе. З Богам, Ігнат! Што-ж зрабіць?!

Бацька махнуў рукою, быццам даючы зразумець, што пажагнаньне кончылася, але ніхто не кранаўся з месца. Ігнат маўчаў і тупа глядзеў сабе пад ногі.

– Так, мы прыракаем, – дрыжучым голасам дабавіла мама, працягнула руку да Полькі, але зараз-жа апусьціла яе і адвярнулася.

– Справы цяпераka ўжо не паправіш! – зноў загаварыў бацька, якому, як відаць, нямая сцэна адчаю гэтых людзей ставалася цяжарам. – Трэба ўжо як-небудзь... Тэрмін ня гэтак вялікі, пераживеш. Што-ж зробіш?

Матрона ціха адсунула Польку набок, зрабіла крок наперад і моўчкі павалілася барыне ў ногі, датыкаючы ілбом падлогу.

– Матрона! – крыкнула тая, і сьлёзы адразу пырснулі з вачэй. – Не кланяйся мне, Матрона! Павер ты мне: я дапільную тваю дзяўчыну. Я клянуся табе... Не кланяйся ў ногі!

Яна нахілілася, дрыжучаю рукою дакранулася да пляча Матроны і сама апусьцілася на падлогу побач яе.

– Трэба цярпець... Усім трэба цярпець! – хутка шаптала яна. – Усім трэба...

– Ну, хопіць, хопіць! – ня ўкрываючы свае нецярплівасьці, загаварыў бацька. – Я вельмі засмучаны. Я быў здаволены зь цябе, Ігнат. Адбудзеш тэрмін, прыходзь зноў. Прыму. І ня турбуйся пра дачку. З Богам цяперака!

Ён узяў за руку жонку і хацеў павесьці яе з сабою, але тая асвабадзіла руку і яшчэ раз крэпка абняла Матрону.

– Трэба цярпець! – шапнула яна яшчэ раз.

Матрона ўстала. Яна акінула пакой няпрытомным позіркам і затрымалася на Міхасю. Адну хвіліну жанчына і хлапчук глядзелі адзін на аднаго ў вочы, пасьля Міхась сарамяжна апусьціў павекі і крануўся наперад.

– Бывай! – сказаў ён вельмі ціха і ласкава. Але Матрона і надалей глядзела на яго моўчкі, усё яшчэ няпрытомная таго, што сталася. Тады Міхась накіраваўся да Ігната. Ён працягнуў руку, Ігнат узяў яе і раптам нахіліўся да самага твару дзіцяці.

– Польку... будзеш шкадаваць? – запытаў ён.

– Буду! – паважна і ўрачыста адказаў Міхась і адважным, блішчустым узрокам зірнуў у сумныя вочы свайго сябры. Ігнат правёў рукою па галаве хлапца, акуратна перахрысьціўся на абраз і скіраваўся да дзьвярэй.

– Матрона! – клікнуў нехта з дворні. – Матрона! Ігнат ужо выйшаў. Чакаюць на цябе, ідзі! Воз каля ґанку.

Маладая жанчына схамянулася, зъдзіўленьне зьмянілася боязьзю. Побач яе, як і раней, уткнуўшыся тварам у складкі спадніцы, стаяла Полька і дрыжэла ўсім целам. Яна павольна павярнулася і выйшла.

Хлопчык, устрымліваючы плач, спачатку крокам, пасьля бягом падаўся ў дзіцячы пакой і сеў зноў за ложка, хмурна пазіраючы перад сабою. У калідоры пачуліся крокі бацькі. Ён увайшоў у дзіцячы пакой і затрымаўся перад Міхасём.

– Што ты сядзіш тутака? Ідзі да нянькі, – сказаў ён.

Хлопчык маўчаў і не кранаўся з месца.

- Міхась! - сувора крыкнуў бацька, - да цябе я гавару, ці не?

Дзіця падняло галаву і затрымала на ім паважны, няпрыязны і пранізваючы позірк.

- Паслухай, - міжвольна сьмягчаючыся, загаварыў бацька, - ты, здаецца, злосьцішся на мяне? Дый пры чым я тут? Ці я вінаваты? Гэта мне трэба было цябе добра прабраць: як гэта ты адважыўся крычаць на ўрадніка? Ды кажы-ж! - нясьцерпна крыкнуў ён, адчуваючы, што ўпарчывы позірк сына раздражняе яго і быццам замінае яму.

- Няхай... - ціха і спакойна сказаў Міхась.

- Што няхай?

- Няхай сабе ты крычыш на мяне. Мне цяперака ўсё роўна.

Бацька крыху зьбянтэжыўся.

- Ну, добра! - сказаў ён. А я з табою цяперака і гаварыць ня хочу.

Ён павярнуўся і скіраваўся ў дзьверы.

- Па-твойму, - крыкнуў за ім Міхась, па-твойму, яго канфітурамі карміць, як нянька?!

Бацька затрымаўся.

- Кажны чыніць сваю справу, - адцеміў ён, - выконвае свой абавязак. Ураднікў загадана было, каб ехаў па Ігната, ён і паехаў. Ён прыгожы, добры чалавек, а ты пакрыўдзіў яго. І ты пакрыўдзіў мяне, няньку... За што?

Міхась паволі апусьціў вочы, і на ягоным твары выразна вырысаваліся зьдзіўленьне і боль.

- Добра, братка, - упікаючы, завяршыў бацька і выйшаў з пакою.

Міхась сядзеў нярухома.

"Добра, братка! - успомніўся яму дакорны, бадай што ветлівы голас бацькі. - Ня добра?... Пакрыўдзіў?... - балюча разважаў хлопчык. - Я пакрыўдзіў.. А яны ўсе... Ігната... за што?"

"Кажны чыніць сваю справу... Дык як-жа выйшла гэтая нядобрая, дрэнная справа?..."

Ён падняў свой узрок, і ў ягоным непарушным позірку асталося балючае і цяжкое пытаньне.

Л. Авілава

## ІНДЭКС АЎТАРАЎ І КРЫНІЦАЎ

Авілава, Л. - 198.
Аґні Пурана - 86.
Айліян - 159.
Айсхілёс - 160.
Альлілуева, Сьвятлана - 142, 143.
Аміель - 130.
Анґельская прыказка - 49.
Андэрсон, Г. Х. - 82, 100.
Арабская прыказка - 54.
Арнольд, Маттью - 48, 185.
Арсеньнева, Н. - 105, 118.
Архімэдэс - 46, 53.
Арыстотэлес - 29, 50, 53, 123, 125, 159, 160, 161, 162, 185.
Аўґустын, Сьв. - 56, 189.
Аўрэліюс, Марк - 15, 29, 33, 48, 65, 88, 98, 109, 110, 111, 122-125, 130, 146, 155, 156, 160, 161, 167, 174, 187, 189.
Багдановіч, Максім - 76, 79, 81.
Байрон - 49.
Балтыморскі рукапіс - 34.
Беларуская мудрасьць - 28, 47, 50.
Бічэр, Г. В. - 48.
"Божым Шляхам" - 27, 33, 49, 111, 132, 142.
Бонгёфэр - 55.
Боэці, Этьен дэ-ля- - 89.
Браўн - 15.
Будыйская мудрасьць - 28, 47, 67, 98.
Буркэ - 88.
Бэльл, Александар Ґрам - 52.
Бядуля, Зьмітрок - 17.
Вішну Пурана - 15.
Вольтэр - 29, 53, 54, 110-112, 136, 140, 145, 146, 160, 162, 168.
Вэрґіліюс - 167.
Ґаррысон, Вільліям Л. - 190.
"Ґэйнсвільл Сан" - 33.
Гатчынс, Робэрт М. - 16, 137, 185.
Гвайт, Вільліям Альлен - 88.
Гіппократэс - 51.
Гольмс - 38.
Готопадэза - 51, 54.
Гулістан Садзі - 67.
Гэґэль - 163.

Гэйвуд, Джон - I2I.
Гэйкэй, Кунінгам - 84.
Гэндэрсон - 38.
Гэнрі, Патрык - 87.
Гэраклітос - I62.
Гюґо, Віктар - 5I-55, I47, I6I.
Дансані, Лёрд - I2I.
Дастаеўскі,Хведар - I59, I79.
Даўґляс, Ґ. В. - I24.
Нэру, Джавахарлял - I84
Джаксон, Робэрт Г. - 87.
Джорж, Гэнрі - II8, I36, I86.
Джоўітт, Б. II2.
Джэнінґс, Вільліям - 36.
Джэффэрсон, Томас - I70.
Дісраэлі, Бэньямін - III, I87.
Дрэйк, Гэнрі Л. - I09.
Дэкартэс - I4.
Дэклярацыя Незалежнасьці - I3I.
Дэмокрытос - I62, I72.
Дэскартэс - I65.
дэ Сэн-Пьер, Бэрнардэн - 20.
Індыйскае выслоўе - I62.
Індыйская Вэмана - 84.
Індыйская Готопадэза - 54.
Інскрыпцыя на зване Свабода - 87.
Іоанна, I Пасланьне - 4:I6, 4:I2:I7.
Ісус з Назарэту - 56.
Кавыль, Міхась - 39, 68, I8I.
Кант - I3, I8, I9, 85, II3, I22, I23, I42-I44,I56, I67.
Карлайль, Томас - 83, II9, I2I, I22.
Кельлер, Гэлен - I9.
Кінґ, Марцін Лютар, Мал. - I88.
Кітайская мудрасьць - I4, 67.
Кітайскае выслоўе - 30, I60.
Кольтон, Ч. К. - I9.
Контынэнтальны Конґрэс /I775/ - 87. .
Конфуцы - 28, 42, 49, I65, I7I.
Лессінґ - Ґ. Э. - I8, I9, 50, I42.
Леўчык, Гальляш - 85.
Лёнґфэльлёў, Г. У. - I24.
Лівіюс, Цітус /рымскі гісторык/ - I73.
Лінкольн, Абрагам - I70-I74, I78.
Ліхтэнбэрґ - I37.
Лойка, Алег - I3
Лютар, др Марцін - II0, II9.
Лявалэ - 43.

Лямэнэ - 56, I37.
Ляндор, Вальтэр Савэйдж - 49.
Ляо-Тсэ - 30, 66, III, I29, I59.
Мадзіні, Язэп - 56, 88, I36, I78.
Маді - 38.
Манґам Сомэрсэт - 36.
Магамэт - 67, I2I, I23.
Макоўскі, С. - 55.
Малёрі, Люсі - III, II8, I29, I55.
Маррэй, Ґільбэрт - 57.
Марціно - 47, 83, 84.
Мацьвея, Эв. - 84, I05, I08, I62.
Мід, Марґарэт - 27.
Мільл, Джон, Стюарт - I70, I73, I75.
Мільтон - I35.
Мінс, Джаквэлін - I38.
Міцкевіч, Адам - 35.
МкКарті, Мэрі - 66.
Монтэнь, М. - I22.
Монтэск'е́, Шарль - I78.
Мэкдональд, Дэвайт - I60.
Мэтэрлінк, М. - 42.
Наббарт, Альбэрт - III.
Навука I2 Апосталаў /Дідахэ/ - 67.
Наґільл, Гэлен - I07.
Напалеон - 54.
Нямецкая прыказка - I9, 48.
Парацэльсус - 58, 65, II7.
Паскаль, Улас - I4, 30, 48, 50, 57, 66, 99, I08-II0, I56.
Паўла, Сьв. Ап. - 65, 87, I25.
Паўэльл, Джоді - I70.
"Перадавая думка сьвету" - I3, I4.
Пітаґорас - 35.
Плютарх - 36.
Плятон - I7, 27, 29, 3I, 42, 5I, 57, 67, I06, II2, II3, I29, I42, I6I, I67, I84, I87, I88.
Протаґорас - 36.
Пэйдж, Вільліям - I84.
Пэйн, Томас - I9, I85.
Пэнн, Вільліям - 38.
Пэрскі Альбіціс - I67.
Пятроўскі, Ян - бадай-што ўсе непадпісаныя думкі.
Рёскін, Джон - 27, 30, 42, 47, 65, 83, 86, 99, I35, I54, I90.
Руссо, Жан-Жак - I8, 28, 36, 47, 54, I05, I2I.
Садзі - I22.
Сакратас - 8, 27, 29, 47, 49, 5I, 65, I23, I60, I90.

"Санляйт" - 86.
Сапега, Леў - 43.
Скарына, Францішак - 156, 157.
Солён - 167.
Сольтэр - 37.
Софоклес - 36.
Спэнс, Томас - 42.
Стэфэнсон, Адляі - 38.
Сьпіноза, Б. - 36, 66, 154, 155, 158, 159.
Сэнэка - 13, 30, 34, 186.
Сяднёў, Масей - 117.
Талстой, Леў - 14, 18, 29, 33, 42, 47, 49, 54, 56, 57, 56, 57, 65-67, 83, 84, 86, 88, 98, 99, 108, 110, 120, 122-126, 129, 130, 135, 139, 142, 143, 154, 160, 162 173, 178, 182, 184, 185, 187, 190.
Тальмуд - 28, 36, 41, 98, 107, 108, 110, 123, 154, 159,
Тамаш Аквінскі - 121.
Токвіль - 33.
Томас, Давід - 17.
Торо, Гэнрі Д. - 160.
Турэцкая прыказка - 160.
Тэкстор, Кацярына Э. - 34.
Ўвоттон, Сэр Гэнрі - 19.
Унівэрсальная Дэклярацыя Правоў Чалавека - 43, 182.
Усевалад Радзевіч-Крывіч - 88.
Усходняя мудрасьць - 98, 168.
Ўэнслей, Робэрт - 29.
Фільлер, Томас - 49.
Флюґэль, Морыс - 144.
Форд, Гэнрі - 162.
Форд, Джон - 48.
Фосдік, Г. Э. - 105, 106, 107.
Франклін, Бэнджэмін - 136, 144, 161.
Франс, Анатоль /псэўдонім для Жак Анатоль Франсуа Тібо/ - 184.
Французская прыказка - 84.
Фульлер, Томас - 51, 110.
Хама Кэмпійскі - 57.
Цыцэрон - 38, 50, 52, 88, 130.
Чаньнінґ - 88.
Шопэнгаўэр - 19, 30, 49, 51, 52.
Эдісон, Т. Э. - 121.
Эзопос - 48.
Эмэрсон, Р. У. 14-16, 51, 54, 67, 83, 84, 121, 157.
Энслей, Ф. Ґэральд - 138.
Эпіктэтус - 40, 109, 158, 165, 170, 178.
Эпікурос - 159, 169.
Эразм з Роттэрдаму - 28.

Юбэрвэґ - I64.
Ян Залатавусны - I56.
Яна, пав. Эв. - 47, 66, 84, I74.

---

ТЭМАТЫКА

Прадмова .................................... 9
У напрамку пазнаньня ........................ I3
Бог ......................................... I7
Веда для дабра .............................. 27
Жыцьцё ...................................... 33
Чалавек ..................................... 36
Права ....................................... 42
Праўда ...................................... 47
Веды, веда .................................. 5I
Любоў ....................................... 65
Залатое праменьне ........................... 76
Вера ........................................ 83
Свабода ..................................... 87
Гордасьць ................................... 98
Малітва ..................................... I05
У пэрспэктыве ............................... I09
Гаспадарства ................................ II3
Праца ....................................... I20
Адно ........................................ I29
Воля народу ................................. I3I
Прагрэс ..................................... I35
Рэлігія ..................................... I42
Мужнасьць ................................... I54
Філязофія ................................... I63
Свабода ..................................... I70
Роўнасьць ................................... I82
Справядлівасьць ............................. I86
Індэкс аўтараў і крыніцаў ................... 20I

---

ДЛЯ ЗАПАМЯТАНЬНЯ: